Установа адукацыі
«Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»

**С.Ф. Лапановіч**
**А.М. Сувалаў**

# ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем
па гуманітарнай адукацыі
ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка
для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі,
якія навучаюцца па спецыяльнасцях
1-24 01 02 «Правазнаўства», 1-24 01 03 «Эканамічнае права»*

Мінск
Акадэмія МУС
2018

УДК 34(476)(09)
ББК 67.3.(4Беи)
Л24

Рэцэнзенты:
кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права
Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь;
доктар юрыдычных навук, прафесар *Т.І. Доўнар*

**ISBN 978-985-576-127-4**
© УА «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», 2018

## ПРАДМОВА

Вучэбна-метадычны дапаможнік змяшчае матэрыялы для замацавання атрыманых на лекцыі тэарэтычных ведаў і падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў. Аўтары ў якасці асновы для тэарэтычнай часткі дапаможніка выкарыстоўвалі наступныя крыніцы: падручнік Т.І. Доўнар «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (Мінск, 2014); вучэбныя дапаможнікі: А.Ф. Вішнеўскі «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (2-е выд., Мінск, 2003), Я.А. Юхо «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» : у 2 ч. (Мінск, 2000–2003), Г.К. Аргучинцев «История государства и права Беларуси» (Минск, 2014), В.А. Круталевіч «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.)» (2-е выд., Мінск, 2000); калектыўныя працы «Гісторыя Беларусі» : у 6 т. (Мінск, 2000–2011), «Нарысы гісторыі Беларусі» : у 2 ч. (Мінск, 1994–1995); энцыклапедычныя выданні: «Гісторыя Беларусі» : у 6 т., «Вялікае Княства Літоўскае» : у 3 т., а таксама манаграфіі А.Ф. Вішнеўскага, Т.І. Доўнар, Г.В. Дзербінай, А.К. Краўцэвіча і інш.

Аўтары звяртаюць увагу, што для адказаў на заданні і тэсты вучэбна-метадычнага дапаможніка трэба карыстацца крыніцамі, асноўнай і дадатковай літаратурай па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі». Спісы крыніц, асноўнай і дадатковай літаратуры змяшчаюцца ў электронным вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», якія размешчаны на сайце Акадэміі МУС – http://www.academy.mia.by

*Аўтар тэксту і заданняў вучэбна-метадычнага дапаможніка – С.Ф. Лапановіч.*

*Тэсты падрыхтаваны А.М. Сувалавым.*

# ЛІТАРАТУРА, НА ПАДСТАВЕ ЯКОЙ СКЛАДЗЕНА ТЭАРЭТЫЧНАЯ ЧАСТКА ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАГА ДАПАМОЖНІКА (па ўсіх тэмах)


## Асноўная літаратура

Аргучинцев, Г.К. История государства и права Беларуси : учеб. пособие для студентов специальности «Правоведение» / Г.К. Аргучинцев. – Минск : Амалфея, 2014. – 379 с.

Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам. для студэнтаў юрыд. і гіст. спецыяльнасцей ВНУ / А.Ф. Вішнеўскі. – 1-е выд. – Мінск : ВП «Экаперспектыва», 2000. – 319 с. ; 2-е выд. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – 313 с.

Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях «Правазнаўства», «Паліталогія», «Эканамічнае права», «Міжнароднае права» / Т.І. Доўнар. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. – 415 с.

Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / Я.А. Юхо. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000–2003. – 2000. – Ч. 1. – 349 с. ; 2003. – Ч. 2. – 274 с.

## Дадатковая літаратура

Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодарский, М. Пиетрчак ; пер. с пол. – М. : Юрид. лит., 1980. – 559 с.

Васілевіч, Р.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р.А. Васілевіч, Т.І. Доўнар, Я.А. Юхо ; рэдкал. : В.М. Гадуноў [і інш.] ; пад агул. рэд. Р.А. Васілевіча. – Мінск : Права і эканоміка, 2001. – 363 с.

Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзён) : вучэб. дапам. / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо ; пад агул. рэд. А.Ф. Вішнеўскага ; М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь, Акад. МУС. – 1-е выд. – Мінск : Акадэмія МУС, 1998. – 311 с. ; 2-е выд. – Мінск : Акадэмія МУС, 2003. – 320 с.

Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : ВП «Экаперспектыва», 2000–2011. – Т. 1 : Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / В. Вяргей [і інш.]. – 2000. – 350 с. ; Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – 2008. – 685 с. ; Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 343 с. ; Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2007. – 518 с. ; Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006.– 615 с. ; Т. 6 : Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]. – 2011. – 728 с.

Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі / пер. з рус. мовы Т.М. Бутэвіч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – 309 с.

История государства и права Белорусской ССР: в 2 т. / АН БССР, Ин-т филос. и права ; редкол.: В.А. Кучинский [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1970–1976. – 1970. – Т. 1 (1917–1936). – 608 с. ; 1976. – Т. 2 (1937–1975 гг.). – 656 с.

Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) : вучэб. дапам. для студэнтаў юрыд. і гіст. спецыяльнасцей ВНУ / В.А. Круталевіч, Я.А. Юхо. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 237 с. ; – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 237 с.

Кузнецов, И.Н. История государства и права Беларуси : пособие для студентов высш. учеб. заведений / И.Н. Кузнецов, В.А. Шелкопляс. – Минск : Тесей, 2004. – 320 с.

Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Мінск : Беларусь, 1994–1995. – 1994. – Ч. 1. / М.П. Касцюк [і інш.] ; Ін-т гісторыі АН Беларусі. – 527 с. ; 1995. – Ч. 2. / М.П. Касцюк [і інш.] ; Ін-т гісторыі АН Беларусі. – 560 с.

Сільчанка, М.У. Асноўныя этапы беларускай дзяржаўнасці : навуч. дапам. / М.У. Сільчанка, І.А. Басюк. – 2-е выд. дап. – Гродна : ГрДУ, 1996. – 148 с.

# ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА ЯК НАВУКА І ВУЧЭБНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

**Пытанні тэмы**

*1. Прадмет, задачы і метады гісторыі дзяржавы і права Беларусі.*

*2. Перыядызацыя гісторыі дзяржавы і права Беларусі.*

*3. Крыніцы і гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права Беларусі.*

## 1. Прадмет, задачы і метады гісторыі дзяржавы і права Беларусі

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» прызначана даць яснае і глыбокае разуменне заканамернасцей гістарычнага працэсу, асаблівасцей узнікнення і развіцця беларускай дзяржаўнасці, у тым ліку адносна змены тыпаў і формаў дзяржавы на працягу стагоддзяў, эвалюцыі дзяржаўных органаў і палітыка-прававых інстытутаў, змен у прававым становішчы насельніцтва і інш. Акрамя таго, гісторыя дзяржавы і права Беларусі, якая вывучаецца ва ўстановах вышэйшай адукацыі, мае на мэце фарміраванне ў студэнтаў прававога мыслення.

Як гісторыка-прававая дысцыпліна «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» мае не толькі **пазнавальнае**, але і **метадалагічнае** і **практычнае значэнне**. Яна дапамагае ў фарміраванні светаўяўлення і выпрацоўцы погляду на дзяржаўнасць як на дынамічны арганізм, які пастаянна развіваецца ў цеснай узаемасувязі з рэальным грамадска-палітычным становішчам. Дысцыпліна садзейнічае набыццю навыкаў абагульнення гістарычнага і прававога матэрыялу, умення аналізаваць яго і фармуляваць з навуковых пазіцый належныя вывады.

Аб'ект пазнання гісторыі дзяржавы і права – уся гістарычная рэчаіснасць. Прадмет гісторыі дзяржавы і права як навукі – больш вузкае паняцце, якое ўключае грамадскае развіццё ў часава-прасторавай канкрэтыцы.

Такім чынам, кожная навука мае свой прадмет даследавання, пад якім разумеюць вывучаемы бок аб'ектыўнай рэчаіснасці. Іншымі словамі, прадмет навукі – гэта тыя з'явы і працэсы рэальнага свету, якія яна даследуе, на што накіравана навуковае пазнанне.



Прадмет гісторыі дзяржавы і права Беларусі вызначаецца ў залежнасці ад філасофскіх поглядаў і метадалагічнай арыентацыі даследчыка ці выкладчыка.

Напрыклад, доктар гістарычных навук, прафесар А.Ф. Вішнеўскі вызначае, што прадметам гісторыка-прававой навукі з'яўляецца вывучэнне вядучай ролі эканамічных адносін ва ўзнікненні і развіцці дзяржавы і права, а таксама ў вызначэнні службовай ролі дзяржавы і права ў ахове і абароне існуючага спосабу вытворчасці ў розных грамадска-эканамічных фармацыях.

Доктар юрыдычных навук, прафесар Т.І. Доўнар лічыць, што гісторыя дзяржавы і права Беларусі як навука і вучэбная дысцыпліна вывучае прычыны і заканамернасці ўзнікнення, станаўлення, развіцця і функцыянавання дзяржаўнасці, яе прававых інстытутаў у народаў, якія насялялі беларускія землі з далёкай старажытнасці да цяперашняга часу.

На нашу думку, **прадметам** гісторыі дзяржавы і права Беларусі з'яўляецца пазнанне найбольш агульных заканамернасцей і адметнасцей узнікнення, развіцця і змен формаў дзяржавы і права, а таксама асаблівасцей функцыянавання дзяржаўных устаноў і інстытутаў права ў канкрэтных гістарычных умовах.

Галоўнымі задачамі гісторыі дзяржавы і права з'яўляюцца:

вывучэнне гістарычнага ходу падзей у іх храналагічнай паслядоўнасці;

выяўленне асноўных заканамернасцей развіцця структуры і дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і праваадносін грамадзян, вызначэнне прававога становішча класаў, станаў, саслоўяў і іншых сацыяльных груп;

выяўленне і вывучэнне крыніц права, даследаванне развіцця асноўных галін права (дзяржаўнага, цывільнага, крымінальнага, працэсуальнага і г. д.).

Метадалогія – сукупнасць найбольш агульных прынцыпаў, спосабаў навуковага пазнання.

Асноўныя метады гісторыі дзяржавы і права: гістарычны, параўнальна-гістарычны, сістэмна-структурны, статыстычны і інш.

## 2. Перыядызацыя гісторыі дзяржавы і права Беларусі

Гістарычная перыядызацыя – форма колькаснага і якаснага абазначэння гістарычнага развіцця.

Прынцыповую аснову любой перыядызацыі складаюць крытэрыі, выбар якіх вызначаецца як навуковай кваліфікацыяй, так і светапоглядам даследчыка. Адны кіруюцца сацыяльна-эканамічнымі крытэрыямі, іншыя грунтуюцца на сферы духоўнага развіцця.

Сацыяльна-эканамічныя крытэрыі сталі падставай для фармацыйнай перыядызацыі, якую распрацавалі тэарэтыкі марксізму-ленінізму. Прыхільнікі фармацыйнага падыходу падзяляюць гісторыю чалавецтва (у залежнасці ад спосабаў вытворчасці, што паслядоўна змянялі адзін аднаго) на некалькі грамадска-эканамічных фармацый (перыядаў): першабытна-абшчынную, рабаўладальніцкую, феадальную, капіталістычную і сацыялістычную, якая павінна была пераходзіць у камунізм. Па гэтаму падыходу гісторыя дзяржаўнасці ў нашым рэгіёне разгортвалася ў рамках толькі трох фармацый: **феадальнай** – IX ст. н. э. – 1861 г. (феадальная дзяржава), **капіталістычнай** – 1861–1917 гг. (буржуазная дзяржава), **камуністычнай** – з 1917 г. (сацыялістычная дзяржава, якая павінна была з цягам часу саступіць месца постдзяржаўнай камуністычнай арганізацыі грамадства). У савецкі час адбылася «кананізацыя» грамадскай фармацыі як перыядаў гісторыі. У асвятленні гісторыі СССР савецкімі гісторыкамі выкарыстоўваўся выключна фармацыйны прынцып, заснаваны на эканамічнай дэтэрмінанце гістарычнага працэсу. Развіваць астатнія погляды забаранялася.

Канцэпцыя цывілізацыйнага падыходу была распрацавана даследчыкамі з ліку гісторыкаў, філосафаў і сацыёлагаў – М. Веберам, О. Шпенглерам, К. Ясперсам, А. Тойнбі, М. Данілеўскім і інш. Яны даказвалі, што гісторыя грамадства звязана найперш з развіццём рэлігіі, культуры, духоўнасці, з індывідуальнасцю і непаўторнасцю чалавечай асобы, такім нематэрыяльным паняццем, як «дух народа» ў той ці іншы гістарычны перыяд.

Як гісторыка-прававая навука гісторыя дзяржавы і права абстрагуецца ад дадзяржаўнай эпохі развіцця чалавецтва, яе цікавіць час з моманту, калі ў грамадстве ўзнікаюць праваадносіны і пачынаецца працэс фарміравання дзяржаўнасці. Такой заснаванай на прынцыпе дзяржаўнасці з'яўляецца наступная перыядызацыя:

дзяржаўнасць і права ранняга сярэднявечча (IX – першая палова XIII ст.);

беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (другая палова XIII – першая палова XVI ст.);

беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (1569–1795 гг.);

беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – 1917 г.);

станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў перыяд рэвалюцыйных пераўтварэнняў і ўтварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (1917–1922 гг.);

дзяржаўнасць і права Беларускай ССР у складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (1922–1991 гг.);

заходнебеларускія землі ў складзе Польскай Рэспублікі і Сярэдняй Літвы (1920–1939 гг.);

дзяржаўнасць і права суверэннай Рэспублікі Беларусь (1991 г. – пачатак XXI ст.).



## 3. Крыніцы і гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права Беларусі

Гістарычныя **крыніцы** – гэта матэрыяльныя аб'екты, якія маюць сацыяльную прыроду паходжання, адлюстроўваюць гістарычнае мінулае грамадства, уцягнуты ў сферу гістарычнага даследавання і служаць сродкам гістарычнага пазнання. У працэсе апошняга гістарычныя крыніцы знаходзяцца паміж аб'ектам вывучэння (з'явы, падзеі) і суб'ектам (навуковец), які вывучае.

Пад **гістарыяграфіяй** разумеюць гісторыю самой гістарычнай навукі ці сукупнасць гістарычных даследаванняў, аб'яднаных агульнымі рысамі. Гістарыяграфія ў Беларусі развівалася ў прамой сувязі з палітычнымі, сацыяльнымі і культурнымі працэсамі, якія адбываліся ў грамадстве.

Грунтоўнае і сістэматычнае вывучэнне гісторыі дзяржавы і права Беларусі пачынаецца з 80-х гг. XVIII ст. Актыўна развіваюцца гісторыка-прававыя даследаванні феадальнай Беларусі ў XIX ст. У гэты перыяд вылучаюцца тры асноўныя напрамкі ў даследаванні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, якія ўмоўна называюць польскім, расійскім і патрыятычным.

Савецкая гістарыяграфія ўспрыняла ў асноўным славянафільскую канцэпцыю расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі і некалькі «мадэрнізавала» яе, спалучыўшы з класавай марксісцка-ленінска-сталінскай метадалогіяй і фразеалогіяй. Значнай падзеяй у развіцці гісторыі дзяржавы і права Беларусі з'яўляецца выданне двухтомнай працы «Гісторыя дзяржавы і права Беларускай ССР» (1970, 1976). У першым томе выкладаюцца падзеі ад утварэння Беларускай ССР да 1937 г. У другім томе асвятляецца перыяд з 1937 да 1970 г.

У сучасны перыяд даследаванню гісторыі дзяржавы і права Беларусі прысвечаны працы такіх беларускіх навукоўцаў, як Я.А. Юхо, Т.І. Доўнар, А.Ф. Вішнеўскі, С.Ф. Сокал, В.А. Круталевіч, М.У. Сільчанка, А.А. Радаман і інш.

### Дадатковая літаратура

Блок, М. Апология истории, или ремесло историка / М. Блок ; пер. с фр. – М. : Наука, 1986. – 254 с.

Лінднэр, Р. Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX стст. / Р. Лінднэр. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2003. – Т. 12. – 540 с.

Праблемы перыядызацыі гісторыі Беларусі : матэрыялы II навук. канф. Беларускага гістарычнага таварыства (Магілёў, 23–25 ліст. 2001 г.) // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 7.

Беларуская гістарыяграфія часоў БССР : матэрыялы IV навук. канф. Беларускага гістарычнага таварыства (Мінск, 31 мая – 1 чэрв. 2004 г.) // Гістарычны альманах. – 2004. – Т. 10.

Юхо, И. История юридической науки Беларуси / И. Юхо, С. Сокол. – Минск : Белорус. негос. ин-т правоведения, 2000. – 95 с.

Юхо, Я.А. Гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права феадальнай Беларусі : у 2 ч. / Я. Юхо ; НАН Беларусі ; Ін-т філас. і права, Беларус. дзярж. ін-т права-знаўства. – Мінск : [б. в.], 1999–2003. – 101 с.

## Пытанні для самакантролю

Як вы разумееце сацыяльнае прызначэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»?

Якія катэгорыі з'яўляюцца ключавымі пры вызначэнні даследчыкамі прадмета гісторыі дзяржавы і права Беларусі?

Ці ўплываюць канкрэтныя гістарычныя ўмовы на развіццё інстытутаў дзяржавы і права?

Як вы разумееце сувязь паміж метадалогіяй навуковага пазнання і аб'ектыўнасцю атрыманых вынікаў?

Якая перыядызацыя была пануючай у навуцы гісторыі дзяржавы і права Беларусі ў савецкі перыяд?

Якая сфера развіцця грамадства з'яўляецца вызначальнай для навукоўцаў, што прытрымліваюцца канцэпцыі цывілізацыйнага падыходу, пры перыядызацыі грамадства?

Чаму ў перыядызацыі, заснаванай на прынцыпе дзяржаўнасці, адсутнічае першабытны перыяд?

Хто з'яўляецца суб'ектам у працэсе гістарычнага пазнання?

Якія асноўныя напрамкі ў даследаванні гісторыі дзяржавы і права Беларусі ў XIX ст.?

Асобы якіх сучасных даследчыкаў гісторыі дзяржавы і права Беларусі вы ведаеце?

## Тэсты

1. Як адзначае А.Ф. Вішнеўскі, прадметам вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» з'яўляецца:

а) вывучэнне ролі палітычных адносін ва ўзнікненні і развіцці дзяржавы і права, вызначэнне службовай ролі дзяржавы і права ў ахове і абароне існуючага спосабу вытворчасці ў розных грамадска-эканамічных фармацыях;

б) вывучэнне вядучай ролі эканамічных адносін ва ўзнікненні і развіцці дзяржавы і права, вызначэнне службовай ролі дзяржавы і права ў ахове і абароне існуючага спосабу вытворчасці ў розных грамадска-эканамічных фармацыях;

в) вывучэнне вядучай ролі прававых адносін ва ўзнікненні і развіцці дзяржавы і права, вызначэнне службовай ролі дзяржавы і права ў ахове і абароне існуючага спосабу вытворчасці ў розных грамадска-эканамічных фармацыях;



г) вывучэнне вядучай ролі культурных адносін ва ўзнікненні і развіцці дзяржавы і права, вызначэнне службовай ролі дзяржавы і права ў ахове і абароне існуючага спосабу вытворчасці ў розных грамадска-эканамічных фармацыях.

2. Першымі буйнымі вучонымі савецкага часу, якія сталі займацца гісторыяй дзяржавы і права Беларусі, былі:

а) М.В. Доўнар-Запольскі і У.І. Пічэта;

б) І.М. Даніловіч і Ф.Г. Малеўскі;

в) Я.А. Юхо і В.А. Шаўкапляс.

3. Значныя дасягненні ў вывучэнні праблем гісторыі дзяржавы і права Вялікага Княства Літоўскага належаць такім даследчыкам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, як:

а) М.К. Любаўскі, І.А. Маліноўскі, Ф.В. Тараноўскі;

б) І.М. Даніловіч, А.А. Міцкевіч, Ф. Малеўскі;

в) М.В. Доўнар-Запольскі, У.І. Пічэта, Я.А. Юхо, Т.І. Доўнар.

4. Прадстаўнікамі Кіеўскай школы гісторыі «западно-русского права» з'яўляюцца:

а) М.К. Любаўскі;

б) М. Уладзімірскі-Буданаў;

в) І.А. Маліноўскі;

г) І.І. Лапа.

5. Як называлася першая адукацыйная ўстанова на тэрыторыі ВКЛ, дзе вывучалі айчыннае права?

а) Святаянская школа права;

б) Віленскі ўніверсітэт;

в) Віленская езуіцкая акадэмія;

г) Віленская галоўная школа.

6. Які даследчык увёў у навуковае абарачэнне Судзебнік Казіміра 1468 г., упершыню падрыхтаваў да друку рукапіс Статута ВКЛ 1529 г., кіраваў дзейнасцю групы юрыстаў, якая склала праект Зводу мясцовых законаў Заходніх губерняў Расійскай імперыі, быў прафесарам Віленскага, Харкаўскага, Кіеўскага і Маскоўскага ўніверсітэтаў?

а) М.В. Доўнар-Запольскі;

б) А.Ф. Вішнеўскі;

в) І.М. Даніловіч;

г) В.А. Шаўкапляс.

7. Хто першы ў БССР падрыхтаваў вучэбны дапаможнік, у якім змешчаны дакументы, што асвятляюць працэс развіцця дзяржавы і права нашай Айчыны ад часоў існавання Полацкага і Тураўскага княстваў да нашых дзён?

а) М.В. Доўнар-Запольскі;

б) І.М. Даніловіч;

в) В.А. Шаўкапляс;

г) А.Ф. Вішнеўскі і Я.А. Юхо.

8. Першую спецыяльную навуковую юрыдычную працу напісаў у ВКЛ:

а) Ф. Скарына;

б) П. Раізій;

в) А. Волан;

г) Т. Чацкі.

9. Хто напісаў першае дысертацыйнае даследаванне аб гарадах на магдэбургскім праве ў ВКЛ?

а) Ф.В. Тараноўскі;

б) М.Ф. Уладзімірскі-Буданаў;

в) І.І. Лапа;

г) С.У. Юшкоў.

10. Задачамі вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» з'яўляюцца:

а) вызначэнне своеасаблівасці і заканамернасцей развіцця палітычных інстытутаў для засваення і выкарыстання вопыту айчыннай юрыспрудэнцыі і росту прававой культуры грамадства;

б) умацаванне ўласнай нацыянальнай годнасці ў грамадстве;

в) даследаванне развіцця асноўных галін права;

г) вывучэнне гістарычнага ходу падзей у іх храналагічнай паслядоўнасці, выяўленне асноўных заканамернасцей развіцця структуры і дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і праваадносін грамадзян, вызначэнне прававога становішча класаў, саслоўяў, выяўленне і вывучэнне крыніц права, даследаванне развіцця асноўных галін права (дзяржаўнага, цывільнага, крымінальнага, працэсуальнага і г. д.).

### Прыкладныя тэмы рэфератаў

Метадалагічныя асновы вывучэння гісторыі дзяржавы і права.

Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі.

Сучасныя падыходы да праблем перыядызацыі гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Польская і расійская гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права ВКЛ і Беларусі ў дасавецкі перыяд.

Гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права Беларусі савецкага перыяду.

Погляды сучасных польскіх, літоўскіх, расійскіх і ўкраінскіх даследчыкаў на праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Адказы на тэсты: 1 – б); 2 – а); 3 – в); 4 – б), в); 5 – а); 6 – в); 7 – г); 8 – б); 9 – а); 10 – г).



# ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ І ПРАВА ЎСХОДНІХ СЛАВЯН РАННЯГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА (IX – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIII ст.). ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

**Пытанні тэмы**

*1. Зараджэнне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Полацкае, Тураўскае, Смаленскае і іншыя княствы як першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях.*

*2. Грамадскі лад дзяржаў-княстваў ранняга сярэднявечча.*

*3. Дзяржаўны лад княстваў ранняга сярэднявечча.*

*4. Права ранняга сярэднявечча: звычаёвае і пісьмовае.*

*5. Міждзяржаўныя нарматыўныя дагаворы.*

*6. Царкоўнае права. Юрысдыкцыя хрысціянскай (праваслаўнай) царквы на беларускіх землях. Рэцэпцыя візантыйскага царкоўнага права.*

## 1. Зараджэнне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Полацкае, Тураўскае, Смаленскае і іншыя княствы як першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях

У VI ст. славяне ўключыліся ў працэс «вялікага перасялення народаў». У VI–VII стст. славяне ўмоўна падзяліліся на тры вялікія групы – паўднёвыя, усходнія, заходнія. У выніку аб'яднання (каля 882 г.) наўгародскім князем Алегам некалькіх ранніх дзяржаўных аб'яднанняў паміж Ноўгарадам і Кіевам утварылася магутная ўсходнеславянская дзяржава з правячай варажскай дынастыяй, вядомая ў крыніцах як Кіеўскае княства (Кіеўская Русь, Старажытнаруская дзяржава).

Засяленне славянамі беларускіх зямель адбывалася ў апошняй трэці 1-га тысячагоддзя. Паводле летапісаў на беларускіх землях (зараз тэрыторыя сучаснай Беларусі) было некалькі аб'яднанняў усходніх славян, з якіх асноўныя: **крывічы, дрыгавічы, радзімічы**.

**Крывічы** – засялялі вярхоўі Дняпра, Заходняй Дзвіны, Волгі, поўдзень Чудскага возера, першае ўзгадванне – 859 г. у «Аповесці мінулых часоў». У канцы 1-га тысячагоддзя крывічы распаліся на тры групы – полацкая (паўночная частка тэрыторыі Беларусі, гарады Полацк, Віцебск, Лукомль, Браслаў), смаленская і пскоўская.

**Дрыгавічы** – займалі паўднёвую і цэнтральную часткі тэрыторыі Беларусі, гарады Тураў і Пінск, Слуцк і Клецк. Першае летапіснае прыгадванне дрыгавічоў прыпадае на недатаваную частку «Аповесці мінулых гадоў» – яны прыгадваюцца ў сувязі з рассяленнем славян, што прыйшлі з Падунаўя.

**Радзімічы** – жылі ў міжрэччы Дняпра і Дзясны па цячэнні Сожа і прытокаў. Першыя звесткі пра радзімічаў – 885 г. (кіеўскі князь Алег абавязаў радзімічаў плаціць яму даніну). У 984 г. гэта тэрыторыя ўключана ў склад Кіеўскага княства.

**Полацкае княства – зямля.** Славянскае насельніцтва ў Полацку – крывічы. У X–XI стст. Полацкае княства займала ўсю Паўночную Беларусь. Першае ўзгадванне Полацка – 862 г. Полацк знаходзіўся ў пастаянных палітычных і эканамічных сувязях з Кіевам. Першы гістарычна вядомы князь – Рагвалод (980 г.), узгадваецца яго дачка Рагнеда. Потым Полацк захапіў наўгародскі князь Уладзімір Святаславіч, які хутка стаў кіеўскім князем. У пэўны час падпарадкавання беларускіх зямель Кіеву адносіны паміж кіеўскім князем і мясцовымі князямі будаваліся на прынцыпах васалітэту. Кіеўскі князь быў сюзерэнам і аказваў дапамогу мясцовым князям, якія, у сваю чаргу, абавязваліся быць «у яго паслушэнстве», выстаўляць войска, перадаваць частку сабранай даніны. Ізяслаў (сын Рагнеды і Уладзіміра) і яго нашчадкі аднавілі ў Полацку мясцовую дынастыю. Значнага росквіту Полацкае княства дасягнула пры князю Усяславу Брачыславічу (сучаснікі далі яму мянушку Чарадзей), які кіраваў дзяржавай у другой палове XI ст. Усяслаў Брачыславіч праводзіў самастойную ўнутранную і знешнюю палітыку, пры ім у Полацку быў пабудаваны сімвалічны Сафійскі сабор – трэці ва ўсёй Усходняй Еўропе, пасля кіеўскага і наўгародскага. З імем Усяслава звязана і першае летапіснае ўзгадванне ў «Аповесці мінулых часоў» пад 1067 годам г. Менска (з 1939 г. – Мінска) – будучай сталіцы сучаснай Беларусі.

Як лічаць беларускія даследчыкі, Полацкая зямля пры Усяславу Брачыславічу канчаткова пераўтварылася ў самастойную раннесярэднявечную дзяржаву, што характарызавалася наяўнасцю наступных неабходных атрыбутаў і палітычных інструментаў: стабільнай тэрыторыяй, вышэйшай уладай у асобе князя, уласнай дынастычнай лініяй, апаратаў прымусу і ідэалогіі, рэлігійнай арганізацыяй і ўзброенымі сіламі.



Сярод нашчадкаў Усяслава Брачыславіча адзначым асветніцу і манахіню, святую Ефрасінню Полацкую, якая шануецца хрысціянамі як нябесная заступніца Беларусі.

Пры нашчадках Яраслава Мудрага (1019–1054) рашэнне Любецкага з'езда 1097 г. «каждо да держіть отчізну свою» пачало перыяд распаду сярэднявечных дзяржаў на больш дробныя дзяржаўныя ўтварэнні – час феадальнай раздробленасці.

Аснову **Тураўскага княства** складала тэрыторыя племяннога саюзу дрыгавічоў у паўднёвай частцы беларускіх земель. Першае ўзгадванне аб ім адносіцца да 980 г., легендарным заснавальнікам лічыцца вараг Тур. Тураўскае княства трапіла ў сферу інтарэсаў Кіева і з канца X ст. на княжэнне ў Тураў пасылалі старэйшых сыноў Кіеўскага князя. У 1157 г. тураўскім князем стаў Юрый Яраслававіч, з імем якога звязана адраджэнне самастойнасці Тураўскага княства.

У Верхнім Падняпроўі ў VIII–IX стст. адбываўся працэс аб'яднання смаленскіх крывічоў. Было ўтворана **Смаленскае княства**, якое пры князю Расціславу Мсціслававічу ў XII ст. дасягнула найбольшага росквіту. У XII ст. адбываецца эканамічнае і культурнае збліжэнне Полацкага і Смаленскага княстваў.

## 2. Грамадскі лад дзяржаў-княстваў ранняга сярэднявечча

Да VII ст. на тэрыторыі Беларусі родаплемянное грамадства знаходзілася на стадыі **ваеннай дэмакратыі** – формы арганізацыі грамадства і яго кіравання, якія грунтаваліся на суіснаванні ваеннай улады родаплемяннай знаці і народнага сходу, родавых і мілітарысцкіх каштоўнасцей. Існаваў грамадскі падзел працы, патрыярхальнае рабства. У IX–XI стст. у Кіеўскай Русі, у адрозненне ад Заходняй Еўропы, яшчэ адсутнічала буйное феадальнае землеўладанне, не існавала ў развітай форме феадальная іерархія. Тут жылі свабодныя абшчыннікі. Такім чынам, у грамадстве ўсходніх славян IX–XI стст. выдзяляюцца тры эканамічныя ўклады: родаплемянны (быў на схіле), рабаўладальніцкі (не атрымаў значнага распаўсюджання), феадальны (пачынаўся).

На тагачаснай тэрыторыі Беларусі паступова ўсталёўваецца **раннефеадальны** лад. У грамадстве пачалі складвацца некалькі саслоўяў (станаў). Асноўнымі класамі стануць *феадалы* і *феадальна-залежныя сяляне.*

Вышэйшыя саслоўі складалі князі, баяры, частка дружыны, вышэйшае духавенства. Феадалы былі ўзаемазвязаны сістэмай васалітэту, якая рэгулявала правы і абавязкі паміж імі, а таксама іх перад дзяржавай.

Першыя феадалы – дружыннікі князя. Пазней яны сталі **баярамі.** У IX–XI стст. працэс феадалізацыі развіваўся марудна. Да з'яўлення буй-

нога княжацкага землеўладання ва ўсходніх славян узнікалі прыкметы васальнай залежнасці. Яна выглядала як права атрымання дружыннікамі даніны з пэўнай тэрыторыі. У якасці васалаў вялікага князя дружыннікі неслі ў яго службу за «лен» – права збору даніны з пэўнай тэрыторыі. У IX ст. князь не жалаваў сваёй дружыне зямель і не заводзіў сваёй гаспадаркі, а абкладаў свабоднае і паўсвабоднае насельніцтва данінай.

Толькі ў другой палове XI – першай палове XII ст. утвараецца вотчына, заснаваная на ўласнасці на зямлю. **Вотчына** – форма зямельнай уласнасці і звязаных з ёй правоў на залежных сялян, якая атрымлівалася ў пажыццёвае валоданне і магла перадавацца па спадчыне. **Памесце** – форма зямельнай уласнасці і звязаных з ёй правоў на залежных сялян, якіх атрымлівалі ў валоданне за службу і якія не перадаваліся па спадчыне (без права імунітэту). Эканамічная магутнасць класа феадалаў дазволіла яму заняць пануючае становішча ў палітычным жыцці грамадства, захапіць у свае рукі ўсе ключавыя пасады ў дзяржаўным апараце.

Для феадалізму ўласціва прысваенне феадаламі працы сялян у форме зямельнай рэнты. Феадалізму ўласцівы тры яе формы: *адработачная рэнта, ці паншчына; рэнта прадуктамі, ці аброк; грашовая рэнта*.

Клас феадальна-залежных людзей утвараўся: 1) за кошт замацавання халопаў і іншых несвабодных людзей на зямлі – для феадала значна важней станавілася валодаць правам распараджацца павіннасцямі сялян, чым імі самімі; 2) шляхам гвалтоўнага пазаэканамічнага прымусу былых свабодных абшчыннікаў уносіць пэўныя даніны і выконваць павіннасці на карысць асобных феадалаў або дзяржавы ў цэлым; 3) у выніку маёмаснага расслаення свабодных сялян, якія, збяднеўшы, трапілі ў даўгавую кабалу.

Разам з тым у пачатку развіцця феадальных адносін на тэрыторыі Беларусі яшчэ працягвалі захоўвацца свабодныя сяляне-даннікі, якія вялі сваю ўласную гаспадарку і абавязаны былі ўносіць на карысць цэнтральных і мясцовых органаў кіравання пэўную даніну натурай або грашыма, выконваць шэраг дзяржаўных павіннасцей.

У гарадах таксама ішоў працэс маёмаснага расслаення. Пануючае становішча ў гарадской эканоміцы занялі купцы і багатыя рамеснікі.

## 3. Дзяржаўны лад княстваў ранняга сярэднявечча

На тэрыторыі Беларусі ў IX–XIII стст. існавалі такія буйныя дзяржавы-княствы, як Полацкае, Тураўскае, Менскае, Навагародскае, Смаленскае і інш.

Навукоўцы С.Ф. Сокал і А.Ф. Вішнеўскі, працягваючы традыцыю шэрагу дарэвалюцыйных аўтараў, вызначаюць форму праўлення ў раннесярэднявечных дзяржавах-княствах як раннефеадальную **дуалістычную манархію**, паколькі, на іх думку, гэтае азначэнне адлюстроўвае палітычны дуалізм, увасоблены ў двух цэнтрах улады: князя з яго радай і веча.



Шэраг даследчыкаў вызначаюць форму дзяржаўнасці, што ўзнікае ў гэты час, як **патрымоніум**. Гэта палітычны лад, пры якім улада пануючай дынастыі і падпарадкаваная ёй тэрыторыя (зямельныя ўладанні) разглядаліся непарыўна з'яднанымі. Спачатку права на ўладу меў кожны член пануючага дому, і пасля смерці чарговага валадара тэрыторыя раздзялялася паміж яго сынамі як саўдзельнікамі ўладання. Гэтую калектыўную стадыю валадарання называюць таксама corpus fratrum ці абшчына братоў; пазней яна перарастае ў **сеньярат** (senior – старэйшы) ці вяршэнства старэйшага брата.

Вышэйшую ўладу ажыццяўлялі **князь, рада князя, веча**.

Галоўнай асобай у сістэме ўлады быў **князь**. Ён стаяў на чале дзяржавы і ўсіх выканаўчых органаў. На першапачатковым этапе існавання раннесярэднявечных дзяржаў галоўнымі абавязкамі князя з'яўляліся **арганізацыя** і **камандаванне войскам**, ажыццяўленне **судовых функцый** і збор даніны. Для арганізацыі абароны дзяржавы ад знешняга нападу і падтрымання ўнутранага парадку ён трымаў пры сабе дружыну, а ў час небяспекі ўзначальваў усё войска зямлі-княства. Паўнамоцтвы князя больш позняга перыяду знаходзіліся ў асноўным у сферы **выканаўча-распарадчай дзейнасці**. Князь меў права рашаць усе бягучыя пытанні дзяржаўнага кіравання, здзяйсняць правасуддзе, прадстаўляць дзяржаву ў знешнепалітычных адносінах і інш.

**Інтранізацыя** – узвядзенне князя на пасад ці пасаджэнне на «стол» – суправаджалася строгім рытуалам, у час якога прыносілася прысяга з абяцаннем ахоўваць тэрыторыю дзяржавы і інтарэсы падданых, дзейнічаць у адпаведнасці з мясцовымі дзяржаўна-прававымі звычаямі. Уладарныя паўнамоцтвы князя абумоўліваліся як яго асабістымі якасцямі і аўтарытэтам сярод насельніцтва, так і падтрымкай вярхоў пануючага класа.

**Рада князя** не мела пастаяннага складу. Кампетэнцыя рады фактычна злівалася з кампетэнцыяй князя, бо ўсе пытанні, якія вырашаліся князем, як правіла, ён абмяркоўваў са сваёй радай. Акрамя пытанняў бягучай выканаўча-распарадчай дзейнасці ў радзе князя вырашаліся і найбольш важныя судовыя справы, якія тычыліся інтарэсаў феадалаў і вышэйшых службовых асоб дзяржаўнага апарату.

Важным элементам палітычнай сістэмы была **царква**, цесна звязаная з дзяржавай. Вярхушка духавенства прымала актыўны ўдзел у палітычным жыцці дзяржавы і грамадства.

Пэўнае значэнне мела **веча** – народны сход у сярэднявечны перыяд, які збіраўся для абмеркавання агульных спраў. Гэта была пачатковая форма гарадскога самакіравання, у пэўнай ступені падуладнага мясцовай знаці. У пачатку XII ст. роля веча ўзрасла настолькі, што яно актыўна вырашала пытанні вайны і міру, запрашала на прастол князёў і нярэдка праганяла іх з горада, устанаўлівала раскладку павіннасцей і падаткаў, прымала захады па арганізацыі апалчэння і абароны, разглядала найбольш важныя судовыя справы, ажыццяўляла заканадаўчую ўладу.

У некаторых гарадах функцыі органаў цэнтральнага кіравання выконвалі такія службовыя асобы, як **пасаднік, тысяцкі, падвойскі, ключнік, цівун** і інш. **Пасаднік** абіраўся вечам або прызначаўся князем у іншыя гарады дзяржавы, дзе ён з'яўляўся намеснікам князя. Галоўным абавязкам **тысяцкага** з'яўлялася ваеннае кіраўніцтва. У час вайны ён камандаваў апалчэннем, а ў мірны – сачыў за падтрыманнем парадку ў горадзе. **Падвойскаму** даручалася сачыць за выкананнем рашэнняў веча і распараджэнняў князя. Гаспадарчымі справамі і некаторымі судова-адміністрацыйнымі пытаннямі ў дзяржаве займаліся **ключнік** і **цівун**.

## 4. Права ранняга сярэднявечча: звычаёвае і пісьмовае

**Звычаёвае права** вызначаецца як форма права, сукупнасць прававых звычаяў (звычаёва-прававых нормаў) – агульных правіл паводзін, што дзейнічаюць у межах пэўнай супольнасці адносна ўсіх яе членаў, якія аб'яднаны зместам гэтых правіл. Апошнія ўсведамляюцца як правамерныя і абавязковыя, адпавядаюць і непасрэдна грунтуюцца на прынцыпах натуральнага права, выступаюць як вынік трывалай, аднастайнай і сталай практыкі вырашэння прававых сітуацый, якія вынікаюць на аснове тыповых адносін у практычным жыцці людзей, забяспечваюцца сацыяльнай санкцыяй, а таксама могуць мець падтрымку з боку дзяржаўных органаў улады і суда. Звычаёвае права характарызуе сабой здольнасць супольнасці прызнаваць і ўстанаўліваць пэўны абсяг правоў і абавязкаў, якія неабходны для нармальнай рэалізацыі канкрэтных відаў сацыяльных адносін.

**Сацыяльная дэтэрмінацыя** звычаёвага права азначае абумоўленасць развіцця звычаёва-прававых нормаў сацыяльнымі прычынамі. У якасці асноўных фактараў сацыяльнай дэтэрмінацыі звычаёвага права выступалі: сацыяльна-этнічныя, эканамічныя, сацыяльна-палітычныя і духоўныя.

Звычаёвае права выяўлялася: у юрыдычных дзеяннях (фактах) – аднастайнае паўтарэнне адных і тых жа дзеянняў ёсць дакладны паказальнік



для распазнання звычаёвага права (але з улікам спецыфікі дзяржаўнага права); у сімвалах (умоўных фактах, створаных менавіта для выражэння правамернасці з'явы: «пасаджэнне князя на стале» азначае законнасць набыцця ўлады); у славесных формулах – напрыклад, у юрыдычных прыказках, з якіх некаторыя потым паслужылі формай закона (*«Муж крепок по жене, а жена крепка по мужу», «В отперты двери лезут звери» (знайшло адлюстраванне ў «Рускай Праўдзе»).*

Для раннесярэднявечнага звычаёвага права характэрны наступныя рысы:

рэлігійнае значэнне – падвойная абавязковасць (унутраная і вонкавая);
дуалізм (дваістасць);
партыкулярызм;
кансерватызм (традыцыяналізм).

Паступова з развіццём і ўскладненнем грамадскіх адносін архаічнае звычаёвае права перастала адпавядаць узроўню іх развіцця. Яно не паспявала рэгуляваць тыя змяненні, якія дынамічна адбываліся ў грамадстве і патрабавалі новых формаў права – **пісаных** нарматыўных прававых актаў.

Першапачаткова пісанае права не адмяняла звычаяў, а толькі дапаўняла іх, а таксама сістэматызавала звычаі, надаючы ім агульнадзяржаўны характар. Першымі нарматыўна-прававымі актамі былі княжацкія ўставы, а першымі зборнікамі гэтых актаў, якія складаліся на падставе прававых звычаяў, – так званая «Руская Праўда».

Як сцвярджаў М. Ф. Уладзімірскі-Буданаў, пад «Рускай Праўдай» трэба разумець шэраг зборнікаў, што былі складзены для прыватных асоб з княжацкіх уставаў, звычаёвага права, часткова візантыйскіх крыніц. Зборнік законаў грунтаваўся на казуальнай сістэме, адпаведна якой заканадаўца імкнуўся прадугледзець усе магчымыя жыццёвыя сітуацыі. Гэтыя юрыдычныя асаблівасці абумоўлены тым, што крыніцавай базай «Рускай Праўды» служыла звычаёвае права, нормы і прынцыпы якога несумяшчальныя з абстрактным паняццем юрыдычнай асобы.

Выцясненне звычаёвага права пісьмовымі крыніцамі права адбывалася паступова на працягу стагоддзяў.

## 5. Міждзяржаўныя нарматыўныя дагаворы

З X ст. усходнія славяне ў саюзе з дружынамі скандынаваў (варагаў) уступілі ў сутыкненне з аддаленымі краінамі – Візантыяй і заходнееўрапейскім светам. Гэта паўплывала на звычаёвае права дваякім чынам:

узмацніла разнастайнасць у разуменні юрыдычных нормаў і прымусіла ўзгадніць свае айчынныя нормы з замежнымі. Адсюль паўсталі такія прыёмы заканадаўства, як дамовы з замежнімі краінамі і рэцэпцыя чужых законаў.

У «Аповесці мінулых часоў» утрымліваюцца звесткі аб пагадненнях русаў і Візантыі, якія былі заключаны князямі: Алегам у 907 і 911 гг., Ігарам у 944 (945) г. і Святаславам у 971 (972) г. Гэтыя пагадненні з'яўляюцца першымі нарматыўнымі дагаворамі дзяржаў-княстваў Русі. Летапісы ўзгадваюць пра ўдзел крывічоў і радзімічаў у паходах на Царград (Канстанцінопаль). Аднак іх удзел у падрыхтоўцы саміх дагавораў малаверагодны.

Права дагавораў складзена з нормаў як візантыйскага, так і русінскага права з мэтай урэгуляваць праваадносіны паміж бакамі (калі ў дагаворы за забойства пастаноўлена смерць, то для візантыйцаў яна азначала смяротнае пакаранне, а для русаў – кроўную помсту; за крадзёж накладалася маёмаснае пакаранне і, акрамя таго, злачынец павінен быць пакараны «по закону греческому и по уставу и закону русскому»).

Вынікамі дыпламатычных і гандлёвых кантактаў з заходнееўрапейскім светам стала з'яўленне шэрагу міжнародных пагадненняў. Да іх адносяцца **граматы і дагаворы** аб адносінах Смаленскага, Полацкага і Віцебскага княстваў з Рыгай, Готландам, нямецкімі Ганзейскімі гарадамі і Ордэнам братоў па мячы**,** якія з'яўляюцца найбольш старажытнымі помнікамі пісанага права, што паходзяць непасрэдна з тэрыторыі Беларусі і дайшлі да нашага часу. **Дагавор 1229 г.** навукоўцы яшчэ называюць «Смаленскай гандлёвай праўдай». Вядомы некалькі спісаў дагавора, які замацаваў прававыя нормы, што гарантавалі і забяспечвалі развіццё міжнародных гандлёвых адносін.

Ва ўступе да дагавора паведамляецца пра ўстанаўленне дружалюбных адносін паміж краінамі і пералічваецца склад пасольстваў, якія прымалі ўдзел у яго заключэнні. Тэкст дагавора складаецца з шэрагу артыкулаў, дзе выкладзены нормы крымінальнага, працэсуальнага права і права па абавязацельствах, а таксама палажэнні, што рэгламентавалі парадак заключэння дагавораў куплі-продажу, правозу тавару і інш. Дагавор устанаўліваў гарантыі недатыкальнасці іншаземных купцоў, узаемныя прывілеі па тавараабмене, агаворваў умовы бесперашкоднага продажу тавараў.

Такім чынам, галоўнае прызначэнне Дагавора 1229 г. заключалася ў замацаванні прававых нормаў, якія забяспечвалі нармальныя адносіны паміж заходне- і ўсходнееўрапейскімі народамі на аснове ўзаемнасці і раўнапраўя.



## 6. Царкоўнае права. Юрысдыкцыя хрысціянскай (праваслаўнай) царквы на беларускіх землях. Рэцэпцыя візантыйскага царкоўнага права

**Царкоўнае права** – корпус кадыфікаванага права, які склаўся на працягу гісторыі хрысціянства і рэгулюе як унутранае дысцыплінарнае (кананічнае) жыццё царквы, так і яе адносіны з той ці іншай дзяржавай.

У канцы X ст. (988 г.) адносіны Кіеўскай Русі з Візантыяй прывялі да прыняцця хрысціянства, што зрабіла пераварот ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку ў праве. З хрысціянствам з'явілася царква, што мела свае кананічныя законы, вылучылася новая сацыяльная група – хрысціянскае духавенства, якое заняло ў грамадстве прывілеяванае становішча. Царкве была прадастаўлена шырокая юрысдыкцыя ў дзяржаве. Гэтая новая арганізацыя стала рэалізоўваць новыя грамадскія задачы – удзел у падтрыманні рэлігійнага і маральнага парадку ў грамадстве.

У працэсе ўмацавання пазіцый хрысціянства і яго распаўсюджвання на тэрыторыі Кіеўскай Русі асаблівае значэнне набылі шэраг візантыйскіх юрыдычных дакументаў. Найбольш вядомымі з іх з'яўляюцца: **«Номаканон», «Эклога», «Прахірон»**. З часам гэтыя царкоўна-юрыдычныя дакументы, якія называліся на Русі «Кормчымі Кнігамі», прымаюць сілу паўнапраўных заканадаўчых актаў, а разам з іх распаўсюджаннем пачынае ўкараняцца інстытут царкоўных судоў, якія існуюць разам з княжацкімі.

Пераварот, выкліканы ва ўсходнеславянскім грамадстве хрысціянствам, акрамя рэцэпцыі, выклікаў і самастойную заканадаўчую дзейнасць сярод славян. Былі створаны так званыя **царкоўныя Статуты**, якія прыпісваюцца князям Уладзіміру, Яраславу і іншым, больш позним уладарам. Княжацкія статуты, у адрозненне ад законаў візантыйскіх імператараў, практычна не закраналі ўнутрыцаркоўнае жыццё, а тычыліся ўзаемаадносін паміж царквой і дзяржавай, у іх таксама пералічваліся прадастаўленыя царкве льготы. Змест Статутаў Уладзіміра і Яраслава складаецца з трох частак: уступ, установачная частка і заключэнне. Установачная частка змяшчала юрысдыкцыю царкоўнага суда: 1) справы толькі «грахоўныя» (без элемента злачыннасці) – судзіліся выключна царкоўнай уладай і разбіраліся па царкоўных законах біскупскім судом без удзелу суддзі княжацкага; 2) справы «грахоўна-злачынныя» (парушэнне царкоўных правіл спалучалася з гвалтам, з фізічнай або маральнай шкодай, з парушэннем грамадскага парадку) – такія справы парушалі і дзяржаўны закон, таму разбіраліся княжацкім суддзёй з удзелам суддзі царкоўнага; 3) справы «духоўныя», саслоўныя (тычыліся «царкоўных

людзей», якія здзейснілі звычайныя супрацьзаконныя дзеянні) – разглядала царкоўная ўлада па законах і звычаях, што дзейнічалі ў княжацкіх судах; але князь як выканаўца судовага прысуду і вярхоўны ахоўнік грамадскага парадку пакідаў за сабой некаторы ўдзел у судзе над людзьмі царкоўнага саслоўя.

### Дадатковая літаратура


Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды / М. Ермаловіч. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 365 с.

Пьянков, А.П. Происхождение общественного и государственного строя Древней Руси / А.П. Пьянков. – Минск : БГУ, 1980. – 208 с.

Свердлов, М.Б. От Закона Русского к Русской Правде / М.Б. Свердлов. – М. : Юрид. лит., 1988. – 174 с.

Свердлов, М.Б. Домонгольская Русь : Князь и княжеская власть на Руси VI – первой трети XIII в. / М.Б. Свердлов ; Рос. акад. наук, С.-Петерб. ин-т истории. – СПб. : Акад. проспект, 2003. – 734 с.

Щапов, Я.Н. Византийское и южнославянское правовое наследие на Руси в IX–XIII вв. / Я.Н. Щапов. – М. : Наука, 1978. – 292 с.

Щапов, Я.Н. Государство и церковь Древней Руси, X–XIII вв. / Я.Н. Щапов ; АН СССР, Ин-т истории СССР. – М. : Наука, 1989. – 228 с.

Штыхаў, Г.В. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі / Г.В. Штыхаў. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Права і эканоміка, 2002. – 89 с.


### Пытанні для самакантролю

На якія тры вялікія групы славяне падзяліліся ў VI – VII стст.?

На якой геаграфічнай прасторы пражывала племя радзімічаў?

На якіх прынцыпах будаваліся адносіны паміж кіеўскім князем і мясцовымі князямі на тэрыторыі Беларусі ў перыяд феадальнай раздробленасці?

З якіх сацыяльных груп складалася вышэйшае саслоўе ў раннекласавым грамадстве?

Чым характарызуецца вотчына як форма зямельнай уласнасці?

Якія асноўныя крыніцы фарміравання класа феадальна залежных людзей?

Якія асноўныя абавязкі князя ў раннефеадальным грамадстве?

Як вы разумееце кампетэнцыю веча ў раннесярэднявечных дзяржавах-княствах?

Якой службовай асобе даручалася сачыць за выкананнем рашэнняў веча і распараджэнняў князя?

Як вы разумееце сацыяльную дэтэрмінацыю звычаёвага права?

Растлумачце сутнасць такой рысы раннесярэднявечнага права, як партыкулярызм.



Што стала асноўнай крыніцай «Рускай Праўды»?

Нормы якіх галін права адлюстраваны ў «Смаленскай гандлёвай праўдзе»?

Якая грамадская задача паўстала перад царквой пасля прыняцця хрысціянства?

Якія візантыйскія юрыдычныя дакументы былі найбольш вядомымі на тэрыторыі Кіеўскай Русі?

На якія катэгорыі насельніцтва распаўсюджвалася юрысдыкцыя царкоўных судоў?

### Тэсты

1. Дзе адбыўся з'езд князёў, які паклаў пачатак афармленню падзелу «Кіеўскай Русі»?

а) у Любечы (1097);

б) у Віцічаве (1100);

в) на Долабскім возеры (1103).

2. Першымі пісанымі нарматыўнымі прававаыі актамі ў дзяржавах-княствах на тэрыторыі Усходняй Еўропы былі:

а) княжацкія ўставы;

б) указы княжацкай рады;

в) распараджэнні пасаднікаў;

г) пастановы царкоўных сабораў.

3. Па азначэнні М.Ф. Уладзімірскага-Буданава пад «Рускай праўдай» трэба разумець:

а) збор законаў, які фарміраваўся паступова на працягу XI–XII стст. і быў складзены прыватнымі асобамі з княжацкіх уставаў, звычаёвага права і часткова візантыйскіх крыніц;

б) кодэкс, дадзены Яраславам Мудрым і дапоўнены яго сынамі і Уладзімірам Манамахам.

4. Якія рысы акрамя партыкулярызму і традыцыяналізму характэрны для раннесярэднявечнага звычаёвага права Беларусі?

а) мадэрнізм;

б) дуалізм;

в) унітарызм.

5. Ці ведае раннесярэднявечнае права паняцце юрыдычнай асобы?

а) так;

б) не.

6. Калі за забойцу па «Рускай Праўдзе» разлічвалася яго «вервь» (абшчына), то як называлася кампенсацыя пацярпеўшаму?

а) «праміскуітэт»;

б) «дзікая віра»;

в) «галоўшчына».

7. У адпаведнасці з Дагаворам 1229 г. за забойства свабоднага чалавека з вінаватага спаганялася:

а) жыццё;

б) 1 грыўна срэбра;

в) 10 грыўнаў срэбра;

г) 1 векша.

8. Якую санкцыю за пралюбадзейства ўстанаўліваў артыкул 17 Готландскай рэдакцыі Дагавора 1229 г. Смаленска, Полацка і Віцебска з Рыгай, Готландам і нямецкімі ганзейскімі гарадамі?

а) смяротнае пакаранне;

б) грашовы штраф у 10 грыўнаў срэбрам;

в) заключэнне ў манастыр.

9. Ці разглядалася ў адпаведнасці з Дагаворам 1229 г. аднабаковае сведчанне за канчатковы судовы доказ?

а) так;

б) не.

10. Які тэрмін ужываўся ў помніках права ранняга сярэднявечча для абазначэння злодзея (вора)?

а) «таць»;

б) «агнішчанін»;

в) «цівун»;

г) «ізгой».

### Заданні

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: Ефрасіння Полацкая, князь Уладзімір Святаславіч, князь Яраслаў Мудры, князь Усяслаў Чарадзей?











2. Вызначце на карце тэрыторыю рассялення ўсходнеславянскіх плямёнаў: крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў.

3. Прасачыце на карце беларускую частку шляху «з вараг у грэкі».

### Прыкладныя тэмы рэфератаў

Праваахоўныя органы і прававое рэгуляванне іх дзейнасці ў раннім сярэднявеччы.

Судовая ўлада і судаводства ў IX – першай палове XIII ст.

Фарміраванне раннекласавага грамадства на тэрыторыі Беларусі .

Этнічны і сацыяльны састаў насельніцтва гарадоў раннесярэднявечных дзяржаў-княстваў.

Сацыяльны статус смердаў і халопаў.

Агульныя і адметныя рысы грамадскага і дзяржаўнага ладу Смаленскага княства.

Паходжанне, састаў і сімвалы княжацкай улады.

Паходжанне, састаў і кампетэнцыя веча.

Роля царквы ў дзяржаўным жыцці.

Крыніцы кананічнага права праваслаўнай і рыма-каталіцкай царквы.

Уплыў хрысціянства на шлюбна-сямейнае права.

Класіфікацыя злачынстваў у крымінальным праве ранняга сярэднявечча.

Роля міжнародных дагавораў як крыніц права ў раннім сярэднявеччы.

Адказы на тэсты: 1 – а); 2 – а); 3 – а); 4 – б); 5 – б); 6 – б); 7 – в); 8 – б); 9 – б); 10 – а).

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ
# Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, РУСКАГА І ЖАМОЙЦКАГА
# Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.
# ГРАМАДСКІ І ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД

**Пытанні тэмы**

*1. Навуковыя канцэпцыі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага.*

*2. Працэс фарміравання тэрыторыі дзяржавы, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у другой палове XIII – першай палове XVI ст.*

*3. Грамадскі лад Вялікага Княства Літоўскага ў XIII – першай палове XVI ст.*

*4. Дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага ў XIII – першай палове XVI ст.*

*5. Міжнародныя адносіны Вялікага Княства Літоўскага з замежнымі дзяржавамі. Унійныя пагадненні Вялікага Княства Літоўскага з Польскім каралеўствам у канцы XIV – першай палове XVI ст.*

*6. Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага ў XIII – першай палове XVI ст.*

*7. Сістэмная рэформа дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага 60-х гг. XVI ст.*

*8. Агульная характарыстыка прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага.*

*9. Класіфікацыя і аналіз крыніц права Вялікага Княства Літоўскага дастатутавага перыяду.*

*10. Першая агульнадзяржаўная кадыфікацыя права Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. Гісторыка-прававая характарыстыка «Правоў пісаных» (Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г.).*

*11. Другая агульнадзяржаўная кадыфікацыя права Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. (Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г.).*



## 1. Навуковыя канцэпцыі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага

У сярэднявеччы дзяржавы Усходняй Еўропы, у тым ліку і раннефеадальныя княствы на тэрыторыі Беларусі, знаходзіліся ў пастаянным узаемадзеянні, асабліва калі гэта тычылася адпору знешнім ворагам. Спачатку аб’яднальным цэнтрам было Полацкае княства. У XIII ст. ініцыятыву аб’яднання перахапіла Новагародскае княства (Навагрудскае) на чале з князем Міндоўгам. Яно стала палітычным цэнтрам, вакол якога згуртаваліся Лідскае, Гальшанскае, Крэўскае, Ашмянскае, Слонімскае і іншыя княствы. У другой палове XIII ст. пасля далучэння да яго княстваў Мінскага, Пінскага, Берасцейскага, Тураўскага і іншых новая дзяржава стала называцца Вялікім Княствам Літоўскім, а з XIV ст. – Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім (далей – ВКЛ). Такая назва адлюстроўвае складаны працэс станаўлення і дае адказ на характар этнічнага складу насельніцтва. Але спрэчка па гэтай праблеме працягваецца, і спектр поглядаў на праблему вельмі шырокі. У значнай ступені гэта абумоўлена адсутнасцю ў пісьмовых крыніцах інфармацыі аб юрыдычных асновах аб’яднання балцкіх і славянскіх тэрыторый у адзіную дзяржаву, аб дамінаванні балцкага або славянскага элементаў. У аснове розных канцэпцый – супярэчлівасць, сутнасць якой заключаецца ў тым, што *вярхоўная ўлада* ў першыя стагоддзі належала *літоўскім князям*, а *культура, юрыспрудэнцыя, дзяржаўная мова і асноўныя землі* былі *беларускімі*.

Погляды навукоўцаў выкладзены ў трох асноўных канцэпцыях.

**Літоўская** (летува-цэнтрысцкая). Такой пазіцыі прытрымліваліся: афіцыйная дарэвалюцыйная руская гістарыяграфія (прадстаўнік – М.В. Каяловіч), а таксама савецкая гістарыяграфія (прадстаўнік – Л.С. Абецэдарскі) і значная частка літоўскіх аўтараў (прадстаўнікі – Т. Баранаўскас і Э. Гудавічус).

**Беларуская** (беларуса-цэнтрысцкая). Была распрацавана ў другой палове XX ст. беларускім даследчыкам М. Ермаловічам.

Галоўны недахоп дзвюх першых канцэпцый – у памылковасці іх асновы (падмурку), што ў пачатку новай дзяржавы была балта-славянская канфрантацыя, але адсутнасць апошняй пацвярджаецца цэлым комплексам лінгвістычных і археалагічных крыніц.

**Цэнтрысцкая** (біэтнічная). Галоўны сэнс цэнтрысцкай канцэпцыі (распрацавана ў канцы XX ст. беларускімі навукоўцамі В.Л. Насевічам, Г.Я. Галенчанкам, А.К. Краўцэвічам і інш.) – узнікненне дзяржавы каля сярэдзіны XIII ст. было выклікана знешняй пагрозай (манголы і крыжакі),

дзеля прадухілення якой створаны саюз праз добраахвотнае аб'яднанне дзвюх мацнейшых палітычных сіл Панямоння: Новагародскай (Навагрудскай) зямлі і балцкага князя Міндоўга. Сярод унутрыпалітычных прычын перш за ўсё адзначаецца неабходнасць пераадолець феадальную раздробленасць.

Шляхам комплекснага аналізу пісьмовых, археалагічных і лінгвістычных крыніц А.К. Краўцэвіч прыйшоў да канцэпцыі балта-славянскай дзяржавы, якая складаецца з наступных галоўных высноў: 1) ВКЛ узнікла ў сярэдзіне XIII ст. у балта-славянскай кантактнай зоне; 2) штуршком да пачатку працэсу дзяржаваўтварэння стала знешняя пагроза з боку Залатой Арды і Тэўтонскага ордэна; 3) існаванне раннефеадальнага балцкага дзяржаўнага ўтварэння (саюза ці канфедэрацыі) – папярэдніка ВКЛ нельга лічыць даказаным; 4) пачаткам ВКЛ стаў утвораны каля 1248 г. саюз усходнеславянскага горада Новагародка (Навагрудка) з балцкім нобілем Міндоўгам; 5) ВКЛ з самага пачатку было біэтнічнай *балта-ўсходнеславянскай дзяржавай* з дамінаваннем усходнеславянскага элемента.

## 2. Працэс фарміравання тэрыторыі дзяржавы, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у другой палове XIII – першай палове XVI ст.

Працэс утварэння ВКЛ пачаўся прыкладна ў другой чвэрці XIII ст. Дзяржава мела шматэтнічны склад насельніцтва, пры гэтым яе палітыка-эканамічным цэнтрам з'яўляліся беларускія землі. Галоўнай рэзідэнцыяй кіраўніка новай дзяржавы князя Міндоўга стаў г. Новагародак (Навагрудак).

У тэрытарыяльным плане дзяржава ўяўляла кангламерат самых розных зямель і ўладанняў. Спачатку адміністрацыйна-дзяржаўнае ўладкаванне Вялікага Княства Літоўскага характарызавалася захаваннем старых межаў, якія існавалі паміж асобнымі княствамі. М.К. Любаўскі вылучаў дванаццаць тэрытарыяльна-гістарычных частак ВКЛ: уласна Літву, Русь Літоўскую, Жамойць, Палессе, Падляшша (Берасцейскую зямлю), пяць асобных абласцей (Полацкую, Віцебскую, Смаленскую, Кіеўскую, Валынскую і Падольскую) і раздробленыя Чарнігаўска-Северскія землі.

У цэлым дзяржаўнаму ўладкаванню ВКЛ быў уласцівы ўмоўны падзел тэрыторыі на дзве часткі – цэнтральную (галоўную), а таксама прымыкаючую частку («прыслухоўваючую»). Адносіны паміж цэнтрам і прымыкаючымі землямі на пачатковым этапе існавання дзяржавы будаваліся на асабістай залежнасці ўдзельных князёў гэтых зямель ад



вялікага князя – на аснове сюзерэнітэту-васалітэту. Шэраг даследчыкаў падкрэсліваюць асаблівае становішча тых старажытнарускіх зямель (так званыя «княствы-анексы»), якія мелі аўтаномны статус на падставе велікакняжацкіх прывілеяў. Пазней буйныя васальныя княствы былі ператвораны ў ваяводствы або паветы, у якіх сталі кіраваць намеснікі вялікага князя – ваяводы і старосты.

Дамінуючае становішча ў дзяржаве займалі цэнтральныя землі, дзе была засяроджана асноўная колькасць велікакняжацкіх і дзяржаўных маёнткаў, тут размяшчаліся і асноўныя маёнткі буйных феадалаў. Гэтая тэрыторыя была параўнальна густа заселена, тут набіралася асноўная частка войска, з насельніцтва гэтых зямель збіраліся большыя падаткі ў дзяржаўную казну. «Прыслухоўваючыя» землі мелі значную адасобленасць ад цэнтра. На гэтых землях доўгі час захоўваліся мясцовыя старажытныя органы дзяржаўнага кіравання. Але гэтыя землі («вобласці») у складзе Вялікага Княства Літоўскага ніколі не былі поўнасцю самастойнымі. Іх адносіны з цэнтральнай уладай рэгламентаваліся спецыяльнымі нарматыўнымі актамі – абласнымі граматамі, а насельніцтва знаходзілася пад уладай цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання і было абавязана несці вызначаныя агульнадзяржаўныя павіннасці.

У 1345 г. князі Альгерд і Кейстут падзялілі паміж сабой ВКЛ на *Віленскую* і *Троцкую* часткі (пад вярхоўнай уладай вялікага князя Альгерда).

Пры вялікім князю Вітаўце ў 1420-я гг. ВКЛ дасягнула свайго максімальнага пашырэння – каля 687 тыс. км$^2$ (без уліку прычарнаморскіх стэпаў).

## 3. Грамадскі лад Вялікага Княства Літоўскага ў XIII – першай палове XVI ст.

Грамадскі лад Вялікага Княства Літоўскага быў феадальным. Па сваёй сацыяльнай структуры тагачаснае грамадства падзялялася на два асноўныя класы – феадалаў-землеўладальнікаў і феадальна-залежных сялян.

У асяроддзі **феадалаў** існавала значная маёмасная няроўнасць. У залежнасці ад маёмаснага становішча і палітычнага значэння ў складзе феадалаў выдзялялася некалькі стратаў (слаёў). Узаемаадносіны паміж рознымі групамі знаці грунтаваліся на прынцыпах феадальнай іерархіі, што абумовіла эканамічную залежнасць малазаможнай і незаможнай шляхты ад **магнатаў** (паноў). Найбольш багатыя і ўплывовыя магнаты зваліся князямі і панамі. На ніжэйшай прыступцы шляхецкага саслоўя знаходзілася дробная **шляхта**. Такія шляхцічы валодалі мінімальным надзелам зямлі і за яго самі служылі буйному пану ці вялікаму князю.

Пачатак юрыдычнаму афармленню правоў шляхецкага стану (саслоўя) паклалі агульназемскія прывілеі (граматы). Першапачаткова правы і прывілеі замацоўваліся толькі за шляхтай каталіцкага веравызнання (прывілеі 1387 і 1413 гг.), а затым прывілеем 1432 г. такія ж правы былі нададзены і праваслаўнай шляхце. Асабліваe значэнне для ўмацавання палітычных правоў шляхты меў прывілей 1492 г. вялікага князя Аляксандра.

**Духавенства** складалася з прафесійных служак культу праваслаўнай, рымска-каталіцкай, грэка-каталіцкай (уніяцкай) канфесій хрысціянскага веравызнання. Таксама былі прадстаўнікі мусульманскага і іудзейскага веравызнання.

**Мяшчанства** – уваходзілі жыхары гарадоў і мястэчак розных сацыяльных катэгорый, нацыянальнасцей і веравызнанняў. Яны складалі параўнальна невялікую частку насельніцтва Беларусі.

**Сялянства** – паводле прыналежнасці зямлі, якой карысталіся сяляне, існавалі **дзяржаўныя** (велікакняжацкія, гаспадарскія), **баярскія** (шляхецкія), **царкоўныя** (духоўныя) сяляне. Асобную катэгорыю сялянства складалі **сяляне-слугі**, якія выконвалі павіннасці па абслугоўванні панскага маёнтка, неслі вайсковую службу ці службы, выкананне якіх патрабавала адпаведнай кваліфікацыі.

У юрыдычным плане сярод сельскага насельніцтва адрозніваліся **людзі «пахожыя»** (свабодныя), **«непахожыя»** («отчычы»,«людзі отчызные»), **закупы** (часова несвабодныя) і **чэлядзь нявольная, парабкі (рабы)**. «Воляй» сялян было права вольнага пераходу да іншага гаспадара, калі павіннасці рабіліся вельмі цяжкімі. Землеўладальнікі імкнуліся пазбавіць іх такога права. Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права ў ВКЛ паклаў прывілей 1447 г. Статуты ВКЛ 1529 і 1566 гг. развілі нормы прыгоннага права, якое канчаткова аформлена Статутам ВКЛ 1588 г.

## 4. Дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага ў XIII – першай палове XVI ст.

ВКЛ з’яўлялася феадальнай манархіяй. Грамадска-палітычны лад у ВКЛ прадоўжыў далей палітычную традыцыю Полацкай зямлі. У рамках феадальнай манархіі даследчыкі-навукоўцы вылучаюць наступныя падперыяды: 1) **патрыманіяльная** (родавая) феадальная манархія ў часы станаўлення і развіцця дзяржавы: з другой паловы XIII – да канца XV ст.; 2) **саслоўна-прадстаўнічая** (саслоўная, станавая) манархія: у перыяд з сярэдзіны – канца XV (1447–1492) – да 1560-х гг. XVI ст. Дзяржаву ўзначальваў **манарх** (вялікі князь, гаспадар, кароль). Манархічная форма кіравання ў ВКЛ характарызавалася ў XIV – пачатку XV ст. за-



сяроджваннем у руках вялікага князя шырокіх уладных паўнамоцтваў. З канца XIV ст. у пытанне спадчыннасці трона ўсё больш умешваюцца буйныя феадалы. Пачынаючы з Гарадзельскага прывілея 1413 г. пасада вялікага князя прызнаецца выбарнай, а не спадчыннай. *Вялікі князь* прызнаецца гаспадаром дзяржавы, які валодае ўсёй паўнатой улады, але адначасова ён – службовая асоба, абавязаная здзяйсняць рашэнні *рады* і *сойма* і дзейнічаць у адпаведнасці з законам.

Пры ажыццяўленні дзяржаўнай улады гаспадар абапіраўся на садзейнічанне органаў цэнтральнага і мясцовага кіравання і службовых асоб, у тым ліку буйных землеўласнікаў, якія складалі **гаспадарскую раду**. Рада ўзнікла як дапаможны орган пры вялікім князю. У XIV ст. **рада** была толькі *дарадчым* органам, у яе склад уваходзілі князі і баяры, найбольш набліжаныя да гаспадара. Становішча змянілася, калі буйная зямельная арыстакратыя пачала патрабаваць ад манарха юрыдычнага замацавання свайго дамінавання. У пачатку XV ст. у склад рады ўключаны намеснікі акруг і вышэйшыя саноўнікі дзяржавы, каталіцкія біскупы і некаторыя асабіста запрошаныя князі і паны. Паступова рада ВКЛ ператварылася ў *прадстаўнічы* орган магнацкай алігархіі. Суадносіны кампетэнцыі паміж гаспадаром і радай мяняліся – ужо пры вялікім князю Казіміру (1440–1492) яна стала не толькі асабістым гаспадарскім, але і *паўнавартасным* дзяржаўным саветам ВКЛ.

Удзел рады ў заканадаўчай дзейнасці санкцыяніруецца прывілеем 1492 г., па якому вялікі князь не мог адмяняць або змяняць пастановы, што былі прыняты ім са згоды паноў-рады. Гэтыя абмежаванні ўлады вялікага князя былі замацаваны ў Статутах ВКЛ. На сойме 1566 г. было прынята рашэнне аб увядзенні ў склад рады ваявод і кашталянаў новастворaных ваяводстваў. У наступны перыяд рада ўсё больш пачала адыгрываць галоўную, вырашальную ролю ў дзяржаўных справах. Гэта быў ужо *паўнапраўны* орган прадстаўнічай улады, а манарх стаў намінальным кіраўніком дзяржавы. У залежнасці ад колькасці прысутных і важнасці разглядаемай справы даследчыкі гісторыі ВКЛ умоўна вылучаюць у радзе некалькі складаў. У поўны склад рады – так званы сойм паноў-рады, уваходзілі амаль усе прадстаўнікі правячай эліты ВКЛ: **каталіцкія біскупы** – віленскі, луцкі, жамойцкі і кіеўскі, **ваяводы** (ці **старосты**) – віленскі, троцкі, жамойцкі (староста), кіеўскі, полацкі, смаленскі (да 1514 г.), навагародскі, віцебскі, падляшскі, луцкі староста і валынскі маршалак, **кашталяны** (займалі месцы ў той жа паслядоўнасці, што і ваяводы), а таксама цэнтральныя земскія і дворныя ўраднікі – **канцлер** і **падканцлер**, **гетман**, **маршалак земскі** і **дворны**, **падскарбі** і інш. Больш вузкае кола Тайнай, або найвышэйшай, рады

ўтваралі самыя ўплывовыя каталіцкія біскупы, ваяводы, кашталяны пры іх, старосты, маршалкі, асобныя дзяржаўныя ўраднікі – канцлер, земскі падскарбі, земскі маршалак, гетманы. Праднейшая (так званая «першая лавіца»), або старшая рада – гэта больш вузкае кола магнатаў, якое праводзіла закрытыя пасяджэнні і абмяркоўвала найбольш важныя дзяржаўныя пытанні ў складзе некалькіх асоб, якія сядзелі на першай лавіцы: віленскі біскуп, ваявода і кашталян віленскія, ваявода і кашталян троцкія, жамойцкі староста. Згодна са Статутам 1566 г. рада ўдзельнічае ў заканадаўчай дзейнасці ўжо ў складзе *Вальнага сойма* як яго асобная структурная адзінка. За радай як самастойнай установай, якая функцыянавала асобна ад сойма, захоўваецца права на ўдзел у адміністрацыйных і судовых справах.

Інстытут **сойма (сейма)** як саслоўнага прадстаўніцтва быў тыповай з'явай дзяржаўнага жыцця тагачаснай Еўропы. Вытокі сойма як прадстаўнічага органа ўлады бяруць пачатак ад старажытных сходаў, у кампетэнцыі якіх было вырашэнне ўсіх важных пытанняў. Аднак з органа шырокага прадстаўніцтва ён паступова трансфармаваўся ў алігархічны інстытут і адстойваў інтарэсы заможных магнацкіх родаў. Пад канец XV ст. на аснове абласных соймікаў паўстаў **агульны (Вальны) сойм** усіх зямель ВКЛ.

Парадак склікання і працы сойма, а таксама яго кампетэнцыя да XVI ст. рэгуляваліся не нарматыўнымі прававымі актамі, а толькі звычаёвым правам і залежалі ад меркавання вялікага князя і яго рады, а прадстаўнікі шляхты толькі інфармаваліся аб гэтым (яны валодалі фактычна правам дарадчага голасу). Таму соймы ў XIV–XV стст. мелі больш значэнне органа *дарадчага*, а не заканадаўчага. У гэты перыяд у склад сойма ўваходзяць вялікі князь і паны радныя як вышэйшая палата сойма, а таксама прадстаўнікі (так званыя паслы) ад мясцовай шляхты, якія штогод абіраліся ад кожнага павета. Яшчэ ў працы сойма прымалі ўдзел духавенства, князі мясцовых княстваў, службоўцы цэнтральных і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама ўсе шляхцічы, якія пажадалі прыбыць на сойм. У 1511 г. Жыгімонт І Стары ўпершыню загадаў склікаць шляхту па паветах і прапанаваў выбіраць па 2 прадстаўнікі (паслы) ад павета для ўдзелу ў Вальных соймах.

У сярэдзіне XVI ст. узмацніўся рух шляхты за пашырэнне сваіх палітычных правоў. Шляхта з класа ваеннаабавязаных землеўладальнікаўператварылася ў прывілеяваны стан (саслоўе) – «народ-шляхту». Абмежаванне вярхоўнай улады манарха, якое раней належала толькі панам-радзе, паводле Статута 1566 г., перайшло да Вальнага 2-х палатнага сойма, на якім з рашаючым голасам сталі ўдзельнічаць прадстаўнікі



павятовай шляхты. Перад Вальнымі соймамі папярэдне прапановы вышэйшай улады абмяркоўваліся на *павятовых сойміках (сейміках)*, якія скліваліся вялікім князем за некалькі тыдняў да адкрыцця Вальнага сойма.

Патрэбы арганізацыі дваровай гаспадаркі, праблемы ўнутранай і знешняй палітыкі абумовілі ўтварэнне спецыяльных *урадаў* (пасад) і органаў цэнтральнага кіравання. На вышэйшыя пасады ў дзяржаве прызначаў вялікі князь, гэта былі *маршалкі земскі (вялікі)* і *дворны*, *канцлер, падскарбі земскі* і інш. Важную ролю ў дзяржаве адыгрываў **канцлер** вялікі літоўскі, другі пасля маршалка міністр у дзяржаве, які з'яўляўся кіраўніком урада (складаўся з пэўнага штату службоўцаў (ураднікаў)) Вялікага Княства Літоўскага. Ён загадваў канцылярыяй вялікага князя і паноў-рады, захоўваў вялікую дзяржаўную пячатку і фактычна выконваў функцыі, аналагічныя сучасным міністрам унутраных і замежных спраў. У розныя перыяды існавання ВКЛ пасаду канцлера займалі такія палітычныя дзеячы, як Судзівой Валімонтавіч (першы вядомы на гэтай пасадзе), Альбрэхт Гаштольд, Мікалай Радзівіл Чорны, Мікалай Радзівіл Руды, Астафій Валовіч, Леў Сапега, Міхал Чартарыйскі і Яўхім Храптовіч. Асноўнымі службовымі асобамі, якія кіравалі на месцах да XV ст., былі намеснікі і цівуны. Аднак па меры збліжэння з Польшчай назвы пасад і званняў ва ўсіх мясцовых органах кіравання змяняліся на «ваявод», «старост» і г. д.

На тэрыторыі *ваяводства* прадстаўніком вышэйшай улады быў **ваявода**. Ён узначальваў адміністрацыйныя, гаспадарчыя, ваенныя і ў значнай ступені судовыя органы. Бліжэйшым памочнікам ваяводы быў кашталян, які ўзначальваў войска галоўнага замка і апалчэнне. Кіраўніком адміністрацыі ў *павеце* быў *староста*, а яго намеснікам – *падстароста*. Памочнікам старосты па ваенных справах быў *павятовы маршалак*, які камандаваў павятовым апалчэннем шляхты. Ніжэйшым звяном у сістэме мясцовага кіравання (на ўзроўні *воласці*) былі *дзяржаўцы* – кіраўнікі дзяржаўных і велікакняжацкіх маёнткаў. Памочнікамі дзяржаўцаў былі *сельскія войты*, якія сачылі за падтрыманнем парадку ў сёлах і выкананнем феадальных павіннасцей сялянамі. У мясцовасцях, дзе жылі дзяржаўныя сяляне і не было замкаў ці маёнткаў, дзейнічалі органы сялянскага самакіравання і выбраныя імі *старцы*.

У шэрагу гарадоў мяшчане ў некаторай ступені вызваляліся ад адміністрацыйнай і судовай улады ваявод, старост і іх намеснікаў, і атрымлівалі права мець органы гарадскога кіравання разам з некаторымі элементамі самакіравання – так званае *магдэбургскае права*. Асаблівай сацыяльнай і палітычнай з'явай сталі *юрыдыкі* – адміністрацыйна аддзеленыя часткі тэрыторыі гарадоў, якія знаходзіліся пад уладай і

юрысдыкцыяй якога-небудзь землеўласніка або царкоўнай установы. Юрыдыкі ствараліся на частцы той гарадской тэрыторыі, якая была ва ўласнасці канкрэтнага феадала-землеўласніка або царквы, на іх жыхароў не распаўсюджвалася адміністрацыйная і судовая ўлада гарадскіх органаў кіравання.

## 5. Міжнародныя адносіны Вялікага Княства Літоўскага з замежнымі дзяржавамі. Унійныя пагадненні Вялікага Княства Літоўскага з Польскім каралеўствам у канцы XIV – першай палове XVI ст.

Пасля смерці вялікага князя Альгерда ў 1377 г. у дзяржаве пачаліся ўнутраныя разлады і міжусобіцы. Князя Ягайлу, які захапіў вярхоўную ўладу, не прызнавалі іншыя прэтэндэнты на прастол, у тым ліку галоўны яго канкурэнт – Вітаўт Кейстутавіч. Становішча Ягайлы як вярхоўнага ўладара заставалася складаным.

Каб пераадолець унутраны палітычны крызіс, Ягайла шукаў апоры ў саюзе з суседнімі дзяржавамі. Спачатку ў сярэдзіне 1380-х гг. вызначылася збліжэнне ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай. Прадугледжвалася, што Ягайла ажэніцца з дачкой маскоўскага князя Соф'яй, прыме праваслаўе і ахрысціць сваіх суайчыннікаў. Вялікая частка праваслаўнай арыстакратыі ВКЛ ставілася прыхільна да такога саюза з Масквой, аднак віленска-маскоўскаму збліжэнню перашкодзілі шэраг абставін. Ягайла адмовіўся ад збліжэння з Масквой і аддаў перавагу **уніі (саюза)** з Польшчай.

Паступовая каланізацыя немцамі польскіх зямель і анямечванне насельніцтва прымушалі польскую эліту шукаць больш цесных сувязей з ВКЛ. Польскае кіраўніцтва распачало перамовы з вялікім князем Ягайлам аб саюзе дзвюх дзяржаў шляхам *дынастычнага шлюбу* – жаніцьбы князя Ягайлы на польскай каралеўне Ядвізе. У жніўні 1385 г. польскія паслы прыбылі ў Крэва, дзе адбылася дамова аб саюзе дзвюх дзяржаў. Умовы **Крэўскай уніі** дакладна невядомы. Маецца толькі тэкст абяцанняў, нібыта дадзеных Ягайлам польскім прадстаўнікам: вярнуць Польшчы раней адарваныя ад яе землі, далучыць усе землі ВКЛ да Польшчы і перадаць апошняй дзяржаўную казну княства, прыняць каталіцкую веру і распаўсюдзіць яе на тэрыторыі дзяржавы і інш.

Прыняўшы каталіцтва, вялікі князь Ягайла ўступіў у 1386 г. на польскі прастол і стаў каралём Польшчы як Уладзіслаў II, пасля чаго пачаў распаўсюджваць у ВКЛ каталіцызм. З юрыдычнага боку крэўскі акт фактычна азначаў інкарпарацыю ВКЛ у склад Польшчы. Аднак дзякуючы актыўнасці тых грамадскіх сіл, што былі незадаволены прапанаванай польскім бокам прымусовай формай уніі, інкарпарацыя стала толькі кароткачасовым эпізодам гісторыі.



Ягайла стаў найвышэйшым князем ВКЛ і адначасова з'яўляўся галавой дзвюх дзяржаў – тым самым у гэты перыяд была ўсталявана *персанальная* унія паміж ВКЛ і Польшчай. У 1390 г. Вітаўт аднавіў барацьбу за велікакняжацкі прастол. Шырокая народная падтрымка, аказаная князю Вітаўту, вымусіла Ягайлу пайсці на кампраміс, афармлены ў выглядзе *Востраўскага пагаднення 1392 г.* Востраўскае пагадненне часова спыніла ўнутраную барацьбу ў ВКЛ і прывяло да ўмацавання яго саюза з Польшчай на аснове персанальнай уніі. Вітаўт пагадзіўся з вяршэнствам улады Ягайлы, а апошні прызнаў уладу Вітаўта ў ВКЛ.

Заключэнню *Віленска-Радамскай уніі* 1401 г. папярэднічаў разгром войска Вітаўта, які імкнуўся выйсці з-пад улады Ягайлы, у бітве на р. Ворскле ў 1399 г., і рост уплыву князя Свідрыгайлы, які прэтэндаваў на ўладу ў ВКЛ. Трагедыя на Ворскле падарвала сілы ВКЛ і аслабіла пазіцыі Вітаўта. У гэтых умовах Вітаўт згадзіўся на заключэнне новага дагавора з польскім каралём Уладзіславам II (Ягайлам). Ягайла захаваў тытул вярхоўнага князя літоўскага, а Вітаўт афіцыйна набыў тытул вялікага князя літоўскага (як пацвярджэнне ўмоў Востраўскага пагаднення 1392 г.), стаў пажыццёвым гаспадаром ВКЛ і атрымаў поўную свабоду ў вырашэнні ўнутраных спраў. Але пасля яго смерці пасада павінна была перайсці да Ягайлы і яго нашчадкаў. Польскі бок абяцаў, што ў выпадку смерці Ягайлы і згасання яго дынастыі баяры ВКЛ будуць удзельнічаць у выбарах новага агульнага манарха. Віленска-Радамская унія пацвердзіла сутнасць дзяржаўна-прававога саюза ВКЛ з Польшчай як *персанальную* унію дзвюх дзяржаў пад вяршэнствам аднаго манарха (гаспадара).

Пасля ўрэгулявання дачыненняў з Маскоўскай дзяржавай, Ноўгарадам і Псковам стала магчымым актывізаваць барацьбу з Тэўтонскім ордэнам. Ключавая бітва адбылася ў 1410 г. каля вёсак Танэнберг і Грунвальд і скончылася поўным разгромам ордэнскага войска. З мэтай умацаваць саюз і супакоіць рымскую курыю (якой быў нанесены ўдар у выніку паражэння Тэўтонскага ордэна ў Грунвальдскай бітве) у 1413 г. па ініцыятыве Ягайлы ў Гарадзельскім замку прадстаўнікі польскай шляхты і 47 магнатаў-католікаў ВКЛ распрацавалі ўмовы новай уніі дзвюх дзяржаў. У выніку былі прыняты тры граматы (прывілеі), якія юрыдычна афармілі *Гарадзельскую унію*.

У грамаце, якая ўвайшла ў гісторыю як Гарадзельскі прывілей 1413 г., Ягайла і Вітаўт абяцалі прызначаць на дзяржаўныя пасады феадалаў-католікаў, дазволіць апошнім свабодна распараджацца маёмасцю ў

сваіх маёнтках (тым самым павысіць іх грамадскае становішча), даваць ільготы касцёлам, кляштарам і іншым каталіцкім установам. Недалучэнне праваслаўных да прывілеяў, гарантаваных католікам, было сур'ёзнай дыскрымінацыяй першых. Гэта выклікала разлад, падрывала грамадскі мір. Пасля смерці Вітаўта пачалася феадальная міжусобная вайна 1432–1439 гг. У 1432 г. польскі кароль Уладзіслаў-Ягайла выдаў прывілей, згодна з якім прадстаўнікі знакамітых родаў беларускага, украінскага і рускага паходжання праваслаўнага веравызнання ўраўноўваліся ў некаторых правах з феадаламі-католікамі. У 1434 г. быў абнародаваны аналагічны прывілей, які паходзіў ад вялікага князя літоўскага Жыгімонта.

Пасля смерці Ягайлы новы кароль Польшчы Уладзіслаў III прызначыў свайго малодшага брата 13-гадовага Казіміра каралеўскім намеснікам (а не вялікім князем) у ВКЛ. Тым самым ВКЛ магло згубіць свой дзяржаўны суверэнітэт і станавілася правінцыяй Польшчы. У такіх умовах рада ВКЛ у чэрвені 1440 г. абрала Казіміра гаспадаром. Гэта азначала разрыў дзяржаўнай уніі з Польшчай.

Каб аднавіць унію, пасля смерці Уладзіслава III польскія эліты абралі на сойме 1445 г. вялікага князя Казіміра польскім каралём. Пасля выбрання на польскі прастол Казімір выдаў у **1447 г. прывілей**, які абараняў інтарэсы, замацоўваў суверэнітэт і адасобленасць ВКЛ (забараняў чужаземцам, у тым ліку палякам, мець маёнткі і займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ).

З абраннем вялікага князя Казіміра на польскі прастол пачаўся *другі этап* саюзных адносін паміж ВКЛ і Польшчай, калі зноў была ўстаноўлена персанальная унія дзвюх дзяржаў (першы этап – ад Крэўскай уніі да смерці Ягайлы (1434). Гэты этап персанальнай уніі паміж Польшчай і ВКЛ скончыўся ў 1492 г., калі памёр вялікі князь літоўскі і кароль польскі Казімір.

Палітычная эліта ВКЛ, не зважаючы на ранейшую унію з Польшчай, выбрала (выконваючы завяшчанне Казіміра) на велікакняжацкі трон Аляксандра Казіміравіча (1492–1506). Польскія магнаты абралі каралём Польшчы яго брата Яна Альбрэхта. Смерць апошняга ў 1501 г. ставіла палякаў перад выбарам, каму з сыноў Казіміра Ягайлавіча прапанаваць карону. Палякі, у тым ліку каб зноў аднавіць унію, спынілі свой выбар на вялікім князю літоўскім Аляксандры, але паставілі яму шэраг умоў. Гэта было замацавана *Мельніцкім актам 1501 г.* У Пётркаве, у той самы дзень, калі польскія паны ў г. Мельнік падпісалі акт элекцыі (выбараў) Аляксандра, 27 паноў-рады і выбраных шляхціцаў, якія прадстаўлялі ВКЛ, а таксама прадстаўнікі польскай палітычнай эліты (сенатары і



паслы кароннага сойма) падпісалі ўмовы уніі, вядомай як *Пётркаўска-Мельніцкая унія 1501 г.* Апошняя прадугледжвала: аб'яднанне дзвюх дзяржаў у адну; супольную элекцыю манарха на агульным сойме дэлегатаў абедзвюх дзяржаў у Пётркаве (пры ўдзеле біскупаў, ваяводаў і кашталянаў ВКЛ); стварэнне супольнай рады (Сената), якая павінна была ўхваляць рашэнні па справах усёй дзяржавы; абавязковую ваенную дапамогу ў выпадку неабходнасці; устанаўленне адзінай грашовай сістэмы для Польшчы і ВКЛ (манета павінна быць «адной формы і роўнай вагі») і г. д. Мельніцкі акт падпісалі Аляксандр і 27 прадстаўнікоў ВКЛ, але з умовай, што сойм ВКЛ зацвердзіць яго. У выніку шырокай апазіцыі сойм ВКЛ у 1505 г. не зацвердзіў Мельніцкі акт.

Пасля смерці Аляксандра польскія феадалы абралі сваім каралём вялікага князя Жыгімонта I (1506–1548), і унія паміж ВКЛ і Польшчай захавалася. Гэта персанальная унія працягвала існаванне пасля ўступлення на польскі прастол вялікага князя Жыгімонта II Аўгуста (1548–1572). Узвядзенне на прастол ВКЛ у 1529 г. Жыгімонта Аўгуста пры жыцці бацькі Жыгімонта I Старога падштурхнула палякаў да каранацыі Жыгімонта Аўгуста ў дзіцячым узросце ў 1530 г.

Такім чынам, нягледзячы на неаднаразовыя спробы польскай палітычнай эліты прымусова інкарпараваць ВКЛ у склад Польскага каралеўства, ці навязаць рэальную дзяржаўную унію ў канцы XIV – першай палове XVI ст., гэтага не адбылося.

## 6. Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага ў XIII – першай палове XVI ст.

**ЦЭНТРАЛЬНЫЯ (ВЫШЭЙШЫЯ) СУДЫ ДЗЯРЖАВЫ**. Даволі доўгі час у ВКЛ, як і раней у сярэднявечных дзяржавах (Полацкім, Віцебскім, Пінскім, Берасцейскім і іншых княствах), судовыя функцыі выконвалі розныя службовыя асобы. На працягу XV ст. судовая сістэма паступова ўдасканальваецца і ўдакладняецца, у сувязі з працэсам цэнтралізацыі дзяржавы робяцца першыя спробы ўніфікацыі.

**Велікакняжацкі (Гаспадарскі) суд.** Вышэйшы судовы орган у ВКЛ падзяляўся на пэўныя разнавіднасці (маршалкаўскі, камісарскі і інш.). На першым этапе існавання дзяржавы вялікі князь (гаспадар) выступаў у ролі непасрэднага суддзі па шырокім пераліку спраў, аднак перш за ўсё імкнуўся судзіць дзяржаўных злачынцаў або разглядаць спрэчкі буйных феадалаў. Разам з тым вялікія князі маглі запатрабаваць любую справу з існуючых на той час судоў, бо адной з задач велікакняжацкага суда было выпраўленне і ліквідацыя несправядлівых

або неабгрунтаваных рашэнняў ніжэйшых судовых інстанцый. Гаспадарскі суд браў на сябе значную долю абавязкаў усіх судоў дзяржавы, дапаўняў іх дзейнасць непасрэдным ажыццяўленнем правасуддзя. У сувязі з гэтым павялічвалася яго перагружанасць рознымі судовымі справамі і расло адкладванне іх разгляду.

Ухвала сойма 1542 г. усталявала інстанцыйны парадак для разгляду судовых спраў – заканадаўча было замацавана патрабаванне звяртацца ўпершыню для разгляду судовых спраў у мясцовыя суды і толькі потым, са скаргамі – у Гаспадарскі суд. У сувязі з увядзеннем у дзеянне новых судоў, Статуты 1566 і 1588 гг. значна скарацілі кола спраў і асоб, якія належалі юрысдыкцыі Гаспадара. У XVI ст. велікакняжацкі суд у большасці дзейнічаў як суд другой інстанцыі, які разглядаў: скаргі на рашэнні мясцовых судоў, справы па скаргах на рашэнні царкоўных судоў.

**Камісарскі суд.** Узнік па прычыне вялікай загружанасці Гаспадарскага суда і ў сувязі з неабходнасцю па некаторых справах, якія паступалі да гаспадара, выязджаць на месца разгляду канкрэтнай спрэчкі. Вялікі князь або паны радныя прызначалі так званых *камісараў,* па кожнай справе асобна, і з вынясеннем рашэння іх паўнамоцтвы заканчваліся. Пры прызначэнні камісараў вялікі князь даваў ім «навуку» – гаварыў, як і якім чынам дзейнічаць. Часцей за ўсё гэта былі зямельныя спрэчкі, якія закранaлі інтарэсы вялікага князя. Рашэнні камісарскага суда павінны былі зацвярджацца вялікім князем і радай.

**Маршалкоўскі суд.** Дзейнічаў у якасці цэнтральнага суда, судовыя справы па даручэнні вялікага князя разглядалі *маршалак земскі* і *маршалак дворны*.

**Задворны асэсарскі суд**. Адзін з вышэйшых судоў ВКЛ, які разглядаў пераважна справы, што датычылі дзяржаўных уладанняў і магдэбургскіх гарадоў. *Асэсары* разглядалі малазначныя і пільныя справы – больш важныя разглядаліся ў час соймаў радай ВКЛ.

**Суд паноў-рады.** У выпадку, калі гаспадар адсутнічаў у дзяржаве, усю ўладу ад яго імя ажыццяўлялі паны-рада, і ў першую чаргу члены Праднейшай рады. Паны-рада павінны былі збірацца для разгляду судовых спраў праз два тыдні пасля пачатку царкоўнага Вялікага посту, рашэнні суда мелі законную сілу незалежна ад колькасці паноў-рады, якія прысутнічалі на судовым пасяджэнні.

**Соймавы суд.** З узнікненнем сойма ВКЛ частка судовых паўнамоцтваў перайшла да яго. Судаводства здзяйснялася гаспадаром сумесна з дэпутатамі сойма. Да кампетэнцыі соймавага суда аднесены справы па злачынствах, якія цягнулі смяротнае пакаранне, выгнанне за мяжу, канфіскацыю маёмасці.



**МЯСЦОВЫЯ СУДЫ.** На першым этапе існавання ВКЛ працягвалі сваю дзейнасць мясцовыя суды розных земель, аднак паступова на ўсёй тэрыторыі склалася даволі аднастайная мясцовая адміністрацыя, надзеленая судовай уладай.

**Гродскія суды**. Былі больш характэрнымі для велікакняжацкіх гарадоў, дзейнічалі, як правіла, у «гродзе» (замку). Судовыя функцыі ў гродскім судзе былі ўскладзены на мясцовую адміністрацыю – *ваяводу, старосту, дзяржаўцу* (вышэйшы гродскі суд). У выпадку адсутнасці на месцы гэтых службовых асоб або іх занятасці судовую дзейнасць ажыццяўлялі іх *намеснікі* – у такім выпадку суд здзяйсняўся калегіяй, якая складалася з *падваяводы ці падстаросты* (гэта ніжэйшы гродскі суд). Вышэйшы гродскі суд дзейнічаў і як суд другой інстанцыі – з’яўляўся апеляцыйнай інстанцыяй у адносінах да ніжэйшага складу гэтага суда.

**Замкавыя суды.** Былі ўласцівы прыватнаўласніцкім уладанням і гарадам. Па сваёй юрысдыкцыі былі роўны гродскаму і земскаму. Разглядалі грамадзянскія і крымінальныя справы шляхты, мясцовых зямян, баяр. У іх падсуднасць уваходзілі таксама крымінальныя і важнейшыя грамадзянскія справы мяшчан, яўрэяў і іншых падданых мясцовага князя. Акрамя таго, суд рэгістраваў буйныя гандлёвыя здзелкі, у тым ліку продаж домаўладанняў, зямельных надзелаў, сведчыў у натарыяльным парадку завяшчанні і інш.

**Копныя суды.** Самы старажытны, дзейнічаў на падставе старажытнага звычаёвага (копнага) права. У склад суда ўваходзілі так званыя «копныя мужы» (або «копныя старцы», «капляне») – вольныя сялянедомаўласнікі. Суд, як правіла, склікаўся самім пацярпелым. Асаблівасцю копнага судаводства з’яўлялася спалучэнне ў адным органе следчых і судовых функцый, якое адбывалася на падставе старажытных абрадаў і звычаяў. Як толькі здзяйснялася злачынства, адразу збіралася «гарачая капа» з удзелам бліжэйшых суддзяў і пачыналася праследаванне злачынцы. Калі злачынцу знаходзілі або лавілі «з ліцом», гэтая ж «гарачая капа» яго судзіла. Паступова дзейнасць копных судоў абмяжоўваецца, становіцца абавязковай прысутнасць на капе прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі.

**Войтаўска-лаўніцкія і радзецка-бурмістраўскія суды.** Здзяйснялі судовыя функцыі ў дачыненні да мяшчан у гарадах, якія атрымалі граматы (прывілеі) на магдэбургскае права. Войтаўска-лаўніцкія (ці лентвойтаўска-лаўніцкія) суды разглядалі крымінальныя справы, маёмасныя спрэчкі, сведчылі завяшчанні маёмасці, дагаворы куплі-продажу і інш. Складаліся з войта, яго намесніка лентвойта і лаўнікаў (засядацеляў). Яны з’яўляліся апеляцыйнай інстанцыяй на рашэнні бурмістраўска-радзецкага суда.

Як правіла, дробныя і нязначныя правапарушэнні і спрэчкі сярод мяшчан разглядалі гарадскія бурмістры (прызначаліся войтам ці выбіраліся) з радай – радзецка-бурмістраўскія суды.

Часам як крымінальныя, так і цывільныя справы разглядаліся аб'яднаным войтаўска-лаўніцкім і бурмістраўска-радзецкім судом, які называўся **магістрацкім**, бо ў яго пасяджэннях удзельнічаў увесь магістрат.

Насельніцтва, якое жыло на манастырскіх і царкоўных землях (не было падуладна магістрату горада, а мела сваё кіраванне), судзілася ў *судах праваслаўнага мітрапаліта і манастырскага архімандрыта.* Жыхары зямель каталіцкай царквы былі *падсудны толькі Віленскаму біскупу* і мелі асобную біскупскую юрыдыку.

## 7. Сістэмная рэформа дзяржаўнага ладу ВКЛ 60-х гг. XVI ст.

У гады Лівонскай (Інфлянцкай) вайны вялася падрыхтоўка да аб'яднання з Польшчай, што прадугледжвала радыкальнае рэфармаванне ўнутранага ладу ВКЛ. Папулярная ў колах рыцарства ідэя аб'яднання з Польшчай (з якой шляхта ВКЛ звязвала надзею на атрыманне «залатых шляхецкіх вольнасцей» паводле польскіх узораў) цяпер адпавядала вострай палітычнай патрэбе ва ўмовах складанай вайны з Маскоўскай дзяржавай. Паслы ВКЛ прасілі дапамогі ў Польшчы, аднак польскі бок ставіў гэтае пытанне ў залежнасць ад рэалізацыі новай уніі.

Кароль і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст за 1563–1568 гг. правёў 6 соймаў, кожны з якіх займаўся дзяржаўна-прававымі пытаннямі, звязанымі з рэалізацыяй планаў уніі. Былі прыняты Бельскі прывілей 1564 г., Віленскі прывілей 1565 г., уведзены ў дзеянне Статут ВКЛ 1566 г. Галоўным крокам перамен стала правядзенне судовай і тэрытарыяльна-адміністрацыйнай рэформы, якая канчаткова ліквідавала адасобленасць зямель і даўніх удзелаў.

**Аграрная рэформа.** У 1557 г. Жыгімонт Аўгуст на падставе інструкцыі «Устава на валокі 1557 г.» правёў у сваіх велікакняжацкіх уладаннях аграрную рэформу, якая мела на мэце павялічыць даходы гаспадара праз упарадкаванне сялянскага землекарыстання. Згодна з гэтай рэформай сялянскі надзел складала валока памерам у 33 моргі, або 23,41 га.

**Судовая рэформа.** Бельскі сойм 1564 г. прыняў Бельскі прывілей 1564 г., які ўстанавіў **земскія суды** – выбарныя шляхецкія саслоўныя суды, упершыню цалкам *аддзеленыя ад велікакняжацкай адміністрацыі*. Абвяшчалася роўнасць шляхты перад судом і законам. Другім судом, аддзеленым ад органаў дзяржаўнага кіравання, стаў **падкаморскі суд**, які разглядаў зямельныя спрэчкі феадалаў.

**Парламенцкая рэформа.** Віленскім прывілеем 1565 г. замацаваны інстытут мясцовых соймікаў, якія як элемент сістэмы органаў дзяржаўнай улады (заканадаўчай, выканаўчай і судовай) мелі падвойны характар – адначасова былі парламенцкім інстытутам дзяржавы і органамі мясцовай улады і самакіравання.



**Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа.** У новым дзяленні на ваяводствы ўдзельныя княствы зніклі. У 1566 г. у дадатак да ўжо існуючых ваяводстваў былі ўтвораны 5 новых, у тым ліку 3 на тэрыторыі Беларусі. Паводле новага адміністрацыйнага падзелу ўся тэрыторыя ВКЛ складалася з 13 ваяводстваў і 30 паветаў (ад 1 да 5 паветаў у ваяводствах). Беларускія землі ўваходзілі (цалкам ці часткова) у 9 ваяводстваў.

**Ваенная рэформа.** Пасля рэформы ваяводствы сталі таксама і ваеннымі акругамі. Агульнае камандаванне ўзброенымі сіламі даручалася *ваяводам* і іх памочнікам. *Харунжых* меў кожны павет, *кашталяна* – толькі цэнтральны ў ваяводстве, а маршалкаў – усе іншыя, акрамя цэнтральных. Вайсковая служба была ўдзелам феадальнага саслоўя. Заможныя феадалы абавязаны былі прадстаўляць узброеных воінаў, а дробная шляхта павінна была асабіста служыць у войску.

## 8. Агульная характарыстыка прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага

Прававая сістэма – сукупная сувязь сістэмы права (у тым ліку сістэмы заканадаўства), прававой культуры і праварэалізацыі.

Крыніцы права трэба адрозніваць ад крыніц *пазнання* права.

Пад **крыніцамі пазнання права** мы разумеем усе магчымыя матэрыялы, якія дазваляюць зразумець *сутнасць* права.

**Крыніцы права** – гэта дзяржаўна-афіцыйныя формы выяўлення, замацавання і існавання юрыдычных нормаў ці формы права, якія *афіцыйна* прызнаюцца *правамернымі* для ўжывання судом і іншымі афіцыйнымі органамі.

У традыцыях рамана-германскай прававой сям'і пад крыніцамі права прызнаюцца: *звычай, нарматыўны прававы акт, судовая практыка, дактрына, прынцыпы справядлівасці.*

Агульнай заканамернасцю развіцця права ёсць прыярытэт адной ці некалькіх з адзначаных крыніц на кожным *новым этапе* развіцця прававой сістэмы, але, тым не менш, усе пералічаныя крыніцы прысутнічаюць.

Распрацоўка Статутаў ВКЛ развязала праблему асноўнай крыніцы права, бо прыярытэт ідэі вяршэнства закону надае перавагу статутаваму заканадаўству. Прабелы ў праварэгуляванні запаўняліся з дапамогай *субсідыярных* сістэм права, да якіх далучалі іншаземныя (хрысціянскія)

сістэмы права і прававы звычай (па Статуце ВКЛ 1566 г. афіцыйна была замацавана дапаможная роля прававога звычаю). Асаблівасцю права-развіцця ў XV–XVI стст. з'яўляецца суіснаванне рыс мясцовага і агульнадзяржаўнага закона (агульназемскіх прывілеяў і статутаў).

У цэлым развіццё заканадаўства ВКЛ можна ўмоўна падзяліць на два перыяды – *прывілейны і статутавы*. Характэрнай асаблівасцю першага перыяду з'яўляецца прыняцце нарматыўных прававых актаў у форме *грамат* (ці прывілеяў). Другі перыяд – з часу прыняцця Статутаў 1529, 1566, 1588 гг.

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), у ВКЛ нараўне з пісанымі заканадаўчымі актамі доўгі час працягвала дзейнічаць старажытнае звычаёвае права. У новых пісаных законах пастаянна адзначалася захаванне старых няпісаных нормаў права, так званай «старыны». У сувязі з гэтым нарматыўныя акты, прынятыя ў XIV–XV стст., лічыліся дзеючымі і ў наступны перыяд. Асабліва гэта тычылася законаў, якія замацоўваюць правы і прывілеі саслоўя шляхты.

## 9. Класіфікацыя і аналіз крыніц права Вялікага Княства Літоўскага дастатутавага перыяду

Заканадаўчыя акты таго часу насілі розныя найменні. Адзінай назвы, адпаведнай сучаснаму паняццю «нарматыўны прававы акт», не існавала. На працягу стагоддзяў у залежнасці ад *зместу актаў* і *спосабаў іх прыняцця* яны зваліся *ухвала, грамата, ліст, прывілей, статут, канстытуцыя, універсал, артыкул* і інш. Выразнага размежавання паміж гэтымі тэрмінамі не існавала, але пэўныя сэнсавыя адценні ўтрымліваліся ў кожным найменні.

Асноўныя віды нарматыўных прававых актаў (законаў) эпохі феадалізму:

прывілеі (слова «прывілей» лацінскага паходжання, утворана ад lat. privilegium – privus (асаблівы) + lex (закон));

эдыкты;

вайсковыя артыкулы і статуты («уставы»);

дэкрэты, ардынацыі;

соймавыя ўхвалы: канстытуцыі і рэцэсы.

У вучэбнай літаратуры прынята адзіная ўмоўная назва нарматыўных прававых актаў XIV–XV стст. – граматы або прывілеі.

Прывілеі – заканадаўчыя акты ў феадальных дзяржавах, якімі вялікія князі ці каралі давалі або пацвярджалі *асаблівыя* правы пануючага класа, саслоўя, пэўных сацыяльных або этнічна-рэлігійных груп, асоб. Па сваёй форме яны з'яўляліся аднабаковымі абяцаннямі гаспадара захоўваць асноўныя правы ўказаных катэгорый.



**Агульназемскія прывілеі** – дзейнічалі на *ўсёй* тэрыторыі ВКЛ і былі абавязковымі для выканання *ўсімі* жыхарамі дзяржавы, у тым ліку і службовымі асобамі. У агульназемскіх прывілеях выкладаліся правы і абавязкі розных класаў і груп насельніцтва, замацоўвалася прававое становішча органаў улады і кіравання, вызначаліся прынцыпы іх узаемаадносін, асвятляліся іншыя пытанні. Першыя земскія прывілеі, на думку большасці даследчыкаў, былі дадзены Уладзіславам (Ягайлам) 20 лютага[1] 1387 г. у Вільні; Уладзіславам (Ягайлам) і Вітаўтам 2 кастрычніка 1413 г. у Гародні.

Асаблівае месца ў развіцці заканадаўства ВКЛ наогул і дзяржаўнага права ў прыватнасці належыць **агульназемскаму прывілею Казіміра Ягайлавіча**, які быў выдадзены ў Вільні 2 мая **1447 г.** У гэтым нарматыўным акце былі поўна і грунтоўна выкладзены правы класа феадалаў, некаторыя прынцыпы крымінальнага, цывільнага і дзяржаўнага права. Дзяржаўна-прававое значэнне прывілея 1447 г. заключалася ў яго станоўчым уплыве на ўмацаванне тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы, фіксацыю яе суверэнных правоў і адасобленасці ад Польшчы, а таксама на далейшае юрыдычнае афармленне правоў саслоўя шляхты. І ў цэлым агульназемскія прывілеі былі накіраваны на ўмацаванне становішча феадалаў, на атрыманне шляхтай яшчэ больш палітычных правоў і паглыбленне яе ўплыву на дзяржаўныя справы.

Наступным быў **агульназемскі прывілей, зацверджаны Аляксандрам Казіміравічам** 6 жніўня **1492 г.** у Вільні. Гэтым законам атрымала *юрыдычнае афармленне* рада – вышэйшы орган дзяржаўнай улады ВКЛ. Прывілей устанаўліваў, што вялікі князь не меў права адмяняць або змяняць законы, пастановы і судовыя рашэнні, прынятыя ім сумесна з радай. 7 снежня **1506 г.** у **Гарадзенскім прывілеі Жыгімонт І** пацвердзіў усе асноўныя палажэнні прывілея 1492 г. Гаспадар поўнасцю пазбаўляўся права аднаасобна выдаваць заканадаўчыя акты.

Выданнем прывілея ад 7 снежня 1506 г. практычна завяршыўся першы этап развіцця літоўска-беларускага дзяржаўнага права ў форме прывілеяў – наступныя, выдадзеныя ў 1529, 1547 і 1551 гг., у асноўным пацвярджалі законнасць ранейшых прывілеяў і паўтаралі іх. Шэраг новых палажэнняў у заканадаўства ўнеслі **Бельскі прывілей 1564 г.** (у якасці ўступнай часткі ўвайшоў у Статут 1566 г. і таму самастойнага значэння не меў) і **Віленскія прывілеі 1563 і 1565 гг.** (сталі дадаткам да Статута 1566 г.).

[1] Да 1918 г. даты прыводзяцца па старому стылю.

**Абласныя прывілеі** – заканадаўчыя акты ВКЛ, якія юрыдычна замацоўвалі *аўтаномныя* правы некаторых зямель (княстваў, ваяводстваў, паветаў). Выдаваліся былым княствам, якія ўвайшлі ў склад ВКЛ і дзейнічалі толькі на іх тэрыторыі. Лічыцца, што самыя старажытныя абласныя прывілеі атрымалі ад Вітаўта Полацкая і Віцебская землі ў перыяд з 1392 па 1399 г. Значная частка нормаў, якія ўтрымліваліся ў гэтых граматах, мае яшчэ больш старажытнае паходжанне – яны былі выпрацаваны на працягу папярэдніх стагоддзяў, калі асобныя княствы выступалі як самастойныя дзяржавы.

**Валасныя прывілеі** – выдаваліся па хадайніцтве жыхароў (сялян) той ці іншай валасці з мэтай абароны іх інтарэсаў ад самавольства адміністрацыі. Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), выдаючы валасныя граматы і тым самым абмяжоўваючы ўладу службовых асоб, вялікі князь у першую чаргу бараніў інтарэсы не толькі насельніцтва, але і дзяржаўнага скарбу, бо са збяднелага насельніцтва складана збіраць падаткі. Таму змест валасных прывілеяў у асноўным забяспечваў юрыдычнае замацаванне павіннасцей і некаторых правоў жыхароў валасці, у тым ліку права выбару старца – прадстаўніка сялянскай мясцовай адміністрацыі.

Прыкладамі валасных прывілеяў могуць быць прывілеі Падняпроўскім і Задзвінскім валасцям ад 2 кастрычніка 1511 г., прывілеі каралевы Боны жыхарам Усвяцкай і Азярышчанскай валасцей ад 4 верасня 1535 г., прывілей жыхарам Магілёўскай валасці ад 1 ліпеня 1536 г.

Да спецыяльных актаў, якія выдаваліся толькі для мяшчан, трэба аднесці **прывілеі на магдэбургскае права**; прывілеі, што выдаваліся ў сувязі з цяжкім становішчам жыхароў горада, якое магло быць выклікана стыхійнымі бедствамі (пажарам, паводкай, ваеннымі дзеяннямі), а таксама самавольствам адміністрацыі; прывілеі, што выдаваліся з мэтай развіцця горада і прыцягнення ў яго новых жыхароў.

Спробай сістэматызацыі прававых нормаў у галіне абароны права ўласнасці і іншых маёмасных правоў з'явіўся Судзебнік Казіміра (Ягайлавіча) – першы кодэкс крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права ВКЛ. Быў зацверджаны 29 лютага 1468 г. на Віленскім сойме вялікім князем – пасля абмеркавання з князямі, панамі-радай і «со всим поспольством». Статут Казіміра змяшчаў галоўным чынам нормы *крымінальнага* і *крымінальна-працэсуальнага* права. У яго структуры вызначаюцца тры часткі, якія найперш датычацца сферы крымінальнага права: 1) вызначэнне адказнага за здзейснены крымінальны ўчынак; 2) парадак звароту ў суд; 3) вызначэнне пакаранняў.

Прыняццем Судзебніка Казіміра 1468 г. быў пакладзены пачатак новаму этапу ў развіцці прававой тэорыі і практыкі заканадаўчай дзейнасці



дзяржаўных органаў, з'яўленню новых прынцыпаў сістэматызацыі і кадыфікацыі феадальнага права, які арганічна завяршыўся стварэннем Статутаў ВКЛ – найбольш дасканалых кадыфікацый у тагачаснай Еўропе.

## 10. Першая агульнадзяржаўная кадыфікацыя права Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. Гісторыка-прававая характарыстыка «Правоў пісаных» (Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г.)

**Кадыфікацыя** – дзейнасць праватворчых органаў дзяржавы па стварэнні новага, сістэматызаванага нарматыўнага прававога акта; яна ажыццяўляецца шляхам глыбокай і ўсебаковай перапрацоўкі дзеючага заканадаўства. На працягу амаль шасцідзесяці гадоў, з 1529 па 1588 г., палітычная эліта ВКЛ тройчы здзейсніла кадыфікацыю сістэмы права, што было выключнай з'явай у гэты час. Даследчыкі тлумачаць гэта хуткімі тэмпамі змен сацыяльнай структуры ВКЛ (перш за ўсё эмансіпацыяй шляхты, што выявілася ва ўраўнаванні правоў князёў, паноў і часткі шляхецтва) і заключэннем уніі ВКЛ і Польшчы ў 1569 г. Абодва гэтыя фактары выклікалі *сутнасныя* пераўтварэнні ў прававой сістэме ВКЛ.

XVI стагоддзе з'яўлялася адным з самых важных перыядаў у гісторыі ВКЛ. Паступова ў грамадстве атрымліваюць пашырэнне гуманістычныя і рэфармацыйныя ідэі з Заходняй Еўропы. Працэс развіцця права ў ВКЛ быў падобны да агульнаеўрапейскага і грунтаваўся на агульнасці філасофска-палітычнай думкі і адзіным метадзе адукацыі юрыстаў праз сістэму еўрапейскіх універсітэтаў. Аўтарытэт права, перавага ў грамадскай думцы ідэі законнасці прывялі да вялікай папулярнасці прававых ведаў сярод насельніцтва.

У ВКЛ існавалі ўсе ўмовы для распрацоўкі дасканалага заканадаўства. Акрамя назапашанага заканадаўчага матэрыялу, спрыяльных сацыяльна-палітычных і эканамічных умоў, тут былі дасведчаныя навукоўцы і практычныя юрысты для ажыццяўлення кадыфікацыі права. Вядомыя на той час юрысты-навукоўцы (Францішак Скарына, Вацлаў Чырка, Пётр Раізій, Аўгусцін Ратондус, Ян Даманеўскі і інш.), юрысты-практыкі (Альбрэхт Гаштаўт, Астафей Валовіч, Леў Сапега, Марцін Валадковіч, Павел Астравецкі, Станіслаў Габрыяловіч і інш.) былі здольныя падрыхтаваць і здзейсніць кадыфікацыю, працуючы ў статутавых камісіях.

Кадыфікацыя прадугледжвала перапрацоўку ўсяго праўнага матэрыялу і яго сістэматызацыю паводле новай канцэпцыі права. Навуковую распрацоўку асноўных прынцыпаў кадыфікацыі здзейснілі такія **школы права**, як **каментатары** і **гуманісты**. Кадыфікацыя як праўная з'ява адлюстравала асноўныя рысы Адраджэння (Рэнесансу). *Канцэптуалізацыя*

права вызначыла новую якасць заканадаўства, што адлюстравалася ў замене *казуістычных* палажэнняў прывілейнага перыяду *агульнымі* нормамі ў статутны перыяд, стварэнні і зацвярджэнні акрэсленых інстытуцый права. **Уніфікацыя** права прадугледжвала замену *мясцовага* права асобных зямель *адзіным* дзейным агульнадзяржаўным правам.

Упершыню неабходнасць кадыфікацыі атрымала праўнае афармленне ў Валынскім прывілеі вялікага князя Аляксандра 1501 г. Але першы праект агульнадзяржаўнай кадыфікацыі быў разгледжаны соймам толькі ў 1522 г. Статут стварыла камісія, аднак яе дакладны склад невядомы. Канчатковы праект Статута прыняты на Віленскім сойме 1528–1529 гг. Статут уведзены ў дзеянне 29 верасня 1529 г.

Асноўнымі крыніцамі Статута былі:

звычаёвае права;

нормы пісанага права, выкладзеныя ў Судзебніку 1468 г. і раней прынятых граматах;

адміністрацыйная і судовая практыка;

выкарыстоўваліся нормы царкоўнага права (як праваслаўнага, так і каталіцкага).

Статут 1529 г. стаў зборам законаў, у ім атрымалі юрыдычнае замацаванне асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу, прававое становішча класаў, саслоўяў і розных сацыяльных груп насельніцтва, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы шэрагу органаў дзяржаўнага кіравання і суда і інш. Складаўся з 13 раздзелаў, якія ў сваю чаргу падзяляліся на артыкулы. Першапачаткова ў Статуце было 244 (або 245) артыкулаў, затым у 30-я гг. XVI ст. у яго былі ўнесены дапаўненні і рэдакцыйныя папраўкі, у выніку чаго колькасць артыкулаў павялічылася да 285 (па Слуцкім спісе – 278). Такое адрозненне ў колькасці артыкулаў тлумачыцца тым, што афіцыйны тэкст Статута I529 г. не быў апублікаваны ў XVI ст., а ў шматлікія рукапісныя спісы ўносіліся дапаўненні.

Як адзначае Т.І. Доўнар, Статут 1529 г. па сваім змесце быў першым у Еўропе сістэматызаваным зборам (зводам) прававых нормаў розных галін права (у сучаснай тэрміналогіі – збор законаў). Упершыню была прапанавана арыгінальная структура размяшчэння нарматыўнага прававога матэрыялу ў адпаведнасці з *галіновым прынцыпам*.

Згодна са Статутам 1529 г. вялікі князь абавязваўся захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, не дапускаць замежнікаў на дзяржаўныя пасады і не надзяляць іх маёнткамі і прыбыткамі, не адымаць пасад і маёмасці без суда, выконваць усе старыя законы і новыя выдаваць толькі сумесна з панамі-радай. Асаблівая ўвага ў Статуце надавалася *судова-працэсуальнаму праву*. Абвяшчалася правіла, паводле якога *ўсе асобы*, «як убогія, так і багатыя», *павінны былі судзіцца паводле нормаў*, выкладзеных у Статуце. Больш *упарадкаванымі сталі судовая сістэма і судаводства.* Абвяшчаўся прынцып публічнасці правасуддзя, фармальнай роўнасці бакоў у працэсе, права абвінавачанага на абарону з удзелам адваката.



Шмат увагі закон надаваў *грамадзянскім праваадносінам.* Статут рэгламентаваў розныя дагаворныя адносіны, меў нормы аб відах і формах здзелак, сямейных праваадносінах, апякунскім праве, наследаванні маёмасці і інш. Было дастаткова распрацаваным спадчыннае права, накіраванае на забеспячэнне маёмасных правоў дзяцей, жонкі (або мужа), а таксама іншых асоб, звязаных роднасцю.

Статут 1529 г. адлюстроўваў эвалюцыю палітычнага ладу ВКЛ ад магнацкай манархіі да шляхецкай у сувязі з узмацненнем эканамічнай і палітычнай ролі дробнай і сярэдняй шляхты. Ён яшчэ захоўваў першынство становішча магнатаў, замацоўваючы за імі вядучую палітычную ролю і асаблівую юрысдыкцыю. Аднак выданне першага агульнадзяржаўнага кодэкса было пачаткам абмежавання самавольства буйных магнатаў ў дачыненні да шляхты. Статут 1529 г. адыграў значную ролю ў далейшай кадыфікацыі і сістэматызацыі права – як і Статут ВКЛ 1566 г., паслужыў базай і крыніцай для распрацоўкі Статута ВКЛ 1588 г.

## 11. Другая агульнадзяржаўная кадыфікацыя права Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. (Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г.)

У сярэдзіне XVI ст. у ВКЛ адбываліся змены ў эканамічнай (рост і ўмацаванне права ўласнасці на зямлю, актывізацыя таварна-грашовых адносін), у палітычнай і іншых сферах. У 1550–1560-я гг. праводзіцца шэраг маштабных рэформаў у ВКЛ. На падставе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы былі ўнесены значныя змены ў тэрытарыяльнае ўладкаванне дзяржавы і сістэму мясцовых органаў дзяржаўнай улады. У адпаведнасці з судовай рэформай на больш прагрэсіўных прынцыпах будуецца сістэма судовых органаў і судаводства дзяржавы і г. д. У выніку аграрнай рэформы ўзмацняецца залежнасць сялян, павялічваюцца шляхецкія землеўладанні і ствараюцца фальваркі. Усё гэта выклікала неабходнасць унясення змяненняў у заканадаўства, таму і ўзнікае шляхецкая ініцыятыва *«папраўы»* Статута 1529 г.

Для падрыхтоўкі новага Статута ў 1551 г. меркавалася стварыць камісію з 10 чалавек (5 католікаў, 5 праваслаўных). У выніку працы статутавай камісіі ў 1561 г. быў падрыхтаваны і пададзены на абмеркаванне

сойма праект новага Статута, аднак у сувязі са шматлікімі заўвагамі ён не быў прыняты. У 1564 г. на Бельскім сойме праект быў адобраны і меркавалася ўвесці яго ў дзеянне з 11 лістапада 1564 г., аднак працэс зацягнуўся. Статут быў уведзены ў дзеянне толькі з 1 сакавіка 1566 г.

Статут 1566 г. складаўся з 14 раздзелаў і 367 артыкулаў. У першым раздзеле ўтрымліваліся нормы, якія абвяшчалі галоўныя прынцыпы права, а таксама нормы, якія можна аднесці да *канстытуцыйнага* права і *крымінальнага* права. Другі раздзел уключаў нормы, якія адносяцца да *ваеннага* права («абароны земскай»), трэці – аб правах шляхты, чацвёрты – аб *суддзях і судах*, пяты – аб *шлюбна-сямейным* праве, шосты – аб *апеках*, сёмы – аб *запісах і продажах* (аб праве адчужэння маёнткаў пад умовай закладу і продажу), восьмы – аб *завяшчаннях*, дзявяты – аб *правах на зямлю* і *зямельных спрэчках*, дзясяты – аб *лясных угоддзях* і правілах карыстання імі, адзінаццаты – аб *злачынствах* супраць *асобы* ў цэлым і супраць *шляхты* ў прыватнасці, дванаццаты – аб *злачынствах* супраць *простых людзей*, трынаццаты – аб *маёмасных злачынствах*, чатырнаццаты – аб злачынствах іншага роду і, у прыватнасці, аб *«вывадзе»* (збегах і дапамозе ў гэтым) *залежных сялян або чэлядзі нявольнай*. Найбольш істотныя змены былі ўнесены ў нормы дзяржаўнага, судовапрацэсуальнага і цывільнага права.

Статут 1566 г. працягваў дзейнічаць (за выключэннем некаторых артыкулаў) на частцы тэрыторыі ВКЛ (Валынскае, Кіеўскае, Брацлаўскае ваяводствы), якая была далучана да Польшчы ў 1569 г., пад назвай Валынскі Статут і пасля ўвядзення ў ВКЛ новага Статута 1588 г.

### Дадатковая літаратура


Гудавичюс, Э. История Литвы : в 2 т. / Э. Гудавичюс ; пер. на рус. яз. Г.И. Ефремова ; под ред. Е.Л. Назарова. – М. : Фонд им. И.Д. Сытина (при участии изд-ва «Зарницы»), BALTRUS, 2005. – Т. 1 : История Литвы с древнейших времен до 1569 года. – 2005. – 679 с.

Доўнар, Т.І. Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV–XVI стст. / Т.І. Доўнар ; ЕГУ. – Мінск : Пропилеи, 2000. – 224 с.

Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага / А.К. Краўцэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 206 с. ; 3-е выд. – Беласток : Выш. шк. Публ. адм., 2008. – 196 с.

Лаппо, И.И. Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Опыт исследования политического и общественного строя / И.И. Лаппо. – СПб., 1901. – Т. 1. – 780 с.

Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М.К. Любавский. – 3-е изд. – СПб. : Наука, 2004. – 310 с.





Насевіч, В.Л. Пачаткі Вялікага Княства Літоўскага: падзеі і асобы / В.Л. Насевіч. – Мінск : Полымя, 1993. – 160 с.

Спиридонов, М.Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.) / М.Ф. Спиридонов ; под ред. А.Л. Хорошкевич. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 223 с.

Старостина, И.П. Судебник Казимира 1468 г. / И.П. Старостина // Древнейшие государства на территории СССР (1988–1989) : материалы и исследования. – М. : Наука, 1991. – С. 170–344.


### Пытанні для самакантролю

Якая поўная назва супольнай беларуска-літоўскай дзяржавы ў другой палове XIII ст., як яна стала называцца ў наступныя стагоддзі і што паказвае эвалюцыя назвы дзяржавы?

Які навуковец распрацаваў цэнтрысцкую (біэтнічную) канцэпцыю ўтварэння ВКЛ?

Які беларускі горад стаў галоўнай рэзідэнцыяй кіраўніка ВКЛ князя Міндоўга?

На якіх прынцыпах будаваліся ў ВКЛ адносіны паміж цэнтрам і прымыкаючымі землямі на пачатковым этапе існавання гэтай дзяржавы?

У час праўлення якога вялікага князя тэрыторыя ВКЛ дасягнула свайго максімальнага пашырэння – каля 687 тыс. км$^2$?

На якія страты ў залежнасці ад маёмаснага становішча і палітычнага значэння падзялялася саслоўе свецкіх феадалаў?

На якія катэгорыі падзяляліся сяляне паводле прыналежнасці да зямлі, якой яны карысталіся?

Які прывілей паклаў пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права ў ВКЛ?

Пачынаючы з прыняцця якога прывілея пасада вялікага князя прызнаецца выбарнай, а не спадчыннай?

У які перыяд гаспадарская рада была дарадчым органам пры вялікім князю?

На якіх мясцовых прадстаўнічых органах папярэдне абмяркоўваліся прапановы ўрада, якія склікаліся вялікім князем за некалькі тыдняў да адкрыцця Вальнага сойма?

Якая службовая асоба была ў павеце памочнікам старосты па ваенных справах і камандавала павятовым апалчэннем шляхты?

Што такое юрыдыкі ў гарадах?

Які вялікі князь ВКЛ уступіў у 1386 г. на польскі прастол і стаў каралём Польшчы як Уладзіслаў II?

Якое пагадненне паміж Вітаўтам і Ягайлам часова спыніла ўнутраную барацьбу ў ВКЛ і прывяло да ўмацавання саюза ВКЛ з Польшчай на аснове персанальнай уніі?

Калі і дзе адбылася ключавая бітва Польшчы і ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам?

Калі былі выдадзены прывілеі, згодна з якімі прадстаўнікі знакамітых родаў беларускага, украінскага і рускага паходжання праваслаўнага веравызнання ўраўноўваліся ў некаторых правах з феадаламі-католікамі?

Пасля смерці Уладзіслава III якога вялікага князя ВКЛ польскія эліты абралі на сойме польскім каралём, каб аднавіць унію дзвюх дзяржаў?

Які парадак для разгляду судовых спраў заканадаўча замацоўвала ўхвала сойма 1542 г.?

Як называўся суд, які ўзнік па прычыне вялікай загружанасці Гаспадарскага суда і ў сувязі з неабходнасцю па некаторых справах, якія паступалі да гаспадара, выязджаць на месца разгляду канкрэтнай спрэчкі?

На якіх асоб былі ўскладзены судовыя функцыі ў гродскім судзе?

Які мясцовы суд, што дзейнічаў на падставе звычаёвага права, лічыцца самым старажытным?

Якія асноўныя перадумовы правядзення рэформаў у ВКЛ у 60-х гг. XVI ст.?

У чым сутнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і ваеннай рэформаў у ВКЛ напярэдадні Люблінскай уніі?

Як называліся выбарныя шляхецкія саслоўныя суды, упершыню цалкам аддзеленыя ад велікакняжацкай адміністрацыі?

На якія два перыяды ў цэлым можна ўмоўна падзяліць развіццё заканадаўства ВКЛ?

У чым заключаецца дзяржаўна-прававое значэнне прывілея 1447 г.?

Які помнік права з'яўляецца першым кодэксам крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права ВКЛ?

На падставе якіх крыніц быў створаны першы Статут ВКЛ?

Якія былі прычыны і ўмовы другой агульнадзяржаўнай кадыфікацыі права Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст.?

## Тэсты

1. Хто з сучасных даследчыкаў прызнае, што ВКЛ – вялікая поліэтнічная дзяржава, стала вынікам сумесных дзеянняў балтаў і славян? Выйгрыш абодвух бакоў пры гэтым пераважаў выдаткі, а сам працэс «балта-славянскага ўзаемадзеяння» насіў пераважна мірны характар.

а) Э. Гудавічус і У.Ц. Пашута;
б) А.К. Краўцэвіч;
в) В.Л. Насевіч;
г) М.І. Ермаловіч;
д) Т. Баранаускас.

2. З пералічаных зямель ВКЛ да зямель «прыслухоўваючых» не адносіліся:

а) Падляшша;
б) Трокскае княства;



в) Віцебская зямля;
г) Полацкая зямля.

3. Які горад на тэрыторыі сучаснай Беларусі першым атрымаў магдэбургскае права?

а) Вільня;
б) Мінск;
в) Брэст;
г) Полацак.

4. У якіх заканадаўчых актах ВКЛ была ўпершыню замацавана ідэя індывідуалізацыі пакарання?

а) у земскіх прывілеях 1387 і 1413 гг.;
б) у земскім прывілеі 1447 г. і Судзебніку 1468 г.;
в) у Статутах ВКЛ 1529 і 1566 гг.

5. У якім Статуце ўпершыню быў вылучаны раздзел, што змяшчаў нормы працэсуальнага права?

а) у Статуце ВКЛ 1529 г.;
б) у Статуце ВКЛ 1566 г.;
в) у Статуце ВКЛ 1588 г.

6. Найбольш прывілеяванай часткай грамадства ВКЛ XV ст. быў вышэйшы радавіты слой феадальнай знаці – землеўладальнікі-дзедзічы (вотчыннікі). Для азначэння дзвюх асноўных груп феадальнай арыстакратыі выкарыстоўваліся тэрміны:

а) «князі»;
б) «баяры»;
в) «паны»;
г) «зямяне».

7. Дзяржаўцы і цівуны ў ВКЛ у XV–XVI стст.:

а) узначальвалі адміністрацыю дзяржаўных маёнткаў;
б) узначальвалі княжацкія дружыны.

8. Які ўраднік (службовая асоба) стаяў на чале органаў суда і самакіравання ў гарадах ВКЛ, што мелі магдэбургскае права?

а) ключнік;
б) лаўнік;
в) войт;
г) гараднічы;
д) маршалак.

9. Паміж Польскім каралеўствам і Вялікім Княствам Літоўскім у 1385–1386 гг. была заключана:

а) Віленска-Радамская унія;
б) Крэўская унія;
в) Гарадзельская унія;

г) Люблінская унія;

д) Мельніцкая унія.

10. Хто з вялікіх князёў літоўскіх не толькі называўся каралём у заходнееўрапейскіх крыніцах, але сапраўды быў каранаваны і насіў пасля каранацыі тытул караля Літвы?

а) Віцень;

б) Міндоўг (Міндаўг);

в) Гедымін;

г) Вітаўт.

## Заданні

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: князь Міндоўг, князь Вітаўт, Францыск Скарына, Мікалай Радзівіл Чорны?











2. Вызначце на карце, якія тэрыторыі ВКЛ на пачатковым этапе існавання дзяржавы складалі цэнтральную (галоўную), а якія – прымыкаючую («прыслухоўваючую») частку.

3. Вызначце на карце, якія ваяводствы былі ўтвораны на беларускіх землях часоў ВКЛ у час адміністрацыйна-тэрытарыяльных пераўтварэнняў у XIV – сярэдзіне XVI ст.

## Прыкладныя тэмы рэфератаў

Этнічная сітуацыя ў перыяд утварэння і развіцця дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага і прававы статус прадстаўнікоў этнічных меншасцей.

Праваахоўныя органы і іх дзейнасць у ВКЛ.

Міжнародныя прававыя дагаворы Вялікага Княства Літоўскага.

Прававое замацаванне сістэмнай рэформы грамадскага і дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага ў Статуце 1566 г.

Субсідыярныя крыніцы права, іх выкарыстанне ў прававой сістэме Вялікага Княства Літоўскага.

Асноўныя рысы публічнага і прыватнага права Вялікага Княства Літоўскага.

Канстытуцыйнае і ваеннае права Вялікага Княства Літоўскага.

Крымінальнае права Вялікага Княства Літоўскага.

Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага права Вялікага Княства Літоўскага.

Характэрныя асаблівасці развіцця апякунскага, шлюбна-сямейнага, спадчыннага права Вялікага Княства Літоўскага.

Агульная характарыстыка працэсуальнага права Вялікага Княства Літоўскага.

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы працэсу фарміравання Вялікага Княства Літоўскага.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага XV ст.

Удзельныя князі і іх васальная залежнасць ад вялікага князя.

Пачатак фарміравання шляхецкага саслоўя ў ВКЛ.

Прававы статус праваслаўнага і рыма-каталіцкага духавенства.

Прававы статус розных сацыяльных груп мяшчан.

Пачатак заканадаўчага афармлення прыгонніцтва.

Праблема пераўтварэння Вялікага Княства Літоўскага ў каралеўства.

Праблема паходжання Вальнага сойма.

Стварэнне і дзейнасць велікакняжацкай канцылярыі.

Кампетэнцыя вышэйшых земскіх (маршалак земскі, канцлер, падскарбі) службовых асоб.

Службовыя асобы мясцовай адміністрацыі (намеснік, ваявода, староста, дзяржаўца, цівун).

Органы судовай улады (войтаўска-лаўніцкі і бурсмісцерска-радзецкі) у гарадах, якія атрымалі прывілеі на магдэбургскае права.

Востраўскае пагадненне 1392 г.

Міжнародныя прававыя дагаворы Вялікага Княства Літоўскага з Вялікім княствам Маскоўскім (1349, 1372, 1400 і 1408 гг.).

Вотчынны (даменіяльны) суд.

Пётркаўска-Мельніцкая унія 1501 г.

«Устава на валокі 1557 г.».

Інстытут інстыгатара (публічнага абвінаваўцы) у задворным судзе вялікага князя.

Кампетэнцыя, абавязкі і дзейнасць пракуратараў (адвакатаў).

Інстытут вознага ў павятовых і ваяводскіх судах ВКЛ.

Асаблівасці развіцця духоўнай культуры насельніцтва ВКЛ у сярэднявеччы.

Гуманістычная школа права і яе ўплыў на працэс кадыфікацыі права ў ВКЛ.

Гісторыя распрацоўкі і прыняцця Статута ВКЛ 1566 г.

Гісторыя распрацоўкі і прыняцця Статута ВКЛ 1588 г.

Субсідыярныя крыніцы права: паняцце, класіфікацыя і прымяненне ў ВКЛ.

Рэгуляванне шлюбна-сямейных адносін у звычаёвым, царкоўным, земскім і магдэбургскім праве.

Адказы на тэсты: 1 – б), в); 2 – б); 3 – в); 4 – б);
5 – а); 6 – а), в); 7 – а); 8 – в); 9 – б); 10 – б).



# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XVI – КАНЕЦ XVIII ст.). АСАБЛІВАСЦІ ГРАМАДСКАГА І ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ

**Пытанні тэмы**

*1. Люблінская унія 1569 г.*

*2. Грамадска-дзяржаўны лад беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай (1569–1763 гг.).*

*3. Судовая сістэма Рэчы Паспалітай.*

*4. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай у 1763–1795 гг.*

*5. Першы і другі падзелы Рэчы Паспалітай (1772 і 1793 гг.).*

*6. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.*

*7. Агульная характарыстыка прававой сістэмы Рэчы Паспалітай. Генрыкавы артыкулы і Пакта канвента.*

*8. Статут ВКЛ 1588 г. Гісторыка-прававая характарыстыка.*

*9. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г.*

## 1. Люблінская унія 1569 г.

На працягу XIV–XVI стст. кіраўніцтва Польшчы неаднаразова рабіла спробы навязаць ВКЛ унію з мэтай інкарпарацыі ў склад Польскага каралеўства. ВКЛ разглядала уніі з Польшчай як вымушаны крок, на які яно звычайна ішло пад ціскам унутраных і знешніх абставін. Асабліва востра пытанне аб уніі паўстала ў 60-я гг. XVI ст., калі сутыкненнямі ў Лівоніі пачалася новая вайна паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Ваенныя дзеянні перамясціліся на тэрыторыю Беларусі, якая стала асноўным тэатрам вайны. Няўдачы Лівонскай вайны фактычна сталі галоўнай прычынай, што прымусіла ВКЛ да дзяржаўнай уніі з Польшчай.

Сярод прычын уніі 1569 г. былі супярэчнасці ў пануючым саслоўі ВКЛ, асабліва паміж *магнатэрыяй* і сярэдняй і дробнай *шляхтай*. Маг-

нацтва ў ВКЛ трымала ўладу, на сойме паны-рада праводзілі галоўным чынам свае рашэнні, маніпулірызючы думкамі большасці шляхты. У Польскім каралеўстве шляхта ўжо мела так званыя «залатыя вольнасці», доступ да ўлады, уплывала на ўнутраную і знешнюю палітыку ўрада. Шырокія колы беларуска-літоўска-ўкраінскай шляхты марылі заняць вызначальнае становішча ў сваёй дзяржаве, як польская шляхта ў сваёй. Шляхта ВКЛ жадала набыць польскія «залатыя шляхецкія вольнасці» – дасягненне гэтых мэт яна звязвала з заключэннем уніі з Польшчай.

Спрыяла уніі блізкасць палітычнага ладу краін. Вялікі князь, як і польскі кароль, выбіраўся «вольным абраннем» усіх станаў. Гаспадарская рада, як і польскі сенат, складалася з біскупаў, ваяводаў, кашталянаў і міністраў, а ніжэйшую палату прадстаўлялі паслы ад павятовай шляхты. Сістэма цэнтральнага і мясцовага кіравання, ваенная арганізацыя, гарадскія ўстановы былі набліжаны да польскіх узораў. Мала таксама адрозніваліся грамадская структура і прававое становішча станаў.

Пэўным фактарам збліжэння абедзвюх дзяржаў была рыма-каталіцкая царква. У геапалітычным плане гэтая царква спрыяла больш шчыльным сувязям ВКЛ з еўрапейскімі краінамі і ў пэўным сэнсе цясней збліжала знешнюю палітыку менавіта з Польшчай.

Яшчэ адным фактарам палітычнага збліжэння ВКЛ і Польшчы была небяспека з боку крымскіх татараў і Турэцкай імперыі.

ВКЛ і кіруючыя колы Польшчы прапаноўвалі розныя ўмовы злучэння дзяржаў.

Літвінскія палітыкі хацелі абмежавацца ваенна-палітычным саюзам, які б захаваў незалежнасць і самастойнасць ВКЛ. Кожная з дзяржаў павінна была захаваць свой сойм, кароль і вялікі князь злучанай дзяржавы павінен абірацца і абвяшчацца той і другой дзяржавамі асобна. На вышэйшыя службовыя пасады ў кожнай дзяржаве прызначаць толькі яе ўраджэнцаў.

Прадстаўнікі кіруючых колаў Польшчы стаялі за першынство Польшчы і за поўнае скасаванне незалежнасці ВКЛ.

*10 студзеня 1569 г.* у Любліне адкрыўся агульны сойм Польшчы і ВКЛ. *1 ліпеня* акт уніі прынялі ўсе сенатары і паслы. Кароль падпісаў акт *4 ліпеня 1569 г.* Акт Люблінскай уніі стаў кампрамісным варыянтам пагаднення двух процілеглых лагераў. Яго прэамбула адлюстроўвала праграму польскіх магнатаў, а далейшы тэкст улічыў імкненні беларуска-літоўскай эліты. Сутнасць новастворанага саюза дзвюх дзяржаў заключалася ў тым, што «каралеўства Польскае і Вялікае Княства Літоўскае ўяўляюць сабою ўжо адно непадзельнае і неаддзельнае цела, а таксама не асобную, але агульную рэспубліку, якая злучылася і з'ядналася ў адзін народ з дзвюх дзяржаў і народаў».



Пры гэтым дзяржавы, якія аб'ядналіся ў складзе Рэчы Паспалітай, захавалі важныя атрыбуты суверэнітэту: асобную дзяржаўную адміністрацыю, войскі, фінансавую сістэму, эмісію грошай, адміністрацыйны і судовы апарат, свае законы, мытную сістэму, дзяржаўныя гербы і сцягі. Сойм Рэчы Паспалітай прымаў асобныя законы для Польшчы і ВКЛ. Польшча і ВКЛ захоўвалі самастойныя назвы і розныя дзяржаўныя мовы. Была створана асобная вышэйшая судовая інстанцыя для ВКЛ – Галоўны трыбунал. Найлепшым сведчаннем дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ стаў прыняты ў 1588 г. Трэці Статут. Ён *не змяшчаў* ніводнага артыкула, які б абмяжоўваў суверэнітэт ВКЛ, і *абавязваў* гаспадара захоўваць недатыкальнасць тэрыторыі дзяржавы.

## 2. Грамадска-дзяржаўны лад беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай (1569–1763 гг.)

Палітычны лад Рэчы Паспалітай развіваўся асаблівым шляхам, таму сярод навукоўцаў існуюць разыходжанні ў вызначэнні формы праўлення і формы дзяржаўнага ўладкавання гэтай палітычнай супольнасці. Рознымі навукоўцамі форма дзяржаўнага ўладкавання Рэчы Паспалітай вызначаецца як федэрацыя (саюзная дзяржава) ці канфедэрацыя (саюз дзяржаў). Значная колькасць даследчыкаў вызначаюць форму праўлення Рэчы Паспалітай як мяшаную, паколькі сцвердзілася рэспубліканская сістэма ўлады, але пры захаванні інстытута «слабага» манарха (ён быў выбарным, дзейнічаў у прававым полі і мог быць пазбаўлены трона ў выпадку невыканання ўмоў, на якіх ён быў абраны). Сістэма так званай «мяшанай», або збалансаванай, улады *(monarchia mixta)* стварыла альтэрнатыву манархіі абсалютнай.

У рамках гэтага перыяду даследчыкі ўмоўна вылучаюць падперыяды:

шляхецкая дэмакратыя;

магнацкая алігархія;

пачатак канстытуцыйнай манархіі.

**Вальны сойм** Рэчы Паспалітай складаўся з трох так званых соймавых станаў:

**Кароль**;

**Сенат** (вышэйшая палата сойма), у склад якога ўваходзілі ўсе каталіцкія біскупы і найболей важныя саноўнікі (*ураднікі*) цэнтральнага і мясцовага апаратаў абедзвюх дзяржаў;

**Пасольская хата** (ніжняя палата сойма) – палата дэпутатаў, якая складалася з абраных прадстаўнікоў (*паслоў*) павятовай шляхты.

Да выключнай кампетэнцыі Вальнага сойма Рэчы Паспалітай належалі выданне заканадаўчых актаў, увядзенне падаткаў, скліканне «па-

спалітага рушэння», набілітацыя, выпрацоўка агульнага напрамку знешняй палітыкі, зацвярджэнне мірных дагавораў і перамір'яў, кантроль за дзейнасцю караля і цэнтральныхураднікаў.

Перад Вальным соймам Рэчы Паспалітай сенатары і шляхецкія паслы з усёй ВКЛ збіраліся на свой **Галоўны (генеральны) соймік**, на якім на аснове інструкцый павятовых соймікаў выпрацоўвалася іх агульная праграма і пазіцыя.

Апрача генеральнага сойміка, у перыяд 1570-х гг. у ВКЛ быў яшчэ адзін інстытут парламентарызму – **Галоўны з'езд**, празваны Віленскай канвакацыяй. На ім палітычная эліта ВКЛ выраршала пытанні забеспячэння знешняй бяспекі дзяржавы, вызначала прынцыпы арганізацыі ўлады, акрэслівала пазіцыю ВКЛ у адносінах з Каронай Польскай і кандыдатамі на трон.

Мясцовымі саслоўна-прадстаўнічымі органамі шляхты павета (зямлі, ваяводства) з'яўляліся **соймікі (сеймікі)**, якія былі формай самарэалізацыі шляхецкай супольнасці павета і дзяржаўна-прававым інстытутам, дзякуючы якому шляхецкая супольнасць была здольная прымаць актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны.

У канцы XVI ст. комплекс прывілеяў шляхты Рэчы Паспалітай стаў асновай афармлення ідэалагічнай дактрыны «залатой вольнасці» – культу павагі да свабод кожнага індывіда *шляхецкага* стану. Галоўнымі з гэтых вольнасцей былі роўнасць усіх шляхцічаў перад законам, права на свабодную элекцыю караля, права кожнага шляхціча на свабоду голасу, права на пратэст, а таксама недатыкальнасць асобы шляхціча і яго маёнтка. Вольнасці шляхты маглі абмежаваць толькі пастановы Вальных соймаў і соймікаў, аднак яны прымаліся самой шляхтай. Пры гэтым кароль і вялікі князь не меў права без згоды шляхецкіх паслоў накладаць падаткі, пачынаць вайну, выдаваць якія-небудзь уставы, што тычыліся шляхты. Абсалютызаваныя «залатыя вольнасці» сталі трактавацца як аснова ўсіх унутрыдзяржаўных адносін. Усялякая спроба рэфармаваць усталяваны лад уяўлялася шляхце замахам на яе прывілеі і блакіравалася. На практыцы найлепшым спосабам прадухілення рэформаў стала спыненне працы соймаў праз **ліберум вета** («вольнае не дазваляю» – права *аднаго пасла* сарваць працу *ўсяго сойма*). Не менш важным для феадальнай барацьбы ўнутры дзяржавы было права на стварэнне **канфедэрацый** і абвяшчэнне **рокашаў** (афіцыйная форма ўзброенай барацьбы супраць каралеўскай улады). У сярэдзіне XVII ст. шляхецкая дэмакратыя настолькі дэфармавалася, што стала ператварацца ў магнацкую алігархію.



### 3. Судовая сістэма Рэчы Паспалітай

Далейшае рэфармаванне судовай сістэмы ВКЛ і абмежаванне судовай улады вялікага князя і паноў радных адбылося ў сувязі з утварэннем вышэйшага апеляцыйнага суда дзяржавы – **Галоўнага суда (Трыбунала)**. Ён быў створаны згодна з Уставай «Способ прав трибунальских», прынятай на Варшаўскім сойме ў 1581 г. У кожным ваяводстве, дзе дзейнічалі земскія суды, у вызначаны час на сойміку павінны былі з'ехацца мясцовыя паны радныя, розныя службовыя асобы і ўся шляхта для абрання *суддзяў* Трыбунала. Такія соймікі атрымалі назву трыбунальскіх. У кожным павеце выбіраліся дзве асобы (па адной на кожную сесію). Выбраныя суддзі выконвалі свае функцыі на працягу года, а затым на сойміках абіраліся новыя дэпутаты на наступны год. Кіраваў працай суда старшыня – маршалак, які абіраўся суддзямі штогод (на абедзве сесіі). Справы разглядаліся судовай калегіяй у складзе ад 2 да 7 чалавек.

Паводле Уставы асноўнай катэгорыяй спраў, аднесеных да кампетэнцыі Трыбунала, былі апеляцыйныя скаргі на рашэнні *гродскіх, земскіх і падкаморскіх* судоў. Акрамя апеляцыйных спраў Галоўны суд разглядаў некаторыя справы па першай інстанцыі, што раней адносіліся да кампетэнцыі Велікакняжацкага суда. Працэс у Галоўным судзе меў *іскавы характар*, і сам ісцец павінен быў збіраць і прад'яўляць у суд доказы і падтрымліваць абвінавачванне. Выконвалі рашэнні Галоўнага суда павятовыя суды або павятовыя старосты.

Юрыдычна Трыбунал перастаў існаваць 6 чэрвеня 1792 г. Фармальна ён скончыў сваю судовую дзейнасць у сакавіку 1797 г., і замест Трыбунала расійская ўлада стварыла Суд Галоўны Літоўскі.

### 4. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай ў 1763–1795 гг.

У 1764 г. на выбарах новага манарха Рэчы Паспалітай пад ціскам Расіі перамог Станіслаў Панятоўскі. Ён узначальваў дзяржаву больш за 30 гадоў. Палітычная лінія новаабранага караля была накіравана на правядзенне неадкладных дзяржаўных рэформаў і ўсталяванне больш раўнапраўных адносін з Прусіяй і Расійскай імперыяй, што вельмі не спадабалася манархам гэтых дзяржаў. Апошнія найбольш зручнай нагодай для ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай бачылі **дысідэнцкае пытанне** (нераўнапраўнае становішча католікаў як дамінуючай канфесіі і прадстаўнікоў іншых хрысціянскіх канфесій). Для «садзейнічання» ў яго вырашэнні (пры вайсковым і фінансавым забеспячэнні Расіі і Прусіі) у 1767 г. утварыліся дзве дысідэнцкія канфедэрацыі – у Слуцку з праваслаўнай і пратэстанцкай шляхты і ў

Торуні – з пратэстантаў. Адначасова пачалі ствараацца і рэканфедэрацыі каталіцкай шляхты Беларусі і Літвы з мэтай абароны «веры і вольнасці». Паколькі ніякай рэальнай сілы ні **Слуцкая**, ні **Торуньская канфедэрацыі** не мелі, пецярбургскі двор пачаў наладжваць кантакты з праціўнікамі новага караля, заахвочваючы іх абяцаннямі *дэтранізацыі* (пазбаўлення трона) Станіслава Аўгуста. Адбылося ўтварэнне новых канфедэрацый – спачатку **Віленскай**, а потым **Радамскай**.

Для разгляду «дысідэнцкага пытання» адбыўся Надзвычайны сойм 1767–1768 гг. У 1768 г. распрацаваныя падкантрольнай расійскаму паслу «дэлегацыяй» праекты пастаноў былі ўхвалены соймам. Дысідэнты атрымалі права доступу да ўсіх дзяржаўных пасад, у тым ліку сенатарскіх. Ім была гарантавана свабода культу, права будовы і рамонту храмаў, адкрыцця пры іх школ. Дысідэнты былі вызвалены ад каталіцкай царкоўнай юрысдыкцыі. Для вырашэння рэлігійных канфліктаў павінен быў утварыцца «змешаны суд». Аднак *за каталіцкай верай* было пакінута яе *пануючае становішча* ў дзяржаве.

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай быў акрэслены так званымі **кардынальнымі правамі**, яны абвяшчаліся вечнымі і нязменнымі. Кардынальныя правы 1768 г. замацоўвалі: «ліберум вета», свабодны выбар манарха, права на ўтварэнне шляхецкіх канфедэрацый, манапольныя прывілеі шляхецкага стану займаць дзяржаўныя пасады, валодаць і распараджацца зямлёй і сялянамі – усё тое, што вяло да палітычнай анархіі ў дзяржаве. Астатнія правы, так званыя **«дзяржаўныя справы»**, падлягалі кампетэнцыі Вальных соймаў і маглі быць зменены шляхам адзінагалоснасці. Трэцяя катэгорыя законаў, якія прымаліся соймам, так званыя **«справы эканамічныя»**, павінны былі зацвярджацца большасцю галасоў.

Сойм 1767–1768 гг. можна разглядаць як частковую перамогу Станіслава Аўгуста. Праз кампраміс з расійскімі ўладамі ўдалося зберагчы пэўныя рэформы. Віленска-радамскія канфедэрацыі пацярпелі на гэтым сойме паражэнне – самым адчувальным для праціўнікаў палітыкі рэформаў стала іх капітуляцыя ў дысідэнцкім пытанні.

### 5. Першы і другі падзелы Рэчы Паспалітай (1772 і 1793 гг.)

Праціўнікамі рэформаў у 1768 г. ва ўкраінскім мястэчку Бар была абвешчана канфедэрацыя ў абарону каталіцкай веры і незалежнасці дзяржавы. Мэтай **Барскай канфедэрацыі** была заяўлена абарона незалежнасці, правядзенне Рэччу Паспалітай самастойнай знешняй і ўнутранай палітыкі, выгнанне чужаземных войскаў (*пазітыўны і патрыятычны бок* дзейнасці). Аднак адначасова барычане выступілі ў абарону вяршынства каталіцкай царквы, шляхецкіх правоў пры ігнараванні



дзяржаўных рэформаў (*адмоўны бок* дзейнасці). Пачалася канфедэрацкая вайна, якая прывяла да прамога ўмяшальніцтва Расійскай імперыі і інтэрвенцыі замежных войскаў у Рэч Паспалітую.

Першай вырашыла скарыстаць слабасць Рэчы Паспалітай Аўстрыя, якая ў 1769 і 1770 гг. захапіла частку Паўднёвай Польшчы. Прусія пад умовай «санітарнага кардону» ў 1770 г. акупавала частку Паўночнай Польшчы так званых «Прусаў Каралеўскіх» і актыўна падштурхоўвала Расійскую імперыю да падзелу Рэчы Паспалітай. Перагаворы паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй, якія ішлі на працягу 1771 г., завяршыліся ў Пецярбургу падпісаннем **5 жніўня 1772 г.** трохбаковага пагаднення. Расія заняла паўночна-ўсходнія беларускія землі з Полацкам, Віцебскам, Мсціславам і частку Інфлянтаў плошчай у 92 тыс. км$^2$ з 1 млн 300 тыс. насельніцтва. Прусія атрымала тэрыторыю з гарадамі Холмам, Мальбаркам, Вармію, частку Куяў і Вялікапольшчы. Аўстрыя набыла польска-украінскія землі на поўдзень ад верхняй Віслы, Падолію, частку Валыні з гарадамі Тэрнопаль, Пярэмышль і Львоў.

Надзвычайны сойм у Варшаве ў 1775 г. пад знешнім прымусам зацвердзіў падзельныя **трактаты**, пацвердзіў Кардынальныя правы 1768 г., але мадыфікаваў некаторыя іх пункты. Манархам Рэчы Паспалітай мог быць толькі католік-паляк з асяроддзя землеўладальнікаў, якому забаранялася замацоўваць трон за сынамі і ўнукамі. Расійскай імперыі і магнацтву Рэчы Паспалітай было выгадным устанаўленне такога ладу, які б рабіў караля поўнасцю залежным і ад імператрыцы Кацярыны II, і ад феадальнай алігархіі.

У 1775 г. было прынята рашэнне аб утварэнні **Пастаяннай Рады**. Яна павінна была складацца з 18 сенатараў і 18 паслоў, якіх выбіралі на 2 гады, з падзелам на **пяць дэпартаментаў**: *замежных спраў, паліцыі, вайсковага, справядлівасці і скарбу.* Старшынёй Рады прызнаваўся кароль. Пры гэтым яго паўнамоцтвы ў прызначэнні на вызначаныя пасады абмяжоўваліся. Артыкулы, якія тычыліся дысідэнтаў, былі зменены ў бок абмежавання: яны зноў былі пазбаўлены права атрымліваць сенатарскія і міністэрскія пасады.

Падзелы дзяржавы выклікалі патрыятычны ўздым і рэфарматарскі рух, вяршыняй якіх стала дзейнасць **Чатырохгадовага (Вялікага) сойма** (з 6 кастрычніка 1788 г. па 30 чэрвеня 1792 г.). Найвышэйшым яго дасягненнем лічыцца прыняцце **Канстытуцыі 3 мая 1791 г.**, якая абвяшчала *канстытуцыйную саслоўную манархію*. Законы, якія ўхваліў Вялікі сойм, былі накіраваны на адмену Кардынальных правоў 1768 г., на прагрэсіўныя змены ў грамадскіх адносінах. *Рэч Паспалітая аб'яўлялася прававой дзяржавай, у якой вяршэнства належала закону, прынятаму соймам.* Пастанова сойма «Гарады нашы каралеўскія вольныя

ў дзяржавах Рэчы Паспалітай» распаўсюдзіла на мяшчанства права асабістай недатыкальнасці без пастановы суда. Заможныя жыхары гарадоў атрымалі таксама права набываць зямельную ўласнасць.

Праціўнікі Чатырохгадовага сойма (1788–1792 гг.) пры падтрымцы Расійскай імперыі абвясцілі **Таргавіцкую канфедэрацыю**. Зноў пачалася вайна, у якую актыўна ўмешваліся суседнія дзяржавы. **23 студзеня 1793 г.** прадстаўнікі Расіі і Прусіі падпісалі пагадненне аб *другім падзеле* Рэчы Паспалітай. Галоўным апраўданнем дзвюх дзяржаў стала неабходнасць барацьбы *з «якабінскай заразай»*, якая паўплывала на рэфарматарскія рашэнні Чатырохгадовага сойма. Прусія атрымлівала Гданьск і Торунь разам з часткай Вялікапольшчы, Куяваў, Мазовіі і іншых земель. Да Расійскай імперыі адыходзілі цэнтральна-паўночныя і паўднёвыя землі Беларусі з гарадамі Мінск, Нясвіж, Слуцк, Пінск і Мазыр.

**Апошні сойм** Рэчы Паспалітай адбыўся ў Гародні ў 1793 г. Галоўнай мэтай было **зацвярджэнне падзельных трактатаў** з Расіяй і Прусіяй і адмена рашэнняў Чатырохгадовага сойма (1788–1792 гг.). Падпісанне трактата, у тэкст якога паслы не маглі ўносіць змены, адбывалася ў абставінах прымусу і дэманстрацыі ваеннай сілы. Сойм зацвердзіў новае дзяржаўнае ўпарадкаванне Рэчы Паспалітай. Былі пацверджаны ўсе прывілеі шляхецкага саслоўя праз вяртанне **ранейшых кардынальных правоў**, якія замацоўвалі дэцэнтралізацыю і слабасць дзяржаўнай улады.

## 6. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай

У сакавіку – лістападзе **1794 г.** на ўцалелай ад двух падзелаў тэрыторыі Рэчы Паспалітай разгарнулася паўстанне пад кіраўніцтвам **Тадэвуша Касцюшкі**. З красавіка па верасень яно ахоплівала тэрыторыю часткі Цэнтральнай і Заходняй Беларусі. Паступова сфарміраваліся тры цэнтры падрыхтоўкі будучага паўстання: эміграцыйны цэнтр у Лейпцыгу, «таемны камітэт» у Варшаве і Віленскі цэнтр.

Паўстанне ў Польшчы пачалося 24 красавіка 1794 г. з абвяшчэння ў Кракаве «Акта паўстання жыхароў Кракаўскага ваяводства». Галоўнай мэтай дэкларавалася «забеспячэнне народнай свабоды і незалежнасці Рэчы Паспалітай». У якасці мясцовых органаў па кіраўніцтве паўстаннем прадугледжвалася стварэнне **«парадкавых камісій»** у ваяводствах і паветах, якія павінны былі стварыць **«дазорныя ўправы»** (на 1 000–1 200 сялянскіх гаспадарак).

Паўстанне на тэрыторыі ВКЛ пачалося ў Вільні ўначы з 22 на 23 красавіка 1794 г. 24 красавіка ў Вільні быў урачыста прыняты і абвешчаны **«Акт паўстання народа Вялікага Княства Літоўскага»**.



Згодна з ім утвараўся свой орган па кіраўніцтве паўстаннем – **Найвышэйшая рада ВКЛ**. З членаў рады ўтварыліся яе «дэпутацыі» – *забеспячэння, публічнай бяспекі, скарбу і таемная (для кіраўніцтва ваеннымі аперацыямі)*. Рада ВКЛ прызначыла **Я. Ясінскага** галоўнакамандуючым над паўстанцкімі войскамі.

У маі 1794 г. Тадэвуш Касцюшка выдаў **Паланецкі ўніверсал**, якім абвяшчалася апека ўрада над сялянамі, што аб'яўляліся асабіста вольнымі, але яны не атрымлівалі зямлю. Гэта быў прагрэсіўны акт, але многія палажэнні ўніверсала не выконваліся на месцах і засталіся толькі на паперы.

З самага пачатку паўстанне ў Беларусі і Літве набыло свае адметныя рысы. У ВКЛ яно было больш радыкальным. Лозунгам паўстання ў ВКЛ сталі словы «свабода», «роўнасць», «незалежнасць», а ў Польшчы замест слова «роўнасць» прысутнічала «цэласць». Істотным быў факт утварэння самастойнага ў асноўных пытаннях органа – Найвышэйшай рады ВКЛ, што кракаўскім актам не прадугледжвалася. Але гэтая рада праіснавала толькі да 10 чэрвеня 1794 г., потым ёй на змену прыйшла **Цэнтральная дэпутацыя ВКЛ**, ужо поўнасцю падпарадкаваная Найвышэйшай нацыянальнай радзе ў Варшаве. У перыяд паўстання ў ВКЛ функцыянавала да 23 «парадкавых камісій»: 2 ваяводскія – берасцейская і віленская і 21 павятовая.

У ходзе баявых дзеянняў рэгулярныя расійскія войскі мелі значную перавагу над паўстанцамі. Сітуацыя складвалася не на карысць апошніх на ўсім тэатры ваенных дзеянняў. У лістападзе 1794 г. рускія войскі пад камандаваннем А.В. Суворава авалодалі Варшавай. Вывезены ў Санкт-Пецярбург Станіслаў Аўгуст Панятоўскі 25 лістапада 1795 г. вымушаны быў адмовіцца ад трона.

У выніку *трэцяга* падзелу Рэчы Паспалітай **у 1795 г.** да Расійскай імперыі адышла частка ВКЛ з Вільняй, герцагства Курляндскае, Заходняя Валынь і частка Холмскай зямлі агульнай плошчай 120 тыс. км$^2$ з насельніцтвам каля 1 млн 200 тыс. чалавек. Аўстрыя атрымала Кракаўскае, Сандамірскае, Люблінскае, часткі Мазавецкага, Берасцейскага і Падляшскага ваяводстваў, а Прусія – большую частку Мазавецкага ваяводства разам з Варшавай, часткі Падляшскага, Троцкага ваяводстваў і Жамойці.

## 7. Агульная характарыстыка прававой сістэмы Рэчы Паспалітай. Генрыкавы артыкулы і Пакта канвента

Утварэнне Рэчы Паспалітай унесла прыкметныя змены ў развіццё ВКЛ. Асноўнымі крыніцамі заканадаўства побач з рашэннямі вярхоўнай улады і пастановамі Вальных соймаў сталі *дагаворы* шляхты з манархамі, у якіх вызначаліся галоўныя прынцыпы палітычнага ладу Рэчы Паспалітай,

гарантыі правоў прывілеяваных саслоўяў, паўнамоцтвы каралёў і вялікіх князёў літоўскіх – Генрыкавы артыкулы і Пакта канвента.

**Генрыкавы артыкулы** вызначалі асновы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і паўнамоцтвы караля польскага і вялікага князя літоўскага. Былі прыняты на элекцыйным сойме 1573 г. і складаліся з 18 пунктаў. Генрыкавы артыкулы былі нязменнымі па змесце і іх падпісанне было абавязковым пры абранні для ўсіх наступных каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх.

Як каранаваны манарх, першым пацвердзіў гэты нарматыўны прававы акт Стэфан Баторый. Згодна з Генрыкавымі артыкуламі **Рэч Паспалітая абвяшчалася шляхецкай рэспублікай з выбарным каралём.** Паводле дакумента кароль не меў права прызначаць сабе пераемніка, мець самастойныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, без згоды сойма абвяшчаць вайну, склікаць «паспалітае рушэнне», аднаасобна выдаваць законы, вяршыць суд і ўстанаўліваць падаткі. Кароль абавязваўся кожныя 2 гады склікаць Вальны сойм і падтрымліваць рэлігійны мір у краіне. Ён павінен быў знаходзіцца пад апекай 16 сенатараў-рэзідэнтаў і, калі не выконваў узятых на сябе абавязкаў, знаць Рэчы Паспалітай абвяшчалася вольнай ад падпарадкавання і вернасці каралю.

**Пакта канвента** – пагадненне публічна-прававога характару паміж шляхтай Рэчы Паспалітай і новаабраным каралём. У ім фіксаваліся *індывідуальныя* абавязкі манарха. Упершыню было заключана (разам з Генрыкавымі артыкуламі) у 1573 г. Элекцыйны сойм рыхтаваў *Пакта канвента* нанава пры кожным абранні караля, з канца 17 ст. гэтым займалася спецыяльная соймавая камісія.

**Соймавыя пастановы** прымаліся на агульных соймах у выглядзе *ухвалаў, канстытуцый.* Вырашаліся справы як усёй Рэчы Паспалітай, так і асобна Польшчы, ВКЛ, асобных зямель і рэгіёнаў. Тычыліся пераважна палітычнага і сацыяльна-эканамічнага зместу (аб арганізацыі і ўтрыманні войска, павіннасцях і правах розных пластоў насельніцтва, зменах у адміністрацыйнай структуры, судовым ладзе, мясцовых органах кіравання, падатках, гандлі і інш.). Пасля падпісання соймавай канстытуцыі пасламі і сенатарамі маршалак быў абавязаны ўнесці яе ў актавыя кнігі гродскага суда горада, дзе адбываўся сойм. Толькі пасля гэтага канстытуцыя набывала юрыдычную моц. Соймавыя канстытуцыі і асноўныя заканадаўчыя акты Польшчы, ВКЛ, Рэчы Паспалітай увайшлі ў шматтомнае неафіцыйнае выданне ***«Валюміна легум»*** *(Volumina legum) – неафіцыйны збор* законаў Рэчы Паспалітай.

**Соймікавыя ўхвалы** *(ляўдумы – laudum)* прымаліся соймікамі, тычыліся ўсіх сфер дзейнасці ў павеце (ваяводстве, зямлі) і зацвярджалі нормы мясцовага звычаёвага права.



**Дапаможныя законы –** законы замежнага паходжання (субсідыярныя крыніцы права): рымскае права, кананічнае права (Corpus juris Canonici), ленныя феадальныя законы (Liber feudorum), германскія гарадскія статуты (магдэбургскае і хэлмскае права).

## 8. Статут ВКЛ 1588 г. Гісторыка-прававая характарыстыка

Сацыяльныя і палітычныя змяненні, выкліканыя далучэннем значнай часткі ВКЛ да Польшчы і наступным падпісаннем акта Люблінскай уніі, сталі падставай для ўнясення змяненняў у заканадаўства. Пасля таго як быў прыняты Статут 1566 г., кадыфікацыйная работа не спынілася.

Існуе некалькі навуковых гіпотэз пра паходжанне тэксту Статута 1588 г.

Прыхільнікі першай сцвярджаюць, што Статут быў падрыхтаваны спецыяльна ўтворанай соймавай камісіяй, у склад якой уваходзілі найбольш выдатныя юрысты свайго часу.

Расійскі даследчык канца XIX – пачатку XX ст. І.І. Лапа лічыў, што соймавая камісія перадала справу «поправенья» Статута павятовым соймікам ВКЛ, а канчатковае рэдагаванне тэксту праходзіла ў дзяржаўнай канцылярыі ВКЛ.

Шэраг даследчыкаў спалучаюць дзе канцэпцыі: у працы па падрыхтоўцы Статута 1588 г. удзельнічалі перш за ўсё паны-рада, а таксама спецыяльная статутавая камісія, а на наступным этапе праца над праектам Статута перайшла да павятовых соймікаў.

У 1584 г. Статут быў гатовы, але паколькі ён ігнараваў акт Люблінскай уніі, польскі бок не пагаджаўся зацвердзіць яго на агульным сойме Рэчы Паспалітай. У такіх умовах зацвярджэнне Статута адбылося пры незвычайных абставінах: выкарыстаўшы складанае становішча кандыдата на каралеўскі трон Жыгімонта Вазы, які яшчэ не ведаў аб сваёй перамозе над Максімільянам Габсбургам, пасольства ВКЛ, у склад якога ўваходзіў і Л. Сапега (з 1581 г. – каралеўскі пісар пры Стэфану Баторыю, затым з 1585 па 1589 г. – падканцлер, з 1589 па 1623 г. – вялікі канцлер ВКЛ, з 1621 г. – віленскі ваявода, з 1625 г. – вялікі гетман ВКЛ), дамагаецца выдання прывілея на зацвярджэнне Статута ў абмен на прызнанне яго вялікім князем літоўскім, рускім і жамойцкім. Таму Статут ВКЛ 1588 г. быў уведзены ў дзеянне не соймавай канстытуцыяй, а паводле прывілея караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта III Вазы. Пасля падпісання Статута 1588 г. паўстала праблема друкавання гэтага зводу законаў, і падканцлер Л. Сапега ахвяраваў на гэтую справу ўласныя сродкі.

Статут 1588 г. складаўся з 14 раздзелаў, у якіх утрымлівалася 488 артыкулаў. Прадмовай да Статута служыў зварот Л. Сапегі да ўсіх саслоўяў,

дзе тэарэтычна абгрунтоўвалася неабходнасць абмежавання ўлады вялікага князя і прызнання вяршэнства права ў параўнанні з іншымі сацыяльнымі рэгулятарамі.

У першы раздзел Статута былі ўключаны разнастайныя па сваім змесце нормы, большасць з якіх мела канстытуцыйны характар: нормы, якія тычацца найважнейшых канстытуцыйных палажэнняў (перанесеныя са Статута 1566 г. і дапоўненыя) і нормы, якія рэгламентавалі пакаранні за дзяржаўныя злачынствы. Другі раздзел Статута ўключаў артыкулы, якія рэгулявалі выкананне шляхтай ваеннага абавязку. У трэцім раздзеле ў асноўным былі выкладзены нормы канстытуцыйнага права. Статут заканадаўча замацаваў суверэнітэт ВКЛ насуперак акту Люблінскай уніі, гарантаваў эканамічную, палітычную і культурную самастойнасць дзяржавы. Раздзел чацвёрты быў прысвечаны рэгламентацыі судовай сістэмы і судаводства дзяржавы. Раздзел пяты – змяшчаў нормы шлюбнасямейнага права. Раздзел шосты – апякунскага права. Раздзел сёмы – нормы грамадзянскага права, якія рэгламентавалі сутнасць, правілы і формы абавязацельстваў, розныя віды дагавораў і г. д. Восьмы раздзел быў прысвечаны атрыманню ў спадчыну маёмасці па завяшчанні. У дзявятым раздзеле рэгуляваліся зямельныя праваадносіны, а таксама вызначалася юрысдыкцыя падкаморскага суда. Дзясяты раздзел у асноўным утрымліваў нормы прыродарэсурснага і прыродаахоўнага права. З адзінаццатага па чатырнаццаты раздзелы ўтрымлівалася падрабязная рэгламентацыя крымінальнай адказнасці за здзяйсненне злачынстваў.

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), Статут 1588 г., як і папярэднія, быў напісаны на старабеларускай мове, што рабіла яго зразумелым і даступным адукаванаму насельніцтву. У 1614 г. ён быў перакладзены на польскую мову і неаднаразова на ёй выдаваўся.

З'яўляючыся адным з першых прававых кодэксаў у Еўропе, ён быў настолькі дасканалым, што захоўваў сілу закона нават у XIX ст. – асобныя яго часткі дзейнічалі пасля далучэння Беларусі да Расіі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях да 1831 г., а ў Мінскай, Віленскай і Гродзенскай – да 1840 г.

## 9. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г.

Канстытуцыя 3 мая 1791 г. распрацоўвалася і прымалася **Чатырохгадовым (Вялікім) соймам** пад выразным уплывам перадавой асветніцкай думкі. Ідэя аб тым, што «ўсялякая ўлада бярэ пачатак ад народа», вынікала з поглядаў Ж.-Ж. Русо. Замацаванне пастулата аб падзеле ўлады на тры часткі – *заканадаўчую* (сойм), *выканаўчую* (кароль і Варта законаў) і *судовую*, з выразнай перавагай першай, сведчыць аб уплыве ідэй Ш. Мантэск'ё.



Канстытуцыя складалася з Уводзін і 11 раздзелаў. Ва ўводзінах гаварылася, што дадзеная Канстытуцыя з улікам недахопаў дзяржаўнага кіравання ў Рэчы Паспалітай імкнецца дасягнуць знешняй незалежнасці і ўнутранай свабоды, прымаецца для захавання дзяржавы і яе межаў. Быў скасаваны падзел Рэчы Паспалітай на Карону Польскую і ВКЛ і абвешчана «назаўсёды адзіная вольная і незалежная» дзяржава.

У раздзеле 1 адзначалася, што каталіцкая канфесія з'яўляецца пануючай, а іншым канфесіям і рэлігіям гарантуецца свабода і талерантнасць (пры гэтым адрачэнне ад каталіцтва было забаронена).

Да найбольш важных змен у дзяржаўным ладзе можна аднесці адмену права «ліберум вета» і свабоднай элекцыі караля і вялікага князя (захоўвалася выбранасць трону, але ў межах адной нязменнай сям'і).

Па Канстытуцыі заканадаўчая ўлада належала *двухпалатнаму* пастаянна дзеючаму сойму, які выбіраўся на два гады. Палата дэпутатаў (Пасольская хата) складалася з 204 дэпутатаў (паслоў), якія выбіраліся на павятовых сойміках. Сенат, які складаўся з азначанага кола свецкіх і духоўных службовых асоб пад старшынствам караля, налічваў 132 чалавекі. Закон, прыняты ў Палаце дэпутатаў, перадаваўся ў Сенат, які мог яго ўхваліць або адкласці да паўторнага пасяджэння сойма. У такім выпадку абедзве палаты збіраліся разам і рашэнне прымалася простай большасцю галасоў. Канстытуцыя забараняла любыя канфедэрацыі. Галоўны прынцып, на якім будавалася дзейнасць сойма, заключаўся ў тым, што дэпутаты – прадстаўнікі ўсяго народа, а не толькі свайго павета, і таму павінны клапаціцца аб агульных інтарэсах грамадства.

Устанаўліваўся новы вышэйшы орган выканаўчай улады для ўсёй Рэчы Паспалітай – Варта законаў (Straż Praw). У склад гэтага ўрада ўваходзілі ў якасці старшыні – кароль, кіраўнік каталіцкай царквы (прымас) як старшыня камісіі народнай асветы і пяць міністраў: паліцыі, унутраных і замежных спраў, вайсковы і фінансаў.

Захоўваліся асновы феадальнага грамадства, шляхецкія правы абвяшчаліся непарушнымі. Пры гэтым рабіліся пэўныя ўступкі жыхарам гарадоў, напрыклад: асабістая недатыкальнасць, права набыцця зямлі і шляхецкага статусу, заняцця ніжэйшых адміністрацыйна-судовых і царкоўных пасад. У чацвёртым раздзеле Канстытуцыі праца селяніна прызнавалася галоўнай крыніцай багацця дзяржавы, а само сялянства – самай вялікай часткай насельніцтва. Залежнасць прыгоннага селяніна ад феадалаў не скасоўвалася, але была зроблена спроба крыху абмежаваць іх свавольства.

Дзеянні **Таргавіцкай канфэдэрацыі**, падтрыманай ваеннай інтэрвенцыяй Расійскай імперыі, прывялі да адмены Канстытуцыі 3 мая 1791 г. і ліквідацыі створаных на яе аснове органаў улады.

### Дадатковая літаратура

Бардах, Ю. Канстытуцыя 3 мая і «Узаемныя Заручыны Абодвух Народаў» 1791 г. / Ю. Бардах // Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бардах ; пер. з пол. і фр. М. Раманоўскага, А. Істоміна ; уклад. Г. Сагановіч. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 359–401.

Дзербіна, Г.В. Права і сям'я Беларусі эпохі Рэнесансу / Г.В. Дзербіна. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 175 с.

Довнар, Т.И. Уголовное право феодальной Беларуси (XV–XVI вв.) : учеб. пособие / Т.И. Довнар, В.А. Шелкопляс ; М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждения образования «Акад. М-ва внутр. дел Респ. Беларусь». – Минск : Акад. МВД, 1995. – 96 с.

Мацук, А. Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.) / А. Мацук. – Мінск : Медысонт, 2010. – 640 с.

Радаман, А.А. Прынцыпы забеспячэння бяспекі дзейнасці соймікаў у праве Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага другой паловы XVI – пачатку XVII ст. / А.А. Радаман // Проблемы борьбы с преступностью и подготовки кадров для органов внутренних дел Республики Беларусь : сб. материалов науч.-практ. конф., Минск, 28 янв. 2005 г. / учреждение образования «Акад. М-ва внутр. дел Респ. Беларусь» ; под ред. И.И. Басецкого. – Минск : Акад. МВД, 2005. – С. 136–137.

Рахуба, А. Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай (1569–1763 гг.) / А. Рахуба ; пер. з пол. М. Раманоўскага ; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск : Медысонт, 2008. – 424 с.

### Пытанні для самакантролю

Якія перадумовы садзейнічалі больш цеснаму збліжэнню ВКЛ і Польшчы?

Вызначце асноўныя прычыны Люблінскай уніі.

Якая роля ў стварэнні Рэчы Паспалітай належыць рыма-каталіцкай царкве?

Зыходзячы з якіх крытэрыяў значная колькасць даследчыкаў вызначае як мяшаную форму праўлення Рэчы Паспалітай другой паловы XVI–XVII стст.?

З якой мэтай сенатары і шляхецкія паслы з усёй ВКЛ збіраліся на свой галоўны (генеральны) соймік перад Вальным соймам Рэчы Паспалітай?

Якія мясцовыя саслоўна-прадстаўнічыя органы былі дзяржаўна-прававым інстытутам, дзякуючы якому шляхецкая супольнасць у паветах магла прымаць актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны?

Якое саслоўе мела ў Рэчы Паспалітай «залатыя вольнасці»?

Як на працу Вальных соймаў паўплывала права шляхты на «ліберум вета» («вольнае не дазваляю»)?



Згодна з якой Уставай, прынятай на Варшаўскім сойме ў 1581 г., дзейнічаў Галоўны суд (Трыбунал) ВКЛ?

Хто быў абраны апошнім каралём Рэчы Паспалітай?

Якія дзве дысідэнцкія канфедэрацыі былі створаны ў 1767 г.?

Якія прынцыпы дзяржаўнага ладу замацоўвалі Кардынальныя правы 1768 г.?

Якая тэрыторыя адышла да Расійскай імперыі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай?

Якая форма праўлення Рэчы Паспалітай была замацавана ў Канстытуцыі 3 мая 1791 г.?

Калі і дзе адбыўся апошні сейм Рэчы Паспалітай?

Якія асноўныя прычыны паражэння паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі?

Які прававы акт, прыняты на Элекцыйным сойме 1573 г. і з тых часоў нязменны па змесце, вызначыў асновы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і паўнамоцтвы караля польскага і вялікага князя літоўскага?

Як называліся пагадненні публічна-прававога характару паміж шляхтай Рэчы Паспалітай і новаабраным каралём, у якім фіксаваліся індывідуальныя абавязкі манарха?

У чым сутнасць навуковай канцэпцыі расійскага даследчыка канца XIX – пачатку XX ст. І.І. Лапа пра паходжанне тэксту Статута 1588 г.?

Якая роля Льва Сапегі ва ўвядзенні ў дзеянне Статута ВКЛ 1588 г.?

Які раздзел Статута 1588 г. уключаў артыкулы, што рэгулявалі выкананне шляхтай ваеннага абавязку?

Якому органу дзяржаўнай улады па Канстытуцыі 3 мая 1791 г. належала заканадаўчая ўлада?

### Тэсты

1. Як называлася судовае следства ў ВКЛ у адпаведнасці з соймавай ухвалай 1578 г. і артыкула 61–66 раздзела XI Статута ВКЛ 1588 г.?

а) шкрутыніум;

б) лімітацыя;

в) вываланне (баніцыя).

2. Якім чынам замяшчалася пасада земскага суддзі паводле Статута ВКЛ 1588 г.?

а) на пасаду земскага суддзі ў любы павет вялікі князь прызначаў любога чалавека, якога лічыў вартым пасады;

б) вялікі князь прызначаў земскага суддзю пасля кансультацыі з панамі-радай з ліку 4 электаў, якія выбіраліся на вакантны ўрад на павятовым сойміку адпаведнага павета;

в) земскія суддзі выбіраліся на павятовых сойміках.
3. Каго ў судах ВКЛ называлі «пракуратарамі»?
а) пракурораў;
б) адвакатаў;
в) судовых выканаўцаў.
4. Што такое «канфедэрацыя»?
а) інстытут няпоўнага шляхецтва;
б) ваенны шляхецкі з'езд пад палітычным лозунгам;
в) пазбаўленне шляхецкай годнасці.
5. Калі была зацверджана унія (саюз), паводле якой Вялікае Княства Літоўскае і Карона Польская аб'ядналіся ў Рэч Паспалітую абодвух народаў?
а) 15 лютага 1563 г.;
б) 1 ліпеня 1569 г.;
в) 16 лістапада 1588 г.
6. Абавязкі гетмана найвышэйшага ВКЛ у другой палове XVI ст.:
а) кіраваў узброенымі сіламі дзяржавы;
б) сачыў за парадкам і этыкетам на велікакняжацкім двары;
в) узначальваў дзяржаўную канцылярыю і зберагаў дзяржаўную пячатку.
7. Абавязкі канцлера ВКЛ у другой палове XVI ст.:
а) узначальваў дзяржаўную канцылярыю, удзельнічаў у падрыхтоўцы і канчатковым рэдагаванні заканадаўчых актаў;
б) зберагаў вялікую дзяржаўную пячатку;
в) сачыў за парадкам і этыкетам на велікакняжацкім двары;
г) кіраваў узброенымі сіламі дзяржавы.
8. Па канстытуцыі 3 мая 1791 г. вышэйшая выканаўчая ўлада ў Рэчы Паспалітай належала:
а) Вальнаму сойму;
б) Варце законаў (Стража правоў);
в) каралю.
9. У адпаведнасці з нормамі Статута ВКЛ 1588 г. у шлюб маглі ўступіць дзяўчаты, якія не былі ў другім шлюбе, у блізкім сваяцтве з жаніхом і дасягнулі ўзросту:
а) 13 гадоў;
б) 14 гадоў;
в) 15 гадоў;
г) 16 гадоў.
10. Артыкул 11 раздзела XIV Статута ВКЛ 1588 г. «О обвиненью в злодействе шляхтича, лет зуполных не маючого, также и о простых людях» устанаўліваў наступленне крымінальнай адказнасці за крадзёж:
а) з 13 гадоў;
б) 14 гадоў;



в) 15 гадоў;
г) 16 гадоў.

**Заданні**

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: Стэфан Баторый, Леў Сапега, Станіслаў Панятоўскі, Тадэвуш Касцюшка?









2. Вызначце на карце, у якіх гарадах адбываліся Вальныя соймы Рэчы Паспалітай і Галоўны (генеральны) соймік ВКЛ.
3. Вызначце на карце, якія тэрыторыі страціла Рэч Паспалітая ў выніку падзелаў 1772, 1793 і 1795 гг.

## Прыкладныя тэмы рэфератаў

Прававы статус прадстаўнікоў этнічных меншасцей у перыяд Рэчы Паспалітай.

Дзяржаўна-прававое становішча Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага.

Перадсоймавы з'езд Вялікага Княства Літоўскага ў Ваўкавыску і Слоніме (генеральны або галоўны соймік).

Фінансавая сістэма Рэчы Паспалітай.

Арганізацыя войска Рэчы Паспалітай.

Мясцовыя органы ўлады і кіравання Рэчы Паспалітай.

Кіраванне гарадамі і мястэчкамі ў сістэме органаў улады Рэчы Паспалітай.

Праваахоўныя органы і іх дзейнасць у Рэчы Паспалітай.

Судовая сістэма ў 1569–1795 гг. у Рэчы Паспалітай. Задворны суд манарха. Асэсарскі суд. Рэферэндарскі суд.

Соймавы суд: склад, юрысдыкцыя.

Суд Камісіі скарбовай Літоўскай і Скарбовы трыбунал.

Духоўны Трыбунал.

Надзвычайныя суды ў Рэчы Паспалітай. Каптуровы і канфедэрацкі суды.

Інстытут адвакатуры. Інстытут возвага і возвага-генерала. Папярэдняе следства (шкрутыніум).

Міжнародныя прававыя дагаворы паміж Рэччу Паспалітай і замежнымі дзяржавамі.

Асноўныя рысы публічнага і прыватнага права Вялікага Княства Літоўскага: канстытуцыйнае, крымінальнае, грамадзянскае, шлюбна-сямейнае, апякунскае і спадчыннае права.

Гарадское права ВКЛ і яго эвалюцыя ў перыяд Рэчы Паспалітай.

Акты уніі і канстытуцыя Люблінскага сойма 1569 г.

Рэч Паспалітая абодвух народаў: канфедэрацыя або федэрацыя?

Трансфармацыя чэлядзі нявольнай (дворнай) у прыгоннае сялянства.

Кейданскія дамовы са Швецыяй 1655 г.

«Ураўнаванне правоў» («Coaequationis Jurium») ВКЛ і Кароны Польскай 1697 г.

Ардынарныя і экстраардынарныя соймы Рэчы Паспалітай.

Месца Галоўнага дзяржаўнага з'езда ВКЛ (Віленскай канвакацыі) у дзяржаўна-прававой сістэме Рэчы Паспалітай абодвух народаў.

Кампетэнцыя і дзейнасць павятовых і ваяводскіх соймікаў.

Канфедэрацыі і рокашы ў палітычным жыцці Рэчы Паспалітай.

Надзвычайныя суды ў ВКЛ.



Міжнародныя прававыя дагаворы паміж Рэччу Паспалітай абодвух народаў і замежнымі дзяржавамі.

Асноўныя дзяржаўныя законы Рэчы Паспалітай абодвух народаў.

Праекты выпраўлення Статута ВКЛ 1588 г. у XVII–XVIII стст.

Рэфармаванне дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай у перыяд да пачатку дзейнасці Чатырохгадовага сойма (1764–1788 г.).

Гродзенскі сойм і яго канстытуцыі.

Арганізацыя і функцыянаванне органаў паўстання (Найвышэйшы начальнік нацыянальных узброеных сіл, Найвышэйшая нацыянальная рада, Парадкавыя камісіі і інш.) 1794 г. пад кіраўніцтвам Андрэя Тадэвуша Банавентуры Касцюшкі.

Ліквідацыя Рэчы Паспалітай абодвух народаў як суверэннай дзяржавы ў выніку падзелаў.

Адказы на тэсты: 1 – а); 2 – б); 3 – б); 4 – б); 5 – б);
6 – а); 7 – а), б); 8 – б), в); 9 – а); 10 – г).

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ
# Ў СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ
# (канец XVIII ст. – 1917 г.).
# АСАБЛІВАСЦІ ГРАМАДСКАГА, ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ І ПРАВА

**Пытанні тэмы:**

*1. Асаблівасці грамадскага ладу Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі.*

*2. Дзяржаўны лад Расійскай імперыі і імперская дзяржаўная палітыка ў заходніх губернях.*

*3. Судовая сістэма Расійскай імперыі.*

*4. Буржуазныя рэформы ў Расійскай імперыі. Асаблівасці іх правядзення ў заходніх губернях.*

*5. Асаблівасці прававой сістэмы заходніх губерняў Расійскай імперыі.*

## 1. Асаблівасці грамадскага ладу Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі

Расійскае феадальнае грамадства падзялялася на чатыры асноўныя саслоўі: **дваранства, духавенства, гарадскія і сельскія абывацелі**, аднак фактычна яно мела больш складаную структуру. Саслоўі падзяляліся на прывілеяваныя і падатковыя. Вышэйшым прывілеяваным саслоўем было **дваранства**. Калі параўноўваць з Рэччу Паспалітай, то там прывілеяванае саслоўе – шляхта – мела шырокія палітычныя правы: перыядычна збірацца на соймікі, на якіх адстойваць свае інтарэсы перад цэнтральнымі ўладамі, праз сваіх прадстаўнікоў удзельнічаць у выбранні караля на Вальным сойме і магла яму не падпарадкоўвацца. З пераходам да Расійскай імперыі гэтая шляхта страціла свае палітычныя правы, але ў сацыяльнай і эканамічнай сферах засталася прывілеяваным саслоўем. Пры гэтым усе прадстаўнікі шляхты (пад пагрозай пазбаўлення нерухомай маёмасці) павінны былі прынесці прысягу на вернасць расійскаму манарху. Царскі ўрад, абвясціўшы дваранства «першынствуючым» расійскім саслоўем, юрыдычна замацаваў яго пануючыя пазіцыі ў сістэме **абсалютысцкай дзяржавы**. Асновай палітычнай і эканамічнай магутнасці дваранства з'яўлялася валоданне не толькі зямлёй, але і прыгоннымі. Дваранства было вызвалена ад усялякіх падаткаў, цялесных пакаранняў, магло быць асуджана толькі роўнымі сабе.



Да прывілеяваных саслоўяў таксама адносіліся **духавенства**, **купецтва** і нешматлікая група **ганаровых грамадзян** (з 1832 г.). Яны таксама пазбаўляліся рэкрутчыны, цялесных пакаранняў, падушнага падатку і іншых дзяржаўных павіннасцей.

Асноўную масу *падатковага* саслоўя і ўсяго насельніцтва Беларусі (53,5 %) складалі *прыгонныя сяляне,* якія падзяляліся на дзве асноўныя групы – **дзяржаўныя (казённыя) і прыватнаўласніцкія**. Апошнія складалі абсалютную большасць, да іх адносіліся **памешчыцкія** (панскія), **царкоўныя** і тыя, што належалі **асобным мяшчанам і розным ведамствам** (гарадам, дабрачынным арганізацыям, Вольнаму эканамічнаму таварыству і г. д.). Нешматлікую частку насельніцтва складалі **вольныя** сяляне. Другім падатковым саслоўем былі **мяшчане** – асабіста свабоднае насельніцтва гарадоў, якое павінна было плаціць падушны падатак, адбываць рэкрутчыну, выконваць іншыя грашовыя і натуральныя павіннасці.

У першай палове XIX ст. у Беларусі ўтвараецца новая група насельніцтва (непадатковая, але і не прывілеяваная) – **разначынцы**, гэта значыць выхадцы з «розных чыноў і званняў».

## 2. Дзяржаўны лад Расійскай імперыі і імперская дзяржаўная палітыка ў заходніх губернях

Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі было некалькі тэрытарыяльна-адміністрацыйных рэформаў па падзелу гэтых тэрыторый. У 1801 г. Аляксандр І увёў новы падзел – на Магілёўскую і Віцебскую (абедзве губерні ўвайшлі ў склад Беларускага генерал-губернатарства), Віленскую і Гродзенскую (увайшлі ў склад Літоўскага ваеннага губернатарства) і Мінскую (уваходзіла ў склад розных генерал-губернатарстваў) губерні. Гэты падзел праіснаваў да Кастрычніцкай рэвалюцыі

Расійская імперыя, у складзе якой апынуліся беларускія землі, па форме дзяржаўнага ладу была **абсалютнай манархіяй**. Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі ў пяці заходніх губернях дзейнічалі агульныя прынцыпы палітыкі царызму, якія прымяняліся ў адносінах да ўсіх нацыянальных ускраін Расіі.

На беларуска-літоўскія землі царскі ўрад распаўсюдзіў сістэму мясцовага дзяржаўнага кіравання па аналогіі з расійскімі губернямі. Галоўнай асобай у губернях быў **генерал-губернатар**, які лічыўся намеснікам цара. Яму падпарадкоўваліся вайсковыя і грамадзянскія губернатары. У абавязак грамадзянскага губернатара ўваходзіў нагляд за падтрыманнем грамадскага парадку, зборам падаткаў, рэкрутаў, ходам следства, заключэннем казённых падрадаў і паставак і інш. У кожнай губерні як выканаўчы орган дзейнічала губернскае праўленне ў складзе «общего присутствия» і канцылярыі. Гаспадарчай і фінансавай справай кіравала казённая палата, якую ўзначальваў віцэ-губернатар.

Галоўным органам павятовай улады лічыўся **ніжні земскі суд**, што адначасова выконваў адміністрацыйна-паліцэйскія і судовыя функцыі. Узначальваў яго земскі спраўнік – у адрозненне ад расійскіх губерняў, ён не выбіраўся, а прызначаўся Сенатам.

Адзначым, што ў першы час пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі царскі ўрад імкнуўся не выкарыстоўваць жорсткія меры ў адносінах да мясцовага насельніцтва, спрабуючы тым самым прыглушыць апазіцыйныя настроі. Аднак значная частка апалячанай шляхты і каталіцкага духавенства засталася незадаволенай. У першай чвэрці XIX ст. на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай адбывалася пэўная ідэалізацыя гэтай дзяржавы ў свядомасці прапольскай знаці. Таму вельмі папулярнай сярод апошняй заставаліся ідэі аднаўлення Рэчы Паспалітай у былых межах да 1772 г., для чаго ствараліся тайныя арганізацыі. Гэта прымусіла царскі ўрад неўзабаве стаць на шлях узмацнення сваіх пазіцый у беларускіх землях. Частка дзяржаўных зямель разам з сялянамі была раздадзена імператрыцай Кацярынай II рускім дваранам і чыноўнікам. У адносінах да апазіцыйна настроенай мясцовай шляхты былі выкарыстаны такія сродкі, як «разбор шляхты» і канфіскацыя маёнткаў за ўдзел у антыўрадавай дзейнасці.

Напярэдадні **франка-рускай вайны 1812 г.** пытанне аб адраджэнні Рэчы Паспалітай і ВКЛ набыло асаблівую актуальнасць, паколькі будучыя ўдзельнікі канфлікту – Напалеон I Банапарт і Аляксандр I – імкнуліся заручыцца падтрымкай былога насельніцтва гэтых дзяржаў. Дзяржаўны і вайсковы дзеяч ВКЛ Міхал Клеафас Агінскі падрыхтаваў для расійскага імператара кампрамісны праект, якім прадугледжвалася ўтварэнне ў Расійскай імперыі адной **правінцыі** пад назвай **Вялікае Княства Літоўскае** з Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай і Валынскай губернямі і з Беластоцкай і Тарнопальскай акругамі. Кіраванне ВКЛ даручалася б імперскаму намесніку, а сталіцай меркавалася абвясціць Вільню. У якасці органа ўлады прапаноўвалася стварыць Літоўскую канцылярыю пад кіраўніцтвам аднаго з дзяржаўных міністраў. Унутраная адміністрацыя ВКЛ засяроджвалася б у Адміністрацыйнай радзе кіравання пад старшынствам імператарскага намесніка. Арганізацыя і кампетэнцыя ўсіх галін унутранага кіравання павінны былі вызначацца Статутам ВКЛ. Як адзначае прафесар А.Ф. Вішнеўскі, цар Аляксандр I у сувязі з супраціўленнем з боку кансерватыўнай расійскай палітычнай эліты адмовіўся ад ідэі аднаўлення ВКЛ як аўтаномнай часткі Расіі.

Пасля нападу ў 1812 г. арміі імператара Напалеона на Расійскую імперыю і захопу заходніх губерняў на змену расійскай адміністрацыі тут прыходзіць французская. Адносіны мясцовага насельніцтва да новай улады былі рознымі: частка арыстакратыі падтрымала Аляксандра I і змагалася на баку расійскай арміі. Іншыя прадстаўнікі літоўска-беларускай шляхты падтрымлівалі Напалеона, бо спадзяваліся пры яго дапамозе на аднаўленне Польшчы ў межах 1772 г. Часткова і фармальна гэтыя чаканні французскі імператар задаволіў. Ён выдаў указ аб стварэнні Часовага ўрада (Літоўская часовая камісія) Вялікага Княства Літоўскага, кампетэнцыя якога распаўсюджвалася на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую і Беластоцкую губерні. Аднак Напалеон не планаваў прадастаўляць дэклараванаму ВКЛ палітычную незалежнасць, усе ключавыя пасады ў адміністрацыі займалі прадстаўнікі французскага камандавання. Галоўная мэта Напалеона – гэта стварэнне бяспечнага тылу, забеспячэнне з дапамогай мясцовай адміністрацыі тылу арміі харчаваннем і фуражом.

Франка-руская вайна 1812 г. прынесла беларускаму народу вялізныя страты і пакуты, загінула значная частка насельніцтва, спалены ці знішчаны шмат жыллёвых і гаспадарчых пабудоў.

Кульмінацыяй антыімперскага супраціўлення стала **паўстанне**, падрыхтаванае польскімі тайнымі таварыствамі, у першую чаргу «Патрыятычным таварыствам» і «Таварыствам падхаружых». Пачалося ў **1830 г.** у Варшаве, а ў **1831 г.** яно перакінулася на тэрыторыю Літвы і Беларусі. Паўстанцы стварылі **Часовы ўрад**, які абʼявіў аб скліканні сойма. Рашэннем сойма быў створаны **Нацыянальны ўрад** на чале з А. Чартарыйскім. Царскі ўрад прымаў меры, каб абмежаваць распаўсюджванне паўстання ў заходніх губернях: Заходняя Беларусь, Літва і Заходняя Украіна былі абвешчаны на ваенным становішчы. Паўстанне было падаўлена, дзяржаўная палітыка ў пяці заходніх губернях змянілася. Паслядоўная дэпаланізацыя і ўзмоцненая русіфікацыя сталі асноўнымі кірункамі палітыкі Расійскай імперыі ў адносінах да беларускіх зямель. Былі зачынены вышэйшыя навучальныя ўстановы ў Полацку і Вільні, пачалося закрыццё каталіцкіх кляштараў і уніяцкіх манастыроў.

## 3. Судовая сістэма Расійскай імперыі

Пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай на далучаных да Расіі тэрыторыях прадугледжвалася захаванне судовай сістэмы, якая існавала на тэрыторыі Беларусі ў перыяд знаходжання яе ў складзе Рэчы Паспалітай. Таму спачатку сістэма мясцовых судовых органаў на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. адрознівалася ад судовай сістэмы іншых расійскіх губерняў. Але паступова яна ўсё больш збліжаецца з судаўладкаваннем Расійскай імперыі.

На пачатку XIX ст. асноўным звяном судовай сістэмы заставаліся **земскія суды**. **Гродскія суды** функцыянавалі толькі ў Віленскай і Гродзенскай губернях. У іх склад уваходзілі гродскі суддзя, падсудак і пісар, якія прызначаліся генерал-губернатарам або губернатарам. Усе справы па зямельных спрэчках дваран адносіліся да падсуднасці **падкаморскага суда**.

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. сістэма судовых органаў была зменена па закону ад 30 кастрычніка 1831 г. У гэты перыяд усё судаводства было пераведзена на рускую мову і пачало ажыццяўляцца па расійскіх законах. Разгляд спраў ва ўсіх судовых інстанцыях адбываўся пры зачыненых дзвярах. На дзейнасць суда моцны ціск аказвалі розныя адміністрацыйныя органы, вядзенне следства і выкананне прысуду перадаваліся органам паліцыі, якія, акрамя таго, маглі прымаць на сябе і судовыя функцыі па малаважных справах. У судовым працэсе панавалі інквізіцыйны пачатак і тэорыя фармальных доказаў. Уводзіліся губернскія суды – аднатыпныя з існаваўшымі ў цэнтральных расійскіх губернях.

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыі дзяржавы і права Беларусі»), вышэйшымі судовымі інстанцыямі ў губернях сталі **Палаты па крымінальных і грамадзянскіх справах** – усесаслоўныя судовыя ўстановы. Далей ішла складаная сістэма саслоўных судоў.

Для дваран у кожным павеце ствараўся **павятовы суд**, члены якога (павятовы суддзя і два засядацелі) абіраліся дваранствам на тры гады. Апеляцыйнай інстанцыяй для павятовых судоў стаў **верхні земскі суд**, які складаўся з двух дэпартаментаў, – па крымінальных і грамадзянскіх справах. Верхні земскі суд ствараўся адзін на губерню. Яму належала права рэвізіі і кантролю за дзейнасцю павятовых судоў. Верхні земскі суд складаўся з прызначаных імператарам старшыні і віцэ-старшыні і выбраных на тры гады дваранствам дзесяці засядацеляў.

Для гараджан ніжэйшай судовай інстанцыяй сталі **гарадскія магістраты**, члены якіх абіраліся на тры гады. Апеляцыйнай інстанцыяй для гарадскіх магістратаў былі губернскія магістраты, што складаліся з двух старшыняў і засядацеляў, якія выбіраліся са складу гараджан (губернскага горада).



Дзяржаўныя сяляне судзіліся ў павятовай **ніжняй расправе**, у якой крымінальныя і грамадзянскія справы разглядалі прызначаныя ўладамі чыноўнікі. Апеляцыйнай інстанцыяй для ніжняй расправы стала **верхняя расправа**, справы ў якую ўносіліся пад грашовы заклад на працягу тыднёвага тэрміну.

У губернях засноўвалі «суды сумлення», якія складаліся з саслоўных прадстаўнікоў (старшыні і двух засядацеляў): дваран – па дваранскіх справах, гараджан – па справах гараджан, сялян – па сялянскіх справах. Суд насіў прымірэнчы характар – разглядаў грамадзянскія іскі, а таксама спецыяльнага суда – па справах аб злачынствах малалетніх, вар'ятаў і справах пра вядзьмарства.

Апеляцыйнай і рэвізійнай інстанцыяй у губерні сталі **судовыя палаты** (па грамадзянскіх і крымінальных справах).

**Сенат** заставаўся вышэйшым судовым органам для судоў усёй сістэмы.

Працягвала існаваць і дзейнічаць вотчынная юстыцыя.

## 4. Буржуазныя рэформы ў Расійскай імперыі. Асаблівасці іх правядзення ў заходніх губернях

У дзяржаўна-палітычным ладзе Расіі ў сярэдзіне XIX ст. панавалі абсалютызм і прыгоннае права. У 1855 г. на трон імператара ўступіў Аляксандр II (да 1881 г.). У гэты перыяд у Расіі сфарміраваліся сацыяльна-палітычныя і эканамічныя перадумовы для правядзення дзяржаўных пераўтварэнняў. Сведчаннем крызісу дзяржавы стала Крымская вайна (1853–1856 гг.), у час якой Расія не здолела супрацьстаяць краінам Заходняй Еўропы і пацярпела паражэнне. Стала відавочна, што прыгонніцкая сістэма значна прайграе капіталістычнай (з таварна-грашовымі адносінамі, рынкам працы і жорсткай канкурэнцыяй, якія падштурхоўваюць тэхнічнае развіццё, вядуць да інтэнсіфікацыі вытворчасці).

Урад Аляксандра II разумеў неабходнасць адмены прыгоннага права. **19 лютага 1861 г.** Аляксандр II падпісаў **Маніфест аб адмене прыгоннага права** і «Палажэнні аб сялянах, якія выйшлі з-пад прыгоннай залежнасці».

Рэформа 1861 г. у беларускіх губернях праводзілася на падставе Агульнага палажэння, двух Мясцовых палажэнняў і дадатковых правілаў аб уладкаванні сялян дробнапамесных маёнткаў.

У Агульным палажэнні былі выкладзены правілы для ўсіх губерняў Расійскай імперыі, дзе меліся прыгонныя. Яно вызначала асабістыя і маёмасныя правы сялян, парадак кіравання і выканання імі казённых, земскіх і грамадскіх павіннасцей. Сяляне аб'яўляліся вольнымі сельскімі

абывацелямі і надзяляліся грамадзянскімі правамі і свабодамі. Аднак памешчык па-ранейшаму заставаўся ўласнікам усёй зямлі. Сялянам даваўся ў карыстанне пэўны надзел зямлі, аднак да яго выкупу (не раней чым праз 9 гадоў) яны не з'яўляліся ўласнікамі гэтай зямлі. Да заключэння выкупной аперацыі селянін знаходзіўся ў стане часоваабавязанага і выконваў на карысць памешчыка вызначаныя павіннасці ў выглядзе паншчыны або аброку. Пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі рэгуляваліся ўстаўнымі граматамі, у якіх указваліся памеры палявога надзелу і павіннасці за яго.

Землеўпарадкаванне беларускіх сялян праводзілася па двух Мясцовых палажэннях, якія вызначалі парадак надзялення сялянства зямлёй і выканання павіннасцей за карыстанне ёй. Наяўнасць гэтых палажэнняў тлумачыцца сацыяльна-эканамічнай спецыфікай. Згодна з Мясцовым палажэннем для рускіх, паўднёваўкраінскіх і ўсходнебеларускіх (Віцебскай (8 паветаў) і Магілёўскай) губерняў быў усталяваны душавы зямельны надзел (да адмены прыгону тут існавала сялянскае *абшчыннае* землекарыстанне). Абшчына, а не асобны селянін, з'яўлялася ўласнікам зямлі, таму яна выкупляла зямлю і пераразмяркоўвала яе паміж сялянскімі дварамі. У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях і чатырох паветах Віцебскай губерняў землеўпарадкаванне сялян праводзілася паводле асобнага Мясцовага палажэння. Тут не было абшчыннага землекарыстання і вызначаўся *падворна-ўчасткавы парадак* спадчыннага землеўладання (надзельная зямля перадавалася ў падворнае ўладанне сялянам).

Для правядзення рэформы на месцах ствараліся спецыяльныя органы: павятовыя **міравыя з'езды** і **міравыя пасрэднікі**, **губернскія па сялянскіх справах прысутнасці**. Інстытут міравых пасрэднікаў узнік як *сувязное звяно* паміж валасным і сельскім самакіраваннем і царскім дзяржаўным апаратам. Сваю дзейнасць міравыя пасрэднікі здзяйснялі да 1874 г., затым іх функцыі павінны былі перайсці да павятовага «присутствия по крестьянским делам», якое складалася з асоб мясцовай адміністрацыі, земскіх органаў і міравога суддзі. Аднак да таго часу на тэрыторыі Беларусі не былі створаны ні земствы, ні міравыя суды. Таму гэтыя функцыі былі перададзены павятоваму капітану-спраўніку.

Пачатак паўстання ў Каралеўстве Польскім у 1863 г., якое на тэрыторыі Беларусі ўзначальваў К. Каліноўскі, прымусіў царскі ўрад стаць на шлях лавіравання і пайсці на *пэўныя ўступкі* былым прыгонным, каб адцягнуць іх ад удзелу ў паўстанні. У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Ковенскай губернях і шэрагу паветах Віцебскай губерні абавязковыя адносіны паміж



сялянствам і памешчыкамі спыняліся ў 1863 г., у Магілёўскай губерні і астатніх паветах Віцебскай губерні – з 1 студзеня 1864 г.

Сялянская рэформа змяніла арганізацыю сялянскага кіравання. Органамі сялянскага самакіравання ў сельскіх грамадствах, якія аб'ядноўвалі сялян-гаспадароў у сёлах (у сваю чаргу яны аб'ядноўваліся ў больш буйныя адміністрацыйныя адзінкі – воласці), з'яўляліся **сельскія сходы** і **сельскія старасты**. Валасное кіраўніцтва складалася з **валаснога сходу**, **валаснога старшыні** з валасным кіраўніцтвам і **валаснога суда**.

Адмена прыгоннага права, буржуазнае развіццё краіны абумовілі неабходнасць правядзення шэрагу рэформаў:

паліцэйскай (1862),
вайсковай (1862, 1874),
земскай (1864),
судовай (1864),
школьнай (1864),
гарадскога самакіравання (1870).

На тэрыторыі Беларусі гэтыя рэформы былі праведзены пазней і са значнымі адхіленнямі ў параўнанні з агульнарасійскімі правіламі.

На землі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны палажэнні аб **земскай рэформе** ў XIX ст. не распаўсюджваліся – правядзенне земскай рэформы было адкладзена да пачатку XX ст. Царскі ўрад, не маючы значнай падтрымкі з боку асноўнай масы землеўласнікаў і простага народа, асцерагаўся таго, што насельніцтва гэтых губерняў выкарыстае земствы ў якасці цэнтраў апазіцыйнага руху, і не рашыўся іх увесці ў гэтых губернях. Пачатак земскай рэформы ў Беларусі быў пакладзены ўрадавым Палажэннем ад 2 красавіка 1903 г., у адпаведнасці з якім у шасці заходніх губернях (Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай) былі заснаваны губернскія і павятовыя камітэты і ўправы па справах земскай гаспадаркі. Губернскія і павятовыя камітэты *не абіраліся, а прызначаліся* расійскім міністрам унутраных спраў і губернатарамі. На тэрыторыі Беларусі земствы ўвялі толькі ў 1911 г. у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях.

З усіх буржуазных рэформаў 60–70-х гг. XIX ст. найбольш паслядоўнай была **судовая**, у аснову якой пакладзены прынцыпы буржуазнага права. Яна на тэрыторыі Беларусі была праведзена са значным спазненнем і адступленнямі ад палажэння 1864 г. Васьмігадовая затрымка ажыццяўлення рэформы была звязана з дзеяннем на тэрыторыі Беларусі ваеннага становішча і дзейнасцю следчых камісій па справах за ўдзел у паўстанні 1863 г. Судовая рэформа ў Беларусі была пазбаўлена адной з істотных адзнак – выбарнасці суддзяў.

Пасля забойства нарадавольцамі імператара Аляксандра II у 1881 г. ва ўнутранай палітыцы Расіі адбыліся значныя змены. 80–90-я гг. XIX ст. увайшлі ў гісторыю як перыяд **контррэформаў**.

Развіццё Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. было супярэчлівым. Пэўныя галіны эканомікі развіваліся даволі паспяхова, аднак заставаліся нявырашанымі ключавыя пытанні: **аграрнае** (малазямелле ці беззямелле сялян, панаванне памешчыцкага землеўладання), **канстытуцыйнае** (супрацьстаянне грамадства і самаўладдзя), **узаемаадносіны працы і капіталу** (складанае эканамічнае і сацыяльнае становішча працоўных), **прававая няроўнасць**. Значны ўдар па аўтарытэту расійскай улады нанесла паражэнне ў Руска-Японскай вайне. Такім чынам, эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя прычыны сталі падставай для пачатку **першай рускай рэвалюцыі 1905–1907 гг.**

Каб спыніць рэвалюцыйны рух, расійскі **імператар Мікалай II** выдаў Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г., па якому грамадству надаваліся палітычныя правы і свабоды: сумлення, слова, сходаў, саюзаў і гарантавалася недатыкальнасць асобы. Маніфест таксама абвясціў **Дзяржаўную думу**, якая спачатку стваралася як дарадчая ўстанова, заканадаўчым органам. У 1906 г. цар ператварыў **Дзяржаўны савет** Расійскай імперыі ў падабенства верхняй палаты парламента. Усяго былі чатыры скліканні Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі. Актыўны ўдзел у выбарах прымалі і жыхары тэрыторыі Беларусі, напрыклад, сярод дэпутатаў, абраных у склад I Дзяржаўнай думы ад 5 заходніх губерняў, было 12 беларусаў. У выніку жорсткай унутрыпалітычнай барацьбы I і II Дзяржаўныя думы былі распушчаны ўказамі цара.

З мэтай вырашыць супярэчнасці ў сацыяльна-эканамічнай сферы царскі ўрад ініцыіраваў правядзенне з 1906 г. **аграрнай рэформы** пад кіраўніцтвам П.А. Сталыпіна. Рэвалюцыйны рух у 1907 г. пайшоў на спад, і на пэўны час становішча ў краіне стабілізавалася.

28 ліпеня 1914 г. пачалася **Першая сусветная вайна** (іншыя назвы – Вялікая вайна, Другая Айчынная, імперыялістычная). Яе пачатак быў звязаны з абвастрэннем супярэчнасцей, якія існавалі паміж буйнейшымі дзяржавамі свету. Да 1914 г. сфарміраваліся два буйныя ваенна-палітычныя блокі – **Антанта** (Расія, Англія, Францыя) і **Траісты саюз** (Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія).

У пачатку вайны ва ўсіх беларускіх губернях уводзілася ваеннае становішча. У 1915 г. нямецкае камандаванне здзейсніла шэраг наступальных аперацый супраць расійскай арміі, што прывяло да страты часткі заходніх губерняў Расійскай імперыяй. У жніўні 1915 г. пачалося нямецкае наступленне ў напрамку Коўна – Вільня – Мінск, у пачатку верасня 1915 г. германскія войскі здзейснілі **Свянцянскі прарыў** у стык пазіцый расійскіх армій. Пад пагрозай акружэння рускія войскі ў верасні 1915 г. вымушаны былі пакінуць тэрыторыю Заходняй Беларусі, стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага была пераведзена з Баранавіч ў Магілёў. Пасля напружаных баёў удалося спыніць наступ нямецкай арміі, з кастрычніка 1915 г. фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск – Баранавічы – Пінск. Германія захапіла прыкладна 25 працэнтаў тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам звыш 2 млн чалавек. З канца 1915 г. і па 1918 г. германскія акупацыйныя ўлады эксплуатавалі эканамічны патэнцыял Заходняй Беларусі, няшчадна выкарыстоўвалі прыродныя, гаспадарчыя і працоўныя рэсурсы. Усякая палітычная дзейнасць на акупаваных тэрыторыях забаранялася, дзейнічаць дазвалялася толькі камітэтам дапамогі ахвярам вайны, якія ўзніклі па ўсёй прыфрантавой паласе яшчэ да акупацыі. На некалькі гадоў тэрыторыя Беларусі аказалася падзеленай лініяй фронту на дзве часткі.



### 5. Асаблівасці прававой сістэмы заходніх губерняў Расійскай імперыі

У канцы XVIII – першай палове XIX ст. існавалі два напрамкі ўпарадкавання заканадаўства ў беларускіх губернях:

*першы* напрамак характарызаваўся ўпарадкаваннем мясцовых нарматыўных актаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі да ўключэння яе ў склад Расійскай імперыі, і здзяйсняўся шляхам перакладаў і перавыданняў Статута 1588 г. і соймавых пастаноў, якія дапаўнялі яго, а таксама распрацоўкі праекта Зводу мясцовых законаў Заходніх губерняў Расійскай імперыі»;

*другі* напрамак заключаўся ў тым, што царскі ўрад упарадкоўваў заканадаўства шляхам адмены мясцовых асаблівасцей у праве і паступовай замены мясцовага права правам Расійскай імперыі.

У канцы XVIII – першай трэці XIX ст. на тэрыторыі Беларусі важнай крыніцай права заставаўся Статут ВКЛ 1588 г. Аднак яго прымяненне было абмежаваным, паколькі ў сваёй дзейнасці суды абавязаны былі кіравацца і нормамі агульнаімперскага заканадаўства.

У 1826 г., калі пад кіраўніцтвам М.М. Сперанскага пачалася работа па стварэнні Зводу законаў Расійскай імперыі, было прынята рашэнне пачаць падрыхтоўку Зводу мясцовых законаў Заходніх губерняў Расійскай імперыі, які меркавалася ўключыць у агульны Звод законаў Расійскай імперыі. Яго падрыхтоўкай кіраваў вядомы беларускі вучоны-юрыст **І.М. Даніловіч**.

У структурных адносінах праект Зводу мясцовых законаў распадаўся на тры часткі.

Як адзначае Т.І. Доўнар, у першай частцы разглядалася прававое становішча розных катэгорый насельніцтва (дваран, духавенства, сялян-

ства і мяшчанства). У ёй ярка адлюстраваўся ўплыў агульнарасійскага заканадаўства, асабліва ў вызначэнні прававога становішча дваран.

Другая частка прысвечана шлюбна-сямейнаму і грамадзянскаму праву. У галіне сямейнага права ўплыў *мясцовых нормаў* права найбольш бачны ў адносінах атрымання спадчыны, парадку і ўмоў заключэння шлюбаў паміж асобамі каталіцкай веры, а ў сферы грамадзянскага права – у адносінах да сервітутаў, некаторых інстытутаў абавязацельнага права.

У трэцяй частцы выкладзены судовы лад і судаводства па пэўнай катэгорыі грамадзянскіх спраў. У той час як судовы лад у беларускіх губернях за некаторымі выключэннямі (наяўнасць межавых судоў, камісій з судовымі правамі) быў ідэнтычны судоваму ладу Расійскай імперыі, судаводства значна адрознівалася – былі спрошчаны правілы падсуднасці па грамадзянскіх справах, істотна адрозніваўся парадак іх разгляду на судовым пасяджэнні і выканання і абскарджання судовых рашэнняў.

Праца па падрыхтоўцы Зводу мясцовых законаў вялася да 1837 г. Аднак гэты Звод не быў уведзены ў дзеянне як асобны закон, а ў Агульнаімперскі звод законаў былі ўключаны толькі яго асобныя нормы. Прычынай гэтага стала тое, што пасля паўстання 1830–1831 гг. царскі ўрад перайшоў ад палітыкі лавіравання да прамога выкаранення праяўленняў нацыянальна-вызваленчага руху ў рэгіёнах, якія былі далучаны да Расіі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай. У дзяржаўна-прававой сферы гэта выявілася ў скасаванні апошніх рэштак асаблівасцей у судовай, адміністрацыйнай і прававой сферах заходніх губерняў. На тэрыторыі Беларусі былі ўведзены адміністрацыйная і судовая сістэмы, аналагічныя адпаведным сістэмам Расійскай імперыі.

У 1831 г. адмяняецца дзеянне Статута 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях, а ў 1840 г. было спынена яго дзеянне і пашырана агульнарасійскае заканадаўства ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях.

У 1832 г. быў выдадзены, а з 1835 г. уступіў у сілу Звод законаў Расійскай імперыі (у 15 тамах), у які ўвайшлі асобныя нормы Зводу мясцовых законаў Заходніх губерняў. Расійскі Звод законаў існаваў амаль у нязменным выглядзе да судовай рэформы 1864 г., пасля чаго быў мадэрнізаваны.

## Дадатковая літаратура

Анішчанка, Я.К. Палітычная гісторыя часоў падзелу Рэчы Паспалітай / Я.К. Анішчанка. – Мінск, 2006. – 256 с.

Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.) : манаграфія / М.М. Забаўскі. – Мінск : БДПУ, 2008. – 267 с.

Комзолова, А.А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. – М. : Наука, 2005. – 380 с.

Литвак, Б.Г. Переворот 1861 года в России: почему не реализовалась реформаторская альтернатива / Б.Г. Литвак. – М. : Политиздат, 1991. – 302 с.



Польша и Европа в XVIII веке : Международные и внутренние факторы разделов Речи Посполитой : сб. ст. / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения ; отв. ред. Б.В. Носов. – М. : ИС РАН, 1999. – 227 с.

Свиб, А.Ф. Государственно-правовой статус Беларуси в составе России в пореформенный период (1861–1906) : монография / А.Ф. Свиб ; Белорус. ин-т правоведения. – Минск : БИП-С, 2004. – 120 с.

Шелкопляс, В.А. Судебные органы в Беларуси: конец XVIII – первая половина XIX в. : учеб. пособие / В.А. Шелкопляс ; М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Акад. М-ва внутр. дел Респ. Беларусь». – Минск : Акад. МВД, 1997. – 63 с.

Шелкопляс, В.А. Полицейские суды в Беларуси в 60-е гг. XIX в. / В.А. Шелкопляс // Милиции Беларуси 90 лет: история и современность : материалы науч.-практ. конф., Минск, 27 февр. 2007 г. ; М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Акад. М-ва внутр. дел Респ. Беларусь» ; редкол.: К.И. Барвинок (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Акад. МВД, 2007. – С. 150–153.

## Пытанні для самакантролю

На якія чатыры асноўныя саслоўі падзялялася расійскае феадальнае грамадства ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.?

Якія катэгорыі насельніцтва Расійскай імперыі адносіліся да падатковых саслоўяў?

Які статус такой сацыяльнай групы, як разначынцы?

Вызначце форму праўлення Расійскай імперыі.

На якія пяць губерняў была падзелена тэрыторыя Беларусі ў перыяд праўлення Аляксандра I?

Якія службовыя абавязкі былі ў генерал-губернатараў і губернатараў у Расійскай імперыі?

Назавіце галоўны орган павятовай улады, які адначасова выконваў адміністрацыйна-паліцэйскія і судовыя функцыі.

Па якіх прычынах расійскі ўрад у адносінах да апазіцыйна настроенай шляхты выкарыстоўваў такія сродкі, як «разбор шляхты» і канфіскацыя маёнткаў?

З якіх дэпартаментаў складаўся верхні земскі суд, які выступаў апеляцыйнай інстанцыяй для павятовых судоў?

Якая юрысдыкцыя так званых «судоў сумлення»?

Што стала асноўнымі прычынамі правядзення буржуазных рэформаў у Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст.?

На падставе якіх юрыдычных дакументаў у беларускіх губернях праводзілася рэформа 1861 г.?

Як вы разумееце часоваабавязаны стан селяніна?

Якія на месцах ствараліся спецыяльныя органы для правядзення рэформы 1861 г.?

Назавіце органы сялянскага самакіравання ў сельскіх грамадствах, якія аб'ядноўвалі сялян-гаспадароў у сёлах і валасцях.

У чым сутнасць судовай рэформы 1864 г.?

Якія былі асаблівасці правядзення земскай і гарадской рэформаў у беларускіх губернях?

Што стала асноўнай перадумовай правядзення контррэформаў у 80–90-я гг. XIX ст.?

Якія крыніцы выкарыстоўваліся пры распрацоўцы Зводу мясцовых законаў Заходніх губерняў Расійскай імперыі?

Якія структурныя часткі змяшчаў праект Зводу мясцовых законаў Заходніх губерняў Расійскай імперыі?

Калі поўнасцю было адменена дзеянне Статута 1588 г. у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях?

### Тэсты

1. У праекце Зводу мясцовых законаў Заходніх губерняў Расійскай імперыі змяшчаліся нормы:

а) крымінальнага права;

б) цывільнага і шлюбна-сямейнага права;

в) працэсуальнага права.

2. Згодна з «Временными правилами об устройстве мировых судебных установлений в губерниях: Виленской, Ковенской, Гродненской, Киевской, Волынской, Подольской, Минской, Витебской и Могилевской, впредь до введения земских учреждений» ад 23 чэрвеня 1871 г. міравыя суддзі:

а) выбіраліся пажыццёва на земскіх сходах;

б) прызначаліся ўрадам (міністрам юстыцыі па прадстаўленні губернатара);

в) выбіраліся на 5 гадоў.

3. У якім годзе было канчаткова спынена дзеянне нормаў Статута ВКЛ 1588 г. у Гродзенскай і Віленскай губернях:

а) 1772 г.;

б) 1795 г.;

в) 1840 г.;

г) 1831 г.

4. У час земскай буржуазнай рэформы ў Расійскай імперыі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях у пачатку XX ст. для кіраўніцтва мясцовай гаспадаркай, народнай асветай, медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва і іншымі сферамі грамадска-культурнага жыцця ўтвараліся:

а) міравыя суды;

б) павятовыя і губернскія сходы і ўправы;

в) губернскія праўленні і канцылярыі.



5. Згодна з указам Кацярыны II ад 23 снежня 1791 г. яўрэі, якія пражывалі на тэрыторыі заходніх губерняў Расійскай імперыі, распісваліся па кагалах і ўключаліся ў саслоўе мяшчан. Калі была ўзаконена пашыраная рыса аседласці, якая ўключала беларускія і частку ўкраінскіх губерняў?

а) 23 чэрвеня 1794 г.;

б) 1 мая 1771 г.;

в) 7 лістапада 1812 г.;

г) 8 сакавіка 1801 г.

6. Якая структура з'яўлялася вышэйшай касацыйнай інстанцыяй для мясцовых судоў заходніх губерняў Расійскай імперыі ў сярэдзіне XIX ст.?

а) Сенат;

б) міравы суд;

в) Галоўны Літоўскі суд;

г) Ніжні земскі суд.

7. Мяшчане беларускіх гарадоў пасля далучэння да Расіі пазбаўляліся часткі сваіх правоў і павінны былі:

а) захаваць свае ранейшыя правы;

б) плаціць падушныя падаткі, выконваць рэкруцкую павіннасць;

в) несці павіннасці як звычайныя сяляне.

8. Прывілеяванымі жыхарамі ў гарадах XIX ст. былі:

а) рабочыя фабрык і заводаў;

б) купцы першай і другой гільдый і фабрыканты;

в) гараджане яўрэйскай нацыянальнасці.

9. У адпаведнасці з палажэннямі Зводу дзяржаўных законаў разам з кім гасудар імператар здзяйсняў сваю заканадаўчую ўладу?

а) Дзяржаўная дума;

б) Сенат;

в) Дзяржаўны Савет.

10. Органам кіравання ў беларускіх гарадах была «Управа благочиния», у якой засядалі:

а) гараднічы, прыставы крымінальных і цывільных спраў;

б) гараднічы, прыставы крымінальных і цывільных спраў і два ратманы, а таксама гарадскі магістрат;

в) два ратманы і гарадскі магістрат.

### Заданні

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: Міхал Агінскі, цар Аляксандр II, Кастусь Каліноўскі, Ігнат Даніловіч?









2. Вызначце на карце, якія заходнія губерні Расійскай імперыі знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь.

3. Вызначце на карце, у якіх беларускіх губернях да рэформы 1861 г. панавала абшчыннае, а ў якіх падворнае сялянскае землекарыстанне.

### Прыкладныя тэмы рэфератаў

Тыльзіцкі мірны дагавор 1807 г. і далучэнне да Расійскай імперыі Беластоцкай акругі.



Франка-руская вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі.

Паліцэйская рэформа 1862 г. і яе значэнне.

Сістэма міравых і агульных судоў па судовай рэформе.

Ваенная і іншыя рэформы.

Контррэформы ў Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст.

Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух на тэрыторыі заходніх губерняў у канцы XIX ст.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на тэрыторыі Беларусі.

Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. і яго ўплыў на развіццё расійскай дзяржавы.

Дзейнасць прадстаўнікоў заходніх губерняў у Дзяржаўнай думе Расійскай імперыі.

Дзяржаўны Савет Расійскай імперыі і яго дзейнасць.

Сталыпінская аграрная рэформа.

Беларускія землі ў гады Першай сусветнай вайны.

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. на тэрыторыі Беларусі.

Развіццё права ў канцы XIX – пачатку XX ст. Змены ў цывільным, крымінальным і працэсуальным праве.

Крымінальнае ўлажэнне 1903 г.

Заканадаўства Расіі ваеннага часу (1914–1917 гг.).

Заканадаўства Часовага ўраду Расіі.

Усталяванне троеўладдзя на тэрыторыі беларускіх губерняў.

Сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі і Літве пасля іх далучэння да Расійскай імперыі.

Праекты аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Расійскай імперыі Адама Чартарыскага і Міхала Клеафаса Агінскага.

Дзейнасць Часовага ўрада Вялікага Княства Літоўскага як органа адміністрацыйнага кіравання, залежнага ад Французскай імперыі.

Паўстанне 1831 г. і яго ўплыў на расійскую імперскую палітыку ў Беларусі і Літве.

Увядзенне ў дзеянне ў Беларусі законаў Расійскай імперыі.

Асаблівасці правядзення расійскіх буржуазных рэформаў на тэрыторыі Беларусі.

Судовая рэформа і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.

Земская рэформа і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі. Земскія камітэты, земскія сходы і іх управы.

Рэарганізацыя кіравання ў гарадах у адпаведнасці з законамі 1870 і 1892 гг.

Эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя фактары фарміравання беларускай нацыі ў XIX – пачатку XX ст.

Адказы на тэсты: 1 – б), в); 2 – б); 3 – в); 4 – б); 5 – а); 6 – а); 7 – б); 8 – б); 9 – в); 10 – б).

# СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПЕРЫЯД РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ І ЎТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ (1917–1922 гг.)

**Пытанні тэмы**

*1. Рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў 1917 г. і беларускі нацыянальны рух. Першы Усебеларускі з'езд і яго рашэнні.*

*2. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.*

*3. Абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі 1 студзеня 1919 г. і Літоўска-Беларускай ССР у лютым 1919 г.*

*4. Польска-савецкая вайна. Другое абвяшчэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.*

*5. Станаўленне прававой сістэмы Савецкай Беларусі.*

## 1. Рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў 1917 г. і беларускі нацыянальны рух. Першы Усебеларускі з'езд і яго рашэнні

Першая сусветная вайна, якая зацягнулася на некалькі гадоў, абвастрыла палітычныя і сацыяльна-эканамічныя супярэчнасці ў Расійскай імперыі. Адбылася **другая, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя**, у выніку якой была звергнута манархія і Расія стала **рэспублікай**. Ключавыя падзеі адбыліся ў лютым 1917 г. 23 лютага (8 сакавіка) 1917 г. у Петраградзе з-за перабояў у гандлі хлебам пачаліся стыхійныя хваляванні. 27 лютага (12 сакавіка) рух перарос ва ўзброенае паўстанне, якое закончылася перамогай рэвалюцыі ў сталіцы імперыі. У час паўстання з ліку ліберальных дэпутатаў Дзяржаўнай думы ўтварыўся Часовы думскі камітэт, які ў ноч на 28 лютага абвясціў аб узяцці ўлады ў краіне. Адначасова прадстаўнікі левай, сацыялістычнай часткі антыцарскай апазіцыі арганізавалі **Петраградскі савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў**. У выніку перагавораў паміж думскімі дзеячамі і лідарамі савета 1 сакавіка быў сфарміраваны **Часовы ўрад** Расіі на чале з князем Г. Львовым. Дамінуючыя пазіцыі ва ўрадзе спачатку займалі канстытуцыйныя дэмакраты (кадэты). Часовы ўрад абавязваўся забяспечыць у краіне дэмакратычныя правы і свабоды, склікаць Устаноўчы сход. Стварэннем новай адміністрацыі, падпарадкаванай Часоваму ўраду Расіі, займаліся грамадскія камітэты парадку.

Значная доля ўлады на Беларусі знаходзілася ў руках ваеннага камандавання – у Мінску размяшчаўся штаб Заходняга фронту, а ў Магілёве – Стаўка Вярхоўнага камандавання. Фактычна на тэрыторыі Беларусі ўсталявалася **троеўладдзе**: органы Часовага ўрада, Саветы і ваеннае камандаванне.

Наяўнасць сярод насельніцтва Беларусі разнародных класавых і нацыянальных інтарэсаў пры поўнай свабодзе слова, сходаў, саюзаў стварыла глебу для дзейнасці шматлікіх палітычных партый і арганізацый. Асноўнае месца ў 1917 г. тут займалі агульнарасійскія партыі, напрыклад: Партыя сацыялістаў рэвалюцыянераў (эсэры), Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП), якая падзялілася на бальшавікоў і меншавікоў, Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя (кадэты). Значна актывізаваўся ў гэты час беларускі нацыянальны рух. Перамога рэвалюцыі стварыла магчымасці для яго поўнай легалізацыі, ідэйнага і арганізацыйнага афармлення.

25–27 сакавіка 1917 г. у Мінску адначасова са з'ездам Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ) адбыўся 1-ы з'езд беларускіх палітычных партый і арганізацый. З'езд вітаў перамогу Лютаўскай рэвалюцыі і заявіў аб падтрымцы Часовага ўрада. Галоўнае праграмнае патрабаванне, выпрацаванае з'ездам, – дзяржаўна-тэрытарыяльная аўтаномія Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі. Ядром беларускай тэрыторыі вызначаліся Мінская, Магілёўская, Віцебская, Гродзенская і Віленская губерні. Аўтаномная Беларусь павінна была мець свой прадстаўнічы орган з заканадаўчымі функцыямі – Беларускую краёвую раду, у якасці выканаўчага органа быў выбраны **Беларускі нацыянальны камітэт – БНК** (старшынёй стаў былы дэпутат І Дзяржаўнай думы Р.А. Скірмунт, які меў рэпутацыю цвёрдага прыхільніка памешчыцкага землеўладання, што адмоўна адбівалася на папулярнасці камітэта сярод насельніцтва).

Унутрыпалітычныя спрэчкі абумовілі скліканне 8–10 ліпеня 1917 г. у Мінску 2-га з'езда беларускіх палітычных партый і арганізацый. Цэнтральным стала пытанне аб будучым статусе Беларусі. Пасля дыс-

кусіі дэлегаты з'езда пацвердзілі праграму дзяржаўна-палітычнай і нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Замест БНК абралі **Цэнтральную раду (ЦР)**. Сур'ёзным набыткам нацыянальнага руху з'явілася далучэнне да яго беларусаў-вайскоўцаў – сярод нацыянальных вайсковых арганізацый усё большую прыцягальнасць набывала ідэя стварэння воінскіх фарміраванняў па нацыянальна-тэрытарыяльнай прыкмеце. Для кіраўніцтва гэтай справай была выбрана **Цэнтральная беларуская вайсковая рада (ЦБВР)**.

У кастрычніку 1917 г. у Мінску на II сесіі ЦР была пераўтворана ў **Вялікую Беларускую Раду (ВБР)**, у склад якой увайшоў і выканкам ЦБВР. Старшынёй ВБР стаў В.А. Адамовіч, яго намеснікамі – А. Гарун (А.У. Прушынскі) і А.А. Смоліч. Меркавалася, што новая структура папоўніцца прадстаўнікамі ад гарадскіх дум, земстваў, нацыянальных меншасцей краю і стане зародкам вышэйшага органа ўлады аўтаномнай Беларусі.

У выніку **ўзброенага паўстання** 25–26 кастрычніка 1917 г., галоўным арганізатарам якога была партыя бальшавікоў на чале з У.І. Леніным (Ульянавым), а непасрэднае кіраўніцтва ажыццяўляў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Петраградскага Савета, Часовы ўрад быў звергнуты. 25–27 кастрычніка адбыўся **II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў**, на якім быў выбраны вышэйшы орган савецкай улады – **Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (УЦВК)**, і сфарміраваны першы савецкі ўрад – **Савет народных камісараў (СНК)** на чале з У.І. Леніным.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі разгарнулася вострая барацьба паміж бальшавікамі і іх праціўнікамі. У лістападзе, пасля канчатковай перамогі над **Камітэтам выратавання рэвалюцыі** (падтрымліваў былы Часовы ўрад), расійскія бальшавікі стварылі **Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняй вобласці** (Віцебская, Магілёўская і неакупаваныя паветы Мінскай і Віленскай губерняў). Ён стаў вышэйшым надзвычайным органам улады бальшавікоў у Беларусі і на фронце.

На неакупаванай немцамі частцы тэрыторыі Беларусі бальшавікі (выконваючы дырэктыву Цэнтральнага камітэта (ЦК) РСДРП (б) змагацца за сусветную сацыялістычную рэвалюцыю) захавалі своеасаблівае тэрытарыяльнае аб'яднанне, якое было ўтворана яшчэ вясной 1917 г. – Заходнюю вобласць і Заходні фронт. З 18 да 25 лістапада 1917 г. яны правялі ў Мінску адразу тры з'езды, якія пад кантролем бальшавікоў выказаліся за неабходнасць для Беларусі савецкай улады і заснавалі адзіны **Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах)**.

Беларускія нацыянальныя партыі ў гэты час актывізавалі дзейнасць па пошуках шляхоў самавызначэння Беларусі. Пры гэтым Вялікая Беларуская Рада не мела ні палітычных, ні вайсковых магчымасцей для змены ці звяржэння савецкай улады. Таму першапачаткова ВБР прызнала ленінскі ўрад у Петраградзе, але адмовілася прызнаваць легітымнасць Аблвыканкамзаха на чале з А.Ф. Мясніковым (гэты бальшавіцкі орган не падтрымліваў ідэі аўтаноміі Беларусі). У сярэдзіне лістапада 1917 г. Вялікая Беларуская Рада і Цэнтральная беларуская вайсковая рада выдалі адозву «Ко всему народу белорусскому», дзе заклікалі суайчыннікаў узяць кіраванне краем у свае рукі, дзеля чаго абвяшчалася скліканне ў снежні ў Мінску з'езда прадстаўнікоў усяго беларускага народа.

5 снежня 1917 г. у будынку Мінскага гарадскога тэатра павінен быў пачаць работу першы **Усебеларускі кангрэс (з'езд)**. На яго запрашаліся 1 872 дэлегаты, 1 167 з іх – з правам рашаючага голасу і 705 – дарадчага. Аднак на гэты час не ўсе дэлегаты прыехалі ў Мінск і Усебеларускі кангрэс быў афіцыйна адкрыты толькі вечарам 14 снежня.

На кангрэсе выявіліся розныя падыходы да дзяржаўнасці Беларусі. Дзейнічалі тры фракцыі: БСГ, беспартыйных і левай плыні. Працавала шэраг секцый і камісій: дзяржаўнага будаўніцтва, аграрная, асветы і культуры, вайсковая, фінансавая, мясцовых самакіраванняў, краёвай гаспадаркі, работніцкага заканадаўства і агульнага права, народнага здароўя, сацыяльнай апекі, рээвакуацыі бежанцаў, адбудовы краю. Кожная фракцыя, секцыя, камісія мелі свой прэзідыум у складзе старшыні, яго намесніка і сакратара. Усе гэтыя прэзідыумы сумесна з прэзідыумам кангрэса ўтварылі кіруючы орган – **Раду старэйшын** першага Усебеларускага кангрэса (з'езда).

Супрацьлеглыя праекты рэзалюцый, унесеныя ўдзельнікамі з'езда – ад поўнага суверэнітэту Беларусі да састаўной часткі ў складзе Расіі, не былі прыняты з'ездам. Кіраўніцтва з'езда прапанавала кампраміснае рашэнне: «...замацоўваючы сваё права на самавызначэнне, завяванае Расійскай рэвалюцыяй, і пацвярджаючы дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі дзеля захавання цэласнасці Беларусі ў складзе Расійскай Федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі, вылучыць са свайго складу орган краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў, якому ўручыць кіраванне Беларуссю аж да склікання Беларускага Устаноўчага Сходу».

Такім чынам, часовы вышэйшы орган улады – Усебеларускі савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, павінен быў замяніць існуючыя органы савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце. Убачыўшы, што перацягнуць на свой бок з'езд не ўдаецца, **Савет народных камісараў (СНК) Заходняй вобласці** на чале з К. Ландарам прыняў рашэнне яго разагнаць (абгрунтоўваў неабходнасцю абароны савецкай улады). У час разгону кангрэс утварыў выканаўчы орган – **Раду з'езда** (Усебеларускі

савет) на чале з Я. Лёсікам, якая перайшла на нелегальнае становішча. 21 снежня 1917 г. (3 студзеня 1918 г.) Рада Усебеларускага з'езда абрала са свайго складу выканаўчы камітэт з 10 чалавек. Рада выконвала функцыі передпарламента, выканкам першапачаткова з'яўляўся прабообразам урада Беларусі.

## 2. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі

18 лютага 1918 г. пачалося наступленне немцаў па ўсяму фронту і яны хутка занялі амаль усю тэрыторыю Беларусі. 19 лютага 1918 г. Аблвыканкамзах і СНК Заходняй вобласці і фронту пераехалі з Мінска ў Смаленск.

Пасля таго як савецкія войскі пакінулі Мінск, а германскія яшчэ не ўступілі ў горад, выйшаў з падполля выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда. 21 лютага 1918 г. ён звярнуўся да беларускага народа з **1-й Устаўной граматай**, у якой аб'явіў сябе ўладай у Беларусі. З прадстаўнікоў сацыялістычных партый быў сфарміраваны першы беларускі ўрад – **Народны сакратарыят** на чале з Я.Я. Варонкам. Народны сакратарыят павінен быў стаць часовым выканаўча-распараджальным органам.

Калі нямецкая армія ў канцы лютага 1918 г. поўнасцю заняла Мінск, імкненні Народнага сакратарыята аб прызнанні і падтрымцы з боку ўрада Германіі былі адхілены. 3-га сакавіка 1918 г. у Брэсце паміж савецкай Расіяй і Германіяй разам з яе саюзнікамі быў падпісаны трактат аб міры. Па гэтай дамове юрыдычна і рэальна этнічная тэрыторыя беларусаў была падзелена на тры часткі: Заходняя частка (Гарадзенская і частка Віленскай губерняў з Вільняй) – непасрэдна была далучана да Германіі і атрымала назву «Новая Усходняя Прусія»; Цэнтральная частка (Мінская, часткова Віцебская і Магілёўская губерні) лічылася часова акупаванай немцамі тэрыторыяй; Усходняя частка (часткова Віцебская і Магілёўская губерні) – заставалася ў складзе Савецкай Расіі. 9 сакавіка 1918 г. выканкам Рады Усебеларускага з'езда ў адказ на Брэсцкі мір, які дзяліў тэрыторыю Беларусі паміж Расіяй і Германіяй, выдае **2-ю Устаўную грамату** да народаў Беларусі, якая з'яўляецца канстытуцыйнай. У ёй гаварылася пра ўтварэнне **Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР)** у межах рассялення і колькаснай перавагі беларусаў. Заканадаўчая ўлада павінна была належаць Устаноўчаму сойму, выбранаму на асновах агульнага, роўнага, простага, патаемнага і прапарцыянальнага выбарчага права, не зважаючы на род, народнасць і рэлігію. Выканаўчая і адміністрацыйная ўлада павінна была належаць прызначанаму Радай з'езда Народнаму Сакратарыяту, які ёй падсправаздачны. У Грамаце сцвярджаліся сацыялістычныя прынцыпы, замацоўваліся правы нацыянальных груп.

Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда быў перайменаваны ў **Раду БНР**, у склад якой увайшлі вядомыя дзеячы беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, у тым ліку Я.Ю. Лёсік, А.А. Смоліч, Б.А. Тарашкевіч, С.М. Рак-Міхайлоўскі, В.Ю. Ластоўскі, А.І. Луцкевіч, І.І. Луцкевіч і інш. У партыйных адносінах Рада складалася з прадстаўнікоў розных партый, якія ў большасці выступілі супраць Кастрычніцкай рэвалюцыі, але не ўсе падтрымалі поўнае аддзяленне Беларусі ад Расіі і ўтварэнне беларускай нацыянальнай дзяржавы. Тым не менш згодна з **3-й Устаўной граматай**, якая была выдадзена 25 сакавіка 1918 г., БНР абвяшчалася «незалежнай і вольнай дзяржавай». Аднак гэтая дэкларацыя засталася нерэалізаванай – БНР была абвешчана ў вельмі неспрыяльных умовах, у час нямецкай акупацыі.

Лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. у Германіі змяніла знешнепалітычную сітуацыю для савецкай Расіі і Беларусі. У.І. Ленін дэнансаваў Брэсцкі мірны дагавор. Армія інтэрвентаў пакідала Беларусь, а Чырвоная Армія пачала наступ. 10 снежня 1918 г. чырвонаармейцы занялі Мінск, а 5 студзеня 1919 г. – Вільню. Савецкая Расія не прызнала незалежнасці Беларусі. Урад БНР накіраваўся ў эміграцыю.

## 3. Абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі 1 студзеня 1919 г. і Літоўска-Беларускай ССР у лютым 1919 г.

Урад РСФСР у «Дэкларацыі правоў народаў Расіі» абвясціў роўнасць і суверэннасць усіх народаў Расіі і іх права на самавызначэнне аж но да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў. У.І. Ленін удакладняў, што такое права нацыям будзе прадастаўляцца толькі тады, калі гэта карысна інтарэсам сацыялістычнай рэвалюцыі.

Цэнтральнаму кіраўніцтву – Палітбюро ЦК РКП(б) і СНК РСФСР – былі вядомы розныя падыходы сярод мясцовых бальшавікоў з Беларусі да праблемы беларускай дзяржаўнасці. У аснове падыходу кіраўнікоў **Аблвыканкамзаха** (А.Ф. Мяснікоў і інш.) – непрызнанне беларусаў як самабытнага этнасу, адмаўленне яго права на дзяржаўнасць. Другія погляды адлюстроўваў **Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам)** на чале з А.Р. Чарвяковым, які быў створаны з бежанцаў – бальшавікоў пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей. Камуністы-беларусы, якія ўваходзілі ў склад Белнацкама і белсекцый РКП(б) у г. Маскве і Петраградзе, з моманту вызвалення беларускіх зямель ад нямецкай акупацыі пачалі ставіць перад ЦК РКП(б) і ўладамі Заходняй вобласці пытанне аб утварэнні савецкай беларускай рэспублікі. Спачатку першыя на такія звароты ніяк не рэагавалі, а другія – кіраўніцтва Аблвыканкамзаха – лічылі, што існаванне нацыянальных рэспублік раз'ядноўвае сілы працоўных і наносіць шкоду інтарэсам сусветнай рэвалюцыі.

Паступова, з прасоўваннем бальшавіцкіх войскаў на захад, пад юрысдыкцыю савецкай улады адыходзілі новыя тэрыторыі, у сувязі з чым вялікую актуальнасць набывала пытанне аб форме і характары дзяржаўнай улады на вызваленых землях. У снежні 1918 г. у Маскве адбылося юрыдычнае афармленне **Заходняй вобласці (Камуны)** як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі РСФСР (у складзе 5 губерняў: Віцебскай, Смаленскай, Магілёўскай, Мінскай і Гарадзенскай).

Становішча рэзка змянілася, калі ў адноўленай Польшчы да ўлады прыйшлі не бальшавікі, а сілы, якія пры падтрымцы Антанты і ЗША ўзялі курс на аднаўленне Рэчы Паспалітай, што азначала канфрантацыю з Савецкай Расіяй. У гэтых абставінах ЦК РКП(б) прыйшлося тэрмінова выпрацоўваць новую палітыку – палітыку абароны. Было прызнана неабходным стварэнне ўздоўж заходняй граніцы РСФСР бар'ера з фармальна незалежных савецкіх рэспублік. Палітбюро ЦК РКП(б) і СНК Савецкай Расіі 25 снежня 1918 г. прынялі рашэнне аб утварэнні БССР. На аснове рашэння Палітбюро ЦК РКП(б) і СНК РСФСР народны камісар па справах нацыянальнасцей І.В. Сталін 27 снежня 1918 г. падпісаў дырэктыву аб практычных мерапрыемствах утварэння БССР (вызначаўся склад урада; адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел і межы). Пытанне аб утварэнні савецкай беларускай дзяржаўнасці вырашалася ЦК РКП(б) і Наркаматам па справах нацыянальнасцей Савецкай Расіі з улікам геапалітычнага становішча і ваенна-палітычнай тактыкі.

30–31 снежня 1918 г. у Смаленску адбыўся I з'езд Кампартыі Беларусі (КП(б)Б). Была прынята рэзалюцыя аб стварэнні савецкай дзяржавы ў Беларусі, планаваўся новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел – рэспубліка падзялялася на 7 раёнаў (Мінскі, Смаленскі, Віцебскі, Магілёўскі, Гомельскі, Гродзенскі і Баранавіцкі) і 54 падраёны. Старшынёй Цэнтральнага бюро КП(б)Б стаў А.Р. Мяснікоў. У снежні 1918 г. утвораны **Часовы рабоча-сялянскі ўрад**, які ўзначаліў З. Жылуновіч (Ц. Гартны). У складзе ўрада былі ўтвораны Прэзідыум, Упраўленне Справамі, Сакратарыят. Пастановай №1 Часовага ўрада абвяшчалася аб скасаванні Аблвыканкамзаха і Мінскага губрэўкама і аб пераходзе іх функцый да Часовага ўрада і яго камісарыятаў. У ноч з **1 на 2 студзеня 1919 г.** у Смаленску быў падпісаны **Маніфест** Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, які абвясціў пра прыналежнасць усёй улады ў Беларусі **Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў**. Абвяшчалася таксама аб стварэнні Беларускай Савецкай Рэспублікі. Сталіцай новай рэспублікі стаў г. Мінск, куды першы савецкі ўрад пераехаў 5 студзеня 1919 г.

2–3 лютага 1919 г. у Мінску працаваў **I Усебеларускі з'езд Саветаў**. Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), на ім была прынята першая Канстытуцыя, якая юрыдычна замацавала новую назву дзяржавы – **Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь (ССРБ)**.



Пад ціскам ЦК РКП(б) з'езд прыняў Дэкларацыю аб аб'яднанні Беларусі і Літвы ў адзіную савецкую рэспубліку і пагадзіўся з вылучэннем Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерняў са складу ССРБ у склад РСФСР. Аб'яднанне ў **Літоўска-Беларускую (Літбел) ССР** адбылося 27 лютага 1919 г. паводле пастаноў Цэнтральных выканаўчых камітэтаў (ЦВК) абедзвюх савецкіх рэспублік. Літбел са сталіцай у Вільні ахоплівала Віленскую, Мінскую і Гарадзенскую губерні. Галоўнай знешняй і ваенна-палітычнай праблемай Літоўска-Беларускай ССР было прадухіленне вайны з Польшчай, аднак гэтая задача не была выканана. У ліпені 1919 г. у сувязі з тым, што польскія войскі акупавалі тры чвэрці тэрыторыі Беларусі і Літвы, Літбел фактычна спыніла сваё існаванне. Юрыдычна яна была ліквідавана пасля падпісання мірнага дагавора паміж РСФСР і Літвой ад 12 ліпеня 1920 г. і другога абвяшчэння ССРБ.

## 4. Польска-савецкая вайна. Другое абвяшчэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Геапалітычныя змены на міжнароднай арэне прывялі да адраджэння дзяржаўнасці Польшчы, якая прэтэндавала на старадаўнія межы Рэчы Паспалітай. 14 лютага 1919 г. адбылася першая польска-савецкая сутычка каля Бярозы-Картузскай, якая паклала пачатак вайне. Знясіленая Грамадзянскай вайной Чырвоная Армія не магла наладзіць сур'ёзнага супраціўлення добра ўзброенаму за кошт Антанты польскаму войску, таму наступленне палякаў ажыццяўлялася паспяхова. 19 красавіка 1919 г. польскія вайсковыя злучэнні захапілі Вільню, а 8 жніўня – Мінск. Польскае войска прасунулася да р. Бярэзіны (на лінію Любань – Барысаў – Полацк – Дзвінск), і тут фронт стабілізаваўся да вясны 1920 г. Большасць беларускіх зямель трапіла пад польскую акупацыю.

Занятымі беларускімі тэрыторыямі кіраваў **Генеральны камісарыят усходніх зямель**, створаны пры штабе Літоўска-Беларускага фронту. Польскія ўлады разагналі сялянскія рады (мясцовыя органы самакіравання, якія ўзніклі пры нямецкай акупацыі). Захопленыя беларускія землі дзяліліся на чатыры акругі – Брэсцкую, Валынскую, Віленскую і Мінскую, а тыя – на паветы на чале са старастамі. Грамадзянская акупацыйная адміністрацыя ва ўсім падпарадкоўвалася ваеннаму кіраўніцтву і самастойнага значэння практычна не мела.

У пачатку сакавіка 1920 г. змянілася ваенна-палітычная сітуацыя на польска-савецкім фронце – войскі Польшчы пачалі ваенныя дзеянні на

Палессі і захапілі Мазыр, Рэчыцу, Калінкавічы. 25 красавіка наступленне пачалося і на Украіне. Польскі фронт стаў для Савецкай Расіі рашаючым, а вайна з Польшчай – «цэнтральнай задачай». Распрацаваны Рэўваенсаветам рэспублікі стратэгічны план ваенных дзеянняў Чырвонай Арміі прадугледжваў, што галоўны ўдар нанясуць войскі Заходняга фронту ў Беларусі. У выніку наступлення Чырвонай Арміі польскія войскі панеслі вялікія страты. Стварылася рэальная магчымасць аднаўлення беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове.

Як і ў канцы 1918 г., беларускае пытанне звязвалася з палітычнай сітуацыяй у Еўропе і перспектывай сусветнай рэвалюцыі. Аднаўленне Беларускай савецкай рэспублікі мела вялікае значэнне – праз гэты факт Чырвоная Армія магла стаць у вачах польскага і іншых народаў вызваліцельніцай прыгнечаных нацый.

**31 ліпеня 1920 г.** Ваенрэўкам рэспублікі выдаў **«Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі»**. Дэкларацыя закранала тэрытарыяльнае пытанне толькі ў самых агульных рысах. Гэта тлумачыцца тым, што ў 1920 г. ССРБ аднаўлялася ў памеры толькі 6 паветаў Мінскай губерні (Мінскага, Барысаўскага, Ігуменскага (Чэрвеньскага), Слуцкага, Бабруйскага, Мазырскага). Насельніцтва рэспублікі складала 1,5 млн чалавек. Беларускія раёны Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў заставаліся ў РСФСР. Дакладнае вызначэнне заходняй мяжы рэспублікі было адкладзена да перамоў з Польшчай.

Дэкларацыя ад 31 ліпеня 1920 г., канстатуючы раўнапраўны характар узаемаадносін паміж ССРБ і РСФСР, заяўляла аб перадачы ССРБ «на ўвесь час рэвалюцыйных войнаў» сваіх узброеных сіл у распараджэнне адзінага камандавання ўсіх савецкіх рэспублік, якое ажыццяўлялася РСФСР. Па свайму статусу ССРБ, хаця і была абвешчана незалежнай дзяржавай, фактычна з'яўлялася аўтаномнай вобласцю РСФСР.

Чырвоная Армія працягвала наступленне і падышла да Варшавы. Аднак у ходзе Варшаўскай аперацыі ў канцы ліпеня – першай палове жніўня 1920 г. Чырвоная Армія пацярпела паражэнне. Польскія войскі пачалі наступленне, у выніку чаго занялі значную частку сучаснай тэрыторыі Беларусі. Далей адбыліся працяглыя перамовы паміж савецкім і польскім урадамі.

## 5. Станаўленне прававой сістэмы Савецкай Беларусі

На вызваленай ад польскіх войскаў тэрыторыі Беларусі атрымалі сілу законы РСФСР, загады камандавання Чырвонай Арміі. Адначасова з аднаўленнем савецкай улады пачала разгортвацца і праватворчая дзейнасць рэвалюцыйных камітэтаў (рэўкамаў) Беларусі, якая перш за ўсё ўвасобіла ў сабе рысы рэжыму «ваеннага камунізму».



**Канстытуцыя ССРБ** была прынята на I з'ездзе Саветаў Беларусі 3 лютага **1919 г.** і грунтавалася на Канстытуцыі РСФСР 1918 г. Канстытуцыя ўключала наступныя раздзелы: агульныя палажэнні; канструкцыю савецкай улады; пра герб і сцяг. Першую частку Канстытуцыі складала своеасаблівая прэамбула – ленінская Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатаванага народа. У першым раздзеле гаварылася аб асноўнай задачы савецкай дзяржавы на пераходны перыяд – «усталяванні дыктатуры гарадскога і сельскага пралетарыяту і бяднейшага сялянства ў выглядзе магутнай Савецкай улады».

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), у адпаведнасці з Канстытуцыяй ССРБ «канструкцыя савецкай улады» ўключала ў сябе толькі вышэйшыя органы: **з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Беларусі**, а ў перапынках паміж з'ездамі – **Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК)**, а таксама **Малы і Вялікі Прэзідыумы ЦВК**. Сістэма мясцовых органаў улады ў першай Канстытуцыі БССР не знайшла свайго юрыдычнага замацавання.

Канстытуцыя замацавала правы і абавязкі грамадзян рэспублікі. Артыкул 12 абвясціў працу абавязкам усіх грамадзян рэспублікі. Пры гэтым замацоўвалася, што «кіруючыся інтарэсамі працоўнага класа ў цэлым, ССРБ пазбаўляе некаторых асоб і асобныя групы правоў, якія выкарыстоўваюцца імі на шкоду інтарэсам сацыялістычнай рэвалюцыі». Апошні раздзел Канстытуцыі, які складаўся з двух артыкулаў, утрымліваў апісанне герба і сцяга ССРБ.

У прававых актах рэвалюцыйных камітэтаў (рэўкамаў) знайшла адлюстраванне барацьба супраць праціўнікаў савецкай улады, дэзерцірства, вінакурэння, разрабавання дзяржаўнай маёмасці. Значнае месца займалі юрыдычныя акты рэўкамаў, што тычыліся гаспадарчых пытанняў, нарыхтоўкі прадуктаў харчавання, дапамогі Чырвонай Арміі. У галіне ўрэгулявання зямельных адносін асобнае значэнне ўлады надавалі Тэзісам ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі па аграрным пытанні ад 24 мая 1920 г. (рэўкамы кіраваліся тэзісамі як дакументам, які меў сілу закона).

II Усебеларускі з'езд Саветаў, які быў скліканы ў Мінску з 13 па 17 снежня 1920 г., прыняў Дапаўненні да Канстытуцыі ССРБ 1919 г. Асноўная сутнасць Дапаўненняў зводзілася да стварэння **Савета Народных Камісараў (СНК)** – урада рэспублікі, які ўтвараўся ЦВК. Усяго было створана 15 наркаматаў: замежных спраў, ваенных спраў, унутраных спраў, асветы, харчавання, працы, аховы здароўя, земляробства, народнай сувязі, сацыяльнага забеспячэння, фінансаў, юстыцыі і інш. Такім чынам, упершыню ў

БССР быў створаны ўрад, аналагічны ўраду РСФСР. З'езд Саветаў згодна з Дапаўненнямі выбіраў ЦВК Беларусі, які з'яўляўся паміж з'ездамі Саветаў вышэйшым заканадаўчым, распарадчым і кантрольным органам ССРБ. Усе пастановы і рашэнні СНК, «якія маюць агульнапалітычнае значэнне, падлягалі разгляду і зацвярджэнню ЦВК», хоць у абодвух органаў быў агульны старшыня (да 1923 г.).

## Дадатковая літаратура


Круталевич, В.А. История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922) / В.А. Круталевич ; НАН Беларуси, Ин-т философии и права. – Минск, 1999. – 388 с. ; 2 изд. – Становление национальной державности (1917–1922 гг.) / В.А. Круталевич. – Минск : Право и экономика, 2003. – 592 с.

Рудовіч, С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 200 с.

Сідарэвіч, А. Беларуская Народная Рэспубліка / А. Сідарэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : энцыкл. давед. : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 1. – С. 384–390.

Трацццяк, С.А. Брэсцкі мір і грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі (лістапад 1917 – студзень 1919 г.) / С.А. Трацццяк ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 206 с.

Широков, А.Т. ЦИК Белорусской ССР в 1919–1936 гг. / А.Т. Широков. – Минск : Наука и техника, 1979. – 158 с.


## Пытанні для самакантролю

Як Першая сусветная вайна паўплывала на рэвалюцыйныя падзеі на тэрыторыі Беларусі?

Чаму становішча на тэрыторыі Беларусі пасля звяржэння царскага ўрада характарызуецца як троеўладдзе?

Якія палітычныя сілы актывізаваліся ў выніку перамогі Лютаўскай рэвалюцыі?

Калі ў Мінску адбыўся 1-ы з'езд беларускіх арганізацый і якая каардынацыйная ўстанова была на ім створана?

Хто кіраваў Вялікай Беларускай Радай (ВБР) у кастрычніку 1917 г.?

Які вышэйшы надзвычайны орган улады бальшавікоў у Беларусі і на фронце быў створаны адразу пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі?

Хто ўзначальваў абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту?

Калі Вялікая Беларуская Рада і Цэнтральная беларуская вайсковая рада выдалі адозву «Ко всему народу белорусскому», дзе абвяшчалася скліканне ў Мінску з'езда прадстаўнікоў усяго беларускага народа?



Чаму Першы Усебеларускі кангрэс (з'езд) быў разагнаны мясцовай бальшавіцкай уладай у Беларусі?

Хто ўвайшоў у склад і ўзначаліў першы беларускі ўрад – Народны сакратарыят?

Рэакцыяй на якую міжнародную падзею стала выданне 9 сакавіка 1918 г. выканкамам Рады Усебеларускага з'езда 2-й Устаўной граматы да народаў Беларусі, у якой гаварылася пра ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі?

Калі згодна з 3-й Устаўной граматай БНР абвяшчалася «незалежнай і вольнай дзяржавай»?

Чаму ўрад БНР накіраваўся ў эміграцыю ў канцы 1918 г.?

Якія падыходы да праблемы беларускай дзяржаўнасці былі ў прадстаўнікоў Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама) на чале з А.Р. Чарвяковым?

Па якой прычыне ЦК РКП(б) прыйшлося выпрацоўваць палітыку абароны і прызнаць неабходным стварыць уздоўж заходняй граніцы РСФСР бар'ера з фармальна незалежных савецкіх рэспублік?

Дзе і калі адбыўся I з'езд Кампартыі Беларусі (КП(б)Б)?

Калі быў абнародаваны Маніфест аб абвяшчэнні Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі?

Па якіх прычынах кіраўніцтва партыі бальшавікоў на I Усебеларускім з'ездзе Саветаў 2–3 лютага 1919 г. аб'яднала Беларусь і Літву ў адзіную савецкую рэспубліку?

У выніку якіх падзей большасць беларускіх зямель трапіла пад польскую акупацыю?

На якія чатыры акругі падзялілі захопленыя беларускія землі польскія ўлады?

Якую дэкларацыю Ваенрэўкам Беларусі выдаў 31 ліпеня 1920 г.?

Калі была прынята першая Канстытуцыя ССРБ і што было яе асноўнай крыніцай?

Якія вышэйшыя органы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй ССРБ уключала «канструкцыя савецкай улады»?

У чым асноўная сутнасць Дапаўненняў да Канстытуцыі ССРБ 1919 г., якія былі прыняты II Усебеларускім з'ездам Саветаў у 1920 г.?

## Тэсты

1. Калі адбыўся I Усебеларускі з'езд?

а) снежань 1917 г.;
б) снежань 1918 г.;
в) 2–3 лютага 1919 г.;
г) 18 сакавіка 1921 г.

2. Калі адбыўся I Усебеларускі з'езд Саветаў?

а) снежань 1917 г.;

б) снежань 1918 г.;
в) 2–3 лютага 1919 г.;
г) 18 сакавіка 1921 г.

3. Палітыка германскіх улад у дачыненні да ўрада БНР вызначалася:
а) умовамі Брэсцкага міру;
б) патрэбамі арганізаваць грамадзянскую адміністрацыю на акупаваных тэрыторыях;
в) неабходнасцю ператварыць акупаваныя тэрыторыі ў сыравінны прыдатак Германіі.

4. У адпаведнасці з умовамі Рыжскага мірнага дагавора:
а) да Польшчы адыходзіла Заходняя Беларусь;
б) Польшча абяцала стварыць умовы для нацыянальнага развіцця беларускай нацыянальнай меншасці;
в) Заходняя Беларусь уз'ядналася з БССР;
г) Заходняя Беларусь стала незалежнай краінай.

5. Намінальна абвяшчэнне БССР у 1919 г. адбылося:
а) у межах этнічнага рассялення беларусаў;
б) у межах неакупаваных беларускіх губерняў;
в) у межах Мінскай і Гродзенскай губерняў.

6. 27 кастрычніка 1917 г. улада ў Мінску перайшла ў рукі:
а) Петраградскага ВРК;
б) Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў;
в) Камітэта выратавання рэвалюцыі.

7. У адпаведнасці з 23 артыкулам II раздзела Канстытуцыі БССР 1919 г. вышэйшым органам Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) з'яўляўся Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК) Беларусі, які быў:
а) заканадаўчым органам ССРБ;
б) распарадчым і кантралюючым органам ССРБ;
в) судовым органам ССРБ.

8. Кіраўніком аднаўленай у 1920 г. БССР стаў:
а) У.М. Ігнатоўскі;
б) А.Р. Чарвякоў;
в) В.Г. Кнорын.

9. Які орган савецкай улады ў 1917 г. выступіў супраць беларускага нацыянальнага дзяржаўнага самавызначэння, паколькі яго лідары прытрымліваліся ідэі стварэння адзінай савецкай дзяржавы?
а) Выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах);
б) Вялікая Беларуская Рада;
в) Народны сакратарыят;
г) Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.



10. Які прававы акт Беларускай Народнай Рэспублікі абвясціў незалежнасць БНР?
а) 2-я Устаўная (статутная) грамата ад 9 сакавіка 1918 г.;
б) 3-я Устаўная (статутная) грамата ад 25 сакавіка 1918 г.;
в) Статут Рады БНР ад 11 кастрычніка 1918 г.

**Заданні**

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: Уладзімір Ленін, Аляксандр Мяснікоў, Вацлаў Ластоўскі, Зміцер Жылуновіч?








2. Вызначце на карце, у якіх межах была абвешчана ў 1918 г. БНР.

3. Вызначце на карце тэрыторыю БССР і Літбел, абвешчаных у 1919 г.

### Прыкладныя тэмы рэфератаў

Беларускі нацыянальны рух на тэрыторыі Беларусі, акупаванай Германіяй. Дзейнасць Віленскай беларускай рады.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г.

Усталяванне савецкай улады на неакупаванай войскамі Германіі частцы Беларусі.

Рада Усебеларускага з'езда і яе выканаўчы камітэт.

Устаўныя граматы БНР і іх гісторыка-прававы аналіз.

Фарміраванне і склад першага Часовага рабоча-сялянскага ўрада ССРБ.

Вышэйшыя і мясцовыя органы савецкай улады Літбел.

Праваахоўныя органы ССРБ і прававое рэгуляванне іх дзейнасці ў 1919–1922 гг.

Увядзенне ў дзеянне на тэрыторыі ССРБ заканадаўчых актаў РСФСР – Крымінальнага кодэкса 1922 г., Крымінальнага працэсуальнага кодэкса 1922 г., Кодэкса законаў аб працы 1922 г.

Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі і Беларусі.

Троеўладдзе ў Беларусі.

Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту, яго Прэзідыум і Савет Народных Камісараў: састаў, кампетэнцыя і дзейнасць.

Брэст-Літоўскі мірны дагавор: гісторыка-прававая ацэнка.

Першы ўрад Беларусі (Народны сакратарыят) і яго дзейнасць.

Ліквідацыя ССРБ і ўтварэнне Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (Літбел).

Адказы на тэсты: 1 – а); 2 – в); 3 – а); 4 – а), б); 5 – а); 6 – в); 7 – а), б); 8 – б); 9 – а); 10 – б).



# ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ І ПРАВА БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ Ў СКЛАДЗЕ САЮЗА САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК (1922–1939 гг.)

**Пытанні тэмы**

*1. Уваходжанне БССР у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.*

*2. Грамадскі лад БССР у 1922–1939 гг.*

*3. Дзяржаўны лад БССР у 1922–1939 гг.*

*4. Прававая сістэма БССР у 1922–1939 гг.*

## 1. Уваходжанне БССР у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Праца па ўтварэнні адзінай савецкай дзяржавы пачалася яшчэ ў Грамадзянскую вайну і была абумоўлена шэрагам прычын. У свой час тэрыторыі савецкіх рэспублік, што ўвайшлі потым у СССР, знаходзіліся ў межах адной імперыі. Паміж імі існавалі цесныя сацыяльныя і эканамічныя сувязі. Складаныя ваенна-палітычныя абставіны, якія ўзніклі ў гады Грамадзянскай вайны, таксама патрабавалі аб'яднання намаганняў для захавання савецкай улады.

У першыя пасляваенныя гады ўзаемаадносіны РСФСР з іншымі савецкімі рэспублікамі будаваліся на падставе двухбаковых дагавораў аб супрацоўніцтве. 16 студзеня 1921 г. быў падпісаны «Союзный рабоче-крестьянский договор между РСФСР и Социалистической Советской Республикой Белоруссией». У дагаворы існавала супярэчнасць – з аднаго боку, урады РСФСР і ССРБ прызнавалі «независимость и суверенность каждой из договаривающихся сторон», з другога – насуперак гэтаму галоўнаму прынцыпу дакумент ставіў ССРБ фактычна ў становішча

аўтаноміі РСФСР. 21 студзеня 1922 г. былі прыняты дэкрэт Прэзідыума ЦВК ССРБ «О силе для ССРБ декретов и распоряжений РСФСР», а 24 чэрвеня 1922 г. – пастанова III сесіі ЦВК ССРБ «О распространении действия Уголовного Кодекса РСФСР на территорию ССР Белоруссии».

Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што абвяшчэнню СССР папярэднічала пераходная форма дзяржаўнага саюза з рысамі, больш характэрнымі для канфедэрацыі, чым федэрацыі. Аднак такая форма дзяржаўнага аб'яднання не магла задаволіць ЦК РКП(б) і савецкі ўрад, паколькі ўскладняла палітычнае і гаспадарчае кіраванне краінай. Супярэчлівасць існуючых федэратыўных формаў была відавочнай: нацыянальныя савецкія рэспублікі (УССР, БССР і інш.) па свайму дэклараванаму статусу – незалежныя, суверэнныя дзяржавы, аднак функцыі цэнтралізаванага кіраўніцтва важнейшымі сферамі дзяржаўнага жыцця ажыццяўляліся праз народныя камісарыяты і Вышэйшы савет народнай гаспадаркі РСФСР. Прававой асновай было адпаведнае заканадаўства РСФСР, якое мела сілу ва ўсіх рэспубліках. На зыходзе Грамадзянскай вайны сама логіка дзяржаўнага будаўніцтва падводзіла да неабходнасці больш дакладнай урэгуляванасці саюзных адносін, да пераходу да *новага этапу* дзяржаўнага будаўніцтва – аб'яднання рэспублік у адзіную дзяржаву з агульнымі для ўсіх рэспублік канстытуцыйнымі органамі ўлады і кіравання.

*Падрыхтоўчая праца* і абмеркаванне прынцыпаў, на якіх павінны былі грунтавацца ўзаемаадносіны паміж савецкімі рэспублікамі ў адзінай дзяржаве, ішлі на працягу 1922 г. У Палітбюро ЦК РКП(б) назіраліся два асноўныя пункты гледжання наконт формы аб'яднання савецкіх рэспублік. Адзін пункт гледжання зыходзіў ад наркама па справах нацыянальнасцей І.В. Сталіна і атрымаў назву «Праект аўтанамізацыі». Па яму ўсе савецкія рэспублікі павінны ўвайсці ў склад РСФСР на правах аўтаноміі. У сутнасці гэты праект адлюстроўваў рэальнае становішча спраў, якое склалася на той час. Такі праект падтрымлівалі многія партыйна-савецкія работнікі на месцах. Напрыклад, сакратар ЦБ КП(б)Б В.Г. Кнорын пасля другога абвяшчэння ССРБ 31 ліпеня 1920 г. падкрэсліваў, што Беларусь вызначылася як Савецкая Рэспубліка, якая ўваходзіла ў Расійскую Федэрацыю, і такой яна будзе.

Другі пункт належаў старшыні СНК У.І. Леніну і вядомы як «Праект федэралізацыі», ці «Саюзны праект». У.І. Ленін разумеў, што «аўтанамізацыя» можа выклікаць адкрытую, а яшчэ больш скрытую незадаволенасць былых ускраін Расіі і прывесці да расколу ў сацыялістычным лагеры. Каб гэтага пазбегнуць, ён прапаноўвае РСФСР прызнаць сябе раўнапраўнымі з Украінскай ССР і інш., і разам і нараўне з імі ўвайсці ў



новы саюз, новую фэдерацыю – Саюз Савецкіх Рэспублік Еўропы і Азіі. Ідэя ўтварэння Саюза рэспублік, выпрацаваная У.І. Леніным, хутка была падтрымана і кіраўнікамі савецкіх рэспублік, і большасцю кіраўніцтва партыі бальшавікоў.

ЦК РКП(б) стварыў спецыяльную камісію для распрацоўкі праектаў дакументаў з мэтай афармлення СССР. 30 снежня 1922 г. у Маскве адбыўся I з'езд саветаў СССР, які прыняў Дэкларацыю аб утварэнні СССР і Саюзны дагавор. З'езд аб'яднаў РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР у адзіны **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**. З'езд выбраў ЦВК СССР прапарцыянальна колькасці насельніцтва рэспублік. У склад ЦВК СССР увайшлі: ад РСФСР – 270 членаў, УССР – 88, ЗСФСР – 26, БССР – 7.

Важнай задачай стала распрацоўка саюзнай Канстытуцыі. 10 студзеня 1923 г. Прэзідыум ЦВК СССР утварыў канстытуцыйную камісію з 13 чалавек (пазней давёў яе колькасць да 25 чалавек: 14 ад РСФСР, 5 – ад УССР і па 3 – ад ЗСФСР і БССР). Праект Канстытуцыі СССР не прадугледжваў выключнага становішча РСФСР, а ўраўноўваў яе з іншымі саюзнымі рэспублікамі. У ліпені 1923 г. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР зацвердзіў тэкст Канстытуцыі. Затым Канстытуцыю ратыфікавалі (зацвердзілі) усе чатыры саюзныя рэспублікі: РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР. Канчатковы тэкст Канстытуцыі СССР зацвердзіў II Усесаюзны з'езд Саветаў **31 студзеня 1924 г.**

Асноўны Закон СССР па змесце і форме нязначна адрозніваўся ад Канстытуцыі РСФСР. Вышэйшыя органы ўлады РСФСР былі пераўтвораны ў вышэйшыя органы ўлады СССР, толькі з павелічэннем колькасці супрацоўнікаў і ўвядзеннем Савета Нацыянальнасцей у якасці другой палаты ЦВК СССР. У выніку **Усесаюзны ЦВК** стаў складацца з дзвюх палат: **Савета Саюза** (371 дэпутат, выбраны Усерасійскім з'ездам з прадстаўнікоў саюзных рэспублік прапарцыянальна колькасці іх насельніцтва) і **Савета Нацыянальнасцей** (131 дэпутат, па 5 ад кожнай саюзнай і аўтаномнай рэспублікі і па 1 ад кожнай аўтаномнай вобласці РСФСР, якія выбіраліся ЦВК рэспублікі ці вобласці).

Саюзная ўлада з улікам унутраных і знешніх абставін, характару і аб'ёму сфер кіравання павінна была ўзяць на сябе кіраўніцтва найбольш важнымі для федэрацыі напрамкамі дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Прынцыповыя пытанні федэратыўнай будовы былі вырашаны ў Дагаворы аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, прынятым I з'ездам Саветаў Саюза ССР у снежні 1922 г., а затым замацаваным з улікам папраўак і дапаўненняў у першай Канстытуцыі Саюза ССР (арт. 1). Выключнай прэрагатывай СССР было прадстаўніцтва Саюза ў

міжнародных адносінах; змяненне знешніх граніц Саюза, а таксама ўрэгуляванне пытанняў аб змяненні граніц паміж саюзнымі рэспублікамі; заключэнне дагавораў аб прыёме ў склад Саюза новых рэспублік; аб'яўленне вайны і заключэнне міру; заключэнне знешніх дзяржаўных пазык; ратыфікацыя міжнародных дагавораў; кіраўніцтва замежным гандлем і ўстанаўленне сістэм унутранага гандлю; кіраўніцтва транспартам і паштова-тэлеграфнай справай; зацвярджэнне адзінага Дзяржаўнага бюджэту СССР; арганізацыя і кіраўніцтва ўзброенымі сіламі Саюза; устанаўленне грашовай і крэдытнай сістэмы, а таксама сістэмы агульнасаюзных, рэспубліканскіх і мясцовых падаткаў; устанаўленне права агульнай амністыі; устанаўленне сістэмы мер і вагаў; выданне законаў аб працы, ахове народнага здароўя, асвеце, грамадзянскім і крымінальным заканадаўстве, судовым ладзе і судаводстве і шэраг іншых пытанняў. Паўнамоцтвы саюзных рэспублік знаходзілі адлюстраванне ў іх праве на ўдзел у заканатворчасці і ў кіраванні саюзнымі справамі.

Кіраўніцтва БССР цесна звязвала статус рэспублікі ў саюзнай дзяржаве з вырашэннем беларускага тэрытарыяльнага пытання. Перагляд граніц паміж БССР і РСФСР увайшоў у савецкую гісторыю як **узбуйненне БССР**. У 1924 г. у склад Беларускай ССР былі вернуты 15 паветаў і асобныя воласці Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў. У выніку тэрыторыя рэспублікі павялічылася больш чым у два разы, колькасць насельніцтва склала 4,2 млн чалавек. У 1926 г. да Беларускай ССР былі вернуты Гомельскі і Рэчыцкі паветы, што ўяўляла сабой важны этап у працэсе аб'яднання беларускай нацыі, які быў завершаны толькі ў верасні 1939 г.

## 2. Грамадскі лад БССР у 1922–1939 гг.

Зацвярджэнне палітычнай сістэмы, пераўтварэнні ў галіне эканомікі былі звязаны са складанымі працэсамі, якія адбываліся ў сацыяльнай сферы. Па заканчэнні Грамадзянскай вайны соцыум уяўляў сабой грамадства «разарваных» грамадскіх пластоў і сувязей. Кардынальна змянілася сацыяльная структура. Велізарнымі былі людскія страты – пачынаючы з 1914 г., яны ў цэлым па былой Расійскай імперыі склалі каля 20 млн чалавек; больш за 2 млн чалавек эмігравалі. Адбывалася ліквідацыя рэштак эксплуататарскіх класаў – дваранства, буржуазіі, чыноўніцтва, духавенства, афіцэрства, буржуазнай інтэлігенцыі. Скарацілася гарадское насельніцтва, колькасць прамысловых рабочых у вядучых індустрыяльных цэнтрах паменшылася ў 5–7 разоў, пачаўся працэс дэкласавання пралетарыяту – рабочыя вярталіся ў вёску да сялянскай працы. Белы і чырвоны тэрор, разруха, голад, эпідэміі спарадзілі масавую дзіцячую бездагляднасць (у 1922 г. налічвалася каля 7 млн бяздомных дзяцей), прывялі да рэзкага росту злачыннасці. Грамадства ў цэлым было стомлена ад вайны і ўзрушэнняў.



Пераход да **новай эканамічнай палітыкі (НЭП)** у 1921 г. быў станоўча ўспрыняты ў шырокіх слаях насельніцтва. Частка сялянства атрымала магчымасць развіваць уласную гаспадарку, аднаўленне прамысловасці і гандлю стварала новыя працоўныя месцы. Гэтую палітыку падтрымала і значная частка інтэлігенцыі.

Аднак у грамадстве меліся сацыяльныя сілы, якія не былі зацікаўлены ў НЭПе. Бальшавікі, імкнучыся *разбурыць старое дарэвалюцыйнае грамадства* і «расчысціць» месца для будаўніцтва *новага*, звярталіся да найбольш неадукаваных слаёў працоўнага класа і сялянства. Лозунгі сацыяльнай справядлівасці ўспрымаліся апошнімі як заклік да пераразмеркавання грамадскага багацця, трансфармаваліся ў іх свядомасці наступным чынам: «рабуй нарабаванае». Менавіта гэтыя сацыяльныя пласты негатыўна ставіліся да НЭПа, які прымушаў мірыцца з маёмаснымі адрозненнямі. Збяднелыя гараджане былі незадаволены захаваннем беспрацоўя і ростам цэн на прадукты харчавання. Значная частка сялянскай беднаты імкнулася палепшыць сваё становішча на аснове прынцыпу: «Адабраць і падзяліць». Гэтыя настроі былі моцныя таксама ў асяроддзі партыйных і савецкіх работнікаў.

З канца 1920-х і на працягу 1930-х гг. у сацыяльнай сферы набірае сілу тэндэнцыя выцяснення тых сацыяльных груп, якія не былі звязаны з дзяржаўнай або калектыўнай, кааператыўнай уласнасцю. Жорсткі падатковы прэс і рэпрэсіўныя меры прывялі да знікнення «нэпманаўскай» буржуазіі (уладальнікаў і арандатараў дробных і сярэдніх прамысловых прадпрыемстваў, прыватных гандляроў). У выніку палітыкі суцэльнай **калектывізацыі** і ліквідацыі кулацтва ў вёсцы зніклі сяляне-аднаасобнікі, сфарміравалася *калгаснае сялянства*.

Надзвычай важным працэсам, які адлюстроўвае структурныя змены савецкага грамадства ў 30-х гг. XX ст., стала рэзкае павелічэнне колькасці фабрычна-завадскіх рабочых, гарадскога насельніцтва ў выніку **індустрыялізацыі**. На працягу толькі першай пяцігодкі колькасць рабочых павялічылася ў некалькі разоў.

Гэтыя змены ў сацыяльнай сферы сведчылі аб пераходзе ад традыцыйнага да індустрыяльнага тыпу грамадства. Пад уплывам карэнных змен, якія адбываліся ў розных сферах грамадства, стаў складвацца новы тып асобы – **савецкі чалавек**.

## 3. Дзяржаўны лад БССР у 1922–1939 гг.

Пасля прыняцця агульнасаюзнага Асноўнага Закона ў адпаведнасць з ім павінны былі быць прыведзены Канстытуцыі ў саюзных рэспубліках. Праект Канстытуцыі БССР, які быў падрыхтаваны ў 1924–1925 гг. і замацоўваў шырокія паўнамоцтвы вышэйшых органаў рэспублікі, быў адхілены. На пачатку 1927 г. па рашэнні ЦК КП(б)Б была ўтворана новая канстытуцыйная камісія, якая падрыхтавала новы праект Канстытуцыі.

**Канстытуцыя БССР 1927 г.** замацоўвала палажэнне аб тым, што БССР з'яўляецца «сацыялістычнай дзяржавай дыктатуры пралетарыяту» (арт. 2), у якой ад імя пралетарыяту дыктатуру ажыццяўляе Камуністычная партыя бальшавікоў. Таму ўсе дзяржаўныя органы былі падпарадкаваны партыйным установам і павінны былі выконваць дырэктывы і пастановы партыйных з'ездаў, канферэнцый і іх выканаўчых органаў. Адбылося зліццё партыйнага і савецкага дзяржаўнага апарату. Усе важнейшыя пасады ў дзяржаўным апараце займалі толькі камуністы, якія зацвярджаліся ў партыйных камітэтах.

Абвяшчаліся розныя дэмакратычныя свабоды: сходаў, саюзаў, друку, рэлігійнай і антырэлігійнай прапаганды, але ў артыкуле 19 было запісана: «Кіруючыся інтарэсамі працоўных, Беларуская ССР пазбаўляе некаторых асоб і некаторыя групы асоб правоў, якімі яны карыстаюцца са шкодай для інтарэсаў сацыялістычнай рэвалюцыі». Права выбіраць і быць выбраным мелі грамадзяне БССР, якім да дня выбараў споўнілася 18 гадоў, але пазбаўляліся выбарчых правоў прадстаўнікі так званых эксплуататарскіх класаў.

Вышэйшым органам дзяржаўнай улады абвяшчаўся **Усебеларускі з'езд Саветаў**. У перыяд паміж з'ездамі вышэйшым органам улады з'яўляўся **Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК) БССР**. У перыяд паміж сесіямі ЦВК вышэйшым заканадаўчым, распарадчым і кантрольным органам улады БССР з'яўляўся **Прэзідыум ЦВК**, які выбіраўся на сесіі ЦВК БССР. Для непасрэднага кіравання асобнымі галінамі дзяржаўнай дзейнасці рэспублікі ЦВК БССР утварыў **Савет Народных Камісараў (СНК)**.

Органам улады ў межах акруг або раёнаў з'яўляліся акруговыя або раённыя з'езды **Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў**. Іх выканаўчымі органамі былі акруговыя або раённыя выканаўчыя камітэты, якія ў перыяд паміж з'ездамі Саветаў былі асноўнымі органамі ўлады на сваёй тэрыторыі, а для вырашэння бягучых спраў выбіралі прэзідыумы.

У сярэдзіне 1936 г. Пленум ЦК ВКП(б) і Прэзідыум ЦВК СССР адобрылі праект новай Канстытуцыі СССР. 5 снежня 1936 г. яна была прынята VIII Надзвычайным з'ездам Саветаў СССР. Яшчэ ў лістападзе 1936 г.



быў скліканы XII Надзвычайны з'езд Саветаў БССР, які абмяркоўваў праект Канстытуцыі СССР і вылучыў камісію па падрыхтоўцы праекта новай Канстытуцыі БССР. Яна была падрыхтавана ў адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР і паўтарала ўсе асноўныя палажэнні саюзнай Канстытуцыі.

**Канстытуцыя Беларускай ССР 1937 г.** складалася з 11 раздзелаў: 1) грамадскі лад; 2) дзяржаўны лад; 3) вышэйшыя органы дзяржаўнай улады БССР; 4) органы дзяржаўнага кіравання БССР; 5) мясцовыя органы дзяржаўнай улады; 6) бюджэт БССР; 7) суд і пракуратура; 8) асноўныя правы і абавязкі грамадзян; 9) выбарчая сістэма; 10) герб, сцяг, сталіца; 11) парадак змянення Канстытуцыі. Усяго ў Канстытуцыі было 122 артыкулы.

Па сваёй структуры і тэарэтычна-тэхнічнай распрацоўцы Канстытуцыя БССР 1937 г. была больш дасканалай, чым папярэдняя. У ёй была зроблена спроба адыходу ад прынцыпу «ўся ўлада Саветам» і *намечаны* пераход да падзелу ўлады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. *Заканадаўчая* ўлада належала **Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР**, а ў перыяд паміж яго сесіямі – **Прэзідыуму Вярхоўнага Савета БССР** (утвараліся *замест* Усебеларускага з'езда Саветаў, яго Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Прэзідыума ЦВК БССР). *Выканаўчая* ўлада канцэнтравалася ў **Савеце Народных Камісараў БССР**, што з'яўляўся вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам – **урадам** БССР.

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), карэнныя змены былі ўнесены ў выбарчую сістэму. Абвяшчалася, што выбары дэпутатаў ва ўсе Саветы дэпутатаў працоўных – Вярхоўны Савет БССР, акруговыя, раённыя, гарадскія, мястэчковыя, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных праводзяцца выбаршчыкамі на аснове *ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.*

Кіруючыя пасады ў **Камуністычнай партыі БССР** у міжваенны перыяд займалі: у якасці старшыні Цэнтральнага Бюро (ЦБ) – А.Ф. Мяснікоў (Мяснікян) (1919); у якасці адказнага сакратара ЦБ – Я. Генкін (1920–1921), В.Г. Кнорын (Кнорыньш) (1921–1922), В.А. Багуцкі (1922–1924), А.М. Асаткін-Уладзімерскі (1924), А.І.Крыніцкі (1924–1925); у якасці першага сакратара ЦК КПБ А.І. Крыніцкі (1925 – 1927), В.Г. Кнорын (Кнорыньш) (1927–1928), Я.Б. Гамарнік (1928–1929), К.В. Гай (1930–1932), М.Ф. Гікала (1932–1937), В.Ф. Шаранговіч (1937), А.А. Волкаў (1937–1938), П.К. Панамарэнка (1938–1947). Старшынямі Савета народных камісараў БССР у гэты час былі А.Р. Чарвякоў (1920–1924), Я.А. Адамо́віч (1924–1927), М.М. Галадзед (1927–1937), Д.І. Валковіч (1937), А.Ф. Кавалёў (1938–1939) і К.В. Кісялёў (1938–1940).

Вызначальнай асаблівасцю грамадска-палітычнага жыцця створанай бальшавікамі дзяржавы з'яўлялася іх імкненне да адзінаўладдзя. Фактычна была ўстаноўлена дыктатура не пралетарыяту, а дыктатура партыі бальшавікоў. Усталяванне партыйнай дыктатуры перапляталася з мэтанакіраваным фарміраваннем культу асобы генеральнага сакратара ЦК ВКП(б) І.В. Сталіна. Кампартыя стала адзінай палітычнай арганізацыяй, што ажыццяўляла кіраўніцтва ўсімі бакамі сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. Адмоўным вынікам усталявання аднапартыйнасці з'явілася поўная ўседазволенасць і бескантрольнасць вышэйшага партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва ў вырашэнні фактычна ўсіх праблем жыцця краіны. Самай трагічнай праявай савецкай рэчаіснасці 30-х гг. XX ст. стала правядзенне пад надуманымі матывамі пазасудовых рэпрэсій сярод розных груп насельніцтва.

## 4. Прававая сістэма БССР у 1922–1939 гг.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі было ліквідавана адміністрацыйнае, грамадзянскае і крымінальнае права былой Расійскай дзяржавы і адменены ўсе прывілеі раней пануючых класаў. У бальшавіцкіх Дэкрэце аб міру, Дэкрэце аб зямлі, Дэкларацыі правоў народаў Расіі і іншых актах пачало ўсталёўвацца новае **канстытуцыйнае** права. Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), у першыя паслярэвалюцыйныя гады на тэрыторыі БССР працягвалі карыстацца нарматыўнымі актамі РСФСР, бо фактычна БССР разглядалася як частка РСФСР. Так, у Дапаўненнях да Канстытуцыі ССРБ, прынятых на II з'ездзе Саветаў ССРБ, указвалася адносна савецкага будаўніцтва кіравацца Канстытуцыяй РСФСР і пастановамі VII Усерасійскага з'езда Саветаў. Дэкрэтам Прэзідыума ЦВК ССРБ ад 24 студзеня 1922 г. «Аб сіле для ССРБ дэкрэтаў і распараджэнняў РСФСР» было завершана пачатковае будаўніцтва прававой базы дзейнасці вышэйшых і мясцовых органаў дзяржаўнай улады ў рэспубліцы.

Станаўленне і развіццё новага **грамадзянскага права** было звязана з новай эканамічнай палітыкай, з дапушчэннем прыватнай уласнасці на невялікія прамысловыя прадпрыемствы і прыватны гандаль. У маі 1922 г. Усерасійскі ЦВК прыняў «Декрет об основных частных имущественных правах, признаваемых РСФСР, охраняемых ее законами и защищаемых судами РСФСР», які ў жніўні 1922 г. быў распараджэннем СНК ССРБ уведзены ў дзеянне на тэрыторыі ССРБ. Гэты дэкрэт замацаваў права прыватнай уласнасці грамадзян на невялікія прамысловыя прадпрыемствы, домаўладанні; дапускалася права спадчыны



(да 10 тыс. руб.). Дэкрэт паслужыў асновай пры распрацоўцы *першага* Грамадзянскага кодэкса РСФСР, які быў прыняты 31 красавіка 1922 г. Пастановай Прэзідыума ЦВК БССР ад 2 лютага 1923 г. Грамадзянскі кодэкс РСФСР уводзіўся ў дзеянне з 1 сакавіка на тэрыторыі БССР і стаў разглядацца як ГК БССР. У нормах Грамадзянскага кодэкса юрыдычна замацоўвалася новая эканамічная палітыка, акрэсліваліся межы, у якіх дзяржава дапускала развіццё капіталістычных элементаў.

Першымі актамі **грамадзянска-працэсуальнага права**, якімі карысталіся ў БССР, былі акты РСФСР аб судовым ладзе і інструкцыі Наркамюста РСФСР. У сярэдзіне 1923 г. Усерасійскі ЦВК зацвердзіў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс РСФСР, які пастановай ЦВК БССР ад 26 ліпеня 1923 г. быў уведзены ў дзеянне на тэрыторыі БССР.

Пасля вяртання ў састаў БССР усходніх раёнаў узнікла неабходнасць увядзення адзінага зямельнага заканадаўства для ўсёй рэспублікі. З гэтай мэтай у 1925 г. быў выдадзены Зямельны кодэкс БССР.

**Крымінальнае права** ССРБ у 1919–1921 гг. грунтавалася не на законе, а на рэвалюцыйнай самасвядомасці супрацоўнікаў рэвалюцыйных камітэтаў, трыбуналаў, Усерасійскай Надзвычайнай Камісіі і яе мясцовых органаў, судоў і іншых карных устаноў. З пераходам да НЭПа ўзнікла неабходнасць стварэння прававой асновы ў крымінальным праве. У маі 1922 г. у Расіі быў прыняты Крымінальны кодэкс РСФСР. ЦВК ССРБ без змен увёў у дзеянне гэты кодэкс у БССР з 1 ліпеня 1922 г. Кодэкс прадугледжваў павышаную адказнасць за контррэвалюцыйныя злачынствы, а таксама за дызерцірства і сабатаж.

Пасля ўтварэння СССР заканадаўства БССР развівалася пад уздзеяннем агульнасаюзнага заканадаўства. У 1925 г. пачалася праца па падрыхтоўцы праекта новага Крымінальнага кодэкса БССР, які быў прыняты ЦВК БССР у верасні 1928 г. і ўведзены ў дзеянне з 15 лістапада 1928 г. Адначасова з крымінальным правам развівалася і крымінальна-працэсуальнае права. Летам 1922 г. ЦВК ССРБ сваёй пастановай увёў у дзеянне на тэрыторыі БССР Крымінальна-працэсуальны кодэкс РСФСР.

Скасаванне палітыкі НЭПа і пераход да індустрыялізацыі з канца 1920-х гг. суправаджаліся парушэннем грамадзянскіх правоў, ліквідацыяй прыватных прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў, прымусовай калектывізацыяй сялянскіх гаспадарак. У сувязі з гэтым былі ўнесены значныя змены ў Грамадзянскі і Грамадзянска-працэсуальны кодэксы БССР. У 30-х гг. адбыліся змены ў іншых галінах права. Пачалася больш жорсткая цэнтралізацыя і бюракратызацыя дзяржаўнага апарату, абмежаванне правоў саюзных рэспублік у заканатворчасці.

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), у гэты перыяд крымінальнае права набывае агульнасаюзны

характар. У беларускі Крымінальны кодэкс уносяцца толькі тыя артыкулы, што папярэдне былі прыняты вышэйшымі партыйнымі і дзяржаўнымі органамі СССР. У 30-я гг. XX ст. прымаюцца самыя жорсткія законы, накіраваныя супраць «ворагаў народа», «шкоднікаў» і «раскрадальнікаў» сацыялістычнай маёмасці. Крымінальнае права БССР, замацаванае ў Крымінальным кодэксе 1928 г., з пачаткам калектывізацыі мянялася ў адпаведнасці са сталінскай формулай аб абвастрэнні класавай барацьбы па меры руху да сацыялізму, прымяняліся самыя жорсткія меры пакарання.

## Дадатковая літаратура

Вішнеўскі, А.Ф. Асаблівасці палітыка-прававога рэжыму савецкай дзяржавы і яго вытокі (1917–1953 гг.) / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск : Тэсей, 2006. – 328 с.

Ігнаценка, І. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: Асаблівасці і вынікі / І. Ігнаценка. – Мінск, 1995. – 269 с.

Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. – Мінск : ВП «Экаперспектыва», 2000. – 307 с.

Маргунский, С.П. Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921–1925) / С.П. Маргунский. – Минск : Наука и техника, 1966. – 286 с.

Органы государственного управления БССР (1919–1967). – Минск : Наука и техника, 1968. – 327 с.

Слободчиков, Н.А. Совет Народных Комиссаров БССР в 1920–1936 гг.: Правовые вопросы организации и деятельности / Н.А. Слободчиков. – Минск : Наука и техника, 1977. – 166 с.

Широков, А.Т. ЦИК Белорусской ССР в 1919–1936 гг. – Минск : Наука и техника, 1979. – 158 с.

## Пытанні для самакантролю

Якія асноўныя передумовы ўтварэння СССР?

Калі і чаму быў падпісаны «Союзный рабоче-крестьянский договор между РСФСР и Социалистической Советской Республикой Белоруссией»?

Назавіце два асноўныя пункты гледжання ў Палітбюро ЦК РКП(б) наконт будучай формы аб’яднання савецкіх рэспублік.

Калі і дзе былі прыняты «Дэкларацыя аб утварэнні СССР» і «Саюзны дагавор»?

Якія 4 рэспублікі першапачаткова ўвайшлі ў склад СССР?

Колькі прадстаўнікоў БССР увайшлі ў склад канстытуцыйнай камісіі па распрацоўцы першай саюзнай Канстытуцыі?

Назавіце вышэйшыя органы ўлады СССР згодна з Канстытуцыяй 1924 г.



Якія тэрыторыі былі далучаны да Беларускай ССР у выніку другога этапу ўзбуйнення ў 1926 г.?

Якія былі асноўныя прычыны ўвядзення бальшавікамі новай эканамічнай палітыкі?

Як змянілася сацыяльная структура савецкага грамадства ў выніку правядзення палітыкі калектывізацыі?

Які дзяржаўны лад быў замацаваны ў Канстытуцыі БССР 1927 г.?

Якія катэгорыі насельніцтва пазбаўляліся выбарчых правоў па Канстытуцыі БССР 1927 г.?

Назавіце орган, які па Канстытуцыі БССР 1927 г. з’яўляўся вышэйшым органам улады ў перыяд паміж Усебеларускімі з’ездамі Саветаў.

Вызначце асноўную крыніцу Канстытуцыі Беларускай ССР 1937 г.

Якія карэнныя змены былі ўнесены ў выбарчую сістэму па Канстытуцыі Беларускай ССР 1937 г.?

Як аднапартыйная сістэма і культ асобы правадыра ў СССР уплывалі на палітычнае жыццё ў краіне?

На якіх прынцыпах грунтавалася крымінальнае права БССР у 1919–1921 гг.?

Якімі абставінамі суправаджалася скасаванне палітыкі НЭПа і пераход да індустрыялізацыі ў канцы 1920-х гг.?

Як сталінская формула аб абвастрэнні класавай барацьбы па меры руху да сацыялізму паўплывала на ўсталяваныя ў савецкім заканадаўстве меры пакарання?

## Тэсты

1. У склад якой федэратыўнай дзяржавы ўвайшла Беларуская ССР 30 снежня 1922 г.?

а) Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік;

б) Саюз Рэспублік Еўропы і Азіі;

в) Саюз Расіі і Беларусі;

г) Расійская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка.

2. Па Канстытуцыі 1927 г. БССР з’яўлялася:

а) савецкай рэспублікай;

б) парламенцкай рэспублікай;

в) канстытуцыйнай манархіяй.

3. У Канстытуцыі, якая была прынята VIII Усебеларускім з’ездам Саветаў 11 красавіка 1927 г., БССР абвяшчалася дзяржавай дыктатуры пралетарыяту, уся ўлада ў якой належала:

а) Саветам рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў;

б) Народнаму сакратарыяту;

в) Устаноўчаму сойму;
г) Вярхоўнаму Савету.

4. Па Канстытуцыі 1927 г. вышэйшым органам улады БССР з'яўляўся:
а) Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў;
б) Вярхоўны Савет БССР;
в) Савет Народных Камісараў БССР;
г) ЦК КП(б)Б.

5. У адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1927 г. правам выбіраць і быць выбраным у Саветы карысталіся:
а) былыя служачыя паліцыі;
б) гандляры;
в) служыцелі рэлігійных культаў і манахі;
г) рабочыя і сяляне;
д) псіхічна хворыя.

6. Якая мова не была дзяржаўнай па Канстытуцыі БССР 1927 г.?
а) беларуская;
б) украінская;
в) руская;
г) ідыш (яўрэйская);
д) польская.

7. Па Канстытуцыі 1937 г. вышэйшым органам улады БССР з'яўляўся:
а) Савет Народных Камісараў БССР;
б) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Усебеларускага з'езда Саветаў;
в) Вярхоўны Савет БССР;
г) Прэзідыум ЦВК БССР.

8. Пастановай ЦВК СССР ад 8 чэрвеня 1934 г. у Крымінальны кодэкс БССР 1928 г. быў уведзены новы састаў злачынства, за які быў прадугледжаны ў якасці крымінальнай адказнасці расстрэл з канфіскацыяй маёмасці:
а) сабатаж;
б) здрада Радзіме (шпіянаж, выдаванне ваеннай ці дзяржаўнай тайны, пераход на бок ворага, уцёкі ці пералёт за мяжу);
в) адсутнасць на месцы працы больш за 4 гадзіны;
г) крадзёж калгаснай маёмасці;
д) забойства.

9. Калі ў БССР было ўведзена абласное дзяленне, у выніку чаго рэспубліка падзялілася на Віцебскую, Гомельскую, Магілёўскую, Мінскую і Палескую вобласці?
а) у студзені 1924 г.;
б) у студзені 1938 г.;
в) у маі 1945 г.



10. Крымінальны кодэкс Беларускай ССР 1924 г. не ўтрымліваў главу:
а) «Злачынствы супраць прыватнай маёмасці»;
б) «Дзяржаўныя (контррэвалюцыйныя і супраць парадку кіравання) злачынствы»;
в) «Парушэнне правілаў аб аддзяленні царквы ад дзяржавы»;
г) «Злачынствы супраць жыцця, здароўя, свабоды і гонару асобы»;
д) «Парушэнне правілаў, якія ахоўваюць народнае здароўе, грамадскую бяспеку і публічны парадак».

**Заданні**

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: Іосіф Сталін, Аляксандр Чарвякоў, Мікалай Гікала, Мікалай Галадзед?





2. Вызначце на карце, якія тэрыторыі былі ўключаны ў склад БССР у выніку першага ўзбуйнення 1924 г.

3. Вызначце на карце, якія тэрыторыі былі ўключаны ў склад БССР у выніку другога ўзбуйнення 1926 г.

### Прыкладныя тэмы рэфератаў

Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у перыяд НЭПа і беларусізацыі.

Станаўленне сістэмы савецкіх органаў улады.

Заканадаўчая дзейнасць ЦВК і СНК БССР (1922–1939 гг.).

Мясцовыя Саветы і іх выканкамы ў БССР (1922–1939 гг.).

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел тэрыторыі БССР.

Судовы лад БССР (1922–1939 гг.).

Народны камісарыят унутраных спраў БССР.

Кадыфікацыя заканадаўства БССР (1922–1939 гг.).

Станаўленне адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў БССР.

Змены ў сямейным і адміністрацыйным праве БССР у канцы 20–30-х гг. XX ст.

Антырэлігійная і канфесіянальная палітыка савецкай дзяржавы.

«Узбуйненні» тэрыторыі БССР 1924 і 1926 гг.

Парушэнні законнасці і рэпрэсіі ў Беларусі.

Увядзенне абласнога адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў БССР.

Зямельныя кодэксы 1923 і 1925 гг.

Кодэкс законаў аб працы 1929 г.

Змены ў галінах права БССР у канцы 20–30-х гг. XX ст.

Адказы на тэсты: 1 – а); 2 – а); 3 – а); 4 – а); 5 – г); 6 – б); 7 – в); 8 – б); 9 – б); 10 – а).



# ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ СЯРЭДНЯЙ ЛІТВЫ І ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ (1920–1939 гг.)

**Пытанні тэмы**

*1. Грамадскі і дзяржаўны лад Польскай Рэспублікі (1918–1939 гг.). Прававое становішча заходнебеларускіх зямель у Польскай Рэспубліцы.*

*2. Грамадскі і дзяржаўны лад Сярэдняй Літвы (1920–1922 гг.). Прававое становішча заходнебеларускіх зямель у Сярэдняй Літве.*

## 1. Грамадскі і дзяржаўны лад Польскай Рэспублікі (1918–1939 гг.). Прававое становішча заходнебеларускіх зямель у Польскай Рэспубліцы

Аднаўленне незалежнасці Польшчы юрыдычна аформіла Парыжская мірная канферэнцыя 1919 г. У адпаведнасці з прынятай Канстытуцыяй Польскай Рэспублікі ад 17 сакавіка 1921 г. вышэйшымі органамі ўлады і кіравання ў дзяржаве з'яўляліся Прэзідэнт, Сойм, Сенат, Савет Міністраў.

Канстытуцыя Польшчы 1921 г. усталявала ў краіне парламенцкую рэспубліку. *Заканадаўчая ўлада* здзяйснялася Соймам і Сенатам. Акрамя заканадаўчых, Сойм меў *кантрольныя* паўнамоцтвы, Сойм і Сенат – *элекцыйныя* (выбары прэзідэнта). *Выканаўчая* ўлада даручалася ўраду і прэзідэнту, паўнамоцтвы якога былі абмежаваныя, – апошні заканадаўчай улады не меў.

У цэлым палітычная сістэма Польшчы ў першыя гады Другой Рэчы Паспалітай не адрознівалася ўстойлівасцю – толькі за 1922–1925 гг. змянілася 8 урадаў. Палітычныя крызісы дапаўняліся ўзмацненнем страйкавага руху, недастатковай эканамічнай стабілізацыяй, пагаршэннем міжнароднага становішча. У гэтых умовах усеагульнай незадаволенасці Ю. Пілсудскі і яго прыхільнікі здзейснілі 12–15 мая 1926 г. дзяржаўны пераварот, які карэнным чынам змяніў сістэму органаў дзяржаўнай

улады Польшчы. Былі істотна *пашыраны* паўнамоцтвы прэзідэнта. Прэзідэнт надзяляўся правам выдаваць заканадаўчыя акты, мог самастойна распускаць Сойм і Сенат, роля якіх у дзяржаве значна паслабла. Усталяваны ў краіне пасля 1926 г. дзяржаўна-палітычны рэжым атрымаў назву «санацыі» («аздараўлення»).

Адпаведна новай Канстытуцыі Польскай Рэспублікі ад 23 красавіка 1935 г. крыніцай і носьбітам дзяржаўнай улады з'яўляўся прэзідэнт, які валодаў *заканадаўчымі, канстытуцыйнымі, кантрольнымі, выканаўчымі і надзвычайнымі* (у выпадку вайны) паўнамоцтвамі. Прэзідэнт атрымаў паўнамоцтвы фарміраваць і распускаць урад, меў права ўмешвацца ў заканадаўчую дзейнасць парламента, склікаць, адчыняць і зачыняць сесіі Сойма і Сената, меў права роспуску парламента.

Паводле **Рыжскага мірнага дагавора** ад **18 сакавіка 1921 г.** у склад Польскай дзяржавы была ўключана тэрыторыя Заходняй Беларусі. На гэтай тэрыторыі быў фактычна ўсталяваны ваенна-паліцэйскі рэжым, які ажыццяўляўся з дапамогай мясцовага дзяржаўнага апарату.

Згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам, прынятым у Польшчы, заходнебеларускія землі былі падзелены на 4 ваяводствы:

Віленскае,
Навагрудскае,
Беластоцкае,
Палескае.

Ваяводствы дзяліліся на паветы, у якія ўваходзілі гарадскія і сельскія гміны.

У **ваяводстве** органамі дзяржаўнай адміністрацыі з'яўляліся *ваявода* і *ваяводскае ўпраўленне*. Ваявода прызначаўся прэзідэнтам Польшчы па прапанове міністра ўнутраных спраў, зацверджанай Саветам Міністраў. Ваявода каардынаваў дзейнасць усіх дзяржаўных органаў на тэрыторыі ваяводства і меў кантралюючыя паўнамоцтвы над усімі дзяржаўнымі органамі. Пры ваяводзе існавала ваяводскае ўпраўленне, якое складалася з аддзелаў: *агульнага, бяспекі, самакіравання, адміністрацыйнага, ваеннага, земляробства, прамысловасці, аховы здароўя, працы* і інш. Аддзелы займаліся непасрэдным мясцовым кіраўніцтвам і разглядам канкрэтных пытанняў. У **павеце** кіраўніком з'яўляўся *стараста*, які прызначаўся міністрам унутраных спраў і ваяводай, і непасрэдна падпарадкоўваўся апошняму. Паўнамоцтвы старасты ў павеце былі аналагічнымі паўнамоцтвам ваяводы. Пры старасце дзейнічала *павятовае ўпраўленне*, якое складалася з рэфератаў (аддзелаў). У **гмінах** у склад адміністрацыі ўваходзілі **войт** і **гміннае ўпраўленне**. У апошняе ўваходзілі намеснік войта і два-тры засядацелі. Грамады ўзначальвалі **солтысы**.



Да 1933 г. у паветах існавалі органы мясцовага самакіравання – *павятовыя соймікі*, якія з'яўляліся ў значнай ступені дэкларатыўнымі, паколькі без удзелу старасты яны нічога не вырашалі. Пасля 1933 г. у ваяводствах ствараліся *ваяводскія рады*, у паветах – *павятовыя рады*. Члены павятовых рад абіраліся на *гмінных радах*. Выканаўчымі органамі павятовых рад з'яўляліся ўжо абазначаныя раней павятовыя ўпраўленні на чале са старастам.

У Польскай дзяржаве Заходняй Беларусі была адведзена роля *аграрна-сыравіннага прыдатку* больш развітых карэнных рэгіёнаў Польшчы. 85 % насельніцтва Заходняй Беларусі жыло ў сельскай мясцовасці і 79 % было занята сельскай гаспадаркай. Эканамічная палітыка ў сельскай гаспадарцы адносна Заходняй Беларусі насіла дыскрымінацыйны характар. Каля 40 % зямель на тэрыторыі Заходняй Беларусі належала памешчыкам або дзяржаве. Праводзілася палітыка «асадніцтва», якая заключалася ў перасяленні з цэнтральнай Польшчы ва ўсходнія раёны краіны, у тым ліку і на заходнебеларускія землі, *адстаўных вайскоўцаў польскага войска* («асаджэння» іх на гэтай тэрыторыі) і надзялення іх зямлёй. Пры гэтым больш паловы сялян Заходняй Беларусі адносіліся да катэгорыі малазямельных або беззямельных. У канцы 1920-х гг. значная частка сялянскіх зямель прымусова была перададзена ва ўласнасць дзяржавы.

У складзе Польскай дзяржавы беларускае насельніцтва падвяргалася палітычнай дыскрымінацыі. Калі на выбарах 1922 г. у Сойм было абрана толькі 11 беларусаў (з 444 дэпутатаў), у склад членаў Сената – толькі 3 (са 111), то на выбарах у польскі парламент 1935 і 1938 гг. беларусы ўвогуле не былі абраны.

Сацыяльная і палітычная дыскрымінацыя беларусаў дапаўнялася нацыянальным і рэлігійным прыгнётам. Нягледзячы на тое, што адпаведна Рыжскаму мірнаму дагавору 1921 г. Польшча абавязвалася прадаставіць насельніцтву Заходняй Беларусі ўсе правы, якія забяспечвалі б вольнае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў, нацыянальна-культурная палітыка польскіх улад на заходнебеларускіх землях была накіравана на прымусовую паланізацыю і асіміляцыю мясцовага насельніцтва. Як вынік такой палітыкі, у пачатку 1939 г. у Заходняй Беларусі на 4 млн беларусаў не было ніводнай беларускай сярэдняй школы, вышэйшай навучальнай установы, нацыянальнага тэатра, бібліятэкі і г. д. Ва ўсіх дзяржаўных установах афіцыйнай мовай з'яўлялася толькі польская мова, яе няведанне прызнавалася непісьменнасцю і вяло да пазбаўлення выбарчых правоў. Супраць такой палітыкі актыўна выступала Таварыства беларускай школы, якое дзейнічала на працягу 1921–1937 гг. У розны час яго ўзначальвалі Б. Тарашкевіч, І. Дварчанін, Р. Шырма

і інш. Польскія ўлады таксама зачынялі ці ператваралі ў каталіцкія праваслаўныя храмы.

Рэжым санацыі (1926–1939 гг.) Ю. Пілсудскага ўзмацніў сацыяльны, нацыянальны і рэлігійны прыгнёт, што выклікала актывізацыю нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Сярэдзіна 1920 – пачатак 1930-х гг. характарызаваліся імкненнем да спалучэння легальных і рэвалюцыйных формаў барацьбы насельніцтва за свае правы. Да легальных напрамкаў дзейнасці трэба перш за ўсё аднесці працу *фракцыі* **«Беларускі пасольскі клуб»** у польскім Сойме, якую стварылі 11 лідараў розных палітычных сіл Заходняй Беларусі. Яе галоўнай мэтай было адстойванне інтарэсаў беларускага насельніцтва праз парламенцкую дзейнасць. З 1923 г. у рэгіёне пачынае нелегальна дзейнічаць **Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ)**, якая з'ўлялася часткай кампартыі Польшчы (КПП). Актыўнымі ўдзельнікамі савецкага падполля ў Заходняй Беларусі былі А.А. Альшэўскі, А.С. Славінскі, В.З. Харужая, С.В. Прытыцкі і інш. У 1924 г. з'явіўся Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі. У сувязі з гэтым у Польшчы прымаецца шэраг заканадаўчых актаў, якія пашыралі паўнамоцтвы мясцовай адміністрацыі, паліцыі, судова-следчага апарату ў барацьбе з нацыянальным рухам на беларускіх землях. На тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала 19 турмаў і канцэнтрацыйны лагер у Бярозе Картускай.

Другая палова 30-х гг. XX ст. стала складаным часам для вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Жорсткая рэпрэсіўная палітыка польскіх улад прыводзіла да шматлікіх арыштаў членаў палітычных арганізацый і забароны іх дзейнасці.

Непаслядоўна паводзіла сябе і кіраўніцтва СССР – у 1938 г. Камінтэрнам была распушчана КПП і яе адгалінаванне – КПЗБ.

## 2. Грамадскі і дзяржаўны лад Сярэдняй Літвы (1920–1922 гг.). Прававое становішча заходнебеларускіх зямель ў Сярэдняй Літве

У ліпені 1920 г. урад Савецкай Расіі на чале з У.І. Леніным прызнаў незалежнасць Літвы і перадаў ёй раней захопленыя палякамі Віленскі край, у тым ліку такія гарады, як Гродна, Шчучын, Ліда, Ашмяны, Смаргонь і Браслаў. У верасні Чырвоная Армія перадае літоўцам Вільню.

На працягу 1919–1920-х гг. польскія ўлады не прызнавалі не толькі БССР і Літбел, а таксама вялі ваенныя дзеянні з буржуазнай Літвой, бо хацелі захапіць яе тэрыторыю. Аднак пад ціскам краін Антанты ў



кастрычніку 1920 г. падпісваецца польска-літоўская дамова, паводле якой Віленшчына павінна перадацца Літве. Ю. Пілсудскі быў супраць гэтага, аднак не мог напрамую выступіць супраць краін Антанты. Таму ён вырашыў разыграць «беларускую карту» – Ю. Пілсудскі інспіраваў (таемна падрыхтаваў) «бунт» супраць гэтай дамовы ў частцы польскага войска, так званых «літоўска-беларускіх дывізіях» (складаліся з беларусаў-католікаў заходніх рэгіёнаў Беларусі, Беласточчыны і Віленшчыны).

На наступны дзень пасля падпісання дамовы з Літвой 8 кастрычніка 1920 г. «паўстала» 1-я Літоўска-беларуская дывізія на чале з генералам Л. Жалігоўскім, які захапіў г. Вільню. Л. Жалігоўскі абвясціў незалежнасць Віленшчыны, пайшоў на Коўна, і толькі ў раёне Шырвінтаса літоўская армія здолела яго спыніць. Фармальна меў месца беларуска-літоўскі канфлікт, і перад міжнароднай супольнасцю Польшча была быццам бы не вінаватай. Генерал Л. Жалігоўскі абвясціў 12 кастрычніка незалежнасць новай дзяржавы і фактычна ўзначаліў яе. Стварылася *фармальна* незалежная дзяржава – **Сярэдняя Літва**. Новая краіна складалася з 10 паветаў. На тэрыторыі Сярэдняй Літвы жыло 530 тыс. чалавек, з іх беларусы складалі 40 %. Акрамя Вільні, найбольш буйнымі гарадамі былі Трокі, Смаргонь і Ашмяны. Гродна і Ліду палякі адразу ўключылі ў склад Польшчы. У лістападзе 1920 г. пад ціскам Лігі Нацый бакі заключылі перамір'е. Пасля захопу Л. Жалігоўскім Віленшчыны Літва разарвала дыпламатычныя адносіны з Польшчай і фармальна да верасня 1939 г. знаходзілася з ёй у стане вайны.

Л. Жалігоўскі прызначыў урад – Часовую кіраўнічую камісію на чале з В. Абрамовічам, які выступаў за федэратыўную дзяржаву па прыкладу былой Рэчы Паспалітай. У Сярэдняй Літвы былі свае грошы, сімволіка і паштовыя маркі. Існавала самастойная судовая сістэма. Краіна, аднак, залежала ад грашовых крэдытаў польскага ўрада, а эканоміка – ад стану гаспадаркі Польшчы і польскай грашовай адзінкі – маркі.

Польшча пастаянна патрабавала ад Л. Жалігоўскага хуткага ўключэння Сярэдняй Літвы ў свой склад. 16 студзеня 1921 г. выканаўцам абавязкаў старшыні Часовай кіраўнічай камісіі быў прызначаны лаяльны да Польшчы генерал С. Макжэцкі (займаў пасаду да прызначэння ў лістападзе 1921 г. старшынёй А. Мяйштовіча). 30 лістапада 1921 г. Л. Жалігоўскі перадаў А. Мяйштовічу ўсю ўладу і выехаў з Вільні ў Польшчу.

У студзені 1922 г. адбыліся выбары ў сойм Сярэдняй Літвы, які 20 лютага прыняў рашэнне аб далучэнні дзяржавы да Польшчы. Ліга Нацый не выступіла супраць. 22 сакавіка 1922 г. Устаноўчы сойм у Вар-

шаве прыняў Акт уз'яднання Віленскага краю з Польскай Рэспублікай. 24 сакавіка 1922 г. Віленскі сойм быў распушчаны (частка яго дэпутатаў была кааптаваная ў Сойм Польскай Рэспублікі). 6 красавіка варшаўскім Соймам быў прыняты закон аб усталяванні дзяржаўнай улады на Віленшчыне. У красавіку тэрыторыю былой Сярэдняй Літвы ў складзе Польшчы пераўтварылі ў Віленскую зямлю *на правах* ваяводства. У снежні 1925 г. Віленская зямля стала Віленскім ваяводствам.

У верасні 1939 г. у Вільню ўвайшлі савецкія войскі і чакалася, што Віленскі край будзе ўключаны ў склад БССР. Аднак 10 кастрычніка 1939 г. савецкі ўрад перадаў Вільню і частку Віленшчыны Літве ў абмен на права размяшчэння савецкіх войскаў у гэтай краіне.

## Дадатковая літаратура

Ладысеў, У.Ф. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.

Назаўсёды разам: гісторыя нацыянальна-дзяржаўнага станаўлення Беларусі: да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 28 верас. 2004 г. / рэдкал.: А.А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2004. – 198 с.

Палуян, У.А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада / У.А. Палуян. – Мінск : Выш. шк., 1967. – 95 с.

Палуян, У.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / У.А. Палуян. – Мінск, 1978.

Пашкевіч, А.В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1930 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 /А.В. Пашкевіч. – Мінск, 2006.

## Пытанні для самакантролю

Назавіце вышэйшыя органы ўлады і кіравання Польскай Рэспублікі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй ад 17 сакавіка 1921 г.

Якая была форма праўлення ў Польшчы па Канстытуцыі ад 17 сакавіка 1921 г.?

Вызначце ключавую падзею 1926 г., якая карэнным чынам змяніла кампетэнцыю органаў дзяржаўнай улады Польшчы.

Згодна з якім дагаворам у склад Польскай дзяржавы была ўключана тэрыторыя Заходняй Беларусі?

Якія органы дзяржаўнай адміністрацыі былі ўсталяваны польскімі ўладамі на далучанай тэрыторыі Заходняй Беларусі?



Якая роля была адведзена ў Польскай дзяржаве тэрыторыі і насельніцтву Заходняй Беларусі?

На што была накіравана нацыянальна-культурная палітыка польскіх улад на заходнебеларускіх землях?

Растлумачце, у чым змест і механізмы правядзення на заходнебеларускіх землях рэжыму санацыі (1926–1939) Ю. Пілсудскага?

Назавіце легальныя і рэвалюцыйныя формы барацьбы заходнебеларускага насельніцтва за свае правы.

Якія галоўныя мэты дзейнасці фракцыі «Беларускі пасольскі клуб» у польскім сейме?

Што сабой уяўлялі Камуністычная партыя Заходняй Беларусі і Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі?

Хто быў рэальным ініцыятарам стварэння Сярэдняй Літвы?

Якая роля ва ўтварэнні Сярэдняй Літвы належыць Л. Жалігоўскаму?

Якое рашэнне сойм Сярэдняй Літвы прыняў у 1922 г. адносна палітычнай будучыні гэтага дзяржаўнага ўтварэння?

## Тэсты

1. Які міжнародны прававы дагавор, падпісаны з аднаго боку прадстаўнікамі РСФСР і УССР ад імя БССР і з другога боку прадстаўнікамі Польскай Рэспублікі, прадугледжваў уваходжанне Заходняй Беларусі ў склад Польскай Рэспублікі (ІІ Рэчы Паспалітай)?

а) Брэст-Літоўскі мірны дагавор;
б) Версальскі мірны дагавор;
в) Рыжскі мірны дагавор;
г) Ям-Запольскі мірны дагавор.

2. Хто з указаных асоб з'яўляўся кіраўніком Сярэдняй Літвы?

а) У.М. Ігнатоўскі;
б) А.Р. Чарвякоў;
в) В.Г. Кнорын;
г) Л. Жалігоўскі.

3. У адпаведнасці з нормамі Канстытуцыі Польскай Рэспублікі (ІІ Рэчы Паспалітай) 1921 г. Прэзідэнт выбіраўся:

а) на ўсеагульных выбарах;
б) на супольным пасяджэнні палат парламента (Сейма і Сената Нацыянальнага сходу).

4. Якая з палітычных партый Заходняй Беларусі была самай шматлікай па сваім складзе?

а) Камуністычная партыя Заходняй Беларусі;

б) Беларуская сялянска-работніцкая грамада;
в) Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя;
г) Беларускі сялянскі саюз.

5. Калі Сярэдняя Літва перастала існаваць як дзяржаўнае ўтварэнне?
а) 1920 г.;
б) 1921 г.;
в) 1922 г.;
г) 1923 г.

6. Калі на тэрыторыі Заходняй Беларусі для барацьбы з апазіцыйным рухам быў створаны канцэнтрацыйны лагер у Бярозе Картускай?
а) 1921 г.;
б) 1926 г.;
в) 1934 г.;
г) 1941 г.

7. Па Канстытуцыі 17 сакавіка 1921 г. Польская Рэспубліка (ІІ Рэч Паспалітая) была:
а) канстытуцыйнай манархіяй;
б) прэзідэнцкай рэспублікай;
в) парламенцкай рэспублікай;
г) абсалютнай манархіяй.

8. Паводле Канстытуцыі ІІ Рэчы Паспалітай 1935 г. канстытуцыю краіны мог змяніць толькі:
а) Сход электараў;
б) Сойм;
в) Сенат;
г) Прэзідэнт.

9. Урад СССР падпісаў з гітлераўскай Германіяй Пакт аб ненападзенні, што быў дапоўнены сакрэтнымі пратаколамі, па якіх тэрыторыя Польшчы і шэрагу іншых краін Еўропы падзялялася на сферы ўплыву СССР і Германіі 23 жніўня:
а) 1938 г.;
б) 1939 г.;
в) 1940 г.;
г) 1941 г.

10. З мэтай далучэння Заходняй Беларусі да БССР Чырвоная Армія ўступіла на яе тэрыторыю:
а) 17 верасня 1940 г.;
б) 17 верасня 1939 г.;
в) 1 верасня 1939 г.;
г) 22 чэрвеня 1941 г.



**Заданні**

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: Юзэф Пілсудскі, Люцыян Жалігоўскі, Браніслаў Тарашкевіч, Сяргей Прытыцкі?








2. Вызначце на карце, якія ваяводствы былі створаны польскімі ўладамі на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

3. Вызначце на карце тэрытарыяльныя межы Сярэдняй Літвы.

### Прыкладныя тэмы рэфератаў

Выбарчае права ў Польскай Рэспубліцы (1920–1939 гг.).

Закон аб часовай арганізацыі вышэйшай дзяржаўнай улады («Малая Канстытуцыя») ад 20 лютага 1919 г.

Дзейнасць прадстаўнікоў беларускага народа ў Сойме і Сенаце II Рэчы Паспалітай.

Дзяржаўны пераварот 12–13 мая 1926 г. і ўсталяванне рэжыму «санацыі» ў Польшчы.

Прававы статус беларусаў і іншых нацыянальных меншасцей у Польскай Рэспубліцы.

Беларускія палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі ў Польскай Рэспубліцы ў 1920–1939 гг., іх прававы статус.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Сярэдняй Літвы.

Далучэнне Сярэдняй Літвы да Польшчы.

Канстытуцыя Польскай Рэспублікі 17 сакавіка 1921 г.

Новы выбарчы закон і Канстытуцыя Польшчы 23 красавіка 1935 г.

Адказы на тэсты: 1 – в); 2 – г); 3 – б); 4 – б); 5 – в); 6 – в); 7 – в); 8 – а); 9 – б); 10 – б).



# ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ І ПРАВА БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ Ў СКЛАДЗЕ САЮЗА САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК У ЧАС ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1939–1945 гг.)

**Пытанні тэмы**

*1. Пачатак Другой сусветнай вайны. Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР.*

*2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.*

*3. Змены ў дзяржаўным ладзе і прававой сістэме СССР і БССР у час Вялікай Айчыннай вайны.*

*4. Фашысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі. Палітыка генацыду.*

*5. Усенародная барацьба савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі на акупаванай тэрыторыі. Партызанскі рух і антыфашысцкае падполле ў Беларусі.*

*6. Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны.*

## 1. Пачатак Другой сусветнай вайны. Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР

У другой палове 30-х гг. XX ст. СССР актыўна ўдзельнічаў у працы па стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Аднак заходнія дэмакратыі, перш за ўсё Вялікабрытанія і Францыя, ігнаравалі ролю СССР у супрацьстаянні блоку агрэсіўных дзяржаў і спадзяваліся павярнуць германскую агрэсію супраць СССР. У сакавіку 1939 г. пачаліся кансультацыі паміж урадамі СССР, Англіі і Францыі аб магчымым падпісанні пагаднення аб узаемадапамозе і аказанні помачы, аднак яны *не ўтрымлівалі прынцыпу ўзаемнасці* і ставілі СССР у *няроўнае становішча*.

Адначасова Берлін працягваў дыпламатычную гульню як з Лонданам і Парыжам, так і з Масквой. У ліпені 1939 г. было заяўлена аб жаданні Германіі на справе даказаць магчымасці дамовіцца па любых пытаннях, даць любыя гарантыі СССР. У выніку правалу англа-франка-савецкіх перамоў кіраўніцтва СССР вырашыла прыняць гэтую прапанову. 23 жніўня 1939 г. у Маскве германскі міністр замежных спраў І. Рыбентроп падпісаў разам з наркамам В.М. Молатавым **германа-савецкі дагавор аб ненападзенні** тэрмінам на 10 гадоў і *«сакрэтны дадатковы пратакол»*, што вызначыў падзел сфер уплыву ва Усходняй Еўропе (у тым ліку тэрыторыі Польшчы, якая ў польска-савецкую вайну захапіла Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну) паміж Германіяй і СССР.

Польшча, якая атрымала шмат германскіх зямель па выніках Першай сусветнай вайны, была адной з галоўных мішэняў для А. Гітлера. У красавіку 1939 г. нацысцкі лідар зацвердзіў план **«Вайс»**, які прадугледжваў ліквідацыю Польшчы. Раніцай **1 верасня 1939 г.** Германія напала на Польшчу. Пачалася **Другая сусветная вайна**. Да 16 верасня германская армія акупавала большую частку тэрыторыі Польшчы і выйшла на «лінію Керзана» – мяжу рассялення беларусаў і ўкраінцаў.

Кіраўніцтва Германіі падштурхоўвала СССР да актыўных дзеянняў супраць Польшчы, але савецкі ўрад дзейнічаў вельмі асцярожна, бо было разуменне адказнасці за развязванне вайны. 11 верасня быў аддадзены загад аб стварэнні *Беларускага* і *Украінскага франтоў*, а 16 верасня яны былі разгорнуты і падрыхтаваны для *вызваленчага* паходу. Калі польскі ўрад накіраваўся ў эміграцыю і ніхто не гарантаваў бяспеку насельніцтву, савецкі ўрад абвясціў аб увядзенні Чырвонай Арміі на тэрыторыю, якую засяляюць брацкія беларускі і ўкраінскі народы. Паход Чырвонай Арміі пачаўся **17 верасня 1939 г.**, да 22 верасня былі вызвалены Беласток і Брэст. Савецкаму Саюзу адышлі тэрыторыі, якія былі анексіраваны Польшчай у 1920 г. Уз’яднанне народаў Украіны і Беларусі з’явілася актам гістарычнай справядлівасці. Насельніцтва Заходняй Беларусі (большая яе частка) сустракала савецкіх салдат як вызваліцеляў.

1 кастрычніка 1939 г. была прынята пастанова Палітбюро ЦК УКП(б) «Пытанні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны», якая абавязвала склікаць Украінскі і Беларускі Народныя сходы. Выбары адбыліся 22 кастрычніка 1939 г. у абстаноўцы палітычнага ўздыму і пад пільным наглядам Камуністычнай партыі. Народны сход, які адбыўся ў Беластоку, аднагалосна прыняў 29 кастрычніка дэкларацыі аб устанаўленні савецкай улады ў Заходняй Беларусі і аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР. 2 лістапада нечарговая V сесія ВС СССР першага склікання задаволіла просьбу Народнага сходу Заходняй Беларусі і ўключыла Заходнюю Беларусь у склад СССР з уз’яднаннем яе з БССР. На нечарговай III сесіі ВС БССР **14 лістапада** прымаецца Закон «Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». Гэтым актам была юрыдычна замацавана этнічна-тэрытарыяльная кансалідацыя беларускай нацыі ў адзінай дзяржаве. Плошча БССР павялічылася да 225,6 тыс. км$^2$, насельніцтва – да 10,3 млн чалавек. Утварыліся органы новай улады: у гарадах – Часовыя ўпраўленні, у мястэчках і вёсках – сялянскія камітэты. Выбары дэпутатаў ад заходніх абласцей Беларускай ССР у Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўны Савет БССР былі праведзены ў сакавіку 1940 г., а ў мясцовыя Саветы – 15 снежня 1940 г.

### 2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны

Непасрэдная падрыхтоўка да нападу на Савецкі Саюз была распачата нацысцкай Германіяй адразу пасля захопу еўрапейскіх краін. Галоўным дакументам з’яўлялася дырэктыва № 21, вядомая як план **«Барбароса»** (А. Гітлер падпісаў 18 снежня 1940 г.). У *ваеннай* частцы прадугледжвалася ў ходзе «маланкавай вайны» разграміць узброеныя сілы Савецкага Саюза. Галоўны ўдар вермахт планаваў нанесці на Маскву праз БССР групай армій «Цэнтр». Група армій «Поўнач» павінна была захапіць Прыбалтыку і Ленінград. Група армій «Поўдзень» павінна была акружыць і ліквідаваць савецкія войскі на правым беразе Дняпра каля Кіева. У *палітычным* сэнсе вайна супраць СССР – гэта *ідэалагічная* вайна. Камуністычная ідэалогія ўспрымалася нацыстамі як вораг, яе носьбіты падлягалі фізічнаму вынішчэнню, а дзяржавы, якія будавалі сваё жыццё на падставе камуністычнай ідэалогіі, павінны былі знікнуць з палітычнай карты свету. Нацыстамі прапагандавалася тэорыя расавай нераўнацэннасці «неарыйскага» насельніцтва. Менавіта за кошт славянскай тэрыторыі А. Гітлер прапаноўваў пашырыць «жыццёвую прастору» германскай нацыі. У *гаспадарчым* сэнсе рыхтавалася татальная эксплуатацыя мясцовых рэсурсаў усіх відаў на карысць Германіі, пры гэтым мерапрыемствы насілі характар прамога рабаўніцтва.

З боку СССР вайна мела справядлівы, вызваленчы характар Айчыннай вайны за будучыню краіны і яе народаў.

**22 чэрвеня 1941 г.** нямецкая армія ўварвалася на тэрыторыю СССР на працягу ўсёй мяжы – ад Балтыйскага да Чорнага мора. Напад на СССР, у тым ліку на Беларусь, гітлераўцы пачалі моцным артылерыйскім абстрэлам прыгранічных раёнаў, пасля чаго ў наступленне перайшлі танкавыя арміі і сухапутныя войскі. Галоўны ўдар па савецкіх войсках у Беларусі германская армія нанесла ў раёнах Брэста і Гродна, тут колькасць нямецкіх войскаў у жывой сіле і тэхніцы пераўзыходзіла савецкія

войскі ў некалькі разоў. Усяму свету вядома гераічная абарона Брэсцкай крэпасці, за бессмяротны подзвіг якой было прысвоена ганаровае званне «Крэпасць-герой».

Вельмі пацярпеў у час нападу г. Мінск, горад рэгулярна бамбіла нямецкая авіяцыя. Нягледзячы на тое што германскія войскі (вермахт) акружылі савецкую групоўку каля Мінска, іх спроба з ходу фарсіраваць водны рубеж на Бярэзіне і выйсці да Дняпра не ўдалася. Гэта дазволіла заняць баявыя рубяжы новым савецкім дывізіям, падцягнутым на лінію Дняпра з цэнтральных раёнаў краіны. З 3 па 26 ліпеня 1941 г. савецкія войскі гераічна абаранялі г. Магілёў. Цяжкія баі ішлі на подступах да г. Віцебска і г. Гомеля.

Адначасова з абарончымі баямі камандаванне Чырвонай Арміі летам 1941 г. правяло шэраг наступальных аперацый. 6 ліпеня 1941 г. войскі 20-й арміі нанеслі контрудар у напрамку Сянно – Лепель, адбылася *буйнейшая танкавая бітва* з пачатку Другой сусветнай вайны, у якой удзельнічала больш як 1 500 танкаў і бронемашын. Праціўнік быў адкінуты на 30–40 кіламетраў. Другой наступальнай аперацыяй савецкіх войскаў на Беларусі летам 1941 г. з'яўляецца Рагачоўска-Жлобінская аперацыя. 13 ліпеня 63-ці стралковы корпус правёў контрудар, які на некаторы час вызваліў гарады Рагачоў і Жлобін. Нямецкія войскі былі адкінуты на 20–30 кіламетраў у напрамку Бабруйска, што не дазволіла ім хутка фарсіраваць Днепр і выйсці на аператыўную прастору ў напрамку Раслаўль – Смаленск. Такі ход баявых дзеянняў выклікаў трывогу ў вярхоўным кіраўніцтве Германіі. Вермахт спыніў наступленне ў канцы ліпеня 1941 г. на Смаленскім напрамку і перайшоў да ўмацавання флангаў групы армій «Цэнтр».

Але, нягледзячы на гераічнае супраціўленне Чырвонай Арміі, да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя БССР была акупавана нямецкімі войскамі. Падкрэслім, што абарончыя баі ў Беларусі далі магчымасць савецкаму камандаванню разгарнуць войскі другога стратэгічнага эшалону, дазволілі мабілізаваць непасрэдныя рэзервы краіны. Намечаныя камандаваннем вермахта тэрміны захопу г. Смаленска і г. Масквы былі сарваны.

## 3. Змены ў дзяржаўным ладзе і прававой сістэме СССР і БССР у час Вялікай Айчыннай вайны

З першых дзён вайны пачала фарміравацца сістэма мерапрыемстваў па пераводу ўсяго жыцця краіны на ваенны лад і стварацца *сістэма надзвычайных органаў* кіравання. 22 чэрвеня 1941 г. Прэзідыум ВС СССР прыняў Указ «Аб ваенным становішчы»: уводзілася абавязковая працоўная павіннасць, звышурочная работа, устанаўліваўся надзвычайны распарадак работы для дзяржаўных устаноў, прамысловых і гандлёвых арганізацый, а таксама ваенныя нормы забеспячэння насельніцтва таварамі і прадуктамі харчавання, на тэрыторыі ўсіх пагранічных рэспублік уводзілася *ваеннае становішча.* 30 чэрвеня 1941 г. ЦК ВКП(б) і СНК СССР прынялі мабілізацыйны народнагаспадарчы план для забеспячэння патрэб ваеннай абароны. Прадугледжвалася неадкладна ажыццяўляць **эвакуацыю** – мэтанакіраванае перабазіраванне насельніцтва, абсталявання прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, прадуктаў харчавання, маёмасці, матэрыяльных і культурных каштоўнасцей з месцаў, якім пагражала акупацыя, у тылавыя раёны СССР.

30 чэрвеня 1941 г. ствараецца **Дзяржаўны Камітэт Абароны (ДКА)** на чале са старшынёй СНК СССР І.В. Сталіным. ДКА цэнтралізаваў дзяржаўнае і ваеннае кіраўніцтва, вырашаў пытанні пераводу эканомікі на ваенны лад, ажыццяўляў мабілізацыю людскіх і матэрыяльных рэсурсаў краіны і падрыхтоўку рэзерваў і кадраў для ўзброеных сіл і прамысловасці, арганізоўваў эвакуацыю, перавод прадпрыемстваў у вызваленыя раёны і аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі ў заходніх абласцях краіны. Для непасрэднага кіраўніцтва ваеннымі дзеяннямі на франтах была створана **Стаўка Вярхоўнага Камандавання** пад старшынствам І.В. Сталіна, які прызначаецца наркамам абароны і **Вярхоўным Галоўнакамандуючым** Узброенымі Сіламі СССР.

25 чэрвеня 1941 г., калі фашысцкія войскі набліжаліся да Мінска, вышэйшы орган дзяржаўнай улады БССР – Прэзідыум Вярхоўнага Савета – пераехаў у Магілёў, потым у Гомель, а затым у Маскву. Ва ўмовах эвакуацыі Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР працягваў ажыццяўляць свае функцыі: выдаваў указы аб аб'яднанні наркаматаў, прызначэнні і перамяшчэнні членаў урада БССР і іншых службовых асоб, аб прадаўжэнні паўнамоцтваў органаў улады і г. д. У чэрвені 1942 г. скончыўся тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета БССР першага склікання, з улікам ваенных абставін яго паўнамоцтвы былі прадоўжаны на перыяд вайны. Дзейнасць урада – СНК БССР – вызначалася арганізацыйна-гаспадарчымі задачамі і не перапынялася пасля яго эвакуацыі – члены наркаматаў лічыліся адкамандзіраванымі ў адпаведныя наркаматы СССР, дзе і працягвалі сваю работу. Увядзенне ваеннага становішча выклікала значныя змены ў крымінальным заканадаўстве, яго прымяненні і кваліфікацыі злачынстваў. У мясцовасцях, дзе было ўведзена ваеннае становішча, усе справы аб крымінальных злачынствах, накіраваных супраць абароназдольнасці савецкай краіны, дзяржаўнай бяспекі, грамадскага парадку, перадаваліся на разгляд **ваенных трыбуналаў**. Вышэйшай наглядной інстанцыяй для ваенных трыбуналаў была **Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР.**

## 4. Фашысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі. Палітыка генацыду

На захопленай гітлераўскімі войскамі тэрыторыі Беларусі быў устаноўлены нацысцкі акупацыйны рэжым. Гэта сістэма надзвычайных палітычных, эканамічных і ваенных мер была накіравана на ліквідацыю савецкага ладу і савецкай дзяржавы, грабёж нацыянальнага багацця, знішчэнне людзей.

Нацысты падзялілі тэрыторыю рэспублікі на асобныя часткі. Тэрыторыя Беластоцкай вобласці і паўночна-заходніх раёнаў Брэсцкай вобласці была далучана да Усходняй Прусіі. Паўднёвыя раёны Брэсцкай, Пінскай, Палескай і Гомельскай абласцей увайшлі ў склад рэйхскамісарыята «Украіна». Паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці былі ўключаны ў генеральную акругу «Літва». Частка тэрыторыі Беларусі – Баранавіцкая, Вілейская, Мінская, паўночныя раёны Пінскай, Брэсцкай і Палескай абласцей – склалі генеральную акругу «Беларусь». Тэрыторыя генеральных акруг – Беларусі і прыбалтыйскіх рэспублік – увайшла ў склад рэйхскамісарыята «Остланд» з адміністрацыйным цэнтрам у Рызе. Тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, большай часткі Гомельскай і ўсходніх раёнаў Мінскай абласцей была вылучана ў «вобласць армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

На акупаванай тэрыторыі, так званай акрузе «Беларусь», дзейнічала сістэма органаў гітлераўскай акупацыйнай адміністрацыі. Цывільнае кіраўніцтва мела тры ступені – найвышэйшай інстанцыяй быў генеральны камісарыят у Мінску, сярэдняя ступень – гэта галоўныя камісарыяты ў Мінску і Баранавічах (не мелі вялікай ролі і ў сакавіку 1943 г. былі ліквідаваны). Ніжэйшую прыступку займалі акруговыя камісарыяты (гебітскамісарыяты), усяго іх было 10. Апарат генеральнага і акружных камісарыятаў камплектаваўся выключна нямецкімі служачымі. У «вобласці армейскага тылу» разам з ваенным камандаваннем акупацыйную ўладу ажыццяўлялі ваенна-палявыя і мясцовыя камендатуры.

У адпаведнасці са спецыяльным планам **«Ост»** нацысты планавалі высяленне $^{2}/_{3}$ насельніцтва за Урал на працягу 30 гадоў (у тым ліку 75 % з Беларусі), 10–15 % падлягалі анямечванню, частка насельніцтва падлягала поўнаму вынішчэнню (галоўным чынам яўрэі і камуністы). Астатняму мясцоваму насельніцтву адводзілася адзіная роля – быць таннай рабочай сілай. Для рэалізацыі плана 17 ліпеня 1941 г. было створана асобнае **Міністэрства акупаваных усходніх тэрыторый** на чале з А. Розенбергам. Практычныя мерапрыемствы па ўсталяванні «новага парадку» былі выкладзены ў «Інструкцыі аб асобных абласцях» да дырэктывы № 21 (план **«Барбароса»**), выдадзенай 13 сакавіка 1941 г., і шэрагу іншых дакументаў.



У адносінах да мясцовага насельніцтва нямецкія ўлады з першых дзён акупацыі праводзілі палітыку **генацыду**. Праграма каланізацыі акупаваных усходне-славянскіх тэрыторый спачатку прадугледжвала прымусовае высяленне, якое пасля паражэння пад Масквой і Сталінградам было заменена на план па знішчэнні 75 % насельніцтва Беларусі, і засяленне «вызваленых» зямель нямецкімі каланістамі. Толькі за 1941 г. нямецкія акупанты знішчылі на беларускай зямлі каля 100 тыс. мірных жыхароў, спалілі 120 вёсак разам з 3 945 іх жыхарамі. У 1942 г. забойствы і катаванні мірнага насельніцтва Беларусі набылі сістэмны характар. За акрэслены перыяд акупанты спалілі 772 вёскі разам з 46 992 жыхарамі. Акупанты стварылі **сістэму лагераў і турмаў** для розных катэгорый зняволеных. Ваеннапалонныя ўтрымліваліся ў дулагах, шталагах, афлагах, цывільныя асобы – у працоўных лагерах СД, перасыльных лагерах СС, штрафных лагерах, гета. На Беларусі было ўтворана каля 260 лагераў, буйнейшым быў Трасцянецкі пад Мінскам, дзе нацысты знішчылі 206 500 чалавек. На беларускай зямлі нямецкія акупанты закатавалі звыш 810 тыс. савецкіх ваеннапалонных. Для яўрэйскага насельніцтва былі створаны **гета**. Яны сталі месцам масавай бойні, дзе загінулі сотні тысяч яўрэяў.

З набліжэннем лініі фронту да Беларусі акупанты ўзмацнілі расправу над насельніцтвам – у верасні 1943 г. нямецкая армія атрымала загад ператварыць тэрыторыю, якую яна пакідае, у **«зону пустыні»**. Як вынік, у 1943 г. акупанты спалілі 2 653 вёскі разам з 84 188 жыхарамі. Асабліва цярпелі ад ворага прыфрантавыя раёны.

## 5. Усенародная барацьба савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі на акупаванай тэрыторыі. Партызанскі рух і антыфашысцкае падполле ў Беларусі

У адказ на палітыку генацыду ў Беларусі ў гады вайны асабліва значныя памеры набыла дзейнасць партызанскіх атрадаў. Слова «партызан» (ад фр. *Partisan)* – член атрада, арганізаванага з прадстаўнікоў народных мас для барацьбы з ворагам на акупаванай тэрыторыі. У радах антыфашысцкага руху на тэрыторыі рэспублікі налічвалася каля 440 тыс. партызан і падпольшчыкаў, 374 тыс. чалавек з'яўляліся байцамі 1 255 партызанскіх атрадаў (каля 213 брыгад).

**Партызанскі рух** меў некалькі этапаў свайго развіцця. *Першы этап* – арганізацыйны, калі толькі шукаліся формы барацьбы ў тыле ворага (чэрвень – снежань 1941 г.). *Другі этап* пачаўся ў снежні 1941 г., пасля паспяховага контрнаступлення Чырвонай Арміі пад Масквой, і цягнуўся да канца лета 1942 г. Гэта перыяд пераадолення крызісу і

рэзкага колькаснага росту партызанскага руху. 20 сакавіка 1942 г. была створана Паўночна-Заходняя аператыўная група, у маі 1942 г. створаны **Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР)** на чале з кіраўніком ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка. У верасні 1942 г. ствараецца **Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР)** пад кіраўніцтвам сакратара ЦК КП(б)Б П.З. Калініна. Штабы адыгралі станоўчую ролю ва ўдасканаленні пабудовы і кіраўніцтва партызанскага руху, а таксама забеспячэнні яго зброяй, радыёсувяззю і каманднымі кадрамі. *Трэці этап* (з восені 1942 г. па восень 1943 г.) – ствараюцца велізарныя партызанскія зоны, якія ахопліваюць значныя тэрыторыі, партызанамі праводзяцца буйныя вайсковыя і дыверсійныя аперацыі. *Чацвёрты этап* (з восені 1943 г. па лета 1944 г.) – адзначаны пачаткам вызвалення Беларусі і ўдзелам у гэтай аперацыі партызан. Найбольшага ўздыму дасягае «рэйкавая вайна», якая ажыццяўлялася ў тры этапы і ставіла мэтай зрыў ваенных перавозак праціўніка і максімальнае садзейнічанне наступленню Чырвонай Арміі. Яскравым паказчыкам баявых поспехаў партызан з'яўляецца той факт, што ў 1943 г. пад іх кантролем знаходзілася 60 % акупаванай тэрыторыі, значная частка якой была цалкам вызвалена ад захопнікаў.

Адначасова з узброенай партызанскай барацьбой разгортвалася **падпольная антыфашысцкая дзейнасць** у гарадах і іншых населеных пунктах. Мясцовыя парторганы ў сціслыя тэрміны правялі работу па ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі партыйна-камсамольскага падполля. Пасля перамогі ў Маскоўскай бітве падпольная барацьба ў гарадах і населеных пунктах Беларусі шырылася і паглыблялася. Умацавалася сувязь падполля з насельніцтвам, партызанскімі атрадамі і групамі. Падпольшчыкі сваю ўвагу засяродзілі на *масава-агітацыйнай рабоце* сярод насельніцтва, сістэматычных *дыверсіях* на розных аб'ектах, *зборы* для партызан *разведвальных звестак*, *вызваленні* ваеннапалонных і адпраўцы іх у лес да партызан.

Шмат партызан і падпольшчыкаў, якія былі ўраджэнцамі Беларусі, за гераізм і самаадданасць у змаганні з нацысцкімі акупантамі, былі ўзнагароджаны ганаровым званнем **Героя Савецкага Саюза**. Сярод іх: А.С. Азончык, Ц.С. Барадзін, І.А. Бельскі, Ц.П. Бумажкоў, П.А. Галецкі, В.І. Драздовіч, Ф.Ф. Дуброўскі, І.К. Захараў, Е.С. Зенькова, А.Л. Ісачанка, І.К. Кабушкін, М.І. Казей, М.А. Кедышка, А.Е. Клешчаў, П.І. Кавалёў, І.П. Кожар, В.І. Казлоў, В.З. Корж, М.П. Каралёў, Ф.П. Котчэнка, Ф.Я. Ку́хараў, Э.В. Лаўрыновіч, У.Е. Лабанок, Л.Д. Лорчэнка, А.С. Лукашэвіч, А.Р. Мазанік, Ф.А. Малышаў, С.С. Манковіч, Т.С. Марыненка, А.І. Маслоўская, Р.Н. Мачульскі, П.М. Машэраў, К.П. Арлоўскі, М.Б. Осіпава, У.А. Парахневіч, А.М. Рабцэвіч, С.І. Сікорскі, М.Ф. Сільніцкі, Н.В. Траян, У.А. Хамчаноўскі, В.З. Харужая, У.З. Царук, М.П. Шмыроў і інш.



## 6. Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны

Разгром нямецкіх войскаў летам 1943 г. на **Курскай дузе** дазволіў Чырвонай Арміі перайсці ў стратэгічнае наступленне і ў верасні 1943 г. распачаць шырокамаштабную аперацыю па вызваленні Украіны і Беларусі. **23 верасня 1943 г.** часці Цэнтральнага фронту фарсіравалі Днепр і вызвалілі ад нямецкіх акупантаў першы раённы цэнтр Палескай вобласці – гарадскі пасёлак **Камарын**. У асенне-зімовай кампаніі 1943–1944 гг. войскі Чырвонай Арміі поўнасцю ці часткова вызвалілі 36 раёнаў нашай рэспублікі, 36 райцэнтраў і два абласных цэнтры – Гомель і Мазыр. Яны занялі зручныя пазіцыі, з якіх летам 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя **«Баграціён»**.

Згодна з планам аперацыі «Баграціён» прадугледжвалася прарваць абарону нямецкіх войскаў на цэнтральным участку савецка-германскага фронту, расчляніць групу армій «Цэнтр» на часткі і разграміць іх паасобку. Асаблівая ўвага надавалася акружэнню і паланенню германскіх дывізій. Агульная колькасць праціўніка складала каля 1 млн салдат. На тэрыторыі Беларусі гітлераўцы стварылі моцную глыбока эшаланіраваную абарону глыбінёй да 270 км пад назвай «Фатэрлянд».

Войскі Чырвонай Арміі ўваходзілі ў склад чатырох франтоў – **1-га, 2-га і 3-га Беларускіх** (камандуючыя К.К. Ракасоўскі, Г.Ф. Захараў і І.Д. Чарняхоўскі), **1-га Прыбалтыйскага фронту** (камандуючы І.Х. Баграмян). Агульная колькасць савецкіх войскаў складала каля 2 млн салдат. У тыле ворага дзейнічалі 150 партызанскіх брыгад і 49 асобных атрадаў, састаў якіх налічваў больш за 143 тыс. чалавек.

**23 чэрвеня 1944 г.** войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту прарвалі абарону «Усходняга вала» на паўночным захадзе ад Віцебска, а 26 чэрвеня горад быў вызвалены. Амаль адначасова з падзеямі пад Віцебскам арміі 1-га Беларускага фронту ў ходзе Бабруйскай аперацыі акружылі 6 дывізій нямецкай арміі. Працягваючы паспяхова распачатае наступленне, войскі 3-га Беларускага фронту **3 ліпеня 1944 г.** вызвалілі сталіцу Беларусі. На ўсходзе ад Мінска была акружана 105-тысячная групоўка нямецкіх войскаў. **28 ліпеня** быў вызвалены г. Брэст, і было завершана вызваленне Беларусі.

На працягу ўсёй Беларускай наступальнай аперацыі салдаты і афіцэры Чырвонай Арміі паказвалі ўзоры масавага гераізму. Кожны дзень у баях за Беларусь савецкія воіны здзяйснялі сотні гераічных учынкаў. У баях за Беларусь вызначылася больш за 402 тыс. воінаў Чырвонай Арміі, якія

былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а больш як 1 500 салдатам, афіцэрам і генералам было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Далей Чырвоная Армія вызваліла адзінаццаць краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы з насельніцтвам 113 млн чалавек. У выніку цяжкіх баёў у лютым – сакавіку 1945 г. на тэрыторыях Усходняй Памераніі, Сілезіі, Аўстрыі, Польшчы, Венгрыі і Чэхаславакіі савецкімі войскамі былі вырашаны буйныя стратэгічныя задачы і створаны ўмовы для штурму Берліна.

Штурм Берліна пачаўся 16 красавіка 1945 г. Дзесяць дзён спатрэбілася савецкім войскам, каб пераадолець абарону немцаў на подступах да горада. Больш за тыдзень доўжыліся баі ў самім Берліне. 2 мая гарнізон Берліна капітуляваў. **9 мая 1945 г.** у 0 гадзін 43 хвіліны (па маскоўскім часе) у **Карлсхорсце** ў прысутнасці прадстаўнікоў камандавання ўсіх саюзных армій **быў падпісаны акт аб безумоўнай капітуляцыі**. Акт аб безумоўнай капітуляцыі Германіі прынялі: ад савецкага боку – маршал Савецкага Саюза Г.К. Жукаў, ад саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі – маршал А. Тэдэр (Вялікабрытанія). У ноч на 9 мая 1945 г. усе радыёстанцыі Савецкага Саюза перадалі доўгачаканую вестку аб Перамозе. Вайна ў Еўропе закончылася.

Пасля таго як Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі, з восені 1943 г. органы дзяржаўнай улады БССР узнаўляюць сваю дзейнасць непасрэдна ў рэспубліцы. Пасля вызвалення Гомеля Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР пераехаў з Масквы ў гэты абласны цэнтр. У вызваленых ад акупацыі раёнах СНК БССР адразу пачаў разгортваць работу па арганізацыі дзейнасці органаў мясцовага кіравання і ўзнаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі. На працягу 1943–1945 гг. беларускі ўрад вырашаў шматлікія пытанні адносна аднаўлення дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і кіравання, гаспадарчых і культурных устаноў у тых ці іншых вызваленых ад акупацыі раёнах і шляхоў хутчэйшай ліквідацыі наступстваў акупацыі. У **верасні 1946 г.** Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў **першы пасляваенны пяцігадовы план** узнаўлення і развіцця народнай гаспадаркі на 1946–1950 гг., які быў распрацаваны на падставе агульнасаюзнага плана.

### Дадатковая літаратура

Басюк, І.А. Пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі / І. А. Басюк. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2003. – 238 с.

Генацыд у Другой сусветнай вайне: Праблемы дасលед.: У памяць ахвяр Трасцянца: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 25–27 крас. 2002 г. / рэдкал.: К.І. Козак (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2003. – 278 с.



Загорулько, М.М. Крах экономических планов фашистской Германии на временно оккупированной территории СССР / М.М. Загорулько. – М. : Экономика, 1970. – 271 с.

Лемяшонак, Ул.І. Вызваленне – без грыфа «сакрэтна!» / Ул.І. Лемяшонак. – Мінск : Полымя, 1996. – 151 с.

Нюрнбергский процесс: право против войны и фашизма / Д. Гинзбургс [и др.]. – М., 1995. – 263 с.

Партизанское движение в Беларуси и его роль в разгроме фашистских захватчиков в 1941—1944 годах : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 25–26 июня 2009 г. / редкол.: М.В. Мясникович (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2009. – 493 с.

Тимохович, И.В. Битва за Белоруссию, 1941–1944 / И.В. Тимохович ; Ин-т воен. истории М-ва обороны Рос. Федерации. – Минск : Беларусь, 1994. – 254 с.

### Пытанні для самакантролю

Вызначыце абставіны падпісання германа-савецкага дагавору аб ненападзенні 1939 г.

Якім органам і калі была прынята пастанова «Пытанні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны», якая абавязвала склікаць Украінскі і Беларускі Народныя сходы?

Калі нечарговая III сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Закон «Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»?

Якія цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады пачалі дзейнічаць на заходнебеларускіх землях пасля іх далучэння да БССР?

Як называўся нацысцкі план нападу на БССР і СССР?

На якія раёны Беларусі прыйшоўся галоўны ўдар германскай арміі па савецкіх войсках у чэрвені 1941 г.?

Якія самыя значныя контрнаступальныя аперацыі камандаванне Чырвонай Арміі правяло адначасова з абарончымі баямі летам 1941 г. на тэрыторыі Беларусі?

Якое асноўнае значэнне абарончых баёў у Беларусі летам 1941 г.?

Які асноўны змест Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб ваенным становішчы», прынятага 22 чэрвеня 1941 г.?

Калі быў створаны Дзяржаўны Камітэт Абароны (ДКА) і хто яго ўзначаліў?

Куды накіраваўся ў чэрвені 1941 г., калі фашысцкія войскі набліжаліся да Мінска, вышэйшы орган дзяржаўнай улады БССР – Прэзідыум Вярхоўнага Савета?

У чым была сутнасць нацысцкага акупацыйнага рэжыму на акупаванай тэрыторыі Беларусі?

Якая на акупаванай тэрыторыі Беларусі дзейнічала сістэма органаў гітлераўскай акупацыйнай адміністрацыі?

У чым антычалавечая накіраванасць нацысцкай палітыкі генацыду?

Дзе на акупаванай тэрыторыі Беларусі быў буйнейшы лагер смерці?

Пералічыце перыяды партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі?

Калі і на чале з кім былі ўтвораны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) і Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР)?

Якая частка тэрыторыі Беларусі ў 1943 г. знаходзілася пад кантролем партызан?

Вызначце ролю партыйна-камсамольскага падполля ў змаганні з акупантамі.

Калі часці Цэнтральнага фронту вызвалілі ад нямецкіх акупантаў першы раённы цэнтр Палескай вобласці – гарадскі пасёлак Камарын?

Які план па вызваленні ад нямецкай акупацыі прадугледжвала Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён»?

Якія франты Чырвонай Арміі прымалі ўдзел у Беларускай наступальнай аперацыі?

Калі Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў першы пасляваенны пяцігадовы план узнаўлення і развіцця народнай гаспадаркі, распрацаваны на падставе агульнасаюзнага плана?

**Тэсты**

1. Калі быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху 30 мая?

а) 1941 г.;

б) 1942 г.;

в) 1943 г.;

г) 1944 г.

2. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР быў створаны спецыяльны орган для расследавання злачынстваў, учыненых фашыстамі і іх памагатымі, – Надзвычайная дзяржаўная камісія па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў і прычыненых імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР. Гэта адбылося 2 лістапада:

а) 1941 г.;

б) 1942 г.;

в) 1943 г.;

г) 1944 г.

3. Прававой асновай для прыняцця 2 лістапада 1939 г. Вярхоўным Саветам СССР пастановы «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР з аб'яднаннем яе з Беларускай ССР» сталі:

а) Дэкларацыі Народнага (Нацыянальнага) сходу Заходняй Беларусі;

б) пастановы ўрада II Рэчы Паспалітай;

в) пастановы ўрада РСФСР;

г) рашэнні Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.



4. Пасля заканчэння ў чэрвені 1942 г. тэрміну паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Беларускай ССР першага склікання савецкая ўлада пачала наступныя дзеянні:

а) праца Вярхоўнага Савета Беларускай ССР першага склікання была прыпынена ў сувязі з вайной;

б) Вярхоўны Савет Беларускай ССР першага склікання быў распушчаны;

в) былі прызначаны выбары ў Вярхоўны Савет другога склікання;

г) былі прадоўжаны паўнамоцтвы дадзенага складу народных дэпутатаў да 1945 г.

5. Вышэйшым органам улады СССР у час Вялікай Айчыннай вайны ад 30 чэрвеня 1941 г. з'яўляўся (з'яўлялася):

а) Савет Народных Камісараў;

б) Вярхоўны Савет СССР;

в) Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага;

г) Дзяржаўны Камітэт Абароны.

6. Калі быў створаны Дзяржаўны Камітэт Абароны на чале з І.В. Сталіным:

а) 30 чэрвеня 1941 г.;

б) 22 чэрвеня 1941 г.;

в) 3 ліпеня 1941 г.;

г) 26 ліпеня 1941 г.

7. Які орган у Беластоку 28 кастрычніка 1939 г. прыняў дэкларацыі «Аб дзяржаўнай уладзе», «Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР», «Аб канфіскацыі панскіх зямель»?

а) Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі;

б) Вялікі хурал Заходняй Беларусі і Украіны;

в) Вярхоўны Савет БССР;

г) Вальны сойм.

8. У сувязі з разглядам пытання аб уваходжанні БССР у склад ААН на пасяджэнні шостай сесіі Вярхоўнага Савета БССР, якая адбылася ў 1944 г. у Гомелі, было прынята рашэнне аб утварэнні двух новых народных камісарыятаў. Гэта былі:

а) Наркаматы аховы здароўя і народнай асветы;

б) Наркаматы ўнутраных спраў і сацыяльнай аховы;

в) Наркаматы замежных спраў і абароны;

г) Наркаматы лёгкай прамысловасці і транспарту.

9. За злачынствы, учыненыя ў мясцовасцях, аб'яўленых на ваенным становішчы, вінаватыя прыцягваліся да адказнасці па законах ваеннага часу:

а) няверна;

б) верна.

10. Як называўся нацысцкі план эканамічнай эксплуатацыі акупаваных зямель СССР?

а) Ост;
б) Гельб;
в) Гебіт;
г) Альдэнбург.

**Заданні**

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: Панцеляймон Панамарэнка, Мінай Шмыроў, Канстанцін Ракасоўскі, Георгій Жукаў?










2. Вызначце на карце асноўныя напрамкі ўдараў нямецкіх агрэсараў летам 1941 г.

3. Вызначце на карце рэгіёны Беларусі, дзе ў час Вялікай Айчыннай вайны былі пашыраны партызанскія зоны.

**Прыкладныя тэмы рэфератаў**

Пачатак Другой сусветнай вайны.

Прычыны і абставіны перадачы ўрадам СССР Віленскага краю Літоўскай Рэспубліцы ў 1939 г.

Прыняцце Заходняй Беларусі ў склад БССР і СССР.

Асаблівасці дзейнасці савецкіх органаў улады ў партызанскіх зонах на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Дзейнасць Вярхоўнага Савета і Савета народных камісараў БССР у эвакуацыі.

Праваахоўныя органы і асаблівасці іх дзейнасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Законы ваеннага часу. Змены ў крымінальным, цывільным, працоўным, шлюбна-сямейным праве ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Партызанскі рух і антыфашысцкае падполле ў Беларусі.

Стварэнне Народнага камісарыята замежных спраў і Народнага камісарыята абароны БССР у пасляваенны перыяд.

Народны (Нацыянальны) Сход Заходняй Беларусі і яго заканадаўчыя акты.

Дзяржаўны Камітэт Абароны і яго паўнамоцтвы.

Ялцінская і Патсдамская мірныя канферэнцыі.

Адказы на тэсты: 1 – б); 2 – б); 3 – а); 4 – г); 5 – г);
6 – а); 7 – а); 8 – в); 9 – б); 10 – г).

# ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ І ПРАВА БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ Ў СКЛАДЗЕ САЮЗА САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 40-х – ПАЧАТКУ 90-х гг. XX ст.

**Пытанні тэмы**

*1. Грамадскі лад БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гг. XX ст.*

*2. Дзяржаўны лад БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гг. XX ст.*

*3. Прававая сістэма БССР у пасляваенны перыяд.*

*4. Канстытуцыя БССР 1978 г.*

*5. Сістэмны крызіс у СССР. Спробы рэфармавання палітычнай сістэмы.*

*6. Дэзінтэграцыйныя працэсы ў СССР. Абвяшчэнне 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўным Саветам БССР поўнага дзяржаўнага суверэнітэту БССР.*

*7. Скасаванне СССР. Прававое замацаванне беларускага дзяржаўнага суверэнітэту.*

## 1. Грамадскі лад БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гг. XX ст.

Пасля завяршэння Другой сусветнай вайны рэзка змянілася расстаноўка палітычных сіл у свеце. СССР прыкметна пашырыў свой уплыў у Еўропе. У сувязі з гэтым БССР *з прыгранічнай дзяржавы* пераўтварылася *ва ўнутраную*. І гэта мела істотнае значэнне для яе будучыні ў сэнсе эканамічнага і грамадскага развіцця. Паколькі войскі СССР знаходзіліся далей на захад ад Беларусі, то ўрад СССР прыняў рашэнне *развіваць* (на першым этапе – рамантаваць) для іх *матэрыяльна-тэхнічную* базу ў Цэнтральнай і Усходняй Беларусі (але не ў Заходняй Беларусі). Так з'явіліся трактарны, аўтамабільны, маторны, станкабудаўнічы і іншыя заводы. У цэлым аднаўленне эканомікі ўскладнялася тым, што саюзнае



кіраўніцтва з-за ваенна-стратэгічных меркаванняў перавагу аддавала *машынабудаванню і станкабудаванню,* паколькі БССР стала другім эшалонам аховы СССР пасля краін Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. Гэты *перакос* прывёў да некаторага заняпаду традыцыйных для Беларусі *лёгкай, харчовай прамысловасці, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў*. У цэлым прамысловасць БССР перавысіла ў 1950 г. даваенны ўзровень на 15 %, а машынабудаванне і металаапрацоўка – на 137 %.

Больш складаным было становішча ў сельскай гаспадарцы. У заходніх раёнах БССР хуткімі тэмпамі праводзілася калектывізацыя. У выніку сяляне былі пазбаўлены зямлі і сродкаў вытворчасці, якія былі адзяржаўлены ў форме калгаснай уласнасці.

У грамадскім жыцці ў пасляваенныя гады назіраліся супярэчлівыя тэндэнцыі. З аднаго боку, Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне выклікала пад'ём працоўнага энтузіязму і надзеі на лепшае жыццё, а з другога – ва ўмовах таталітарызму працягваліся палітычныя рэпрэсіі.

Пасля смерці І.В. Сталіна ў 1953 г. пачалася дэмакратызацыя савецкага грамадства, якая была звязана з новым кіраўніком – М.С. Хрушчовым (гэты перыяд увайшоў у гісторыю як «адліга»). Вялізнае значэнне ў справе вызначэння стратэгіі далейшага развіцця савецкага грамадства меў **XX з'езд КПСС**, які праходзіў у **1956 г.** З'езд прыняў рашэнні, што ў значнай ступені паўплывалі на змяненне ўнутранай палітыкі дзяржавы ў розных сферах грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця. З'езд адзначыў, што галоўнай рысай сучаснай эпохі з'яўляецца выхад сацыялізму за рамкі адной дзяржавы і пераўтварэнне яго ў сусветную сістэму. З'езд асудзіў рэпрэсіўную дзейнасць дзяржаўных органаў на папярэднім гістарычным этапе савецкай дзяржавы. На з'ездзе былі прыняты рашэнні, у аснове сваёй накіраваныя на пашырэнне правоў саюзных рэспублік.

Была зроблена спроба дэмакратызацыі ў самой правячай партыі – **КПСС**. Рэгулярна сталі праводзіцца з'езды, пленумы, сходы. Ва Устаў КПСС была ўнесена норма аб выбарнасці партыйных кіруючых кадраў не больш чым на два-тры тэрміны. З верасня 1956 г. была адменена плата за адукацыю ў сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школе, з ліпеня 1956 г. стаў дзейнічаць Закон «Аб дзяржаўных пенсіях» – яны прыкметна былі павялічаны па старасці і інваліднасці. З 1957 г. пачалося масавае жыллёвае будаўніцтва.

У цэлым пераўтварэнні ў БССР у канцы 50-х – першай палове 60-х гг. былі накіраваны на ажыццяўленне адпаведных пастаноў XX з'езда КПСС (1956), потым XXI з'езда (1959), які абвясціў аб уступленні СССР у перыяд разгорнутага будаўніцтва сацыялізму. У 1961 г. XXII з'езд КПСС

прыняў новую праграму Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, у якой было заяўлена аб плане будаўніцтва камунізму ў СССР на працягу жыцця аднаго пакалення і аб пераўтварэнні пад кіраўніцтвам КПСС дзяржавы дыктатуры пралетарыяту ў агульнанародную дзяржаву.

У кастрычніку 1964 г. Пленум ЦК КПСС вызваліў М.С. Хрушчова ад займаемых пасад – партыйна-савецкую наменклатуру не задавальняў кірунак яго рэформаў. У наступныя гады на змену «*адлізе*» з яе спробамі рэформаў і пераўтварэнняў дзяржаўнага і партыйнага апарату савецкай дзяржавы прыйшла эпоха *«застою»*. У савецкіх крыніцах таго часу гэты перыяд называўся *«развітым сацыялізмам»*. Характэрнай рысай стала адсутнасць радыкальных змен у жыцці дзяржавы. На гэтым этапе вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання здзяйснялі ў аснове сваёй кантрольна-наглядальную і распарадчую дзейнасць па кіраўніцтве рознымі галінамі народнай гаспадаркі, клапаціліся аб захаванні грамадскага парадку ў дзяржаве.

Замест пасады Першага сакратара ЦК КПСС была ўведзена пасада Генеральнага сакратара ЦК КПСС. Адбылася канцэнтрацыя ўлады – сумяшчэнне пасад Генеральнага сакратара ЦК КПСС і Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у руках адной асобы – Л.І. Брэжнева. Была ўзмоцнена і павялічана заканадаўчая роля КПСС – яна стала ядром палітычнай сістэмы дзяржавы і атрымала права вызначаць *генеральную* лінію развіцця дзяржавы і грамадства. Заканадаўча была замацавана манаполія КПСС на ўладу. Але партыя аказалася нязздольнай да самаразвіцця, самарэгуляцыі і самаўдасканалення. Прынцып дэмакратычнага цэнтралізму ў партбудаўніцтве прывёў да перараджэння вярхоў КПСС, яе адрыву ад партмас у прыватнасці і ўсяго насельніцтва СССР у цэлым. Сярод значнай часткі насельніцтва ўзнік крызіс даверу не толькі да мясцовых кіраўнікоў, якія нярэдка злоўжывалі сваім службовым становішчам, парушалі заканадаўства, але і да вышэйшых кіраўнікоў савецкай дзяржавы. Сітуацыя ў краіне ўскладнялася паступовым ростам напружання ў эканамічнай сферы.

## 2. Дзяржаўны лад БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гг. ХХ ст.

Тэрыторыя БССР у канцы 40-х гг. ХХ ст. уключала ў сябе 12 абласцей: *Баранавіцкую, Бабруйскую, Брэсцкую, Віцебскую, Гомельскую, Гродзенскую, Мінскую, Магілёўскую, Маладзечанскую, Пінскую, Палескую (з цэнтрам у Мазыры) і Полацкую.*

Пачынаючы з сярэдзіны 50-х гг., адбываецца змяненне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення рэспублікі. У 1954 г. ліквідуюцца



Бабруйская, Баранавіцкая, Палеская, Пінская, Полацкая вобласці, а ў 1960 г. – Маладзечанская вобласць. У выніку тэрыторыя Беларускай ССР стала складацца з 6 абласцей. Адначасова ўзбуйняюцца раёны рэспублікі, усяго было ліквідавана 98 раёнаў. Адбываецца таксама ўзбуйненне сельсаветаў – з 2 522 застаецца 1 922 сельскія саветы.

*У* лютым 1947 г. на падставе новага Палажэння аб выбарах адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР другога склікання. На другой сесіі Вярхоўнага Савета БССР у ліпені 1947 г. быў прыняты Закон «Аб змяненні і дапаўненні тэксту Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай ССР». У адпаведнасці з законам за вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады рэспублікі было замацавана права на прыняцце заканадаўства *аб шлюбе і сям'і*, зацвярджэнне справаздач аб выкананні *дзяржаўнага бюджэту БССР*. Уносіліся ўдакладненні ў гарантыі правоў грамадзян *на адпачынак і адукацыю*.

У пасляваенны перыяд актывізаваў сваю дзейнасць Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР. У яго склад уваходзілі *аддзелы*: інфармацыйна-статыстычны, юрыдычны, па ўліку і рэгістрацыі ўзнагароджаных, па падрыхтоўцы да разгляду хадайніцтваў аб памілаванні, фінансава-гаспадарчы, а таксама *канцылярыя* Прэзідыума і *прыёмная* Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі.

У 1950–1960-я гг. развіваецца кантрольна-наглядальная і распарадчая дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР, з'яўляюцца новыя *камісіі*. Апроч бюджэтнай, заканадаўчых прапаноў, па замежных справах і мандатнай камісій, у 1957 г. былі створаны камісіі: *па народнай адукацыі і культурна-асветніцкай рабоце, ахове здароўя і сацыяльным забеспячэнні, жыллёвым будаўніцтве, камунальнай гаспадарцы і добраўпарадкаванні, сельскай гаспадарцы.*

У 1960 г. уступіла ў дзеянне Палажэнне аб пастаянных камісіях Вярхоўнага Савета. У адпаведнасці з ім былі вызначаны два галоўныя кірункі іх дзейнасці – падрыхтоўка законапраектаў і кантроль за выкананнем законаў і іх эфектыўнасцю. Да 1969 г. колькасць камісій Вярхоўнага Савета павялічылася да 15.

Рэальная ўлада ў рэспубліцы была засяроджана ў кіраўніцтве камуністычнай партыі. Пасаду Першага сакратара ЦК кампартыі БССР у гэты перыяд займалі П.К. Панамарэнка (да 1947), М.І. Гусараў (1947–1950), М.С. Пато́лічаў (1950–1956), К.Т. Мазураў (1956–1965), П.М. Машэраў (1965–1980), Ц.Я. Кісялёў (1980–1983), М.М. Слюнькоў (1983–1987). Гэтыя партыйныя кіраўнікі, у сваю чаргу, падпарадкоўваліся кіраўніцтву кампартыі СССР.

На падставе рашэнняў ХХ з'езда КПСС у СССР прымаецца шэраг нарматыўных актаў. Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя

дзяржавы і права Беларусі»), у 1957 г. былі ўнесены змяненні ў арт. 13 Канстытуцыі БССР. Да кампетэнцыі рэспублікі было аднесена ўсталяванне абласнога дзялення ў БССР, кіраўніцтва дарожным будаўніцтвам, транспартам і прадпрыемствамі сувязі рэспубліканскага значэння, а таксама прыняцце заканадаўства аб судаўладкаванні і судаводстве, грамадзянскага і крымінальнага заканадаўства. У распараджэнне рэспубліканскіх улад перадаецца некалькі тысяч прадпрыемстваў цяжкай і лёгкай прамысловасці, аўтамабільнага транспарту, сувязі, рачнога флоту, лясной прамысловасці, будаўнічых арганізацый і інш.

У 1957 г. у СССР адбыліся значныя змены ў сферы кіраўніцтва народнай гаспадаркай. У адпаведнасці з рашэннямі Камуністычнай партыі была праведзена рэарганізацыя органаў кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам. З мэтай больш аператыўнага кіравання народнай гаспадаркай замест сістэмы міністэрстваў, арганізаванай па галіновым прынцыпе, для кіраўніцтва народнай гаспадаркай была створана сістэма **саветаў народнай гаспадаркі (саўнаргасаў)**, пабудаваных на падставе тэрытарыяльнага прынцыпу. Гэтыя змены былі праведзены на падставе Закона СССР ад 10 мая 1957 г. «Аб далейшым удасканаленні арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам». У БССР быў створаны *адзіны* саўнаргас, які выступаў як агульны орган дзяржаўнага кіравання народнай гаспадаркай, надзелены пэўнымі выканаўчараспарадчымі паўнамоцтвамі. Ён ажыццяўляў кіраўніцтва даручанымі яму галінамі гаспадарчага жыцця і перададзенымі яму ў падначаленне прадпрыемствамі і рознымі арганізацыямі.

Пасля пазбаўлення М.С. Хрушчова ўлады Законам СССР ад 2 кастрычніка 1965 г. «Аб змяненні сістэмы органаў кіравання прамысловасцю і ператварэнні некаторых іншых органаў дзяржаўнага кіравання» і аднайменнымі законамі саюзных рэспублік сістэма саўнаргасаў была скасавана – зноў ствараюцца агульнасаюзныя, саюзна-рэспубліканскія і рэспубліканскія галіновыя міністэрствы і ведамствы.

Важнае значэнне мела з’яўленне БССР сярод **заснавальнікаў** Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Пасля вайны СССР імкнуўся прыцягнуць у будучую арганізацыю міжнароднай бяспекі ўсе рэспублікі, каб мець там больш галасоў. Але саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі адмовіліся даць згоду на гэты крок з тлумачэннем, што саюзныя рэспублікі не маюць рэальнага суверэнітэту. Гэта прымусіла кіраўніцтва СССР пашырыць правы саюзных рэспублік. 1 лютага 1944 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон аб прадастаўленні саюзным рэспублікам *паўнамоцтваў* у галіне знешніх зносін і аб стварэнні нацыянальных вайсковых фарміраванняў. Рэспублікі атрымалі права ўваходзіць у непасрэдныя зносіны



з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні, абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі. У Канстытуцыю СССР і саюзных рэспублік былі ўнесены адпаведныя змяненні. Аднак ЗША заявілі, што ў такім выпадку ў ААН трэба прыняць усе штаты іх саюза, а гэта супярэчыць прынцыпу «адна краіна – адзін голас».

Але пры падтрымцы Вялікабрытаніі на Крымскай канферэнцыі 1945 г. было вырашана разам з СССР асобна запрасіць Беларусь і Украіну на Канферэнцыю Арганізацыі Аб’яднаных Нацый *у якасці заснавальнікаў* як рэспублікі, якія панеслі найбольшыя страты ад вайны з Германіяй. 25 чэрвеня 1945 г. БССР і УССР падпісалі Статут ААН. У ліку 51 краіны свету яны сталі заснавальнікамі ААН.

### 3. Прававая сістэма БССР у пасляваенны перыяд

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), у сярэдзіне – другой палове XX ст. права БССР развівалася ў рэчышчы агульнасаюзных тэндэнцый. Заканадаўства Беларускай ССР развівалася па трох галоўных напрамках.

1. На тэрыторыі БССР працягвалі дзейнічаць прынятыя раней агульнасаюзныя нарматыўныя акты.

2. У сувязі з размежаваннем кампетэнцыі СССР і саюзных рэспублік, рэгламентаванай канстытуцыйным законам, у сферы заканадаўства Саюзам ССР пачалі прымацца Асновы заканадаўства, якія ўсталёўвалі асноўныя прававыя прынцыпы, паняцці і палажэнні адпаведных галін права (паводле гэтых законаў саюзныя рэспублікі прымалі новыя і пераглядалі дзеючыя кодэксы і законы).

3. У межах сваёй кампетэнцыі рэспублікай прымаліся ўласныя нарматыўныя акты.

У канцы 40-х і ў 50-я гг. заканадаўчая дзейнасць рэспублікі была накіравана на аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі, а ў наступныя гады (як адзначалася ў рашэннях КПСС) – на «ўсебаковае разгортванне і ўдасканаленне сацыялістычнай дэмакратыі, актыўны ўдзел усіх грамадзян у кіраванні дзяржавай, кіраўніцтве гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, паляпшэнне працы дзяржаўнага апарату». Актывізацыі нарматворчай дзейнасці савецкіх рэспублік паспрыялі рашэнні XX з’езда КПСС, накіраваныя на *пашырэнне* правоў саюзных рэспублік у гэтай сферы. За агульнасаюзнымі заканадаўчымі органамі захоўвалася права на прыняцце Асноў заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік у гэтых сферах.

Аб росце заканадаўчай актыўнасці сведчыць вялікая колькасць прынятых Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР нарматыўных актаў. З 1959

па 1967 г. Вярхоўным Саветам БССР былі прыняты 124 заканадаўчыя акты. Калі раней выдаваліся толькі законы аб народнагаспадарчых планах, дзяржаўных бюджэтах і зацвярджаліся ўказы Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, то ў гэты перыяд прымаюцца законы аб ахове прыроды, аб статусе і парадку адклікання дэпутатаў Вярхоўнага Савета, абласнога, раённага, гарадскога, пасялковага і сельскага саветаў, аб судаўладкаванні, адвакатуры, парадку адклікання суддзяў і народных засядацеляў, аб зменах у сістэме органаў кіравання. Былі *падрыхтаваны* і потым *уведзены* ў дзеянне новыя кодэксы па асноўных галінах права і інш. Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), сфера самастойнай праватворчасці БССР была істотна пашырана.

У 1957 г. у БССР была створана спецыяльная ўрадавая камісія, якая кіравала распрацоўкай крымінальнага, крымінальна-працэсуальнага, грамадзянскага і грамадзянска-працэсуальнага кодэксаў. Галоўнымі крыніцамі, на базе якіх распрацоўваліся дадзеныя кодэксы БССР, з'яўляліся Асновы заканадаўства СССР і саюзных рэспублік. На падставе іх потым былі распрацаваны адпаведныя кодэксы БССР.

Крымінальнае права першым падверглася істотным зменам у пасляваенны перыяд. Калі ў пачатку 50-х гг. у СССР у сферы крымінальнага заканадаўства праявілася тэндэнцыя *ўзмацнення жорсткасці крымінальнай адказнасці* (смяротная кара, скасаваная ў маі 1947 г., у студзені 1950 г. была зноў уведзена), то пасля смерці І.В. Сталіна праяўляецца і такая тэндэнцыя ў развіцці крымінальнага заканадаўства, як *звужэнне сферы крымінальнай адказнасці.*

У снежні 1958 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў **Асновы крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік**. Гэта з'явілася значным крокам наперад у напрамку дэмакратызацыі крымінальнай палітыкі і крымінальнага заканадаўства. Як адзначае прафесар Т.І. Доўнар, умацаванне прынцыпу законнасці праявілася перш за ўсё ў дакладнай канструкцыі нормы аб падставах крымінальнай адказнасці – артыкул 3 Асноў вызначаў: «Крымінальнай адказнасці і пакаранню належаць толькі асобы, вінаватыя ў здзяйсненні злачынства, гэта значыць наўмысна або па неасцярожнасці здзейсніўшыя прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне».

Адпаведна гэтаму палажэнню *прынцыповая* навела ўвайшла ў *паняцце злачынства. Сацыяльная* характарыстыка злачынстваў як грамадска небяспечных дзеянняў дапоўнілася *прававой* – прадугледжаннем дзеянняў крымінальным законам. На падставе гэтага была адменена норма аб ужыванні крымінальнага закона па аналогіі, якая супярэчыла



агульнапрынятаму прававому прынцыпу «няма злачынства без указання аб тым у законе». У Асновах крымінальнага заканадаўства 1958 г. атрымаў значнае развіццё *прынцып гуманізму*. Смяротная кара прадугледжвалася толькі за здзяйсненне дзяржаўных злачынстваў і за наўмыснае забойства пры абцяжарваючых абставінах і вызначалася як выключная і часовая мера да яе адмены.

У чатырох раздзелах Асноў крымінальнага заканадаўства (Агульныя палажэнні; Аб злачынстве; Аб пакаранні; Аб прызначэнні пакаранняў і аб вызваленні ад пакарання) былі рэгламентаваны найважнейшыя пытанні Агульнай часткі савецкага крымінальнага заканадаўства.

Новы **Крымінальны кодэкс Беларускай ССР** быў прыняты Вярхоўным Саветам БССР 29 снежня 1960 г. і ўведзены ў дзеянне з 1 красавіка 1961 г. Ён складаўся з Агульнай і Асаблівай частак. Агульная частка складалася з пяці раздзелаў. Асаблівая частка кодэкса ўтрымлівала раздзелы, прысвечаныя відам *злачынстваў* і *пакарання.*

Развіццё крымінальна-працэсуальнага заканадаўства дадзенага перыяду ішло ў напрамку ліквідацыі тых негатыўных з'яў у дзейнасці органаў расследавання, пракуратуры і суда, якія былі дапушчаны раней. Ліквідацыяй у 1953 г. Асобай нарады пры МУС СССР як неканстытуцыйнага органа правасуддзя быў адноўлены прынцып ажыццяўлення правасуддзя толькі судом. Паступова ліквідавалася празмерная цэнтралізацыя судовага нагляду, пашыраліся правы пракурорскага нагляду, адмяняліся працэсуальныя нормы, якія абмяжоўвалі правы абвінавачанага на абарону і інш. Вярхоўным Саветам БССР быў распрацаваны і прыняты новы **Крымінальна-працэсуальны кодэкс БССР**, які ўступіў у дзеянне 1 красавіка 1961 г. і заканадаўча замацаваў *больш дэмакратычныя асновы дзейнасці* органаў дазнання, следства і пракуратуры па разгляду крымінальных спраў. КПК складаўся з сямі частак, аб'яднаных у 34 раздзелы, у якіх былі выкладзены агульныя палажэнні крымінальнага працэсу, правы і абавязкі ўдзельнікаў працэсу, крыніцы доказаў, парадак узбуджэння крымінальнай справы, парадак дзейнасці органаў дазнання і папярэдняга следства, парадак судаводства, парадак выканання судовых прысудаў і інш. Пазней КПК быў дапоўнены *новымі* палажэннямі і нормамі, прычым павялічылася не толькі колькасць артыкулаў, але і з'явіліся дзве новыя часткі і новыя раздзелы. Упершыню ў КПК быў замацаваны *прынцып ажыццяўлення правасуддзя па крымінальных справах толькі судом.* Ніхто не мог быць прызнаны вінаватым у здзяйсненні злачынства і падвергнуты пакаранню інакш, як па судовым рашэнні.

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), новы **Грамадзянскі кодэкс** у рэспубліцы быў зацверджаны Вярхоўным Саветам рэспублікі 11 чэрвеня 1964 г. і ўведзены ў дзеянне

ў БССР са студзеня 1965 г. Грамадзянскі кодэкс складаўся з 8 частак і 43 раздзелаў, у якіх разглядаліся агульныя палажэнні грамадзянскага права, права ўласнасці, абавязацельнае права, аўтарскае права, права на адкрыццё, вынаходства, рацыяналізатарскую прапанову, прамыслова ўзор, спадчыннае права, праваздольнасць замежных грамадзян, асоб без грамадзянства, ужыванне грамадзянскіх законаў замежных дзяржаў, міжнародных дагавораў і пагадненняў.

## 4. Канстытуцыя БССР 1978 г.

У 1977 г. Вярхоўным Саветам СССР была прынята апошняя агульнасаюзная Канстытуцыя, асноўнай прычынай распрацоўкі якой аб'яўлялася пабудова ў СССР развітога сацыялізму. У сувязі з гэтым у саюзных рэспубліках пачалася распрацоўка адпаведных праектаў уласных канстытуцый. Ужо ў ліпені 1977 г. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І.Я. Палякоў заклікаў стварыць Канстытуцыйную камісію. Яна, па словах І.Я. Палякова, павінна падрыхтаваць праект, які ў снежні таго ж года можна будзе вынесці на ўсенароднае абмеркаванне, а ў пачатку 1978 г. канстытуцыйны праект разгледзець на пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

Камісію па падрыхтоўцы праекта новай Канстытуцыі БССР узначаліў Першы сакратар ЦК КПБ П.М. Машэраў. Членамі камісіі ў колькасці 57 чалавек у асноўным сталі прадстаўнікі савецкіх дзяржаўных і партыйных органаў, рэдактары вядучых газет. У склад камісіі былі таксама ўключаны прадстаўнікі самых розных, у асноўным працоўных прафесій. Першае пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі адбылося ў лютым 1978 г. Старшыня камісіі П.М. Машэраў паведаміў, што праект Асноўнага Закона практычна гатовы і ўжо адобраны ЦК КПСС. П.М. Машэраў заявіў аб неабходнасці вынясення праекта на ўсенароднае абмеркаванне. У сакавіку 1978 г. праект быў апублікаваны ў друку. Усяго паступіла 334 тыс. прапаноў і заўваг грамадзян, было праведзена 70 тыс. сходаў, у якіх прынялі ўдзел каля 6 млн чалавек. У ходзе дапрацоўкі праекта ў яго былі ўнесены пэўныя змены. Істотна была пашырана прэамбула праекта, пэўнай карэкціроўцы падвергліся асобныя артыкулы.

Абноўлены праект Канстытуцыі быў вынесены на абмеркаванне на пазачарговую дзявятую сесію Вярхоўнага Савета дзясятага склікання 13–14 красавіка 1978 г. Са справаздачным дакладам выступіў П.М. Машэраў, які падкрэсліў, што «праект зыходзіць з найважнейшых палажэнняў Канстытуцыі СССР і адлюстроўвае іх з лімітавай паўнатой і выразнасцю». *Адпаведнасць* праекта Канстытуцыі БССР Асноўнаму Закону СССР, па словах П.М. Машэрава, вызначалася «адзінствам



палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай асновы СССР, адзінствам класавай сутнасці, агульнасцю асноў і прынцыпаў … сацыялістычнага быцця, галоўных задач і вышэйшай мэты камуністычнага стварэння».

На гэтай жа сесіі была ўтворана Рэдакцыйная камісія ў складзе 77 чалавек для канчатковай дапрацоўкі праекта Канстытуцыі, у якую ўвайшлі прадстаўнікі кіраўніцкай і інтэлектуальнай эліты, а таксама працоўнага класа. На працягу аднаго дня Рэдакцыйная камісія ўнесла пэўныя змены. 14 красавіка 1978 г. дэпутаты прыступілі да галасавання: праект атрымаў поўную падтрымку і стаў Асноўным Законам. У гэты ж дзень дэпутатамі была зацверджана Дэкларацыя аб прыняцці Канстытуцыі.

**Канстытуцыя БССР 1978 г.** складалася з прэамбулы, 10 частак, 19 раздзелаў, якія ўключалі ў сябе 172 артыкулы.

*Прэамбула,* якая ўпершыню была ўключана ў Канстытуцыю БССР, утрымлівала спрэчнае палажэнне, што беларусы «з дапамогай рускага пралетарыяту *ўпершыню* ў гісторыі здабылі сваю дзяржаўнасць, утварыўшы БССР». У *першую частку* Канстытуцыі, якая называлася «Асновы грамадскага ладу і палітыкі БССР», былі ўключаны палажэнні аб палітычнай і эканамічнай сістэме, адзначалася кіруючая і накіроўваючая роля КПСС у жыцці грамадства і дзяржавы. *Другая частка* «Дзяржава і асоба» была прысвечана грамадзянству БССР, пытанням забеспячэння раўнапраўя грамадзян і асноўным правам, свабодам і абавязкам грамадзян рэспублікі. Прадугледжвалася *роўнасць* усіх грамадзян перад законам. У *трэцяй часцы «*Нацыянальна-дзяржаўнае і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне БССР» гаварылася аб становішчы рэспублікі ў складзе Саюза ССР і правамоцтвах БССР. *У чацвёртай частцы* «Саветы народных дэпутатаў і парадак іх выбрання» замацоўвалася сістэма і прынцыпы дзейнасці Саветаў народных дэпутатаў, выбарчая сістэма, асновы прававога статуса народнага дэпутата. Замацоўвалася новае найменне органаў улады – з Саветаў дэпутатаў працоўных яны ператварыліся ў **Саветы народных дэпутатаў**. *Пятая частка* «Вышэйшыя органы ўлады і кіравання Беларускай ССР» вызначала месца і ролю **Вярхоўнага Савета** як вышэйшага органа дзяржаўнай улады рэспублікі, парадак фарміравання і дзейнасці **Прэзідыума Вярхоўнага Савета**, а таксама склад і кампетэнцыю ўрада – **Савета Міністраў БССР**.

Як адзначае Т.І. Доўнар (у падручніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»), астатнія часткі і раздзелы Канстытуцыі былі прысвечаны парадку фарміравання і дзейнасці мясцовых Саветаў і іх выканкамаў, дзяржаўнаму плану эканамічнага і сацыяльнага развіцця і дзяржаўнаму бюджэту рэспублікі, правасуддзю, арбітражу, пракурорскаму нагляду і інш.

## 5. Сістэмны крызіс у СССР.
## Спробы рэфармавання палітычнай сістэмы

У сярэдзіне 80-х гг. XX ст. крызісныя з'явы ў жыцці савецкага грамадства хутка нарасталі. Перад вышэйшым партыйным і дзяржаўным кіраўніцтвам паўстала задача спыніць распад сістэмы сацыялізму.

У вышэйшае кіраўніцтва СССР у пачатку 80-х гг. XX ст. прыйшлі адносна маладыя палітыкі, якія выступалі за абнаўленне дзяржавы і грамадства. У сакавіку 1985 г. Генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны М.С. Гарбачоў. У сваім выступленні на красавіцкім (1985 г.) Пленуме ЦК КПСС ён аб'явіў аб планах усебаковага абнаўлення грамадства. Але ў гарбачоўскай адміністрацыі адсутнічала распрацаваная канцэпцыя гэтых дзеянняў, таму прынятыя рашэнні *не накіроўвалі* працэсы, якія адбываліся ў грамадстве, а ў большасці выпадкаў *ішлі за імі*. Асноўная ідэя канцэпцыі «паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны» спачатку была разлічана на хуткі ўздым эканомікі за кошт пераразмеркавання фінансавых сродкаў і новай структурнай палітыкі. Вынікі 1985 г. паказалі, што адміністрацыйныя меры ў эканоміцы выратаваць справы не могуць. Таму на XXVII з'ездзе КПСС у лютым 1986 г. прыйшлі да высновы, што канцэпцыю паскарэння трэба скіраваць і на грамадскія адносіны. З'езд зацвердзіў новую Праграму партыі, у якой замест палажэнняў аб пабудове камунізму быў абвешчаны курс на ўдасканаленне сацыялізму.

У студзені 1987 г. адбыўся Пленум ЦК КПСС, на якім канстатавалася пашырэнне крызісных з'яў у грамадстве і неабходнасць працягнуць пераўтварэнні, якія атрымалі назву **«перабудова»**.

Сутнасць рэформаў у эканоміцы – гэта *пераход* ад адміністрацыйных да эканамічных метадаў кіравання народнай гаспадаркай. Стрыжнем пераўтварэнняў у палітыцы аб'яўлялася дэмакратызацыя ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства, рэфармаванне палітычных інстытутаў і на гэтым падмурку стварэнне новай мадэлі грамадства – *«сацыялізму з чалавечым тварам»*. Была зроблена выснова аб неабходнасці правядзення радыкальных змен палітычнай сістэмы з абавязковай адмовай партыі ад сваёй кіруючай функцыі і перадачай рэальнай дзяржаўнай улады Саветам. Прадугледжвалася рэфармаванне вышэйшых органаў улады ў краіне, што павінна было рэалізавацца ў скліканні і працы **з'ездаў народных дэпутатаў СССР**.

Падрыхтоўка да выбараў народных дэпутатаў СССР, якія былі прызначаны на сакавік 1989 г., у БССР, як і ва ўсёй краіне, праходзіла ў абставінах вялікай актыўнасці насельніцтва, адкрытай і напружанай барацьбы. Усяго ад Беларусі на з'езд было абрана 60 народных дэпутатаў.



У маі 1989 г. пачаў сваю работу I з'езд народных дэпутатаў СССР, які стаў арэнай вострай палітычнай дыскусіі. З'езд абраў М.С. Гарбачова Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР як пастаянна працуючага парламента, прыняў рашэнне аб неабходнасці распрацоўкі новай канстытуцыі, зацвердзіў вышэйшых дзяржаўных кіраўнікоў, утварыў парламенцкія камісіі. З'езд закончыўся ўтварэннем дзвюх груповак сярод яго ўдзельнікаў: памяркоўнай на чале з М.С. Гарбачовым і радыкальнай – у выглядзе Міжрэгіянальнай дэпутацкай групы, у якую ўвайшлі Б.М. Ельцын і інш.

У студзені 1990 г. у КПСС узнікае ўнутраная апазіцыя – Дэмакратычная платформа, прыхільнікі якой арыентаваліся на адмену прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму і пераўтварэнне КПСС у партыю парламенцкага тыпу. Паралельна ў партыі актывізуюцца цэнтрысцкая і артадаксальная плыні, што сведчыла аб паглыбленні крызісу. У сакавіку 1990 г. адбыўся III з'езд народных дэпутатаў, які адмяніў артыкул 6 Канстытуцыі СССР (аб выключнай ролі КПСС) і абраў **М.С. Гарбачова** першым **Прэзідэнтам СССР**.

Важную ролю ў палітычнай рэформе адыграла абнаўленне выбарчай сістэмы ў саюзных і аўтаномных рэспубліках, у тым ліку і ў БССР. Выбары па-новаму ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы адбыліся 4 сакавіка 1990 г. У маі 1990 г. адбылася першая сесія Вярхоўнага Савета рэспублікі, на якой Старшынёй быў абраны М.І. Дземянцей. Вярхоўны Савет БССР разгарнуў заканадаўчую дзейнасць, накіраваную на рэфармаванне эканомікі, палітычнай сістэмы, усяго ладу жыцця.

У адпаведнасці з рэформай палітычнай сістэмы ў 1990 г. быў прыняты Закон СССР «Аб грамадскіх арганізацыях». Насельніцтва атрымала правы на стварэнне суполак і таварыстваў, а таксама палітычных партый. Утварэнне палітычных партый і аб'яднанняў сведчыла аб глыбокіх зменах у грамадскім жыцці. Шматпартыйнасць азначала канец манаполіі камуністаў на ўладу.

## 6. Дэзінтэграцыйныя працэсы ў СССР.
## Абвяшчэнне 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўным Саветам БССР поўнага дзяржаўнага суверэнітэту БССР

Няздольнасць агульнасаюзных органаў улады паспяхова кантраляваць становішча ў дзяржаве, рэзкае падзенне тэмпаў сацыяльна-эканамічнага развіцця падштурхнулі саюзныя рэспублікі самастойна шукаць выйсце з глыбокага крызісу. Актывізаваліся і перайшлі ў «гарачую фазу» жорсткія міжнацыянальныя канфлікты ў шэрагу рэспублік СССР.

У лістападзе 1988 г. Эстонія прыняла Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце, якой абвясціла вяршэнства законаў рэспублікі над агульнасаюзнымі. Пасля выбараў у рэспубліканскія і мясцовыя Саветы вясной 1990 г., на якіх большасць галасоў атрымалі прыхільнікі самастойнага развіцця рэспублік, дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце прынялі Літва, Латвія, Арменія, Грузія і Малдова. 12 чэрвеня 1990 г. адпаведны дакумент з'явіўся ў РСФСР.

Улічваючы гэтыя абставіны, **Вярхоўны Савет БССР 27 ліпеня 1990 г.** прыняў **Дэкларацыю «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»**. Яна складаецца з прэамбулы і 12 артыкулаў. Артыкул 7 устанавіў на тэрыторыі Беларусі вяршэнства Канстытуцыі і законаў БССР. Артыкул 11 падкрэслівае самастойнае ажыццяўленне правоў БССР на добраахвотныя саюзы з іншымі дзяржавамі і свабодны выхад з гэтых саюзаў і адначасова прапануе неадкладна прыступіць да распрацоўкі Дагавора аб Саюзе суверэнных сацыялістычных дзяржаў.

Імкненне рэспублік да самастойнасці прымусіла кіраўніцтва СССР актывізаваць працэс па падрыхтоўцы і заключэнні *новага* саюзнага дагавора. 12 сакавіка 1991 г. рэспубліканскія газеты надрукавалі праект «Дагавора аб Саюзе Суверэнных Рэспублік» з 4 раздзелаў і 25 артыкулаў. Каб спыніць крызіс федэратыўных адносін, Вярхоўны Савет СССР вырашыў правесці 17 сакавіка 1991 г. **Усесаюзны рэферэндум** па пытанні аб неабходнасці захавання СССР. У ім прынялі ўдзел каля 80 % грамадзян.

За захаванне рэфармаванага СССР выказаліся 76,4 % удзельнікаў рэферэндуму. 23 красавіка 1991 г. у рэзідэнцыі М.С. Гарбачова пад Масквой адбылася сустрэча кіраўнікоў дзевяці рэспублік (Расіі, Украіны, Беларусі, Казахстана, Узбекістана, Туркменіі, Кіргізіі, Таджыкістана, Азербайджана) і Прэзідэнта СССР, атрымаўшая назву «9 + 1». Выйсце з крызісу федэратыўных адносін удзельнікі нарады знайшлі ў прыняцці тэксту новага саюзнага дагавора, падпісанне якога вырашылі правесці 20 жніўня 1991 г.

## 7. Скасаванне СССР. Прававое замацаванне беларускага дзяржаўнага суверэнітэту

Вынікі рэферэндуму дазволілі Прэзідэнту СССР М.С. Гарбачову прадпрыняць больш актыўныя крокі на шляху да ўмацавання СССР. Адначасова актывізавалі свае намеры і кансерватыўныя сілы – на красавіцкім (1991г.) Пленуме ЦК КПСС было прынята рашэнне правесці ў верасні 1991 г. з'езд КПСС, а затым – З'езд народных дэпутатаў СССР (каб *адлучыць* М.С. Гарбачова ад пасады Прэзідэнта СССР).

М.С. Гарбачоў планаваў хутчэй заключыць *новы саюзны дагавор*, аднак працэдура ўзгаднення з саюзнымі рэспублікамі зацягвалася. Вярхоўны



Савет СССР 12 ліпеня 1991 г. прыняў пастанову «Аб праекце Дагавора аб Саюзе Суверэнных Дзяржаў», у якой прызнаў магчымым падпісаць Дагавор пасля адпаведнай дапрацоўкі і ўзгаднення. 15 жніўня 1991 г. чарговы, узгоднены з рэспублікамі, праект Дагавора аб ССД быў надрукаваны, на 20 жніўня 1991 г. меркавалася яго падпісанне. Імкнучыся не дапусціць падпісання новага дагавора, у ноч на **19 жніўня 1991 г.** віцэ-прэзідэнт СССР Г.І. Янаеў выдаў Указ аб сваім уступленні на пасаду Прэзідэнта (фармальна – з-за «хваробы» М.С. Гарбачова, які быў ізаляваны ў Крыму). Г.І. Янаеў і яго аднадумцы стварылі Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ДКНС) і абвясцілі 19 жніўня «Заяву савецкага кіраўніцтва», «Зварот да кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў і Генеральнага сакратара ААН», у якіх паведамлялася аб перадачы ДКНС усёй паўнаты ўлады ў краіне. Пастановамі № 1 і 2 ДКНС у асобных рэгіёнах краіны было ўведзена надзвычайнае становішча, абвешчаны расфарміраванымі асобныя структуры ўлады, якія не адпавядалі Канстытуцыі СССР 1977 г., спынена дзейнасць апазіцыі. У г. Маскву былі ўведзены войскі, забаронены мітынгі і дэманстрацыі, устаноўлены жорсткі кантроль над СМІ.

Барацьбу з ДКНС узначаліў Прэзідэнт Расіі Б.М. Ельцын. У яго звароце да насельніцтва пераварот быў названы антыканстытуцыйным, а ДКНС – незаконным. Дзясяткі тысяч праціўнікаў ДКНС занялі абарону вакол Дома Саветаў Расіі. Апошні стаў штаб-кватэрай Б.М. Ельцына, якога 21 жніўня падтрымаў Вярхоўны Савет Расійскай Федэрацыі. Члены ДКНС не рызыкнулі масава прымяніць ваенную сілу, іх выступленне было падаўлена, а яны арыштаваны. Правал жнівеньскага путчу 1991 г. стварыў спрыяльныя ўмовы на шляху да рэалізацыі дзяржаўнага суверэнітэту саюзных рэспублік. Паведамленні з Масквы аб перамозе Б.М. Ельцына над путчыстамі і прыпыненне дзейнасці КПСС выклікалі разгубленнасць сярод беларускай партнаменклатуры, і яна падтрымала ідэю нацыянальна-дэмакратычных сіл аб абвяшчэнні незалежнасці.

Скліканая 24 жніўня 1991 г. 5-я нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР адазвала з пасады Старшыні М.І. Дземянцея. **25 жніўня** былі прыняты **Закон «Аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» і пастанова «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР»**. Гэтымі актамі абвяшчалася палітычная і эканамічная незалежнасць рэспублікі. Была зменена назва рэспублікі – 19 верасня прынята рашэнне Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку далей называць «Рэспубліка Беларусь», а ў скарочаных назвах «Беларусь». Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь быў абраны С.С. Шушкевіч. Паводле Закона ад 25 жніўня 1991 г. «Аб некато-

рых змяненнях у сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Беларускай ССР» саюзна-рэспубліканская МУС і КДБ БССР былі пераўтвораны ў рэспубліканскія. Важным крокам на шляху ўмацавання суверэнітэту Беларусі з'явілася стварэнне ўласнага войска – у сакавіку 1992 г. пачало дзейнічаць Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

8 снежня 1991 г. у рэзідэнцыі беларускага ўрада Віскулі С.С. Шушкевіч разам з прэзідэнтамі Расіі Б.М. Ельцыным і Украіны Л.М. Краўчуком падпісалі пагадненне аб фармальнай ліквідацыі СССР і стварэнні **Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)**. Да сферы сумеснай дзейнасці дзяржаў у СНД была аднесена каардынацыя знешняй палітыкі, супрацоўніцтва ў межах агульнай палітычнай прасторы, еўрапейскага і азіяцкага рынкаў, мытнай палітыкі, у развіцці транспарту і сувязі, у галіне абароны навакольнага асяроддзя, удзел у стварэнні ўсеабдымнай міжнароднай сістэмы эканамічнай бяспекі, пытанні міграцыйнай палітыкі, барацьба з арганізаванай злачыннасцю. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 10 снежня 1991 г. ратыфікаваў пагадненне аб утварэнні СНД і прыняў пастанову аб дэнансацыі Дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР.

### Дадатковая літаратура

Абрамович, А.М. Правовой статус советского гражданина / А.М. Абрамович ; под ред. В.И. Шабайлова ; АН БССР, Ин-т истории и права. – Минск : Наука и техника, 1988. – 91 с.

Вихарев, С.Р. Суверенитет БССР в составе СССР / С.Р. Вихарев. – Минск : Изд-во БГУ, 1958. – 128 с.

Кучинский, В.А. Верховный Совет Белорусской ССР – высший орган государственной власти республики : автореф. дис. ... канд. юрид. наук / В.А. Кучинский ; Акад. наук СССР, Ин-т государства и права. – М., 1962. – 20 с.

Мартинович, И.И. История суда в БССР (1917–1960 гг.) / И.И. Мартинович. – Минск : МВССПО БССР, 1961. – 174 с.

Несцяровіч, М.Б. Палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-х гг. XX ст. / М.Б. Несцяровіч, В.Г. Мазец, С.М. Хоміч // Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці : XX стагоддзе / М.П. Касцюк [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – С. 337–523.

Органы государственного управления БССР (1919–1967). – Минск : Наука и техника, 1968. – 327 с.

### Пытанні для самакантролю

Як змянілася геапалітычнае становішча БССР пасля перамогі СССР у Другой сусветнай вайне?



Ахарактарызуйце стан сельскай гаспадаркі ў БССР у пасляваенны перыяд.

Якое значэнне ў справе вызначэння стратэгіі далейшага развіцця савецкага грамадства меў XX з'езд КПСС 1956 г.?

Чаму перыяд праўлення М.С. Хрушчова называюць «адлігай»?

Які з'езд КПСС абвясціў аб уступленні СССР у перыяд разгорнутага будаўніцтва сацыялізму?

Якая эпоха прыйшла на змену «адлізе» пасля вызвалення М.С. Хрушчова ад усіх пасад?

Якія наступствы для палітычнага развіцця краіны мела заканадаўчае замацаванне манаполіі КПСС на ўладу і ўсталяванне прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму ў партбудаўніцтве?

Як пашырылася кампетэнцыя вышэйшых органаў дзяржаўнай улады рэспублікі ў сувязі з прыняццем у ліпені 1947. г. Закона «Аб змяненні і дапаўненні тэксту Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай ССР»?

Назавіце аддзелы, якія ўваходзілі ў склад Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у пасляваенны перыяд.

Вызначыце два галоўныя кірункі дзейнасці пастаянных камісій Вярхоўнага Савета згодна з палажэннем аб гэтых установах, што ўступіла ў дзеянне ў 1960 г.

Якія ў СССР у 1957 г. адбыліся змены ў сферы кіраўніцтва народнай гаспадаркай?

Пры якіх абставінах БССР стала краінай – заснавальніцай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый?

З якой мэтай у СССР пачалі прымацца Асновы заканадаўства па розных галінах права?

Колькі Вярхоўным Саветам БССР было прынята заканадаўчых актаў з 1959 па 1967 г.?

За якія злачынствы прадугледжвалася ў Асновах крымінальнага заканадаўства 1958 г. смяротная кара як выключная і часовая мера?

Калі быў прыняты і ўведзены ў дзеянне новы Крымінальны кодэкс Беларускай ССР?

Назавіце асноўную крыніцу Канстытуцыі БССР 1978 г.

Хто ўзначальваў Камісію па падрыхтоўцы праекта новай Канстытуцыі БССР?

Якія асноўныя структурныя элементы Канстытуцыі БССР 1978 г.?

Чаму прысвечана другая частка «Дзяржава і асоба» Канстытуцыі БССР 1978 г.?

Хто быў абраны Генеральным сакратаром ЦК КПСС у сакавіку 1985 г.?

У чым асноўная ідэя канцэпцыі «паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны» ў сярэдзіне 80-х гг. XX ст.?

Які план развіцця савецкага грамадства быў зацверджаны ў новай праграме партыі на XXVII з'ездзе КПСС у лютым 1986 г. замест палажэнняў аб пабудове камунізму?

У чым сутнасць палітыкі «перабудовы»?

Калі пачаў сваю работу Першы з'езд народных дэпутатаў СССР?

Чаму і калі Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»?

Якія былі вынікі Усесаюзнага рэферэндуму па пытанні аб неабходнасці захавання СССР, праведзенага 17 сакавіка 1991 г.?

Якімі палітычнымі сіламі і з якой мэтай быў створаны Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ДКНС)?

Якія кіраўнікі савецкіх рэспублік 8 снежня 1991 г. у рэзідэнцыі беларускага ўрада Віскулі падпісалі пагадненне аб фармальнай ліквідацыі СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)?

## Тэсты

1. Калі Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб пераўтварэнні Савета Народных Камісараў БССР у Савет Міністраў БССР»?

а) 1943 г.;
б) 1944 г.;
в) 1945 г.;
г) 1946 г.

2. У якім годзе Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон «Аб зацвярджэнні Грамадзянска-працэсуальнага кодэкса Беларускай ССР»?

а) 1967 г.;
б) 1966 г.;
в) 1965 г.;
г) 1964 г.

3. Апошняя савецкая Канстытуцыя Беларускай ССР, пабудаваная ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР, была прынята 14 красавіка:

а) 1975 г.;
б) 1976 г.;
в) 1977 г.;
г) 1978 г.

4. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі 27 ліпеня:

а) 1990 г.;
б) 1991 г.;
в) 1992 г.;
г) 1994 г.

5. Калі ў СССР была ажыццёўлена перабудова кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, калі замест сістэмы міністэрстваў, арганізаваных па галіновым



прынцыпе, для кіраўніцтва народнай гаспадаркай была створана сістэма саўнаргасаў (Саветаў народнай гаспадаркі)?

а) 1957 г.;
б) 1941 г.;
в) 1953 г.;
г) 1964 г.

6. У адпаведнасці з Дагаворам 1999 г. вышэйшым заканадаўчым органам Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі павінен быў стаць:

а) Вышэйшы Савет Саюза;
б) Парламент Саюзнай дзяржавы, які павінен быў складацца з Палаты Саюза і Палаты прадстаўнікоў;
в) Вышэйшы Дзяржаўны Савет;
г) Парламенцкі Сход Саюза.

7. Раздзел 5 Канстытуцыі БССР 1978 г. «Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання БССР» змяшчаў нормы, якія вызначалі месца і ролю вышэйшага органа дзяржаўнай улады рэспублікі, парадак фарміравання і дзейнасці яго Прэзідыума. Гэтым органам быў:

а) Вярхоўны Савет БССР;
б) Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі;
в) Цэнтральны выканаўчы камітэт;
г) Вярхоўны Суд БССР.

8. 27 лютага 1991 г. быў прыняты Закон БССР «Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў БССР», у артыкуле 1 якога сцвярджалася, што «ўся ўлада ў БССР належыць народу Беларускай ССР, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы. Выключнае права выступаць ад імя ўсяго народа рэспублікі належала ў адпаведнасці з гэтым законам:

а) Прэм'ер-міністру;
б) Вярхоўнаму Савету;
в) Прэзідэнту;
г) Канстытуцыйнаму Суду.

9. У 1990 – пачатку 1991 г. кіраўніцтва Вярхоўнага Савета БССР выступала за:

а) добраахвотнае аб'яднанне раўнапраўных савецкіх рэспублік у адзіную федэратыўную дзяржаву;
б) аўтаномію БССР у складзе СССР;
в) утварэнне агульнай унітарнай дзяржавы ў складзе Расіі, Украіны і Беларусі.

10. У Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР «Аб дзяржаўным суверэнітэце БССР»:

а) абвяшчаўся поўны дзяржаўны суверэнітэт БССР;
б) пацвярджаўся суверэнітэт БССР як суверэннай сацыялістычнай дзяржавы;
в) абвяшчалася незалежнасць Беларусі і дэклараваўся яе выхад са складу СССР.

## Заданні

1. Якія выявы належаць наступным гістарычным асобам: Кірыл Мазураў, Леанід Брэжнеў, Пётр Машэраў, Ціхан Кісялёў?










2. Вызначыце на карце буйнейшыя прамысловыя цэнтры, створаныя ў БССР у пасляваенны перыяд.

3. Вызначыце на карце раёны БССР, якія найбольш пацярпелі ад наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

## Прыкладныя тэмы рэфератаў

Партыйныя камітэты УКП(б) – КПСС і іх роля ў дзяржаўным кіраванні СССР.

Асаблівасці дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў пасляваенны перыяд.

Праваахоўныя органы і прававое рэгуляванне іх дзейнасці.

Змены ў дзейнасці суда, пракуратуры і іншых праваахоўных органаў у другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. ХХ ст.

Кадыфікацыя ў БССР у 1970–1980-х гг.

Змены ў Канстытуцыі БССР 1978 г.

Заканадаўчая дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР у 1990–1991 гг.

Удзел БССР у выпрацоўцы новага саюзнага дагавора.

Апошнія спробы рэфармавання СССР.

Змены ў структуры і кампетэнцыі вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і кіравання БССР у пасляваенны перыяд.

ХХ з’езд КПСС 1956 г.: спрэчкі і дыскусіі навукоўцаў.

Спробы правядзення дзяржаўнай рэформы. Утварэнне Саўнаргаса БССР.

Змены ў дзейнасці суда, пракуратуры і іншых праваахоўных органаў БССР у пасляваенны перыяд.

Мясцовыя саветы народных дэпутатаў і іх выканкамы ў БССР.

Міжнародная правасуб’ектнасць БССР.

БССР – краіна – заснавальніца Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

Сістэмны крызіс у СССР.

Абвяшчэнне поўнага дзяржаўнага суверэнітэту БССР.

Апошнія спробы пераўтварыць СССР у канфедэратыўны саюз суверэнных дзяржаў.

Адказы на тэсты: 1 – г); 2 – г); 3 – г); 4 – а); 5 – а);
6 – б); 7 – а); 8 – б); 9 – а); 10 – а).

# ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ І ПРАВА СУВЕРЭННАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1991 г. – пачатак XXI ст.)

**Пытанні тэмы**

*1. Фарміраванне асноў дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржаўнасці. Першая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і яе палітыка-прававая эвалюцыя.*

*2. Дзяржаўны лад Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.*

*3. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.*

## 1. Фарміраванне асноў дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржаўнасці. Першая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і яе палітыка-прававая эвалюцыя

Ва ўмацаванні дзяржаўнага ладу незалежнай Рэспублікі Беларусь важнае значэнне мела выпрацоўка і прыняцце Канстытуцыі. Праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь распрацоўваўся на працягу некалькіх гадоў Канстытуцыйнай камісіяй, у склад якой увайшлі дэпутаты Вярхоўнага Савета і вядучыя навукоўцы ў галіне права. Яны зыходзілі з таго, што асновай дзяржавы павінен з'яўляцца палітычны і эканамічны плюралізм, арыентаваліся на міжнародна-прававыя нормы ў вобласці забеспячэння правоў чалавека. У новым Асноўным Законе былі замацаваны агульнапрызнаныя правы і свабоды чалавека з вызначэннем неабходных гарантый іх рэалізацыі.

На працягу 1992–1994 гг. Вярхоўны Савет стаў арэнай жорсткай палітычнай барацьбы па абвостраных праблемах эканамічнага жыцця, вызначэння палітычнага статуса дзяржавы, будучага дагавора з Расійскай Федэрацыяй. У парламенце разгарэўся канфлікт па пытанні прэзідэнцтва паміж апазіцыяй і большасцю дэпутатаў, якія падтрымлівалі Прэм'ер-міністра В.Ф. Кебіча. Апазіцыя намагалася мінімізаваць



значэнне кіраўніка дзяржавы (на іх думку, палітычная традыцыя Беларусі патрабавала парламенцкага кіравання) і прапанавала, каб кандыдаты на пасаду Прэзідэнта абіраліся Вярхоўным Саветам. Праўрадавая большасць падтрымлівала варыянт Канстытуцыі, у якой будучы Прэзідэнт надзяляўся правамі поўнага кантролю за выканаўчай уладай.

Прэзідэнцкія выбары, прызначаныя на чэрвень 1994 г., прымушалі розныя палітычныя лагеры да ўзмоцненай палітычнай актыўнасці. У гэтай сітуацыі ўзрастаў палітычны рэйтынг А.Р. Лукашэнкі, тагачаснага старшыні парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй.

**15 сакавіка 1994 г.** Вярхоўны Савет прыняў новую **Канстытуцыю** – Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя аб'яўляла Рэспубліку Беларусь **унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай**. Вышэйшым прадстаўнічым заканадаўчым органам у Рэспубліцы Беларусь аб'яўляўся **Вярхоўны Савет**, які складаўся з 260 дэпутатаў, абраных тэрмінам на 5 гадоў. Вялікую ўвагу надавала Канстытуцыя статусу **Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**. Кіраўнік дзяржавы і выканаўчай улады ў Рэспубліцы Беларусь абіраўся непасрэдна народам тэрмінам на 5 гадоў. У Канстытуцыі рэгламентавалася дзейнасць **Кабінета Міністраў**, члены якога прызначаліся і вызваляліся ад пасады Прэзідэнтам, замацоўваліся асновы арганізацыі і дзейнасці судоў і інш.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй выбары першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбыліся ў чэрвені 1994 г. У прэзідэнцкую кампанію ўключыліся А.Р. Лукашэнка, В.Ф. Кебіч, С.С. Шушкевіч, З.С. Пазняк, В. Новікаў (ад камуністаў) і А. Дубко. Пераможцам першага тура выбараў 19 чэрвеня стаў А.Р. Лукашэнка. У наступным туры выбараў 10 ліпеня амаль 80 % выбаршчыкаў **першым Прэзідэнтам Беларусі абралі Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку**. Важнымі палажэннямі передвыбарнай праграмы Прэзідэнта былі: барацьба з карупцыяй і злачыннасцю, забеспячэнне суверэнітэту, эканамічнай і палітычнай стабільнасці рэспублікі, правядзенне курсу на рэфармаванне грамадскіх адносін, паляпшэнне матэрыяльнага становішча народа.

З мэтай забеспячэння эфектыўнасці дзяржаўнай палітыкі было праведзена *рэфармаванне* сістэмы выканаўчай улады. Ствараліся Адміністрацыя Прэзідэнта, скразная *вертыкальная структура*, якая ўключыла ў сябе выканаўчыя і распарадчыя органы як у *цэнтры*, *так* і на *месцах*.

**14 мая 1995 г.** быў праведзены **першы рэспубліканскі рэферэндум**. За наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай прагаласавалі 83,3 % тых, хто прымаў удзел у галасаванні. Прапанову аб усталяванні новых узораў дзяржаўнага сцяга і герба Рэспублікі Беларусь падтрымалі 75,1 % выбаршчыкаў. За ўхваленне дзеянняў Прэзідэнта, накіраваных на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй, выказаліся 83,3 % вы-

баршчыкаў. На пытанне аб згодзе з неабходнасцю ўнясення змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі, 77,7 % выбаршчыкаў адказалі станоўча.

**24 лістапада 1996 г.** ва ўмовах абвостранай канфрантацыі ў грамадстве, а таксама супрацьстаяння апазіцыйна настроенай часткі Вярхоўнага Савета і Прэзідэнта адбыўся **другі рэспубліканскі рэферэндум**. За прыняцце змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, прапанаваных Прэзідэнтам, прагаласавала 70,45 % грамадзян, унесеных у спісы для галасавання. На гэтым жа рэферэндуме была падтрымана прапанова Прэзідэнта аб перанясенні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь з 27 ліпеня на 3 ліпеня («За» прагаласавалі 88,18 % выбаршчыкаў). Большая частка ўдзельнікаў рэферэндуму таксама выказаліся супраць свабоднай, без абмежаванняў, куплі і продажу зямлі сельскагаспадарчага прызначэння (82,88 %) і супраць адмены ў Рэспубліцы Беларусь смяротнай кары (80,44 %). Паводле новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кіраўніком дзяржавы з'яўляецца Прэзідэнт. Замест аднапалатнага Вярхоўнага Савета быў сфарміраваны двухпалатны парламент – Нацыянальны сход, які складаецца з Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Пашыраны правы і паўнамоцтвы Савета Міністраў, зменены парадак прызначэння асоб на некаторыя дзяржаўныя пасады і вызваленне гэтых асоб ад пасад у адпаведнасці з Канстытуцыяй і заканадаўствам.

**17 кастрычніка 2004 г.** быў праведзены **трэці рэспубліканскі рэферэндум**, па выніках якога былі ўнесены змяненні ў Канстытуцыю – *скасавана* абмежаванне, па якому выбірацца на пасаду Прэзідэнта магчыма было толькі на два тэрміны («За» выказаліся 79,42 % выбаршчыкаў).

Сведчаннем падтрымкі насельніцтвам Прэзідэнта з'явіліся новыя выбары, якія адбыліся ў 2001, 2006, 2011 і 2015 гг. – яны зноў прынеслі перамогу А.Р. Лукашэнку.

## 2. Дзяржаўны лад Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе

Рэспубліка Беларусь – унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава (артыкул 1 раздзела 1 Канстытуцыі). Форма праўлення ў краіне большасцю даследчыкаў характарызуецца як прэзідэнцкая рэспубліка.

Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку. Рэспубліка Беларусь абараняе сваю незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць, канстытуцыйны лад, забяспечвае законнасць і правапарадак. Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы. Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ. Народ ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй (артыкул 3 раздзела 1 Канстытуцыі). Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове падзелу яе на заканадаўчую, выканаўчую і судовую (артыкул 6 раздзела 1 Канстытуцыі). У Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршэнства права. Дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй актаў заканадаўства (артыкул 7 раздзела 1 Канстытуцыі).

**Прэзідэнт** Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Прэзідэнт выбіраецца на 5 гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове *ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога* выбарчага права пры тайным галасаванні (артыкул 81 раздзела 4 Канстытуцыі).

Парламент – **Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь** з'яўляецца прадстаўнічым і *заканадаўчым* органам Рэспублікі Беларусь. Выбранне дэпутатаў **Палаты прадстаўнікоў** ажыццяўляецца ў адпаведнасці з законам на аснове *ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога* выбарчага права пры тайным галасаванні. **Савет Рэспублікі** з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Ад кожнай вобласці і горада Мінска тайным галасаваннем выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў **мясцовых Саветаў дэпутатаў** кожнай вобласці і горада Мінска па восем членаў Савета Рэспублікі. Восем членаў Савета Рэспублікі назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

*Выканаўчую* ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе Урад – **Савет Міністраў** Рэспублікі Беларусь – цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання. Урад у сваёй дзейнасці падсправаздачны Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і адказны перад Парламентам Рэспублікі Беларусь. Урад Рэспублікі Беларусь складаецца з **Прэм'ер-міністра**, яго намеснікаў і міністраў.

*Судовая* ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належыць судам. Сістэма судоў будуецца на прынцыпах тэрытарыяльнасці і спецыялізацыі. Правасуддзе ажыццяўляецца на аснове спаборнасці і роўнасці бакоў у працэсе. Судовая сістэма складаецца з Канстытуцыйнага суда і сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі. Кантроль за канстытуцыйнасцю нарматыўных актаў у дзяржаве ажыццяўляецца Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь. Сістэма судоў агульнай юрысдыкцыі складаецца: з **Вярхоўнага Суда** Рэспублікі Беларусь; **абласных** (Мінскага гарадскога) судоў; **раённых (гарадскіх)** судоў; **эканамічных судоў** абласцей і г. Мінска.

Мясцовае кіраванне і самакіраванне ажыццяўляецца грамадзянамі праз мясцовыя **Саветы дэпутатаў**, выканаўчыя і распарадчыя органы, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, мясцовыя рэферэндумы, сходы і іншыя формы прамога ўдзелу ў дзяржаўных і грамадскіх справах (артыкул 117 раздзела 5 Канстытуцыі).

## 3. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе

Новыя грамадскія з'явы і падзеі запатрабавалі радыкальнага перагляду і абнаўлення заканадаўства рэспублікі. За два гады, з 1990 г. па май 1992 г., Вярхоўны Савет прыняў 153 новыя заканадаўчыя акты, у тым ліку акты канстытуцыйнага заканадаўства «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР», пастанову «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР» і інш. У Беларусі пачаўся новы этап развіцця беларускай дзяржаўнасці і права, на які аказалі ўплыў як змяненні ў эканоміцы, палітыцы, сацыяльнай сферы рэспублікі, так і агульныя тэндэнцыі развіцця краін СНД і сусветнага супольніцтва ў цэлым.

Пачынаецца працэс *рэфармавання* сістэмы органаў судовай улады. У красавіку 1992 г. Вярхоўны Савет прыняў пастанову «Аб канцэпцыі судова-прававой рэформы ў Рэспубліцы Беларусь», якая з'явілася прававой асновай карэннай перабудовы сістэмы праваахоўных органаў. Галоўнымі мэтамі рэформы аб'яўляліся: стварэнне самастойнай і незалежнай судовай улады як асноўнага гаранта забеспячэння правоў і свабод грамадзян і іншых удзельнікаў праваадносін; заканадаўчае забеспячэнне рэалізацыі дэмакратычных прынцыпаў арганізацыі і дзейнасці праваахоўных органаў, адпавядаючых агульнапрынятым нормам міжнароднага права.

З другой паловы 90-х гг. ХХ ст. значную ролю ў рэгламентацыі разнастайных пытанняў дзяржаўнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь сталі адыгрываць дэкрэты і ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На мяжы ХХ–ХХІ стст. важнай тэндэнцыяй стала актыўная кадыфікацыя заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Былі прыняты новыя кодэксы па важнейшых галінах права.

### Дадатковая літаратура

Божанов, В.А. Конституция Республики Беларусь : политологический анализ : учеб.-метод. пособие / В.А. Божанов. – Минск : РИВШ БГУ, 2001. – 66 с.

Василевич, Г.А. Органы государственной власти Республики Беларусь. Конституционно-правовой статус : учеб. пособие / Г.А. Василевич. – 2-е изд., доп. – Минск : Бип-С, 1999. – 243 с.



Верховный Суд Республики Беларусь: история и современность (1923–1998): к 75-летию Верховного Суда Республики Беларусь / под ред. В.О. Сукало, Л.Л. Зайцевой. – Минск : ИнтерДайджест, 1998. – 236 с.

Правотворческая деятельность в Республике Беларусь / А.В. Матусевич [и др.]. – Минск : Скарына, 1997. – 254 с.

Судебно-правовая реформа: концепция и пути ее реализации в Республике Беларусь : материалы респ. науч.-практ. конф., 26–28 февр. 1992 г., г. Минск. – Минск, 1992.

Чудаков, М.Ф. Конституционный процесс в Беларуси (от Привилея Казимира до Конституции Республики Беларусь) : монография / М.Ф. Чудаков ; Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь. – Минск : Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2008. – 290 с.

### Пытанні для самакантролю

Хто ўваходзіў у склад Канстытуцыйнай камісіі па распрацоўцы новага Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь?

У чым асноўная сутнасць спрэчак у Вярхоўным Савеце на працягу 1992–1994 гг. па праблемах вызначэння палітычнага статусу дзяржавы?

Калі Вярхоўны Савет прыняў новую Канстытуцыю – Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь?

Калі былі праведзены рэспубліканскія рэферэндумы?

Вызначыце форму праўлення Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.

Хто з'яўляецца адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь?

Як фарміруецца Савет Рэспублікі ў якасці палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва?

Які дзяржаўны орган ажыццяўляе выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь?

Якія былі прыняты новыя кодэксы па важнейшых галінах права на мяжы ХХ–ХХІ стст.?

### Тэсты

1. Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы Рэспублікі Беларусь былі ўхвалены Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь 2 і 24 чэрвеня 1999 г., адобраны Саветам Рэспублікі 24 і 30 чэрвеня 1999 г. і былі ўведзены ў дзеянне ў адзін дзень з 1 студзеня:

а) 2000 г.;
б) 2001 г.;
в) 2002 г.;
г) 2003 г.

2. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь 1994 г. (першай рэдакцыі) носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляўся:

а) Беларускі народ (грамадзяне Рэспублікі Беларусь усіх нацыянальнасцей);

б) Нацыянальны сход;

в) Прэзідэнт.

3. Прэзідэнт па Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са зМяненнямі і дапаўненнямі 1996 г. (п. 15 арт. 84):

а) не з'яўляецца кіраўніком выканаўчай улады, але мае права старшынства на пасяджэннях урада;

б) з'яўляецца кіраўніком выканаўчай улады;

в) не з'яўляецца кіраўніком выканаўчай улады і не мае права старшынства на пасяджэннях урада.

4. У адпаведнасці са Статутам, падпісаным 23 мая 1997 г., у Вышэйшы Савет Саюза Расіі і Беларусі ўваходзілі:

а) кіраўнікі дзяржаў – удзельніц Саюза;

б) кіраўнікі ўрадаў дзяржаў – удзельніц Саюза;

в) кіраўнікі палат парламентаў дзяржаў – удзельніц Саюза;

г) старшыня Выканаўчага Камітэта Саюза з правам дарадчага голасу;

д) міністры абароны дзяржаў – удзельніц Саюза;

е) міністры замежных спраў дзяржаў – удзельніц Саюза;

ж) міністры ўнутраных спраў дзяржаў – удзельніц Саюза;

з) усе дэпутаты парламентаў Расіі і Беларусі дзяржаў – удзельніц Саюза.

5. Прэзідэнт па Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (першай рэдакцыі) (арт. 95):

а) з'яўляўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады;

б) не з'яўляўся кіраўніком выканаўчай улады, але меў права старшынства на пасяджэннях урада;

в) з'яўляўся толькі кіраўніком дзяржавы.

6. 27 лютага 1991 г. быў прыняты Закон БССР «Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў БССР», у артыкуле 1 якога сцвярджалася, што «ўся ўлада ў БССР належыць народу Беларускай ССР, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы». Выключнае права выступаць ад імя ўсяго народа рэспублікі ў адпаведнасці з законам належала:

а) Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР;

б) Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь;

в) Прэм'ер-міністру.

7. У адпаведнасці з Дагаворам 1999 г. вышэйшым заканадаўчым органам Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі павінен быў стаць:

а) Парламент Саюзнай дзяржавы, які павінен быў складацца з Палаты Саюза і Палаты прадстаўнікоў;



б) Вышэйшы Савет Саюза;

в) Вышэйшы Дзяржаўны Савет;

г) Парламенцкі Сход Саюза.

8. Што з'яўляецца адным з важнейшых прынцыпаў прававой дзяржавы?

а) размежаванне заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;

б) самастойнае ажыццяўленне права дзяржавы на добраахвотныя саюзы з іншымі дзяржавамі і свабодны выхад з гэтых саюзаў;

в) імкненне зрабіць дзяржаву нейтральнай, а тэрыторыю дзяржавы – бяз'ядзернай зонай.

9. Па першай рэдакцыі Канстытуцыі 1994 г. Рэспубліка Беларусь была:

а) прэзідэнцкай рэспублікай;

б) парламенцкай рэспублікай.

10. З якога часу ў Рэспубліцы Беларусь пачынаецца фарміраванне шматпартыйнай сістэмы?

а) сярэдзіна 1980-х гг.;

б) пачатак 1990-х гг.;

в) канец 1990-х гг.

### Прыкладныя тэмы рэфератаў

Дэнансацыя Саюзнага дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР.

Міжнароднае прызнанне суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Станаўленне суверэннай сістэмы органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь.

Фарміраванне асноў дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь.

Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г. і яе характарыстыка.

Вышэйшыя органы ўлады, кіравання і суда Рэспублікі Беларусь.

Судовы лад і судова-прававая рэформа.

Праваахоўныя органы і прававое рэгуляванне іх дзейнасці.

Кадыфікацыя права ў Рэспубліцы Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст.

Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД).

Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь.

Фарміраванне асноў прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь.

Стварэнне Саюза Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Судовы лад і судова-прававая рэформа ў Рэспубліцы Беларусь.

Адказы на тэсты: 1 – б); 2 – а); 3 – а); 4 – а), б), в), г);
5 – а); 6 – а); 7 – а); 8 – а); 9 – а); 10 – б).

## ЗМЕСТ

**Прадмова** ...3
**Літаратура, на падставе якой складзена тэарэтычная частка вучэбна-метадычнага дапаможніка (па ўсіх тэмах)** ...4
Асноўная літаратура ...4
Дадатковая літаратура ...4
**Гісторыя дзяржавы і права як навука і вучэбная дысцыпліна** ...6
Дадатковая літаратура ...9
Пытанні для самакантролю ...10
Тэсты ...10
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...12
**Дзяржаўнасць і права ўсходніх славян ранняга сярэднявечча (IX – першая палова XIII ст.). Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях** ...13
Дадатковая літаратура ...22
Пытанні для самакантролю ...22
Тэсты ...23
Заданні ...24
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...25
**Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII – першай палове XVI ст. Грамадскі і дзяржаўны лад** ...26
Дадатковая літаратура ...48
Пытанні для самакантролю ...49
Тэсты ...50
Заданні ...52
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...53
**Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – канец XVIII ст.). Асаблівасці грамадскага і дзяржаўнага ладу** ...55
Дадатковая літаратура ...68
Пытанні для самакантролю ...68
Тэсты ...69
Заданні ...71
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...72



**Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – 1917 г.). Асаблівасці грамадскага, дзяржаўнага ладу і права** ...74
Дадатковая літаратура ...84
Пытанні для самакантролю ...85
Тэсты ...86
Заданні ...87
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...88
**Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў перыяд рэвалюцыйных пераўтварэнняў і ўтварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (1917–1922 гг.)** ...90
Дадатковая літаратура ...100
Пытанні для самакантролю ...100
Тэсты ...101
Заданні ...103
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...104
**Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (1922–1939 гг.)** ...105
Дадатковая літаратура ...114
Пытанні для самакантролю ...114
Тэсты ...115
Заданні ...117
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...118
**Заходнебеларускія землі ў складзе Сярэдняй Літвы і Польскай Рэспублікі (1920–1939 гг.)** ...119
Дадатковая літаратура ...124
Пытанні для самакантролю ...124
Тэсты ...125
Заданні ...127
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...128
**Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у час Другой сусветнай вайны (1939 – 1945 гг.)** ...129
Дадатковая літаратура ...138
Пытанні для самакантролю ...139
Тэсты ...140
Заданні ...142
Прыкладныя тэмы рэфератаў ...143
**Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. XX ст.** ...144
Дадатковая літаратура ...158
Пытанні для самакантролю ...158

Тэсты ....................................................................................................................160
Заданні ..................................................................................................................162
Прыкладныя тэмы рэфератаў .........................................................................163
**Дзяржаўнасць і права суверэннай Рэспублікі Беларусь (1991 г. – пачатак XXI ст.)** ..........................................................................................................164
Дадатковая літаратура ....................................................................................168
Пытанні для самакантролю ............................................................................169
Тэсты ....................................................................................................................169
Прыкладныя тэмы рэфератаў .........................................................................171

*Вучэбнае выданне*

**ЛАПАНОВІЧ** Сяргей Фёдаравіч,
**СУВАЛАЎ** Алег Мікалаевіч

# ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

Вучэбна-метадычны дапаможнік

Рэдактар *В.І. Барысава*
Тэхнічны рэдактар *Ю.С. Раманюк*
Карэктар *М.С. Прушак*

Падпісана да друку 12.06.2018. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Рызаграфія. Ум.-друк. арк. 10,23. Ул.-выд. арк. 9,24.
Тыраж 400 экз. Заказ 136.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/102 ад 02.12.2013.
Пр-т Машэрава, 6, 220005, Мінск.

**Лапановіч, С.Ф.**
Л24 Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэбна-метадычны дапаможнік / С.Ф. Лапановіч, А.М. Сувалаў ; установа адукацыі «Акад. М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь». – Мінск : Акадэмія МУС, 2018. – 173, [3] с.
ISBN 978-985-576-127-4.

Разглядаюцца асноўныя пытанні станаўлення і развіцця дзяржавы і права Беларусі. Асвятляецца ў храналагічнай паслядоўнасці гістарычнае развіццё беларускай дзяржаўнасці са старажытных часоў да нашых дзён, характарызуецца заканадаўства і асабліва важныя помнікі права. Дапаможнік змяшчае метадычныя матэрыялы для замацавання і самакантролю ведаў.

Выданне будзе карысным для курсантаў вышэйшых юрыдычных навучальных устаноў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй беларускага народа.

**УДК 34(476)(09)**
**ББК 67.3.(4Беи)**